ЬМА ЧОРНЫ

ЗЯМЛЯ

РОМАН

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

КУЗЬМА ЧОРНЫ

ЗЯМЛЯ

РОМАН У ТРОХ ЧАСТКАХ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК—1928

Друкавана ў друк. ФЗВ
Беларуск. Дзярж. Выд-ва.
У ліку 3.000 экз. Зак. 426.
Галоўлітбел 1522.

ЛЮБАМУ БРАТУ
ЮРАСЮ

Ў прасторы зоры лушчаць
сузор'яў срэбра—стынь.
Лясы, дубровы, пушчы
вартуюць нашу сінь.

ЯЗЭП ПУШЧА.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

I

Пяць дзён сьвяціла сонца, дарогі ўсе пахлі вільгацьцю пасьля дажджоў—чорныя з жоўтымі адценьнямі гліны. Іржышча было такое пустое і такое ціхае. І ад сонца здавалася шырокім усё—і глыбокае неба, і спустошаная на зіму ўраджаем зямля, і нават дробны камень пасярод палявое травы, і зрэзанай саломы—усё—да туманавае сіні блізкіх лясоў, да рэчак і вазёр, да дзеравяных хат і мураваных будынкаў, да ўсяго малога і вялікага, сярод чаго так пазнаны былі вялікія бунты радасьці і смутку.

Позьняе лета назаўсёды заснула на вясёлым іржышчы.

На выгане, на самых каляінах дарогі, на зарослых сухіх канавах, цьвітуць, шмат яшчэ, дзікія кветкі—пазгорталі па паўдні жоўтыя галоўкі і застылі так нярухома, надаюць яны зямлі выраз жывога твару, як і лагоднасьць паблеклага ўвосень сонца.

Сіняватая ад глею дарога ідзе паміж тарпянога балота і поля. Цыбатыя птушкі скачуць між куп'я, скачуць, крычаць. Зусім блізка дабягаюць яны да падгнілых платоў, дзе дарога робіцца пыльнай і бруднай і дзе густа стаяць нізкія хаты; шмат іх паўрастала ў зямлю, шмат новых пахнуць яшчэ

сьвежай смалою. Двары каля хат застаўлены драбінамі, паабрасталі дрэвамі; малыя сады каля іх паціху абсыпаюць жоўтым лісьцем стрэхі гумен. Сонца кіпіць на пярэстых колерах зямлі і дрэва. Вялікай лагоднасьцю ляжыць дзень на зямлі. І на далёкі размах вакол—пахне зямля і сьвеціць сонца.

Так хутка будзе канчацца дзень.

Тут у канцы вуліцы пачынаюць зьбірацца людзі. Пастаяць некалькі чалавек каля канцавое хаты ды ідуць далей—у новы дзеравяны дом з белымі вокнамі ў поле. Доўга зьбіраюцца людзі. Варочаюцца назад па два ці па тры чалавекі, пасьля зноў ідуць; і толькі, як раньняя ноч агарнула зямлю, поўна стала людзей у вялікім пакою местачковай школы.

Чырвонаватае сьвятло малое лямпы лягло на твары людзей.

— Чаго я, браткі, сабраў вас!

Грубы і роўны голас чалавека ў шырокаплечай бараварцы, пацягненай ні то жоўтым, некалі, ні то зялёным, а цяпер аблезлага няпэўнага колеру сукном, прагучэў цьвёрда і патануў у агульным шуме і непарадку. Чалавек глядзеў на ўсіх утомленымі вачыма. Курачы праз вішнёвы папяросьнік, ён не варушыўся, стаяў перад усімі і з усімі, падставіўшы пад дробныя пераліві скупога сьвятла твар свой, густа абраслы цёмнымі валасамі з моцнай сівізной. І твар яго быў грубым, нібы без асаблівага стараньня высечаным з простага каменя або з цьвёрдага шэрага дзерава—твар быў шырокі, буйны і стары. Тоўстая барада абы-як разгладжана і сівізна ў ёй кавалкамі. Ён усё курыў і стаяў, упёршыся рукамі ў стол.

— Хлопцы, ну то давайце гаварыць!

— Дык мы-ж от гаворым,—пажартаваў з кутка малады голас.

Тады і сам стараваты чалавек, закурваючы нанава, уцягнуўся ў адну з гаворак, што шумна вяліся паабапал яго.

За вокнамі зьбіраўся вечар, вечар першых дзён восені; лета прайшло назаўсёды, але на ўсім і ўсюды застаўся яшчэ яго радасны подых, і сум па леце пануе, калі вечарамі і ў месячныя ночы стукаюць аб зямлю яблыкі, падаючы з дрэва, поле і паплавы дыхаюць неабдымным прасторам, кусты ялоўцу ды крушыны маўчаць і пахнуць. І нават па зьмярканьні нагрэты за дзень моцным яшчэ сонцам камень грэе ў падэшву твае босае нагі.

Блыталіся і гулі гаворкі людзей.

— Ну то, мужчыны, можа, пачнем ужо!?

Стараваты чалавек пабарабаніў косткамі кулака па стале. Цяпер ён стаў трохі на водшыбе і каля яго апынуліся раптам двое—тонканосая, ня зусім маладая дзяўчына і шырокатвары хлопец з цёмнымі, нявыраслымі яшчэ, але скрозь запушчанымі, ня вельмі прыкметнымі вусамі. Мужчыны сталі зьбірацца гусьцей каля стала.

— Дык от, мужчыны, чаго я вас сабраў!

— То ты гавары, чаго ты сабраў нас, а то ты толькі марудзіш. Гэта раз...

Белабароды, баявы і моцны стары выткнуўся бліжэй і, выткнуўшыся, глянуў у твар стараватаму чалавеку за сталом:

... гэта раз. Я табе, Тамаш, скажу ў вочы,—ня мог ты, ліха табе, падабраць іншага якога, сьвяточнага, скажам, дня, а то папалі моду адрываць людзей ад работы.

Тамаш, прыкурыўшы з лямпачкі, апраўдаўся:

— А я табе, Павал, скажу толькі адно, што раз мне сказалі сабраць сход, дык я і зьбіраў,—от што, калі ты хочаш ведаць. А тымчасам, калі ўжо

я гэтак адарваў цябе ад работы, дык можаш сабе ісьці дадому, я табе слова і не скажу. Вер майму сумленьню. Ня ў тым дзела, што я гэта тут зьбіраў, ці ні я. Раз патрэбна, дык патрэбна. Няма чаго абціраціца пазавугольлю. Я гэта кажу, казаў я, казаць буду, калі ты хочаш ведаць. От што. І скончана дзела.

Павал напоўніўся раптам крыўдаю. Паварушыў шырокімі і кантовымі, падагнуўшымі наперад ад старасьці плячыма, узьняў накіраваны ўніз барадаты твар і падышоў да самага Тамаша з такім выглядам, як-бы Тамаш быў вінаваты ва ўсіх бядотах, якія калі хто-небудзь перажываў.

— Я табе павінен расказаць, раз цябе выбралі. Мы табе, Тамаш, даверылі, калі выбралі, значыць, цябе. Дык я табе і скажу, як я цярпеў і цярплю...

— Ты мне не гавары, што ты мне гаворыш! Я тут ня прычым. Маё дзела—старана.

— Як старана тваё дзела? Тамаш, кепікі з мяне строіш! Раз ты сельсаветчык, то ты можаш распараджэньне даваць...

— Якое распараджэньне? Што ты гэта! Што я начальнік які ці што! Я просты чалавек. Мала што мяне выбралі.

— Ты маўчы. Раз ты стаіш бліжэй да справы, дык ты павінен ведаць. Што ты ня бачыш, як хто жыве?.. Як я гарую?!

Хлопец з маладымі вусамі папробаваў уняць Паўла:

— Ціха, дзядзька. Пачакайце, трэба сход пачынаць.

— Сход пачынаць! А калі я хачу сваю крыўду выказаць!

— Дык вы пасьля выкажаце.

— Пасьля... Дык гэта значыць працоўнаму чалавеку не даецца слова выказаць... затыкаеце рот!?

— Ніхто нікому роту не затыкае.

— Я ўсё-ткі цябе, Алесь, люблю. Твой бацька быў рамесьнік, вечны яму пакой на тым сьвеце. Я гэта табе заўсёды скажу,—ты хлопец, Алесь, з толкам у галаве. Ты от пагл'ядзі на Яўхіма Петранчуковага. Што, на яго як належыць наклалі падатак ці не? Скажы, ты-ж таксама ў сельсавеце. Ты маладзейшы за Тамаша. Калі ты пра падатак не даеш веры, дык от табе Сабастыян можа пацьвердзіць. Ты думаеш, тут сваяўство ў мяне з ім, дык ён будзе гаварыць, ня ведаючы? Не такі ён чалавек. Гэта нічога, што нашы дзеці пабраліся. Тут гэта ня прычым. От што... Сабастыян, хадзі сюды!

З натоўпу мужчын вылез буйны чалавек, з вясёла-панурым, поўным тварам і вялікімі вусамі.

Алесь пастараўся не заўважыць яго і пачаў сход. Сабастыян выплішчыўся на самы перад, не даючы Алесю гаварыць:

— Алесь, я табе раз назаўсёды скажу, ня будзь ты такім. Раз чалавек хоча выказаць, то ты чаму яму слова не даеш?..

Раптам ён зьвярнуўся да тонканосае дзяўчыны:

— Вы ў нас у сельсавеце ўжо другі год; паставілі вас, значыць. Дык вы павінны ўзяць мадам-таварыш, на ўвагу, што тут слова не даюць. Выказацца народу ня хочуць даць.

Тут заўважылі, што Сабастыян п'янейшы за Паўла.

— Я, мадам-таварыш, кажу проста, бо я і сам, можна сказаць, чалавек просты і шчыры. Гэта правільна робіцца, ці не?

— Што?

— Усе гэткія парадкі. Хто скажа, што я не пацярпеў, як былі тут немцы. Хто скажа? А цяпер ніхто і вухам не вядзе, калі прышлося да справы. Усякі хвастом накрываецца, каб яго ўжо нечага векам з новых дошчак накрылі. Чулі ці не?

Ён пахіснуўся ўбок, аднак моцна адзержаўся на нагах. Павал радасна глядзеў на яго, чакаючы, што ён як мае быць выкажа ўсё—і за сябе, і за яго. Раптам Сабастыян, забыўшы, што гаворка пачалася пра падатак, зьвярнуўся да сходу, раз-по-разу паглядаючы на Тамаша, Алеся і дзяўчыну:

— ...Нічога з гэтага ўсяго ня было і ня будзе. На такіх парадках далёка не заедзеш. Тут дзела ня толькі ў тым, што Павал пацярпеў пры немцах— і ён пацярпеў і я пацярпеў. А ўвагі, добра кажа, ні на грош. Я вам скажу, браткі, усім адкрыта, што я і дагэтуль свайго ніяк не магу спагнаць.

— Чаго?

— Я вас пытаю: Андрэй магнат ці не? Магнат! А майго гусака забіў, і я дагэтуль ніяк спагнаць не магу. Мне гусака ня шкода. Каб на добры лад, дык я магу яму падараваць жывога гусака, от і ўсё. Чорт яго бяры з гусакамі разам. Але тут дзела важна, чаму я спагнаць не магу, чаму?

Тады раптам Павал падняў лямант з левага боку стала:

— Мы бяз дроў чэзьнем! Няма чым, прыдзецца зімою, душу абагрэць. Чаму дроў не адпускаюць? Гаварылі, што дроў дадуць, а гэта хвастом накрыліся. От чалавек, які летась плот разабраў ды спаліў, Сабастыянаў брат, Мацьвей.

Шэрая сьцяна людзей цяпер шчыльна абкружала стол. Твары людзей, і хмурныя, і вясёлыя, і з спачуваньнем, і з сьмехам, глядзелі на Мацьвея. Мацьвей-

вей вылез наперад: шчуплаваты чалавек з васпаватым ілбом, у кароткай салдацкай вопратцы і вельмі падраных і дрэнна палатаных портках; трымаў шапку ў руках; пробаваў гаварыць няроўным голасам, трохі зайкаючыся:

— ...Летась у мяне было тры вішні ў агародзе, дык я іх спаліў у печы, а пасьля ад вулачкі плот разабраў, так што людзі даўно пасеялі агароды, а ў мяне пустка была, сьвіньні цэлую вясну спацыравалі, каб яны павыдыхалі; не абагнацца ніяк. Колькі я разоў табе, Андрэй, гаварыў, каб ты сваіх сьвіней ня пускаў.

Андрэй утуліўся ў ватовую жыкетку і падаў голас:

— Чаму гэта ўсё я вінават? Што я за грэшнік гэтакі? У таго гусака нехта забіў, дык ён да мяне чапляецца, у гэтага сьвіньні агарод парылі, дык таксама я вінават. Што вы маеце да мяне? Я богу душою ня вінен! Можа яшчэ я вінават, што ў цябе дроў ня было? Унь людзі панавозілі—калі хто не вершалін, дык гальля тоўстага, што цэлую зіму паліў, ды бога хваліў. Нават-жа поўсажонкі адпускалі, а хто табе вінават, што ты нядбайны!

— А на чым я прывязу, калі ў мяне конь ледзьве ногі цягае. Есьці нічога ня хоча. Што я жонку запрагу ў драбіны, ці што? Можа ў каго браты ці сваты памагаюць, а ў мяне брат такі, што каб ён мне калі на макавае зерне памог!

Тут Мацьвей глянуў на брата Сабастыяна. Бачачы, што справа пашла зусім у іншы бок, вакол зарагаталі. Сабастыян падышоў да брата і палажыў руку яму на плячо. Мацьвей застаўся стаяць так, не пакідаючы гаварыць. Голас яго гучэў няроўна і з перапынкамі:

— Я тут скажу перад усім народам. Ты, Сабастыян, не пабрацку робіш. Брат гэтак ня робіць. Ты багацейшы за мяне. У цябе двое коняй летась было, а дзяцей малых няма. Што табе адходзіць. Ты застаўся жыць на бацькаўшчыне, а мяне адзялілі...

— Бо ты змоладу па сьвеце бадзяўся, а я ўвесь час рабіў на гаспадарцы... Ты не забывай, што я табе сплаціў за пляц, хоць ты і забраў другую хату...

— ...У цябе паплавец за гумном і гумно...

— У гэтым самым гумне ты збожжа складаеш. Я табе і слова не кажу...

— Я тут перад усімі табе ў вочы скажу, я таіцца ня буду. Я люблю праўду, от што! Няхай людзі скажуць.

— Ідзі, Мацьвей, дадому, ляж ды прасьпіся, не сьмяшы людзей. Ідзі і я пайду з табою.

— Ідзі сам, калі табе трэба!

Сабастыян з Паўлам адвялі Мацьвея назад. На вачох у Мацьвея блішчэлі сьлёзы. Выціраючы іх каравым рукавом, Мацьвей стараўся давесьці:

— Дайце, браткі, мне крыўду выказаць. Сабастыян, дай я выкажу перад усімі людзьмі, хачу сказаць, ні то што... Дзядзька Павал, пусьці. Сабастыянка, братка, куды ты цягнеш мяне. Чаму-ж сам ніколі ў крыўду не падаешся, а брат, патвойму, павінен загінуць ці што?.. От ты які... няхай-жа людзі ведаюць. Ты не пабрацку робіш, ты гад!

— Мацьвейка, ідзі, я цябе дадому завяду. Ідзі спаць ляж.

— Сабастыян!

Тады пачуліся галасы з усіх бакоў:

— Пасадзеце яго, няхай падрэмле трохі, ды ачухаецца.

— Дадому яго завесьці трэба.

— Няхай пагаворыць, калі яму так хочацца.

— Няхай выкажа чалавек, калі патрэбу мае. Нашто яму рот затыкаць. Няхай гаворыць, калі якая бяда ў яго ёсьць. Гавары, Мацьвей.

Аднак Мацьвей неўзабаве ціха ўжо сядзеў на лаўцы каля сьцяны. Сабастыян стаяў каля яго, стараючыся сьцішыць яго:

— Чаго ты ўскіпеў, дзівак! Калі ты лічыш, што я цябе пакрыўдзіў, то падавай у суд на мяне, калі што з мяне спагнаць думаеш. Суд прысудзіць з таго, хто вінаваты. А то ты — халера цябе ведае, чаго ты хочаш, што ты мяне абармотам робіш перад усімі людзьмі! Чаго ты ад мяне хочаш! Дурань!

— Брат, ты абармот!

— Ты гавары больш выразна.

— Ты багацейшы, а ці памог ты калі мне?!

— Ня крычы гэтак. Няма чаго. А мне калі хто памагаў, калі на тое пашло?..

— Я табе скажу толькі адно: багаты беднаму ніколі таварышам ня будзе. Сабастыян, брат!

А тымчасам Павал стараўся ўсіх перакрычаць, даводзячы аб сваёй крыўдзе.

Тады Алесь стукам рукі па стале сьцішыў агульны шум і непарадак галасоў. Вакол стала цішэй і нават Сабастыян з Мацьвеем панізілі свае галасы. Тамаш зноў пробаваў растлумачыць, чаго ён сабраў сход, што яму было загадана зьбіраць, аднак-жа ён ня скончыў растлумачваньня свайго, бо Алесь, ня слухаючы, мацней за яго сказаў, аб чым будзе сход.

Раней, перад гэтым, кагадзе, вакол вяліся гаворкі спрэчкі аб тым, пра што павінен быў гаварыць сход. Нават сам Тамаш, калі адыходзіўся ўбок, ад стала, даводзіў, што якраз цяпер самая пара пачынаць

работу—да зімы яшчэ можна пасьпець, а тымчасам якраз і каморніка можна затанна дастаць—якраз тут нейкі практыкант жыве і яшчэ месяцаў са два будзе жыць. Тады гаворкі пра гэта вяліся моцна, але няпэўна. Цяпер-жа пачалі гаварыць адзін аднаму цішэй, але цьвёрда і ўпэўнена. І хоць даўно ўжо, з самае вясны, нагаварыліся пра гэта, аднак і цяпер здавалася, што толькі пачулі пра гэтую справу. Усё пачалося нанава. І вось пасьля таго, як Алесь прагаласаваў і большасьць галасоў паказала, што ўсю прыбалотную зямлю трэба перамерць і перарэзаць, тады падняў галаву Мацьвей. Твар яго быў узбуджаны:

— А я магу сказаць, што гэта толькі згуба і больш нічога.

— Чаму?

— Бо каморнік дарэмна мераць ня будзе. Дык багатаму—чорт яго ня возьме, табе, Сабастыян, якое ліха адходзіць. Ты памятаеш, як Наталя памерла, дык у цябе дошчак поўнае застрэшша, добра табе было выгаворваць мне, што я пальца ня прыклаў да пахаваньня сястры. Мала ты тады папатрубіў людзям?!

— Калі гэта было?!

— А ў Юліка, як гумно перакрывалі; людзі чулі.

— А ты чуў?

— Я ўсё роўна як чуў. Юлік яшчэ, здаецца, ніколі ня хлусіў... Можна зараз-жа пайсьці да Юліка. Ён пры сьведках скажа. Хадзем да Юліка!

Алесь і нават Тамаш сьцішалі іх, аднак Мацьвей пасьпеў выказаць:

— Па мне, як сабе хто хоча, а я дык скажу кожнаму ў вочы проста і адкрыта. Чорт яго тут усім выстарчыць. Яшчэ нейкі каморнік зьявіўся

яшчэ і яму плаці. Тут гэта назнарок падстроена багатырамі,—калі ён дасьць колькі рублёў, дык гэта яму, як пугаю па вадзе; ды разам з сабою беднякоў у адну кучу зглабурдзяць, хочуць на чужым карку ў рай уехаць. Хваробы! Я такі чалавек: для мяне родны брат—ня брат, калі ён мне не спагадае.

Ня гледзячы на стук Алеся кулаком па стале, Сабастыян падняў лямант:

— А чаму гэта ты забыўся на тое, што я табе памог каня купіць; чаму гэта ты забыўся?..

— Той конь здох. От што!..

— Але-ж я табе памог яго купіць...

— Шкадаваў, памагаючы, дык от конь доўга на сьвеце ў мяне і не папарыўся. Каб ты ад шчырага сэрца памагаў мне, дык я і дагэтуль рабіў-бы гэтым канём.

Тамаш, седзячы збоку на лаўцы, схаваў пальцы рук у рукавы і зарагатаў. Рогат пачаўся з усіх куткоў. Тады і Алесь глядзеў і слухаў Мацьвея:

— Сярод такіх людзей ня выжывеш, гэта ня людзі, а азіяты. Каб чалавек канаў, ніхто табе не поможа, яшчэ рады будуць, каб іх, бог даў, скрышыла ўсіх да аднаго.

— Каго гэта?—пачуўся голас.

Мацьвей панізіў голас, але ня спыніў гаворкі:

— У людзей, калі радня, дык радня—ад яе можна помачы чакаць, а ў мяне дык усе жывуць сабе, маюць хлеба і да хлеба, а я—хоць прападай. Нават хворую Наталю хацелі мне прыпаручыць. Я гэта перад усімі людзьмі скажу.

— Ніхто табе яе не прыпаручаў, бо яна да цябе і не пашла-б,—ты-ж яе раней пары забіў-бы. Мала ты яе папабіў змоладу?!

— А ты цяпер біў яе.

— Брэшаш!
— Людзі могуць сказаць.
— Брэшаш!
— Я не брашу. Мала яна, жывучы ў цябе, папатулялася пазавугольлю! Ад добрага брата туляцца ня будзе. Каб ты быў людзкі ды добры, дык яна і дагэтуль жыла-б.
— Дык, патвойму, я яе ў магілу зьвёў ці што?
— Ты яе ня зьвёў, але яна яшчэ жыла-б, каб ёй добры догляд.
— То чаму-ж ты не даглядаў, калі ты мне ўпікаеш, што сухотлівая сястра бяз догляду зайшлася.
— А чым я мог яе дагледзець. У мяне ня было ёй чым правіцца.
— Ну дык што ты маеш да мяне?
— Маю і мець буду.
Тут умяшаўся Павал. Трасучы белаю барадою, пагойдваючыся здаровымі яшчэ сваімі плячыма, ён падышоў да Мацьвея. Вочы яго гарэлі вострым агнём нявыказанае крыўды, і губы трасьліся. Ён упёрся барадою ў грудзі і, ад сьпяшаньня не дагаворваючы да канца слоў, сказаў:
— Што ты Сабастыяна вінаваціш, а сам ты што!.. Шмат ты зрабіў Наталі дабра? Колькі ты яшчэ яе дабра спажыў! Гад, абармот!
— З якога гэта часу вы ў адну дудку граць пачалі? Усё дабро засталося ў Сабастыяна. Нават ня даў мне старога картовага Наталінага каптана. Калі-б жонка мая не знасіла, дык дзяўчына гусі ў ім пасьвіла-б. А ён—магнат насупроць мяне, дзедзіч,—старога каптана пашкадаваў, мне, брату роднаму, каб яму бог здароўя пашкадаваў. У чужой справе і ты асэсар знайшоўся. Над чужою душою камандаваць дык і ты майстар. Табе душа не баліць, калі маё дзіця мерзьне. Калі летась у замаразкі

мой хлопец паатмарожваў ногі, бегаючы босы, дык цябе гэта мала абыходзіць!

— Няўжо-ж ты хочаш, каб я твайго хлопца абуваў.

— Дык і ня лезь у чужую справу.

Тут Мацьвей скрывіў на бок твар. Левы куток губ ад'ехаў уніз, і ён пачаў плакаць. Сьлёз у яго было мала, толькі чырвань зьявілася вакол вачэй, і ён некалькі разоў чмыхнуў у нос, гаворачы:

— Наталька, і на тым сьвеце не дадуць, гады, паляжаць табе спакойна; нават чужыя абармоты косьці твае варушаць. Як на гэтым сьвеце ня было табе спакою, так і на тым паляжаньня табе не даюць, каб ім бог шчасьця ня даў.

Раптам Сабастыян, расчуліўшыся, далучыўся да Мацьвея, сам не далёкі ад таго, каб заплакаць:

— Жыла-жыла, гаравала-гаравала, працавала і памерла ліха ведае як... Мацьвейка, хадзем дадому...

Нехта недзе ўздыхнуў, нехта засьмяяўся, і вакол была цішыня. Вялікі сход маўчаў. Толькі зрэдку чуўся шэпт сярод людзей.

Вечар быў ціхі і лагодны. Спакойная змрочнасьць яго прыпала да вокан, за вокнамі-ж чуўся гэты спакой. За вокнамі над апусьцелым полем — праз вокны відаць было — неба ўзьняло некалькі малых і чырванаватых хмар, на захадзе краі іх яшчэ ледзьве прыметна залаціліся белаватымі колерамі і сплывалі яны за рысу зямлі і неба. На фоне іх вырасталі чорныя вялікія дрэвы, і драмалі яны чула і радасна.

Нейкі час на сходзе маўчалі, пакуль, патроху, зноў не ўзьняліся гаворкі. Алесь нанава павёў сход.

Сход цягнуўся да самае поўначы... Пад поўнач-жа моцна стукалі яблыкі, ападаючы з дрэў,

моцна грукалі коні ў хлявох, жуючы і тручыся аб сьцены і жалабы. Востра пахла ўсё. Сход разыходзіўся шумней, чым зьбіраўся. Мацней ад усіх чуўся голас старога Паўла. Голас быў праразьлівы і ўзбуджаны:

— Як мы мучымся—дык ня дай бог. Колькі на ўсё трэба будзе выстарчыць, дык а-яй! А ён яшчэ—гэта-ж падумаць—заяўляе, каб кожны па рублю даў капэлю пажарную зрабіць, ці наняць, чорт яго душу ведае. Музыкі ўжо захацеў, каб ён душою заграў. Ці даўно бяз хлеба сядзеў!

— Хто гэта?

— А гэты жэўжык Марцінюкоў—дадумаўся, ліха яму, па рублю з гаспадара; от абы зьдзерці. Выдумаў.

— Калі-ж ён гаварыў пра гэта?

— А ў тую нядзелю, як сьпіскі рабіў, па хатах ходзячы, у кожнай хаце плёў, пакуль я яго не аблаяў. І сягоньня ўсё каля стала пакручваўся, думаў, мусіць, ушчаць работу гэтую сваю. Няхай-бы ўшчынаў, трэба было-б асекчы дурня гэтага. Тут хлеба няма, а яму капэля. Музыкі, я-ж кажу, захацеў.

Вясёлы голас, з лёгкім рогатам, заўважыў:

— Дык-жа калі сядзіш галодны, то тады і музыка добра—забываеш на голад.

Тады яшчэ адзін голас пачуўся задумена:

— А заграніцаю, калі ў каго нястраўнасьць, дык лечаць музыкаю. Проста над вухам у яго рэжа музыка, дык кажа, ліха яму, так адразу ў жываце ўсё і ператравіць.

— Ну добра, а калі прыдзецца часамі так, што ў душу кавалка хлеба ня ўбіць. То таксама з музыкаю пхаюць сабе ў горла?

— А чорт яго ведае.

— Ты-ж быў там. Ты-ж павінен ведаць.

Чорт яго ўсё ўведае. Сьвет вялікі, а галава малая, дый тая ўсяго адна.

Раптам пачуўся Тамашоў голас:

— Хлопцы, а каб гэта і сапраўды музыку сваю завесьці.

— Заводзь. Хто табе не дае. Пайдзі ў Шалавічы—там кажуць вельмі капэля лоўкая, наймі, ды няхай сабе граюць табе. Ляж на палаткі, паплёўвай у столь дый слухай. От выгаду мецьмеш!

Тамаш больш не гаварыў. Толькі, калі цьвёрды і заклапочаны голас Алеся ў дзесяты раз пачаў даводзіць неабходнасьць перамеркі зямлі, Тамаш памог Алесю:

— Я вам, хлопцы, давяду гэта прыкладам. Справа была ўлетку. А вядома, улетку ноч, як у зайца хвост,—калі твая галава чым вельмі забіта, то ты яе і ня прыкмеціш. Я ўстаў быў яшчэ на расьсьвітаньні, а дзень тады, як год, так што часу было—на ўсялякую работу хопіць. Ну, устаў я гэта сабе нацямочку, яшчэ нават сьцежкі пад нагамі ня відаць...

Голас яго доўга гучэў. Пасьля ён адзін ішоў у свой далёкі канец вуліцы. Ступаў ён цяжкімі ботамі сваімі цьвёрда і няроўна, моцна асядаючы плячыма ў тахт сваім крокам. Шырокая постаць яго сіратліва варушылася на змрочным фоне вясковае ночы. Напроці свае хаты ён прыпыніўся, пачухаў шыю і пашоў да студні. Выцягнуў вядро вады і, разьліваючы на дубовы зруб і сабе на боты, доўга піў, прыпаўшы губамі да халодных клёпак сьлізкага вядра. Вада плюхала моцна і доўга, пасьля, як пашоў ён, вядро, гойдаючыся на жэрдцы, стукалася аб зруб. І гэта былі адзіныя зыкі безутрапёнае ночы.

II

Вецер плыў з надхмарнае вышыні. Шырокасьць і напорнасьць яго весялiла сэрцы. Весялілася-ж і зямля ў пустэчах палявога іржышча. Каля кустоў птушкі ўзьнімаліся і гойдалiся ў неабдымным імчаньні паветра. Сінія даляглядды былі маўклівымі і думнымі, як і той дзень, шумны толькі ветрам ды жоўклым лісьцем на кустох і сухім, раскіданым па траве пад імі. Аўсянае іржышча хмурна жаўцела; зелянілася густым каліўём згрызенае травы і палявога зельля. Дарэшты высыхаў апошні авёс; мала яго засталося на полі, і мяцёлкі яго шумелі суха і сіратліва. Коняй цягнула да гэтых прывабных мэтлiкаў.

Ападаў ветравы холад і цяплела надвор'е.

Аднак-жа вецер густа халадзіў цела, і Мацьвеяў Юрка ўтульваўся ў свой кажушок. Ён стаяў пад жоўтаю, выгінастаю крушынаю, тонкаю і малою, і глядзеў на поле. Дробнае лісьцё сыпалася на яго. Тамаш—грузны і раскудлачаны, сядзеў каля кустоў, курачы з вечнага свайго вішнёвага папяросьніка; моцна адхаркваўся і пляваў на траву. Вецер шавяліў яго бараду і разьвяваў сіні дым яго папяросы. Прачышчаючы саломінаю папяросьнік, Тамаш жартаўлiва сказаў:

— Дзе ты, сынку, каўнер свой падзеў?

Моцна пацягнуўшы чырвоным ад ветру носам, Юрка адказаў:

— Чорт яго ведае, недзе адарваўся.

— Трэба прышыць, сынку. Бо кажух без каўняра, усё роўна як певень без хваста.

— І так даносіцца. Стары ўжо.

Юрка павінаватаму ўсьміхнуўся.

Тамаш паджартоўваў:

— Што-ж ты без каўняра ходзіш, скажы, няхай табе дома прышыюць. Як-жа ты так да дзяўчат ходзіш?

— Я яшчэ не хаджу.

— Чаму ж ты ня ходзіш?

— Бо яшчэ ня вырас.

— І-і-і, дзівак. Я ў твае гады, бывала, дык уг-га... Колькі табе год цяпер?

— Я добра ня ведаю, здаецца дванаццаць—трынаццаты.

— Дык ты неўзабаве гаспадаром будзеш!

Юрка маўчаў, стараючыся схаваць кулакі ў вузкія рукавы аблезлага кажушка.

— Чаму ты такі, сынку, нясьмелы?

— Я ня ведаю... Хіба я нясьмелы?.. У вас, дзядзька, запалкі ёсьць?

— Нашто табе?

— Гэта я хачу агню накласьці.

— Кладзі... На табе запалкі.

Тамаш кінуў запалкі на траву, Юрка ўзяў іх, паглядзеў і сказаў:

— Адсырэлі.

— Якое адсырэлі, калі я іх у кішэні трымаў!

Аднак Юрка падсушыў запалкі: расшпіліў кажух і падлажыў іх пад паху. Мільгнула з-пад кажуха пафарбованае начорна зрэб'е верхняе сарочкі і жоўтая бляшка вузкага раменьчыка-падпяразкі. Пад кажухом Юрка быў тоненькі і кволы.

— Але-ж твой і кажушок выліняў, голы, як бубен.

— Гэта мне і пашылі гэтакі.

— Дзе-ж вы такіх аўчын дасталі?

— Гэта з старога татавага перашылі.

— І без каўняра шылі?

— Не, адарваўся.

— А я думаў, што без каўняра... Бяжы, сынку, коні адвярні ад аўса. Бач, як зьнюхалі, падлы... Эй, куды, каб цябе ваўкі ўклалі!

Голас Тамашоў гучна разыходзіўся з ветрам. Сядзеў ён, як моцна ўрослы ў зямлю і траву,—шырокі постацьцю і ўзлахмачаны валасамі і адзежаю. Юрка сваім дзіцячым голасам, тонкім і няроўным, адварочваў коні. Ён бег па іржышчы, махаючы аброцьцю. Коні,—Тамашоў лепшы, яго горшы, нават зусім дрэнны—на адно вока сьляпы, стары і худы,— нехаця адскочылі ад аўса, усьпеўшы, аднак, скубянуць яго. Тамаш весела гукаў:

— Дагані, дагані, сынку, ды цуглямі па хвасьце ўклей!

Юрка адагнаў коні ў кусты і падышоў назад. Тамаш зноў ужо курыў, моцна харкаючы і плюючы. Юрка зьбіраў ужо лом для агню, але тут белабароды Павал выехаў на белым кані куставою дарогаю з кустоў. Седзячы на высокім кані, ён сам здаваўся вельмі буйным і здаровым. Барада яго, як і заўсёды, упіралася ў грудзі, узбуджаны твар чырванеў. Торкаючы абсацамі зрыжэлых ботаў каню пад чэрава, ён пад'ехаў да самага Тамаша і Юркі. Прыпыніў каня і нарабіў крыку:

— Вы думаеце, калі я ня ўсьпеў прыбраць усяго свайго аўсу, калі я трохі запазьніўся з аўсом, дык думаеце, я так і пакінуў на патраву вашым коням, каб вы іх павывалаквалі!? Вы думаеце, я нічога ня бачу і ня ведаю!? Нашто авёс коньмі травіце? Вы!—сабраліся ўдвух, малы і стары.

Тамаш, не ўстаючы з свайго месца, растлумачыў яму:

— Чалавек з цябе, што ты выдумаў? Чаго ты крычыш; што гэта ня бывае, што конь калі ў патраву ўскочыць? Гэта-ж не назнарок; што гэта мы

азіяты якія, што будзем твой авёс травіць!? Што ты розуму ня маеш у галаве, ці што!?

— Травіш авёс ды яшчэ мяне дурным робіш?!

Ї Павал рушыў забіраць коні. Перапалоханы Юрка схваціў свайго каня за грыву і пацягнуў у кусты, Тамаш стаў і засьмяяўся:

— Ты ўзвар'яцеў, Павал, ці што?

Лямант гэты чуўся на той бок вузкае істужкі кустоў. Ї вось вышаў адтуль Алесь, абветраны і вясёлы. Пасьля вышаў Сабастыян, пануры, шчыльна падпяразаны па доўгім халаце. Яшчэ адзін—кульгавы трохі на левую нагу, нізкі, з нядаўна голенаю барадою. Папраўляючы шапку, ён бліснуў шырокаю лысінаю. Алесь сьмяяўся:

— Вы, дзядзька Павал, усё роўна як камандзір які, на белым кані. Толькі нешта вашага войска нідзе ня відаць.

— Што ты з мяне старога кпіш, знайшоў таварыша!.. Унь авёс травяць, а я павінен маўчаць? Дабралі розуму!

— У нас ён, браце, з прадвеку гэты розум ёсьць.

Тамаш сказаў гэта і ўзрадаваўся новым людзям, што яшчэ выходзілі з кустоў. Юрка зноў стаяў тут, хаваючы рукі ў рукавы.

— Дзе-ж ты сынку, запалкі падзеў?

Юрка пашукаў у кішэнях, пачаў абмацваць за пазухаю.

— Што-ж ты гэта нарабіў? Падняў крык на нас бяз дай прычыны, і цераз цябе хлопец мае запалкі згубіў.

Ї Тамаш зарагатаў. Алесь, сеўшы на зямлю, пастараўся заспакоіць Паўла:

— От пускайце, дзядзька каня, ды пасеце з намі.

Павал моўчкі зьлез з каня. Кульгавы і лысы заўважыў:

— Калі-бо пакідаюць ліха ведае нашто снапы на полі, усёроўна як назнарок. У людзей дык даўно ўсюды чыста, а гэта выткне з поўкапы снапоў што няма ніякага разгарненьня.

Павал, не пакінуўшы яшчэ злаваць, закрычаў:

— Мне тваіх парадаў не патрэбна. Я сам ведаю, што раблю. Калі мне не выпадала гэты авёс раней забраць, дык няма чаго тут мне памагаць языком.

— Чаго-ж ускіпеў так. Хіба я ня праўду кажу? Кручаны нейкі дый годзе. Чаго ты крычыш?

Павал спачатку змоўчаў. Пацерабіў бараду, падумаў нешта гледзячы ў зямлю і паспакайнеў раптам:

— А ты, Юлік, нялішне тут паказвай мне, як мне маю гаспадарку весьці. Я і сам ведаю. Глядзі сябе.

— Я табе і ня зьбіраўся паказваць.

— І добра рабіў. Кожны павінен глядзець свайго.

— Добра таму і глядзець, хто можа.

— А што, ты ня можаш?

— Папробуй ты з гэтакаю нагою, як у мяне.

— Па гэтакай назе можна яшчэ жыць. Ты-ж, можна сказаць, зусім проста ходзіш. Яна-ж у цябе здаўных.

— Мала, што я часам пакульгваць пакідаю, але абы натруджу яе трохі або вільготнае надвор'е, дык проста мне аж да сэрца боль даходзіць.

— То трэба лячыцца.

— Трэба лячыцца! Ты думаеш я сам ня ведаю, што трэба лячыцца?.. Я лячыўся спачатку, але гэта такая хвароба, што заўсёды трэба яе падлечваць. А ўвесь век лячыцца—дык на гэта трэба быць

князем Радзівілам, а ня мною—Юлікам Барановічам. Гэта трэба мецць панскую кішэню.

— Ну то чаго ты енчыш, я табе тут нічога не памагу. Ты адно чужое бачыш: калі я аўсу ня прыбраў, дык ты мне выгаварваеш, што няма табе разгарненьня, што табе свае ўласныя коні трэба пасьвіць. Калі я хацеў заняць кагадзе з аўсу, з свайго ўласнага аўсу коні, дык вы ўсе вэрлах паднялі. Ты не спагадаеш, што, можа, мне не выпадала яго забраць. А сам дык разьенчыўся тут перада мною. Ты думаеш, адно табе баліць? Усякаму баліць. Не нага, дык якая-небудзь іншая трасца. Ты гэта сам павінен ведаць... От пазаўчора на сходзе, калі я хацеў заступіцца за ўсіх, дык мяне паднялі на сьмех. Ты-ж сам усьміхаўся, седзячы ў кутку. Ты думаеш, я ня бачыў? А ці сказаў ты хоць слова, каб абараніцца.

— А ты мне скажы, які гэта ўжо ты там абаронца быў? Ты толькі і абараняў нейкага свайго гусака.

— А што-ж, ты за мяне не заступішся?

— Ну дык і не гавары, што ты вельмі там ужо заступаўся за ўсіх.

— А што-ж, не?.. Хто, як ня я, сказаў першы, што перамер зямлі—гэта згуба.

— Гэта і я гаварыў.

— Хто гэта чуў?

— Той, хто чуў, той і чуў. Ты думаеш мне гэты перамер цацка вялікая? Хто асеўся на гаспадарцы, нават гэтыя сьцегачы, якім зямлю гэтымі гадамі падавалі, няхай от яны скажуць! Павыраблялі зямлю, паўгнойвалі, а гэта зноў пачнецца нанава. Ізноў, трасца іх матары, кашу заварань. Няма, каб было спакойна і ціха—жыві сабе і рабі. Дык не! А мы—дык няхай як сабе хочуць. Ніхто мяне з

маёй зямлі ня спора, на якой я спрадвеку сядзеў. Ня маюць права.

— Цяпер гэтакае права—ніхто ў цябе пытацца ня будзе.

— Але, цяпер, добра кажа, гэтакае права.

— Дык-жа гэта ня ўсю зямлю, а толькі прыбалотны клін. Колькі там тае зямлі! Больш там з яго таго клопату, чым тае карысьці, пакуль яна будзе так ляжаць і пакуль яе не ўлегаваць як мае быць. Дзе-ж вашы вушы былі, як гаварылі пра гэта?!

— Мае вушы былі там, дзе яны павінны быць. Я хоць ня чуў, можа, але сам ведаю лепш за цябе. У гэтым будзь пэвен.

Юлік Барановіч пачухаў хворую нагу і сагнуў шыю, прыстройваючыся пад кустам. Твар яго быў заклапочаны; чухаючыся, ён зьбіў шапку на патыліцу і высокі лоб пераходзячы ў жаўтаватую лысіну, абвяваўся ветрам і блішчэў. Ён так ляжаў, упёршыся ў зямлю левым локцем, і раскідаў думкамі, як яно лепш і як горш. Ён паглядаў на Паўла, які так прыкра кагадзе гаварыў з ім, аднак чуў, мусіць, у ім нейкага прыхільніка свайго. Неўзабаве ён зусім мякка заўважыў Паўлу:

— Горш за ўсё, дык гэтыя сьцегачы. Крыўдна, а-яй, як крыўдна, ліха на яго. Панасьцягваліся з усяго сьвету і цяпер камандаваць пруцца. Унь іншы, можа, дзе якім паскудзтвам займаўся, па сьвеце валачыўся, а гэта прыблытаўся сюды, зямлі ўхапіў і ўжо адразу, як роўны з усімі, разявіў горла арудаваць. Што, ня праўда?

Павал сядзеў на траве, падагнуўшы пад сябе ногі. Трымаў на каленях аброць і ціха пагойдваўся ўзад і ўперад. Тамаш, зноў пачынаючы курыць, сказаў:

— Ён то ўсякі з іх цягаўся па сьвеце. Брадзяжыў. Але цяпер, як асеўся на зямлі, дык от будзе сядзець і рабіць. Што ён вінават, што нідзе прытулку ня меў. Усякаму жыць трэба. Папробаваў-бы ты на яго месцы... Як табе вельмі крыўдна, што чалавек жыць пачаў пачалавечы! Ах, як табе крыўдна!

Павал блiснуў вачыма і ўскіпеў:

— А чаму гэта канешне мы павінны ўсіх у людзі выводзіць. Чаму гэта мы павінны быць такімі міласэрнымі. Добра двум-тром, а гэта чалавек дваццаць прытулілася тут. Як каторы, хоць блізкі які, а як гэты вунь Канапацкі, дык аж з-пад Смаленску аднекуль прыблытаўся, ці якое яму ліха. Чэрці яго ведаюць, што ён рабіў там, можа сабак лупіў.

— А што табе, што ён там рабіў. Няхай сабе лупіў, абы ня ты.

— От не хапала яшчэ, каб я сабакі лупіў!

— А чаму? Уг-га! Чым кепска. Ёсьць людзі, што і з гэтага хлеб ядуць.

— Згарыць ён няхай з сваім такім хлебам. Чаму-ж ён адцураўся гэтага свайго хлеба, ды падаўся сюды, зямлі захацеў?

— Ты гаворыш усё роўна як-бы ён і сапраўды сабак лупіў.

— Чаго ты за яго так абстойваеш. Чаму яму канешне ў нас прытуліцца, а ня дзе іначай?

— Чаго ты на яго напаў?

— Я не на яго. Я на ўсіх. У нас зямлі і так не хапае, а гэта яшчэ некага ўспамагай.

Тамаш глыбокадумна абцёр губы вялікім пальцам правай рукі і змоўчаў. Юлік Барановіч падцьвердзіў Паўлаву гаворку:

— Ёсьць, вядома. І ня было-б крыўды, каб ён хоць сядзеў ціха, а то ўсё наверх стараецца

выбрацца. Дзе які камітэт, дык ужо і ён там! Адразу! Ён ужо камітэтчык! Нядай бог, што за асэсар!

Тамаш зноў ня сьцерпеў:

— Ну, бо і добра робіць. Ён хоць абзавецца дзе трэба. Карысьць вялікая, што ты ад усякіх, як ты кажаш, камітэтаў рукі атрэпаеш, як ад чаго ліхога. І калі дзе прыдзецца, дык слова з цябе ня выцягнуць, як-бы табе цяляты язык аджавалі. А от тут пад кустам або пазавугольлю, дык ты вельмі-ж бойкі. Табе ніхто не ўнаровіць.

— А ты што, сам у камітэтчыках думаеш век векаваць? Пачакай перавыбараў, другі раз у сельсавет наўрад ці пройдзеш!

— Тады ўжо ты пройдзеш.

— А што, ты думаеш я дурнейшы за цябе? Ты думаеш я дзела не павёў-бы? Але я маю чалавечую натуру. Я не магу зьвягаць на кожнага пападвоканьню—таму падатак, таму нядоімка... Начорта мне сварыцца з суседзьмі, навек ворагаў нажываць. Я люблю глядзець свайго. Я гаспадар.

— Ты думаеш, адно ты гаспадар знайшоўся? Усякі з нас гаспадар, хто лепшы, хто горшы. А сельсавецтва гэтае для мяне непатрэбна. Як-бы я ўспамогся вельмі ім! Вялікае шчасьце лазіць па дзесяць разоў да яго пад вакно, выцягваць яго на сход. Парабка знайшоў, ды яшчэ кпіны строіць. Падзякаваў-бы, зараза.

— Дзякуй табе.

Тамаш падняўся і пашоў у кусты. Алесь засьмяяўся, паглядаючы на Барановіча. Павал весела кіўнуў яму:

— Зазлаваў... што яго гаспадаром не назваў.

— Ён то гаспадар, на яго няма чаго казаць. Хто на яго што кажа. Але вельмі ўлазіць куды яму ня трэба. Унь у гэтыя камітэтчыкі як улез,

дык і гаварыць не даецца. Такі ўжо адразу пралентар стаў, што хоць ты перад ім вазьмі ды скачы... Гэта-ж ён Мацьвею, Сабастыянаваму брату, выстараўся шэсьць пудоў аўса. Дык той—ні так пасеяў, як канём скарміў.

— Шэсьць пудоў!?

— Шэсьць. А можа нават і больш яшчэ. І зусім. І аддаваць ня трэба.

Юрка вышаў з кустоў і стаяў збоку каля іх. Ён зьмёрз і ўсё чмыхаў сваім малым пачырванелым носам. Сваім дзіцячым—няроўным і танклявым—голасам ён умяшаўся ў гаворку. Ад холаду голас яго быў яшчэ танчэйшы:

— Ды не, тата канём скарміў усяго пуд аўса. Можа нават і менш. А то ўсё пасеяў. Я сам бачыў.

Маўклівы цяпер Алесь глянуў на яго. Мужчыны не зьвярнулі на яго ўвагі. Павал гаварыў:

— Якое ім ліха адходзіць. Робяць мала, клопату ў галаве ня многа, а ты ім давай. Чаму не, уга! Гэтакім пралентарам і я магу зрабіцца. Што гэта—дрэнна гатовае браць? А хто-ж табе вінават, што ў цябе не гаспадарка, а халера ведае што? Што ты сваю гаспадарку да торбы давёў!? Гультаёў на сьвеце колькі хочаш. Памагай толькі кожнаму, давай гатовае, дык іх табе яшчэ больш наплодзіцца.

Узбуджаны Алесь моцна сказаў:

— Мацьвей хворы. Як ён табе будзе гаспадарыць.

— Ён ня так хворы, як рабіць лянуецца. Нядбала.

— Нядбала? Папробаваў-бы хто іншы на яго месцы. Няхай паскакаў-бы.

Юлік Барановіч заварушыўся і падсунуўся бліжэй да Алеся:

— А я ня хворы? Я, можна сказаць, на аднэй назе скачу, аднак-жа гаспадарку вяду — ніхто ня скажа, што горш за людзей.

— У вас хлопцы зараз навабранцамі будуць.

— Але-ж я іх павыгадоўваў!

— То тады вы яшчэ рабіць маглі як мае быць. Нашто вы, канешне, усюды сябе ўтыкаеце? У вас зусім іншая справа.

Павал паспакайнеў трохі. І гаварыў спакайней:

— Ён заўсёды крыўдзіцца. Нават да мяне нешта мае.

— Хто гэта?

— Мацьвей... Яму і брат ня добры, яму ўсе брыдкія... Што ён да гэтага Сабастыяна мае? Што той вінават, што лепш жыве за яго. Здаецца-ж бацькаўшчыну бяз крыўды падзялілі... Або хоць з гэтаю Наталяю. Тая даўно касьцьмі зямлю парыць, а ён усё, каб прымеў, дык выдраў-бы вочы Сабастыяну за яе. Ты, кажа, ёй есьці шкадаваў, ты яе ў магілу жыўцом увагнаў. Есьці шкадаваў! Як ужо ён яе накарміў-бы! Зьлітаваўся! Агледзеўся, што сястра на сьвеце была! Знайшоў час шкадаваць, як тая ўжо згніла даўно...

— Што гэта вы, дзядзька, над Сабастыянам вельмі апекавацца пачалі? Мусіць вам шкода, што Мацьвей яго крыўдзіць, небараку?

Павал толькі глянуў на Алеся:

— Памойму, дык жыві ты сабе, а брат няхай жыве сабе. Дык не! Яму коле ў вочы, што брат багацейшы! Будзь сабе ты багацейшы, хто табе не дае!? Хто табе вінават, што ты ня ўмееш жыць!? Каторы год, як на каня ня можа ўзьбіцца! Купіць падлу за пяць рублёў, а пасьля той здохне, дык ён яшчэ горшага купляе. Быць ня можа,

каб так ужо дайшло, што ніякае рады. Пасядзеў-бы бяз хлеба, а каня ніштаватага прыдабыў-бы! От як!

Юрка адышоўся да кустоў. Перакінуўшы цераз плячо аброць, ён падаўся на блізкую дарогу, аброслую ў кустох мятліцаю і трыпутнікам. Мятліца паасыпалася і тырчэла белаватаю травяною саломаю. У глыбокіх каляінах хавалася разьмешаная калясьмі гразь. Пазвоньваючы цуглямі, ён вышаў на той бок кустоў. За паплавамі голае поле зьлівалася з небам. Неба на захадзе прачышчалася. Сінія хмары бурна падалі за чорную рысу даляглядy і там, дзе яны назаўсёды разарваўшыся імчаліся ў сваё бяздоньне — зялёная сінь неба веела бязьзьменнай далячынёю. На зямлі было пуста і прасторна.

Юрка глядзеў на чорную ральлю за паплавамі, гладкую і ня ўкрытую яшчэ першымі ўсходамі жыта, падышоў паплавамі да вузкае і чыстае рэчкі і раптам заплакаў. У вачох яго стаяў вобраз памерлае летась цёткі Наталі і паўставала тая горкая хвіліна, калі бацька яго даў быў ёй раз хамутом у плечы. І яшчэ большае нешта выплывала ў памяці: як пасьля бацька тужыў і нудзеў аб гэтым, запрагаючы каня, каб адвезьці Мікалая крываносага на магілкі, капаць ёй яму. У хаце тады і на дварэ было пуста — усе пашлі да дзядзькі Сабастыяна наведваць памерлую.

Яшчэ злосны твар старога Паўла і жорсткія вочы Юліка Барановіча зьяўляліся ў ваччу яго. Глыбокая нянавісьць да іх душыла яго. Ён ня думаў, а сьвядома разумеў сэрцам, што ўсе гаворкі чужых людзей — надзвычайна далёкія ад усяе тае праўды, якая была, ці магла быць ва ўсёй гэтай жыцьцёвай справе.

III

Мікалай крываносы сядзеў на прызьбе і паплёўваў сабе пад ногі; глядзеў на раскалочаную калясьмі гразь. Дрэнна ўшытыя ў плечы рукавы рудое жыкеткі яго неміласэрна адтапырваліся каля плячэй усёю тоўсьцю самаробнага сукна. Ялаўцовым пугаўём ён пахвостваў па зямлі каля ног сваіх. Левае вока яго, як і звычайна, было прыплюшчана. Пад нагамі яго цьвёрдая і прасохлая была зямля; з-пад разломанага тротуару ў два аполкі вылазілі пакалечаныя калівы шчуплай травы. У канцы вуліцы бялела голае поле і ясныя адценьні вячэрняга сонца, хмарнага, кагадзе вызваленага з-пад хмар, клаліся на яго радасную прастору вясёлым харраством. Адвячорак рабіўся ясным і халодным. Мікалай пачаў насьпеўваць сабе пад нос нешта бяз слоў—ціхае і доўгае.

Па вуліцы ішоў рыжы Хоня—нізенькі і рухавы. Ішоў няроўна і чухаў шыю пад гаматным каўняром палатнянага фрэнча.

— Мікалай, о, Мікалай!

— Чаго ты?

— Ты ня бачыў рыжага пеўня?

— Не, ня бачыў.

— Ой, дзе ён дзеўся, чорт яго ведае?!

— Пашукай.

Хоня пашоў далей. Праз хат чатыры прыпыніўся каля студні і пачаў піць ваду з вядра, шырока растапырыўшы боты, запэцканыя ў гліну. На вуліцу выткнуўся Алесь, бяз шапкі і ў сініх портках.

— Нашто ты, Хоня, так многа вады п‘еш?

— Нездароў я.

— Што-ж табе?

— Я ня ведаю.
— Дык гэта ад хваробы табе вады хочацца?
— Я два гуркі з сольлю зьеў.
— То калі ты хворы, дык скажы жонцы, каб табе курыцу зарэзала.
— Я курыцы не жадзён. Ты думаеш я жадзён курыцы? Я цяпер, дзякуй богу, зарабляю. Добра, што конь пакінуў кульгаць.
— Зараз зноў пачне, калі будзеш такія вазы вялізарныя класьці.
— Ат, не пачне... Чорт яго ня возьме.
Хоня пашоў далей, Мікалай, моцна плюнуўшы пад ногі сабе, падаў голас:
— Каб ён так жыў, як у яго гэты конь доўга выбудзе, ён яго як бачыш згаблюе. Балаголскае сэрца каменнае. Ён да каня літасьці ня мае...
Мікалай дастаў з кішэні пачак махоркі і пачаў круціць папяросу. Крывы нос яго чырванеў, вока ён больш яшчэ прыжмурыў.
— Чаму ты, Алесь, так рана сёньня каня прывёў. Хіба ехаць куды сабраўся?
— У сельсавет трэба ісьці.
— Чаго?
— Каморніка гэтага гадзіць будзем.
— Гэта ўжо цяпер?
— От, якраз цяпер і добра, да сьнегу каб скончыць.
— Наймеце мяне тычкі ставіць. Я затанна згаджуся.
— Грошай няма. Няхай усякі сваю чаргу адбудзе.
Алесь падышоў да Мікалая. Мікалай думаў, ці так маўчаў. З завулка ехалі конна хлопцы і мужчыны. Белабароды Павал ехаў паперадзе, наводшыбе ад усіх—конь яго меў самы шырокі крок.

Па самым задзе гойдаўся Тамаш, зьехаўшы па вострай сьпіне свайго каня на бок, каб не замуляцца. Шчуплы Юрка ліпеў на худым кані сваім, падкурчыўшы ногі. Хлопцы густою сьцяною ехалі на конях. Голас аднаго з хлопцаў быў вясёлы і жартаўлівы:

— Чаму ты, Мікалай, так вока прыжмурваеш?

Алесь весела растлумачыў:

— Ён думае — на гэты брыдкі сьвет даволі глядзець і адным вокам, на большае ён не заслугоўвае.

Праехалі далей. Юрка непадалёку завярнуў налева ў свой двор.

Алесь збавіў жартаўлівы тон:

— Праўда, чаму ты, Мікалай, вока прыжмурваеш?

— Кантужаны быў на вайне.

— Але-ж ты на яго бачыш?

— Бачу.

— І здарава цябе кантузіла?

— Не. У левую палавіну твару зямлёю дало.

Яны памаўчалі. Мікалай зноў зацягнуў сваю вечную аднатонную мэлёдыю. Пасьля сказаў:

— Чорт яго ведае... От так жывеш чалавек. Прывыкаеш.

— Да чаго?

— Да ўсяго. Быў там на Горадзеншчыне... а гэта тут.

— Ну і што?

— Нічога. Здаецца тут і радзіўся.

— Ты жаніцца ня думаеш?

— Ліха яго... зьвязацца. Зьвяжыся, а пасьля не разьвяжашся.

— Ну пэўна, калі зьвязвацца для таго, каб разьвязацца, то лепш зусім не.

— Як каму іншаму, от як табе, дык чаму не. А гэта, дзе я гэтую жонку дзену... Жаніся, кажа, каб дурні не зьвяліся... Пражыву і так. Лепш, хоць вольны чалавек. Куды ня глянеш, усюды можаш пайсьці. Можа ты нікуды ніколі і ня пойдзеш, але табе так здаецца. Душа ў цябе вольная. Прасторная.

— Куды ты пойдзеш? Ты на гэтай прызьбе век праседзіш.

— Мала што праседжу. Але мне жонка ня выйдзе і ня скажа—даволі табе сядзець. Ідзі рабі што, або спаць кладзіся. Зноў-жа яно ня страшна, што жонка скажа. Я магу бяз нічые гэтае казкі ўзяць ды пайсьці. Але тут уся музыка ў тым, што от-жа ніхто мне ня скажа.

— Ну, а як пастарэеш, хто цябе тады даглядзіць?

— Тады тое і будзе. Навошта ламаць галаву пра тое, што некалі будзе. Навошта псаваць сабе сэрца... Што чалавеку трэба? Чалавеку трэба, каб душа была на месцы, от што яму трэба. Калі ў чалавека душа на месцы, тады яму і сьвет міл. Я лепш пасяджу галодны дзень, але каб я спакоен быў і каб ніхто мне ня мог слова сказаць прыкрага.

— Ну, добра, а калі ты, скажам, цяпер па чужых хатах прытульваешся, дык, гэта значыць, ты маеш спакой і волю?

— А што. Калі мне гаспадар што буркане калі, дык чорт тваю матару бяры, я табе не прысягаў канешне жыць у цябе. Згары ты няхай, плюну, ды пайду. Адна галава не бядна. От як... Можа мне калі захочацца пабрадзяжыць, ну то я ўстаў, адзеў шапку і марш, і ніхто мне слова ня скажа.

— Жыў-жа ты некалі там на Горадзеншчыне гаспадаром.

— Тады тое і было. Я пры бацькох жыў і рабіў. Маладым хлопцам быў.

— А колькі цяпер табе год?

— А нешта за трыццаць пяць... Ты кажаш, што я туляюся, як ветрагон, а от мяне як было кантузіла на пазыцыі, дык я тады, у першую-ж тую хвіліну і падумаў—добра, што хоць няма ў мяне нікога, а то сам прападаю і яшчэ там нехта будзе прападаць з жалю, ды можа ад голаду. Самому пакута ня страшна. Страшна, калі хто блізкі пакутуе. Гэта куды страшней. Я гэта сам па сабе памятаю, як бацькі старыя ў бежанстве ўміралі, а я ваяваў, халера яго ведае за што. Я ні то што хачу, канешне, каб мне хто якую награду даў за тое, што я ваяваў—от на табе, браце, ты-ж кроў праліваў—але тут крыўда, разумееш?!.

— Ты можаш іначай...·Сам вазьмі сабе награду. Бяры кавалак зямлі, прырэжам, і пачынай жыць нанава.

— Ды ўсё гэта не пра тое. Я не пра сябе гавару...

— Дык гэта-ж усім і так вядома, што з немцам ваявалі нямаведама за што. От так сабе, з ласкі на пацеху, некаму... А ты якраз гавары пра сябе. Калі ты загаворыш пра сябе, тады, значыць, і пра ўсіх загаворыш. А то ты сам брадзягаю жывеш, а пра іншых клапоцішся...

— От я-ж табе скажу. Ты з немцам не ваяваў?

— Не, недарос быў.

— А Варшаву браць хадзіў?

— Хадзіў.

— І можаш сказаць усякаму шмэндрыку, які часам цяпер над табою арудаваць хоча—а дзе-ж

ты, трасца тваёй матары, тады быў, калі мы галодныя і босыя порах нюхалі?

— Магу.

— Дык от. Ты і ёсьць гаспадар тут. Сіла твая. Ты малады і здаровы. Дык табе так і здаецца ўсё. Праўдзіва здаецца—сам будзь гаспадаром, а калі няма табе награды, хоць-бы, скажам, за тое, што кроў праліваў, дык сам зрабі гэтую награду, вазьмі сабе і яшчэ другому дай. Так гэта ці не, ты думаеш?

— Так.

— Ну, дык от. А я чалавек скалечаны. Што мне засталося? Глядзець, каб душа была несапсована. Жыць. Ты думаеш, калі я тут з табою разам на сходы хаджу, і косячы не адстаю ад цябе, дык я ўсё і магу так, як ты? А ці ведаеш ты, як гэта можа стыць душа, калі сам сядзіш пад сьмерцю ў загаджаных акопах, з галавою, аглушанаю пудам зямлі, і ведаць, што ў гэты-ж самы час канаюць за тысячы вёрст старыя бацька і маці з голаду, з вошай, выгнаныя з хаты, недагледжаныя валацугі... Канаюць, можа, дзе адны, сам-на-сам, дзе-небудзь на сьметніку, або на бітай дарозе. А сам, пасьля ўсяго, страціўшы здароўе, ня ведаеш куды падацца? Каб да маіх год ды яшчэ здароўе, дык я табе тут горы варочаў-бы... А можа ў мяне ад усяго гэтага натура стала іншая, ці як іначай—усё стала іншым. Людзі бываюць усякія. Ад чаго яны робяцца ўсякімі, гэта тут мы гаварыць ня будзем. От я цяпер начую ў Мацьвея. Дык я тут табе скажу, што каб яго зрабіць іншым, дык трэба капыл новы. А так нічога ня будзе. Так, дык ён табе будзе да канца дзён сваіх так гібець, прападаць, колькі ты яму не памагай, колькі ты яму не давай. Усё—як вада ў рэшата. Як у тхлань. Калі ў чалавека капыла

няма, такога, які патрэбен. От як. Гэта я каму хочаш скажу. Што-ж ён, з малых дзён ніколі ня зьеў пачалавечы, ні то што іншае. А цяпер, дык ён прывык і яму самому здаецца, што іначай і нельга. Ні то што ён дажывае веку, а так жыве. Можа часам ён што і зрабіў-бы, як мае быць, дык-жа ня прывык ён. Тут трэба, каб штурхануць яго, як мае быць, каб у яго аж душа затраслася. Тады ён табе інакшым зробіцца. На новы капыл яго нацягнуць трэба. Бо з-замаладу, што-б ён не пачынаў рабіць, дык усё яму рукі абцінала. Урэшце ў яго і выходзіць, што дзень пражыў, то і дзякуй богу... На, куры, Алесь.

— Пра капыл, дык гэта праўда, што на новы капыл трэба яго нацягнуць. Але разам з ім і цябе. Каб і цябе штурхануў добра, дык і ты страціў-бы гэтыя свае мудрагельствы.

Мікалаевы вочы блиснулі ўсьмешкай.

— Чалавек-жа без мудрагельства нічога ня варт... Ні то што ня варт ён, але няцікавы ён.

— А якое табе цікавасьці трэба?

— Як якое?! Чалавек трэба, каб быў цікавым, каб ён быў сам сабою!

— А што з яго за карысьць, калі ён толькі і займаецца тым, што мудрагеліць.

— О гэтак, як я, — хочаш сказаць ты.

— А можа нават гэтак, як і ты. От узяў-бы ты кавалак зямлі, ды жонку — бабу здаровую. Што, ты-б з ёю ня справіўся? Дарма што ты вока прыжмурваеш, а ты яшчэ здаровы, цягавіты...

— Ну то што тады было-б?

— Тады ты якраз на той новы капыл нацягнуўся-б, пра які ты кагадзе гаварыў. Жыў-бы тады як мае быць і забыўся-б адразу на ўсе свае мудраваньні.

— Адразу нічога не забудзеш. Ты гэта гаворыш ня маючы практыкі.

— Няхай сабе ня зусім адразу...

— А хіба я жыву ня так, як мае быць? Дзівак ты. Што значыць жыць, як мае быць? Аднаму здаецца так, а другому гэтак. Тут, што галава, то розум... Так цяпер мне вальней.

— Што табе з гэтае волі. Усё роўна далей гэтае прызбы ты з ёю нікуды ня рушыш. Далей яна цябе нікуды не завядзе. Я от колькі да цябе не прыглядаюся, дык ты ўсё на гэтай прызьбе сядзіш ды плюеш сабе пад ногі.

— Я-ж табе гаварыў кагадзе. Ня думай ты, што воля толькі ў тым, што чалавек цягаецца па сьвеце, што поўсьвету пройдзе. От я прайшоў быў поўсьвету, ваюючы; куды мяне толькі не заганялі! Што дзень—то новая сотня вёрст. Але хіба гэта воля была? Седзячы кожны дзень на гэтай прызьбе можна чуць у сабе самую страшэнную волю...

Ён некалькі разоў засаб плюнуў пад ногі сабе і зноў пачаў курыць. Пачынала цямнець. Рыжы Хоня ішоў назад па вуліцы.

— Ну што, знайшоў пеўня?

— Не, прапаў недзе.

— Хадзі сюды.

— Ну, чаго?

— Хадзі, ня бойся. Як ты думаеш?..

— Што?

— От Мікалай гаворыць, што ён вельмі вольны цяпер, седзячы тут на прызьбе. Што такое волі сьвет ніколі ня бачыў.

— Вольны? Як у полі вецер. Ні галавы, ні хваста. Хе-хе-хе.

— Ну так, як у полі вецер. Дзівакі вы абодва.

Хоня паглядзеў на Мікалая з крывою ўсьмешкаю:

— Што гэта за воля, калі ты часам кавалку хлеба жадзён.

— Як ты ведаеш, што я жадзён?

— Ну гэта гэтак гаворыцца. Ты зарабі, то ты мецць будзеш. Каб я жыў! А калі ў цябе будзе жонка і дзеці, то ў цябе сям'я будзе. Тады ты будзеш, як трэба. Сталы чалавек. А то ты, Мікалай, жывеш— уй!—жывеш сабе і старэеш. Гады праходзяць, а як пройдуць, тады не ажэнішся.

— Што ты мне за свата хочаш быць, ці што?

— Не. Нашто мне быць каму за свата. Няхай бог крые.

Хоня пашоў. Алесь яшчэ стоячы тут закурыў папяросу. Мікалай бяздумным вокам сваім глядзеў недзе па той бок вуліцы.

IV

„Кладучыся спаць трэба будзе памыць ногі",— думаў Юрка, упускаючы ў хлеў каня. І ў варотах хлява, зьнімаючы аброць, у маўчаньні перадвячэрняга змроку, убачыў: вока ў каня маўклівае і глыбокае, чыстае, як крыніца ў паплавох. Пад вокам закарваў жаўтаваты гной.

— Чаго ты плачаш?—сказаў Юрка.

Конь падышоў да жолабу. Абмацаўшы ў жолабе, Юрка заўважыў:

— Адны цырбуны.

Павыкідаў іх пад ногі, пашоў у агарод пад купчастую грушу і ўзяў бярэмя накошанай асакі. Асака весяліла яго пахам балота. Асеньнімі днямі яна не хацела вянуць—была такая-ж жывая, як і некалькі дзён таму на балоце.

— На, еш,—сказаў Юрка, кладучы траву ў жолаб.

Конь панюхаў, уздыхнуў, папробаваў жаваць і пакінуў.

— Ня хоча есьці,—думаў Юрка,—дзіва што ён худы такі. За век зубы свае пазьядаў.

Ён пагладзіў каня па шыі. На седале пад страхою дрымотна абазвалася перапалоханая курыца. Кісла пахла конскім гноем і дрывамі. У варотах запахла хамутом. Зачыніўшы хлеў, Юрка нагнуўся і разглядзеў ногі. Яны былі чорныя ад засохлай балотнай гразі. На левай назе каля вялікага пальца было абадрана аб травяны корч на мяжы і крыху балела. Юрка пашоў у хату. У сенцах Мацьвей падсяваў у рэшаце жыта.

— Трэба прасушыць жыта,—сказаў ён,—ды заўтра змалоць у жорнах на хлеб. Сёньня акалаціў пятнаццаць снапоў.

— Трэба будзе абмалаціць больш ды ў млын завязьці.

— Чорт яго ўсё зараз паробіць. Хаця каб як на насеньне пасьпець. Тады ўжо будзем думаць пра млын.

— А, можа, каб нам з вамі хоць акалаціць капу ды змалоць у млыне, дык было-б лягчэй і скарэй.

— А дзе я грошай вазьму на млын! Ты яшчэ малы бацьку ўказваць, бацька і без цябе ведае. Ты яшчэ не зарабіў!

— Юрка ўвайшоў у хату і запаліў газоўку. Цьмянае сьвятло заліло сьцены і згусьціла цені ў кутках. Дзьве малыя сястрычкі яго сядзелі на ложку, цесна прытуліўшыся адна да аднае.

— Чаго вы сядзіце апоўначы?

— Мы думалі мама зараз прыдзе, або тата ўвойдзе і запаліць газоўку.

— А куды мама пашла?

— Мама пашла да Юзікавае цёці пазычыць хлеба, бо мы ня ўсьпелі напячы. Заўтра малоць будзем муку... Ня стой, Юрка, босы доўга на зямлі, а то скочкі на цябе паналазяць, дык заснуць не дадуць.

— Не тваё дзела. Няхай сабе паналазяць. Абы не на цябе.

Аднак-жа ён не злаваў, хоць і гаварыў так жорстка. Панурая раздражнёнасьць толькі была ў яго. Словы бацькі—„ты яшчэ не зарабіў“—мучылі яго. Нявыразная боль і трывога клаліся на сэрца, крыўда пачала межавацца ў ім з безнадзейнасьцю.

— Што ёсьць вячэраць?—запытаў ён.

— Мама казала, што на лаве ў мыцельніку гуркі ў збанку і расол.

Ён наліў у міску расолу і ўкінуў гурок. На стале пад настольнікам знайшоў акраец хлеба і пачаў есьці, гойдаючы пад сталом зложанымі нагамі.

Маці прышла неўзабаве. Яна падышла да стала, палажыла хлеб і сказала Юрку:

— Няхай-бы ты пачакаў трохі, я звару бульбы.

— Я выгаладаўся. Вы мне бульбы трохі пакінеце ў гаршку.

— А куды-ж ты пойдзеш?

Ён падумаў трохі і сказаў:

— Да Юзіка, Юзік дома?

— Дома.

— Што ён робіць?

— Вельмі я ведаю, што ён робіць. От бачыла, што аціраецца каля ганку. Чаго табе цягацца вечарам! Кладзіся спаць павячэраўшы, дык здаравейшы будзеш.

Ён нічога не адказаў і даеў з міскі расол.

— Можа табе яшчэ падліць?

— Даволі.

— Чаму? Дурны, еш ды праўся. А то вельмі-ж худы... Пачакай бульбы, я не забаўлюся. Тады сабе пойдзеш, яшчэ рана.

— Ай!

Ён надзеў шапку і свой кажушок. І пашоў на двор. Усьлед яму маці ціха сказала сама сабе:

— Гадуюцца, як парасята. Ядуць у шапках, богу ніколі ня моляцца, зараз мыцца пакінуць. Проста аж страшна.

Ён пачуў, але пашоў моўчкі далей. Мацеры ён шкадаваў, тады як бацькі толькі баяўся.

На двары каля варот ляжалі зялёныя цырбуны з бульбяніку. Ён абцёр аб іх ногі і падумаў: „няхай высахнуць, тады ў хлеў укінецца“, і раптам забыўся на гэта, выходзячы на вуліцу.

Праразьліва крычалі недзе гусі, скрыпела студня і рыкала карова. Абрысы вуліцы губляліся ў змроку. Змрок быў белаваты, сухі, асеньні. Асьцерагаючыся ступаць, каб ня ўразіць абадранае нагі, ён прайшоў некалькі крокаў, мінуў сваю хату і прыпыніўся каля адчыненых варот суседняга двара.

— Юзік!

У адказ нехта коратка сьвіснуў.

— Дзе ты?

— У цэбры ногі мыю! Ідзі, калі хочаш і ты памый.

Цэбар стаяў у глыбіні двара, каля саламянае павеці. Вады ў ім было да краёў, вада была дажджавая, прытухлая. Юзік сядзеў на непілаваных дрывах, пахнучых мохам і смалою і боўтаў у вадзе нагамі.

У Юзіка быў шырокі твар і сінія вочы. Цяпер толькі шырокі казырок памятае шапкі чарнеў у яго над тварам. Юрка сеў побач з ім і апусьціў ногі ў цэбар. Юзік высмаркаў нос, плюнуў на той бок цэбра і запытаў:

— Ваш конь пакінуў кульгаць?
— Не, яшчэ горш.
— Чаму-ж вы яго не прадаеце?
— Ніхто за яго нічога ня дасьць. Раней тата хацеў прадаваць, а цяпер раздумаўся. Я яму кагадзе палажыў травы з балота, дык ён ня есьць.
— Бо ён можа на пашы наеўся.
— Не, у яго зубоў няма.
— А як-жа ён на пашы есьць?
— Ён дзяснамі цісьне. Дык яму дзясна як забаліць, дык ён тады так стаіць. Вядома—мяса.
— А ці гэта праўда, што яму раз хлопцы хацелі хвост адрэзаць?
— Праўда. Але я схваціў за грыву ды ўцёк з ім.
— Ды ты нават плакаў, праўда, Юрка?
Юзікавы вочы блiснулi белым хітраватым колерам Юрку ў твар. Юрка адвярнуўся і сказаў:
— Не.
Але вінаваты і зьбянтэжаны тон голасу паведаміў, што плакаў ён. І раптам абодвым ім стала няёмка. Яны моўчкі кончылі мыць ногі і Юрка сказаў:
— У мяне мусіць падрываць каля пальца будзе. Вельмі-ж балець пачынае; я пазаўчора на мяжы нагу аб нейкі корч абадраў.
Юзік моўчкі выслухаў і сказаў:
— Хадзем куды.
— Куды?
— Куды-небудзь.
Пасьля, падумаўшы, здагадаўся:
— Хадзем у сельсавет.
— Чаго?
— Там рапяціца нейкая ідзе... хадзем вулачкаю. Калі Хоня дзіркі ў плоце не загарадзіў, дык, можа,

можна будзе ў грушы ўскочыць. Вельмі-ж грушы, братка, а-яй! От смачныя!

— Я еў.

— Калі-ж ты еў?

— Мне раз быў Хоня даў.

— Хлусіш, Хоня нікому груш не дае. Недзе ўскочыў быў ды налаташыў.

— Яй-богу не. Каб я так жыў. І цяпер зноў абодвым ім стала няёмка.

Яны ішлі цёмнаю вулачкаю. Пахлі гнілыя платы. Юрка сказаў:

— Хоня мусіць загарадзіў плот.

— Адкуль ты ведаеш?

— Бо каб не загарадзіў, дык сьвіньні паналазілі-б.

— Можа яны і паналазілі былі.

— Не.

— Чаму?

— Бо мусіць плот загарадзіў.

Каля Хоневага плоту яны прыпыніліся.

— А што, я казаў, што загарадзіў.

Стоячы, яны пасьвісталі трохі і пашлі далей. Прэла пад нагамі лісьце. Плыў пах, густы і вясёлы.

Юзік заўважыў:

— Каб у нас былі свае грушы, от я папаеў-бы.

Холадна і спакойна Юрка адказаў:

— Яблыкі лепш за грушы. От як у папа яблыкі—тыя чырвонабокія, вінныя, дык лепш за ўсякія грушы.

— Вельмі ты еў іх!

— Уга, я іх чорт ведае колькі папаеў. Нават летась яшчэ.

— Летась на іх яблык яшчэ ня было. Гэта-ж маладыя яблыкі, кагадзе шчаплялі іх. А для

яблыні нядобра, калі вельмі рана яблыкі пачынаюць расьці. Калі яблыня добра ўмацуецца, дык тады лепш, даўжэй радзіць будзе... У гаспадарцы добра як у каго яблыні ёсьць...

Маўчалі платы. Чарнелі стрэхі.

V

У меншай палавіне дому, ад двара, жыў поп. У большай, ад саду, быў сельсавет. Два пакоі былі асьвечаны вялікімі лямпамі. На падлозе насыпаны былі пілавіны, сталы былі пазаліваны атрамантам і голыя. У палітурованую шафу былі прыроблены грубыя дзьверы з дрэнна абгаблёваных дошчак. Вялізны замок адцягваў тонкі прабой, з двух драцяных, сагнутых цьвікоў.

У пустым, меншым пакоі дагарвала ў лямпе газа. У большым — хлопцы мазалі насьценную газэту. Вокны былі адчынены ў сад. Ліст паперы ляжаў на стале, удвух размалёўвалі яго. Вакол шчыльна панавісалі хлапячыя твары. Каля дому, у выгараджаным у садзе дварэ, поўна было хлопцаў і дзяўчат. Юрка і Юзік уціснуліся між чужых локцяў да самага стала.

Чорны, як смоўж, Максімаў Петрык спрачаўся:

— А от я калі захачу, дык і яшчэ нап'юся. Ніхто мне не забароніць. Я сам за свой заработак. Я сам адзін усю гаспадарку ўпраўляю, ды каб яшчэ не пагуляць?

— То ты ня крычы тут.

— Я гавару.

Яго адазвалі ўбок, пасьля некалькі хлопцаў вышлі з ім у сад. Юзік і Юрка рушылі за імі. У садзе, узьлёгшы на плот, Петрык даводзіў:

— Маладыя гады неўзаметку пройдуць. І не агледзішся. Я праз два гады ў навабранцы пайду. А пасьля салдат зусім другое; можа я тады ажанюся, дык і мінецца ўсё. А цяпер хацця пагуляць гэтымі гадамі. Колькі тут засталося, гадоў два якіх. Ты, братка Клемусь, сам павінен ведаць.

— Клемуся тут няма.

— А дзе-ж ён? Клемусь!

Спатыкаючыся па няроўнай зямлі, Петрык пашоў у бок вуліцы, Юрка шапнуў Юзіку:

— Петрык-жа з Макаркаваю Волькаю гуляе.

— Ну-у?

— Яй-богу. Я нават сам бачыў.

— Што?

— Як яны вечарам падручку ішлі. Ідуць, баючыся, каб ніхто ня ўбачыў, а я гляджу з свайго двара. Яй-богу-ж праўда!

— От дурны, чаму-ж ты ня гукнуў на іх. Або няхай-бы сьвіснуў моцна.

— Ну але, трэба было сьвіснуць.

Клемусь — белагаловы і цыбаты — пералез цераз плот аднекуль з папоўскага двара. Ён падышоў да хлопцаў і ляпнуў Юзіку па плячы. Юзік спрытна вылузаўся з-пад рукі з дробнаю вясёласьцю ў голасе:

— А-я-яй! братка Клемусь, не чапайся!

Клемусь, гойдаючы каленьмі, цесна абцягненымі чорнымі порткамі, з пры точанымі ўверсе галіфэ, адказаў:

— Я чуў, што твой бацька хоча, каб ты ажаніўся.

Юзік пастараўся не зразумець:

— Хто?

— Ты. Табе-ж бацька казаў, каб ты шукаў сабе якое-небудзь кабеціны.

Юрка зарагатаў, Юзік з раздум'ем плюнуў сабе пад ногі. Хлопцы засьмяяліся і пачалі гаварыць пра капэлю. Гаварыў Клемусь:

—...Нават каб мы, пасьля, злаўчыўшыся, пачалі вясельлі граць, дык на тое выгадалі-б. Гэта каб адно, цяпер купіць струмант.

— А хто-ж цябе граць навучыць.

— Не сьвятыя гаршкі лепяць... Можна было-б на месяцаў два наняць якога-небудзь капяльдудкіна. Няхай-бы вучыў.

Хлопцы зарагаталі. Гаворка пашла далей:

— А каб гэта кожная хата дала частку на арганізацу капэлі. А рэшту дала-б пажарная дружына, бо на ўсё дык у яе ня хопіць грошай. Нічога там няма.

— Ну то і ня дасьць-жа ніхто табе! Ткніся адно ў якую сабе хочаш хату, дык пакажуць табе такую музыку, што ня рад будзеш. Цябе за гэтую выдумку кожная баба памыямі абліе. Твайму або майму бацьку патрэбна музыка? Начорта яна яму. Ён мусіць як і маладым быў, дык ня вельмі быў ахвоч да яе.

— Хто?

— Твой бацька.

— Мой бацька сам музыкантам быў.

— Яго-ж бацька ў дудку сьвістаў. Тут-жа кажуць свая капэля была—дудкі і два бубны.

Хлопцы зарагаталі.

— Чаго-ж вы? Яй-богу. Мой бацька расказвае. Адзін бубен малы, а другі вялікі. Ты думаеш, што твайму бацьку непатрэбна музыка? Грошай у яго няма, от што. А праў ты музыку, дык ён сам рад будзе.

— Але ўсё роўна ніхто табе на капэлю грошай ня дасьць.

— Ну, ня дасьць... А каб гэта нам самім. Мы-ж самі гаспадары. Каб гэта кожны з нас прадаў, можа хоць і цішком ад бацькі, па пудоў колькі жыта, ды самім справіць струмант, а пасьля ўсё вярнулася-б нам. Пачалі-б вясельлі граць. Зарабілі-б.

Тамаш і Алесь вышлі з бакавога пакойчыка сельсавету. Грукаючы ботамі па сашморганых дошках ганку, Тамаш пачуў канец гаворкі і сказаў:

— Дык-жа ты граць ня ўмееш, смаркач ты.

— Папрашу, дзядзька, цябе, каб ты навучыў.

— Ты хочаш, каб я цябе граць вучыў? Чаму іншаму, дык я магу. А граць, дык няхай ужо цябе які іншы махальнік навучыць.

І разам з Алесем убіўся ў кучу хлопцаў.

— А чаму-ж ты, дзядзька, мяне іншаму можаш навучыць?

— Чаму іншаму? Хэ-хэ. Дзівак!

І густа адхаркваючыся, стаяў і курыў. Максімаў Петрык падышоў з боку вуліцы. Клемусь гаварыў.

— Дык давайце, хлопцы, складомся.

Тамаш сказаў:

— Складомся ды вып‘ем.

Клемусь адказаў:

— Куды табе, дзядзька, піць з намі, з гэтакаю блазнотаю.

— А чаму не, уга!

І, памаўчаўшы, дадаў:

— Даўно я ня піў. Яй-богу. Ужо месяцаў са два будзе. Хочацца выпіць, яй-богу.

— Ну та чаму ты, дзядзька, ня вып‘еш?

— Часу няма. Гэта такая справа, што калі выпіў, дык за работу пасьля ня возьмешся. Гэта хіба, каб калі сьвяты дзень падабраў. Ды сказаць і канпані няма. От што. Гэтыя-ж усе, абы вып‘е, дык адразу або пачне цалавацца лезьці, або біцца.

А найчасьцей, дык усё крыўду сваю выказвае. А тут, як ты з ім цалавацца будзеш, калі на іншага і на цьвярозага гадка глянуць. Няхай ён прападзе, няхай ён.

Клемусь зноў пагойдаў каленьмі і сказаў:

— Ну, то як будзе? Будзем складацца ці не?

Раптам ён заўважыў: Юзік—малы і сьмешны тут, у Тамаша пад локцем, пробаваў зацягнуцца на поўныя грудзі махоркаю. Клемусь сказаў:

— А браткі, сам, як вош, а папяроса, як дручок на губе ляжыць.

І зацягнуў высокім голасам:

Над зялёнаю лукою
Ходзяць мухі талакою...

Тамаш падумаў і сказаў:

— От у мой час песьню сьпявалі.

— Якую?

— „Ах, мой божа, сівы конь стаіць!“

— А якая гэта песьня?

— А гэта значыць, паехаў хлопец ваяваць, а яго забілі. Дык конь адзін без яго і прыбег дадому. Больш тысячы вёрст бег, а дадому трапіў. Прыбягае ён дадому, бачыць — вароты зачынены, у двор ня ўвойдзе. Ён пацёрся мордаю ў вакно, а маладая жонка таго хлопца, з якою ён пажыў усяго адзін дзень, ня пускае таго каня ў двор. Кажа — калі ты хоць нябывога яго ня прынёс дадому, дык няма табе месца больш тут. А конь разумее ўсё, ды, вядома, расказаць нічога ня можа. Так стаіць і нудзіць. Хоча заплакаць, ды сьлязы ня можа выпусьціць. Так і стаяў увесь час каля зачыненых варот, пакуль тая маладая ламала рукі, на ганку стоячы.

— Ну, а далей што?

— Далей у песьні нічога не гаворыцца... Ну дык от і сьпяваецца: „Ах, мой божа, сівы конь стаіць“.

Тамаш выдзьмуў спрытна з папяросьніка недакурак. Клемусь зноў зацягнуў:

Над зялёнаю лукою
Ходзяць мухі талакою...

З радасным захапленьнем усе, хто быў тут, гукнулі:

Пад гарою й на гары
Таўкуць кашу камары.
Ай!
Ф‘ю-ю-ю!..

Тамаш паварушыў плячыма, уткнуў галаву ў грудзі і пашоў раптам адсюль. Мінуўшы браму, засьпяваў ціха:

Той прымчаўся конь дадому.
Ах, мой божа,
Сівы конь стаіць!

І ішоў далей, аглядаючыся, каб ніхто ня ўбачыў і не пачуў.

Юрка адышоўся да брамы і, слухаючы, раптам прыпомніў і ўявіў: вока ў кульгавага каня глыбокае і ня міргае у ім затуманены смутак. Адышоўся яшчэ далей, палажыў бараду на сукаватую жэрдку нізкага плоту і запаліў у вачох агні ад страшнае навалы вострага смутку.

VI

Алесь быў у вялізных ботах і палатняных портках, пафарбованых начорна. Тамаш — у сваёй рудой вопратцы на кажусе і босы; калошы кортавых портак былі падвязаны.

Зноў быў вецер і зноў было хмурна.

Яны ўдвух сядзелі ў полі на мяжы, утомленыя аглядам балота і поля, і Тамаш гаварыў:

— Самае горшае дык гэта, што каторую пору на боты ніяк ня ўзьбіцца. Проста аж надакучыла кожны месяц правячы іх. Няхай іх немач. Зусім распорваюцца, падлы. А гэты, трасца яму, Хоняў швагер падвёў—я яшчэ пазаўчора занёс іх яму—дзьве латкі трэба прыставіць, дык ён яшчэ і сягоньня не зрабіў... Трэба будзе на зіму як-небудзь агараць, ды галоўкі прыставіць—халявы ў іх яшчэ добрыя... Халявы, я-ж кажу, добрыя, салдацкія.

Ён прачысьціў саломінаю папяросьнік і гаварыў больш:

— Гэта, каб на зіму валенкі справіў. Раней, дык я мог і ў абыякіх ботах зімаваць, а гэта ўжо летась зімою, чую—ня тое. Ні то, што мне ногі карчанеюць, не, але абы хоць чуць прабярэ холадам, дык проста нейкая, ліха ёй, слабасьць нападае. Леташнюю зіму, пад вясну, я ў лесе прамок быў, дык дома вечарам адразу ногі самлелі былі, у каленях пачало ламаць. Што-ж, браце, гады... От я стараюся тут з табою, а наўрад, госпадзі, ці я прычакаю ўбачыць усю гэтую формальную перастройку. Йй-богу. Але от варушуся... Весялей жыць... Унь той лог, каб забараніць грузіць каровамі, дык там сенажаць буяла-б. А то—чорт яго ведае што. Праўда ці не? Але з нашым народам нічога ня зробіш. Няхай яны паправальваюцца скрозь зямлю гэтакія людзі... Чаму ты, Алесь, ня жэнішся?

— Можа ажанюся.

— На якое ліха ты чакаеш. Ты, ужо сказаць, ў розуме, прызвы адбыў... Ды якія к чорту прызвы, напаваяваў, можна сказаць, у сваю ахвоту... І гібееш

так бяз жонкі... От яшчэ год, яшчэ два, дык-жа ты тады да марцовых кавалераў дарасьцеш... Колькі табе год?

— Дваццаць сем.

— Ну от бачыш... Цяпер-жа табе заводзіць гаспадарку і жыць за пане мой. А што ты бяз бабы. Ты бяз бабы і ў хаце ні госьць, ні гаспадар. Праўда ці не?

— Я гэта і сам ведаю.

— Мала ведаць, трэба дамагацца, раз ты чаго хочаш. На гэтым сьвет стаіць і стаяць заўсёды будзе.

— Дык тут-жа гэтакае дамаганьне—узяў ажаніўся і скончана дзела.

— Жаніся, а то гады праходзяць. Маладыя гады пройдуць, тады ня вернеш. І час такі, пакуль што спакойны... Я от думаю—каб быў я малодшым, дык я тут-бы цяперашнім сьветам чорт ведае чаго нарабіў-бы. Я от і цяпер думаю—трэба будзе зімою зрабіць алейню. Калі ўжо, як той казаў, нісконт рады ня будзе, дык падгаварыць мужчын ды скласьціся. Я пра гэта ўжо думаў... А ты, браце, жаніся. Ты можа пакрыўдзішся, што я ў твае справы ўмешваюся, але я скажу. Я чалавек стары і маю практыку, дык яно можа і можна мне гаварыць табе. Ты ўжо от другі год валаводзішся з Барановічаваю гэтаю дзяўчынаю, дык я табе скажу, што даволі табе з ёю ўжо важдацца, бяры ты яе замуж. А то—яна дзяўчына зграбная, трохі вучаная, дык глядзі, каб ты яе з рук ня выпусьціў.

— А я табе, дзядзька, калі ўжо на тое пашло, таксама шчыра скажу, як старому чалавеку. Што я вясною ўжо быў намерыўся браць яе, але яна сама ўсё адцягае.

— А што, не казаў я?

— Што?

— Што ты яе гатоў з рук выпусьціць. Яна сама сабе верыць і ня верыць. Што-ж, яна там трохі навучылася ў горадзе, дык ёй цяпер здаецца што сьвет — гэта ня сьвет, а яна — гэта не яна. Яна і за цябе згодна пайсьці, і, разам з тым, некага іншага чакае. От як. А цяпер каморнік гэты ў іх закватараваў — мерацьпачне праз тыдзень, а зьявіўся ўжо ўчора. За месяц ён работу скончыць, тады паедзе, але ты глядзі, каб ён і за месяц гэтую дзяўчыну з розуму ня зьвёў. Возьме ён яе ці ня возьме, а з толку зьбіць можа. Сёньня днём стаялі яны пасярод двара і сьмяяліся, гледзячы адно на аднаго. Як ішоў я вуліцаю да цябе, дык бачыў.

Устрывожаным голасам Алесь запытаў:

— Ён у Барановіча закватараваў?

— У Барановіча... Я табе раджу як добра, калі ня хочаш страціць дзяўчыну, дык адразу-ж скажы ёй: альбо — альбо. Альбо так, альбо сяк. Бяры яе да сябе зараз-жа. А яна сказаць, дзяўчына добрая, няма што на яе казаць. Абжывецца, абсталее, дык і гаспадыня будзе добрая.

— Яна і цяпер сталая.

— Сталая, я не кажу... Дык от пра гэтую самую алейню. Што ты на гэта скажаш?

— Трэба падумаць.

— Тут лішне і думаць няма чаго. Толькі што грошай няма і нідзе ты іх, мусіць, ня выкалупіш. Чуў, які крык быў, калі давялося на каморніка зьбіраць, які гвалт?

— Я-ж кажу, што трэба падумаць.

— Цяпер то ты зусім з іншае прычыны думаць ня можаш.

— З якое-ж?

— З-за дзяўчыны гэтае ўстрывожыўся. Як бо яна завецца?
— Ганна завецца.
— Слухай мае парады... Ты з бацькам яе гаварыў?
— Не.
— А сам ён ведае?
— А хто яго ведае, мусіць. А ўрэшце, ліха яго бяры,як сабе хоча. За пасагам я не ганюся.
— Ну ён і пасагу дасьць.
— Няхай дасьць, калі хоча. Я вазьму.
— Сёньня-ж вечарам пагавары з ёю... Хадзем... Ты выбачай, браце.
Яны пашлі ўздоўж паўз мяжу. Тамаш сказаў:
— У босыя ногі іржышча колецца... халь-лера... Трасца яму, ботаў ня правіць. Трымае трэці дзень...
Алесь ішоў паперадзе і маўчаў.
Шумелі заспакоена кусты пры дарозе, вецер плыў і плыў. Моцна пах яловец на ялавіне. Ціха было і хмурна.
Тамаш яшчэ сказаў:
— У ногі холадна, ліха яму.
Алесь маўчаў.
— То чаго ты занудзеў раптам?
— Я не занудзеў.
— Што-ж, я ня бачу?
— Я думаю.
— Пра што ты думаеш?
— Пра ўсё... От, здаецца, і ўсё добра. Робім, нанава перарабляваем, усё як мае быць, а раптам зьявіцца нейкая прычына, дык усё іншым можа здацца.
— Ты гэта пра бабу?
— Ні то што пра яе...

— Плюнь, яй-богу. Што-ж ты за хлопец! Няможна так маладому хлопцу. Эх ты, сьвет цяпер настаў. Людзі пашлі. Хлопец павінен быць казаком, калі давядзецца, каб і на кані і пад канём мог арудаваць.

— Я ўсюды быў.

— Ну, дык глядзі весялей.

Пыльнаю дарогаю падышлі яны да мястэчка. Тут было зацішней і цяплей. На вуліцы зморшчаныя лісьці клёнаў суха шараваліся пад ветрам аб зямлю.

VII

Юлік Барановіч устаў досьвіткам. Да расьсьвітаньня было яшчэ далёка. Ён паволі, стараючыся ня стукаць, усьцягнуў на ногі боты і накінуў на плечы парваную вопратку. Ад печы ішло цяпло на ўсю кухню. Было душна. Ён падышоў да печы і пацікавіўся: прылажыў руку да печы і падумаў: „Мусіць на дварэ цёпла, калі печ за ноч не астыла. Вецер сьціх—ня чуваць, каб шумеў гэтак, як учора“. Жонка пачула, як тупаў ён па кухні і моўчкі пачала ўставаць. Запаліла лямпачку і паставіла на прыпек.

— Хіба адчыні ты комін,—сказаў ён.

— Нашто?

— Горача вельмі.

Яна адчыніла комін, выцягнула з-пад лавы кош бульбы і стала абіраць яе.

На сьцяне чарнелі хамуты і густа пахлі дзёгцем. У хаце нехта заварушыўся—моцна зашумела салома ў сяньніку. Ён падышоў да хатніх дзьвярэй і паглядзеў. Каморнік, лежачы на ложку пад вакном, чухаў над вухам даўгаватую сваю галаву; сьвятло кухоннае лямпы падала на яго чырвонаю

істужкаю праз адчыненыя дзьверы. Убачыўшы гаспадара хаты, ён перавярнуўся на другі бок, тварам да сьцяны, моцна кашлянуўшы. Юлік Барановіч хацеў нешта сказаць яму і не сказаў— з сярэдзіны хаты вярнуўся назад у кухню. Падышоў да жонкі і зашаптаў над яе галавою:

— Ты наглядай за імі.

— За кім за імі?

— Ну за Ганнаю, і за ім.

— А што, я сама ня ведаю ці што.

— Ну, дык я-ж і кажу. Наглядай, каб, барані божа, чаго ня вышла. А так, дык няхай сабе гуляюць. Можа ім і суджана.

Жонка, моцна ўздыхнуўшы ад свае жаночае прывычкі, сказала:

— А бог іх ведае... Што каму суджана, што ня суджана. Хто яго ведае, што ён за чалавек. Мы-ж усяго першы тыдзень яго бачым.

— От нічога. Відаць—ён хлопец разумны і сталы. Гэта чалавек.

Ён павысіў голас. Яна спыніла яго:

— Цішэй ты. А то пачуе яшчэ. Дай яму заснуць. Ідзі будзі Ганну.

— А Ганна таксама — дзяўчына ня дрэнная. Няхай папрабуе знойдзе дзе лепшую. Яна і да работы, і вучаная. Няхай, я-ж кажу, пашукае лепшае.

— Чаго ты раней пары клапоцішся.

— Клапаціцца трэба заўсёды раней пары. Бо, як пара пройдзе, тады ніякі клопат не паможа.

— Яна-ж з Алесем усё валаводзіцца.

— Мала што. Алесь таксама хлопец ня кепскі. Хто на яго што скажа. Але, што-ж ён—просты гаспадар, ды яшчэ і бедны. Будзе за ім увесь век у гнаі корпацца і больш нічога.

— Цішэй ты, паабуджваеш усіх. Чаго ты балбочаш, як цецярук!

У падпечку засьпяваў певень. Недзе за сьцяною на дварэ, у хлеве мусіць, сьледам за ім абазваўся другі.

Жонка сказала:

— Яшчэ гэты гарлач, каб ён здох, зараз усіх на ногі ўзьніме сярод ночы. Горла! Выпусьці яго вон.

— Цёмна яшчэ... Пачакай, няхай разьвіднее трохі.

Ён пераставіў лямпу на лаву і выпусьціў з падпечку куры. Пасьля сыпануў ім з збанка ячменю. Паглядзеўшы, як ядуць куры, дрэнна бачачы пры лямпавым сьвятле і палохаючыся ценяў, ён пашоў на двор.

Было цёпла і вільготна. Яму даў у нос густы пах прэлае восені: пад нагамі ў дварэ макрэла жоўтае лісьцё з яблыні, пад платамі нудзела зельле. Стог саломы бялеў у глыбіні двара за нізенькім платцом. Пачынала разьвідняцца. За гумнамі бялела цёплае неба; цяжкія дзяругі хмар раставалі і гінулі. І цераз агароды з поля веела радасьцю прасторнае цішыні.

Ён падышоў пад гумно, нагроб з стогу пярэбірак аўсянай саломы, пératрос на таку з сенам і занёс каровам. За дашчанаю перагародкаю ў хляве абзываліся гусі, пад нагамі заміналі авечкі.

Ён павольна ўпраўляўся, паціху гаворачы сам з сабою і з жывёлаю. Закідаючы каровам трасянкі, ён сказаў:

— Ежце, падлы. Няма чаго лішне перабіраць. Стаўшы вас карміць адным сенам, дык да каляд можна ўсё скарміць. Унь людзкія каровы ядуць чыстую аўсяную салому. І малака даюць.

Ён адапхнуў з-пад ног авечку і сказаў:
— Зараз і вам дам. Пачакаеце.
І яму весела было, як вакол у суседніх хлявох сьпявалі пеўні.
У конскім хлеве ён аглядзеў жалабы, дрэнна бачачы ў змроку і абмацваючы каструбаватыя дошкі. Пагладзіў па шыях коні, падлажыў ім сена і пастаяў каля іх, слухаючы, як яны ядуць. Весяліў яго гэты стук і шум. Усё яму здавалася добрым, толькі нездаваленьне было тым, што Мікалаю Крываносаму было пераплачана за малацьбу. „Лішнія сорак капеек аддаў—думаў ён—ня варта было даваць, мала што ён зьвягаў. Так і прайшло-б, а то—чорт ведае якую цану зьдзёр“.
Разьвіднялася хутка. Лісьцё і зельле відаць стала выразна. Два высокія клёны каля гумна здаваліся сінімі і мокрымі. Відаць былі на іх яшчэ чорныя камякі сонных варон.
Ён павольна хадзіў па прыгуменьні, падцягваючы сваю хворую нагу і ўсё гаворачы сам з сабою. Насыпаючы ў мяшок мякіну, ён гаварыў:
— Чэрці яго ведаюць, можа ён і сапраўды гэта кашу заварвае, гэты хлопец. Што-ж, ён каморнік, невялікі лішне пан, сам мусіць з мужыкоў. Але вельмі скора нешта, усяго тыдзень, як жыве, а разам ходзяць, хіба ён раней якім-небудзь парадкам Ганну ведаў? Усё можа быць... Каб гэта напраўду ён, дык няхай-бы ішла. Невялікая раскоша пайсьці за якога-небудзь Алеся. Ён-то хлопец можа і нішто, бацька яго быў рамесьнікам і ён да ўсялякае работы здатны, але-ж вельмі галетнік. Пакуль ён на гаспадарку ўзаб‘ецца. А гэта не чалавек, а гатовая крупа. Пройдзе месяц—рабіў не рабіў, а пэнсію—на! От няхай-бы жылі здаровенькія. Калі і дом дзе захацелі-б сабе пабудаваць,

дык я памог-бы. І грашыма і коньмі. Няхай-бы ішла... А Алесь—напэўна гэта ён на пасаг гоніцца. Ён ужо двое коняй у мяне ўгледзеў і жарабіцу трэцюю, а яй! Разявіў горла! Галетнік!

І злосьць на Алеся нямаведама чаго пачала апаноўваць яго. І пакуль ён нанасіў з-пад калодзезя цэбар вады, зусім ужо быў злосны на яго.

Разьвіднелася зусім, калі ён, управіўшыся, вышаў на вуліцу. Цяпер засталося толькі напаіць коні. Ён стаяў напроці свайго двара і глядзеў, як з коміна суседняе хаты паднімаўся дым, і ня ўзьняўшыся высока, ападаў уніз і слаўся па страсе. „Ці ня пойдзе дождж“,—падумаў ён, жуючы саломіну і пакручваючы ў руцэ трухлявы відук, адарваны дзецьмі ад плоту. І раптам прыпомніў зноў, што пераплаціў Мікалаю за малацьбу сорак капеек. І тут ён ня мог змоўчаць:

— Ліха яго матары, падла крываносая... Пайду згаджу яшчэ на які тыдзень, няхай малоціць, а пры расплаце гэтыя сорак капеек я з яго вылічу.

І ён пашоў да Мацьвеевае хаты, дзе жыў цяпер Мікалай.

У хаце было цесна і брудна. Не падмецена пасьля ночы. На зямлі нацярушана была салома, дзьве курыцы грабліся ў ёй. Каля дзьвярэй заstаўлена было кашамі і вёдрамі. Мацьвеіха абірала бульбу, седзячы на зямлі. Мацьвей стаяў над дзеравянаю скрынкаю, поўнаю старых чаравік, падэшваў і абрэзкаў з старых халяваў і выбіраў кавалкі, мусіць, на нейкія латкі. Дзеці сядзелі на печы, Мікалай на лаве—курыў і гойдаў нагамі.

— Дзяндобры ў хату,—сказаў Юлік Барановіч.

— Дзяндобры,—адказаў Мацьвей.

— Добра здароўе,—адказаў Мікалай.

— Але-ж на дварэ цёпла стала,—сказаў Юлік Барановіч.

— Але,—адказалі ўсе гуртам.

Юрка ўвайшоў у хату і паскардзіўся:

— Конь нічога ня есьць.

Мацьвей паглядзеў на Юрку і даў загад:

— Завядзі яго на паплавы, няхай жывіцца. За дзень пад'есьць трохі. Толькі не выпускай на вуліцу, а завядзі, бо ён сам усё роўна ня пойдзе, падла, воўчае мяса... Дай яму вады.

— Даваў. Дык ён адно губы памачыў і ня піў.

Юрка пашоў з хаты. Юлік Барановіч залажыў рукі ў рукавы і стаяў так пасярод хаты. Заўважыў на стале нож-сьцізорык, паглядзеў і сказаў:

— Які нож, з якімі цацкамі!

— Гэта дзеці нашлі,—заўважыла Мацьвеіха.

— У мяне быў такі самы, але я ехаў раз улетку ды згубіў з кішэні. Толькі мой большы быў... Ведаеш што, Мікалай?

„Трасца яго матары, сарака капеек будзе дапамінацца",—падумаў Мікалай і прыжмурыў вока.

— Можа ты яшчэ ў мяне тыдзень памалоціш— хлопцы цяпер у лес езьдзяць, а ты патроху грукаў-бы... А то мы з табою і ўдвух патроху цупалі-б—мне кулі патрэбны, дык трэба жыта перамалочваць; ярына няхай застаецца надалей.

— Малаціць то можна, але каб ты мне наперад даў грошы, вельмі-ж мне цяпер грошы патрэбны.

„А халера-ж на яго, які хітры",—падумаў Юлік Барановіч.

— Нашто-ж табе так адразу грошы?

— Боты шыю новыя.

— Дык няўжо-ж у цябе ўжо на гэта сышло? Адзін душою—табе-б здаецца можна заўсёды грошы мець у кішэні. Ты-ж работу заўсёды маеш.

— Адкуль у мяне грошы!.. А ўрэшце, як сабе хочаш... Я пайду поўсажонкі ставіць.

Юлік Барановіч абмацаў у кішэні кавалак саломіны, узяў яе ў зубы і пачаў жаваць.

— Ну, то як будзе?

— Я-ж табе сказаў.

— Што ты за чалавек. Няўжо ты думаеш, я табе скручу?

— Ты мне ня скруціш, але мне цяпер грошы патрэбны.

— Ну то я табе дам наперад палавіну.

— Дай усё, дык я табе зараз-жа за цэп вазьмуся.

Юлік Барановіч падумаў і сказаў:

— Няма ў мяне цяпер грошай... Дзівак ты... Мне-ж усёроўна плаціць. Каб былі грошы—ты думаеш, я табе ня даў-бы наперад?

Мікалай пачаў круціць новую папяросу. Юлік Барановіч паглядзеў на курыцу і сказаў:

— Ці ня курч гэта на яе напала, вельмі-ж яна ступае нейк фацэтна, прысядаючы.

Мацьвеіха адарвалася ад работы:

— Не, гэта яна і ўрадзілася такою.

Юлік Барановіч пашоў з хаты, нясучы ў сабе веліч нейкіх туманных і радасных надзей.

VIII

Каморнік быў малады і доўгатвары.

Ужо добра разьвіднела, як ён устаў. „Сьпяшаць мне няма куды“,—думаў ён, разглядаючы касьцяныя гузікі зялёнага фрэнча. Ён доўга прыладжваў на нагах шчыгульныя гетры, дасьціпна абцягваў іх рамянямі. Яшчэ даўжэй ён мыўся ў кухні, сам

ня ведаючы чаму і перад кім стараючыся быць дасьціпным.

У кухні нікога ня было. У печы датляваў жар, два хворыя вазончыкі на вакне пахлі на ўсю кухню.

Ён прычэсваў ужо стрыжаныя свае валасы, стоячы ў хатніх дзьвярах, як Ганна ўвайшла з надворку з дайніцаю малака. Яна пачырванела, глянуўшы на яго і адказваючы ўсьмешкай на яго вясёлы выраз твару.

— Чаго вы пачырванелі?—сказаў ён.

— Я не пачырванела.

— Пачырванелі.

— А чаго вы сьмеяцеся?

— Хіба-ж я сьмяюся?.. Чаму вы так позна каровы доіце. Гаспадыня з вас, як...

— Як з вас каморнік.

І яны абое засьмяяліся. Трымаючы твар уніз, яна бліснула на яго востраю прывабнасьцю шырокіх вачэй сваіх. Ён колькі хвілін моўчкі глядзеў на яе, поўны жаданьня не адходзіць ад яе.

— От замест таго, каб так прыглядацца, дык памаглі-б мне.

— Няўжо вы самі ня справіцеся, што яшчэ памагаць вам. Гаспадыня!..

— Ды я то спраўлюся.

— Дык нашто-ж вы просіце, каб я памагаў вам?

— Ня люблю, калі хто без работы стаіць!

— Ах, як ужо вы вельмі работу любіце.

— Бо і люблю.

— З вялікіх любошчаў да работы сягоньня спалі чуць ні да паўдня.

— А вы!.. Я ўжо колькі работы зрабіла, а вы кагадзе ўзварушыліся.

— Я раней за вас узварушыўся.

— Дык відаць-жа. Добрыя людзі напрацаваліся ўжо, а ён яшчэ нават ня прыбраўся, як мае быць.

— Я-ж вядомы для ўсіх гультай.

Яны ізноў засьмяяліся, гледзячы адно на аднаго. І тут ён падышоў бліжэй да яе, гаворачы:

— Каб вы ласкавейшыя былі, дык я памагу вам.

— Ня трэба.

— А вы-ж кагадзе прасілі.

— Ну памажэце.

— Толькі што-ж мне рабіць тут трэба?

— Дзяржэце збанок... Ды ня так... Я-ж казала вам даўно, што вы няўдалы.

— Як вы маглі мне даўно гаварыць, калі ўсяго тыдзень, як я жыву ў вас.

Ён пачаў траціць адценьні жартаў у голасе. Тое-ж самае пачало рабіцца і з ёю. Яна сказала:

— Я вам даўно гэта гаварыла.

— Калі?

— Яшчэ ў горадзе.

— Мы там усяго разоў тры бачыліся.

— І нават амаль што ня былі знаёмымі.

Яна ў раздум'і памаўчала і адзначыла факт:

— Ідзеце вы прыбірайцеся, зараз сьнедаць будзеце.

Ён не адыходзіў і раптам тон яго голасу зусім зьмяніўся.

— Вы ня скончылі школы?

— Не.

— Чаму?

— Ня было як ад дому... Ня было каму рабіць дома.

— А канчаць ня думаеце?

— Не... дзе ўжо там.

— А вы даўно былі ў горадзе?

— Даўно... Некаторага году з татам прадналог завозіла.

Цяпер пачалася маўчанка. Яна была прыкраю. Жадаючы зноў узьбіцца на той ранейшы жартаўлівы тон, яна сказала:

— Ня ўмееце вы збанка трымаць.

— Пакажэце як.

— Дзяржэце вышэй.

Яго рука паднялася вышэй. Яна ўжо вылівала апошняе малако на цадзілку. Пальцы яго рукі ляглі на яе руку. Яна паставіла дайніцу і пачырванела. Тады ён прытуліўся тварам да яе валасоў. Яна маўчала, і толькі чуваць стала яму, як ў яе стукала сэрца.

Яна глядзела недзе сабе пад ногі. Ён прыпаў губамі да яе валасоў.

— Пусьцеце,—сказала яна,—зараз прыдуць.

— Ня прыдуць.

Зноў памаўчалі.

— Ідзеце, будзеце сьнедаць.

— Я пасьля буду сьнедаць.

— Не, вы цяпер ідзеце.

— Чаго вы мяне гоніце?

— Я вас не ганю.

Чырвань залівала яе твар. Чорны каўнерык яе рудое сукенкі варушыўся ніжэй шыі, так яна моцна дыхала. Ён стараўся глянуць ёй у вочы, а яна упарта глязела ўніз.

Ідуць, пусьцеце, ідзеце,—сказала яна.

Голас яе быў няроўны, у гэтую хвіліну хрыплаваты. Апошняе слова яна сказала моцным шэптам.

На ганку нехта стукаў ботамі.

У маўчаньні яны моцна прыціснуліся адно да аднаго і разышліся, нясучы ў сябе вялікую буру радаснай трывогі.

IX

На стале ляжалі пляны і каморнікавы рысункі; у хаце было накурана; каля стала стаялі заслоны і некалькі старых, выпадкова падабраных, крэслаў. Мужчыны разышліся ўсе разам; сядзелі-ж яны тут доўга. Кожны заходзіў „на пяць хвілін“, а сядзеў больш гадзіны.

Тамаш, даводзячы, што мерaць трэба пачаць чым раней, расказаў шмат здарэньняў з свае моцнае жыцьцёвае практыкі,—з кім ён калі, дзе і куды езьдзіў у фурманкі, калі былі халодныя зімы і неўрадлівыя гады, хто з кім, калі і за што судзіўся... Мацьвей слухаў і быў згодзен з усімі, Юлік Барановіч—гаспадар хаты—хітравата глядзеў на ўсіх.

Алесь застаўся адзін, вясёлы і жартаўлівы. Пальцы яго рук назаўсёды зачарнёных работай перабіралі алоўкі, цыркулі і ўсякія іншыя дробныя каморніцкія прылады на стале. Каморнік здаваўся яму вясёлым хлопцам-дружакаю, з якім можна і пажартаваць і пагуляць.

Юлік Барановіч цяпер некалькі разоў выходзіў у кухню і зноў уваходзіў у хату, хвалячы надвор‘е, хвалячы чырвоную кабылу, ганячы Мікалая, хвалячы мурожнае сена для коняй...

— Я маю двое коняй,—сказаў Юлік Барановіч,— а жарабіцу трэцюю. Мяне раней усе лічылі кулаком, цяпер лічаць серадняком. А гэта што значыць? Гэта значыць, што я чалавек. Я сабе маю гаспадарку, гляджу яе, маю што мне трэба і нічые ласкі не прашу, калі ўсе такія разумныя пашлі. Ня дай бог як ззамаладу я мучыўся.

— Як-жа вы мучыліся?

— Хлеба кавалка ня было... А цяпер трое коняй маю. І ніхто мне не памог на макава зерня...

А цяпер—кулак, серадняк... Чорт вашу матару бяры, як сабе хочаце, я ёсьць сам сабою! Нялішне да каго прыслухоўваюся. Калі тут, сказаць, няма каго лішне прыслухоўвацца—у іх што гадзіна, то навіна... Як патвойму, Алесь, я—кулак ці серадняк? Ты мне скажы!

— Памойму, серадняк.

— А зашто мяне ўсе гады лічылі кулаком?

— Хіба не падабаецца?

— Мне ўсё роўна. Няхай мяне хоць чортам лічаць, да мяне нічога ня пристане. Я нікога не забіў і не аграбіў. Іншы ня мае—бо рабіць лянуецца. Абібока, або дурня ніколі кулаком не назавуць.

— Няўжо ўсе бедныя—абібокі, гультаі?

— Ні то што ўсе. Не, ня ўсе. Нашто казаць. Але ёсьць і такія, што на палатках ляжыць і сьніць, што яму гатовыя кавалкі зараз будуць у горла валіцца.

Каморнік глядзеў у вакно і курыў. Сіні дым папяросы густа цягнуўся на ўзроўні яго галавы ў адчыненую фортачку. На вуліцы было ціха і прыемна пахла ў хаце гэтым дымам.

— Я гляджу гаспадаркі, бо хачу жыць на сьвеце, а не прападаць. Унь я і дзяўчыну сыскаў з навукі дзеля гэтага. Мне і шкода яе было, от што, але я не глядзеў на гэта. У мяне сэрца таксама-ж не каменнае і мне таксама хацелася, каб мая дачка выўчылася і была паняю, але што-ж ты зробіш. Не даўчылася. А тут, калі што якое, дык адразу: кулак, кулак. Як-бы гэта ганьба, што чалавек мае. Няўжо-ж, каб усе нічога ня мелі. А калі і кулак, ну то што!.. трасца матары іх!.. Які я кулак!.. Я—працоўны пралентарыят. І больш нічога, калі яны хочуць ведаць!

— Вам цяпер далі скідку з падатку на канюшыну?!.

— Далі. Бо паразумнелі. Бачаць, нічога ня выходзіць, на галетніку далёка не заедзеш. Адразу і мяне серадняком зрабілі... Як гэта ўсё лоўка робіцца ў іх! А-яй, што за майстры!

Патроху Алесяў твар пачаў рабіцца нудным. Каморнік усё курыў каля вакна, зрэдку ўстаўляючы словы. Алесь азіраўся на кухонныя дзьверы, каля печы там мільгацела ў ваччу яго рудая сукенка Ганны.

Каморнік усьміхнуўся, азірнуўшыся на Алеся. Алесю вядома стала, што каморнік здагадваецца, што яму раптам захацелася, каб пашоў адсюль сам гаспадар Барановіч; і Алесь падышоў да вакна і стаў поплеч з каморнікам. Каморнік быў ростам роўны з Алесем, толькі шчуплейшы за яго. І маладзейшы. На малым пальцы ў яго быў адгадованы вялізны пазногаць, роўна падрэзаны і падскрэбены.

Яны абодва глядзелі ў вакно.

— Сёньня субота,—сказаў каморнік,—можа дзе гульнём вечарам.

— Можна будзе гульнуць, — адказаў Алесь. — Табе яшчэ надоўга водпуск?

— Мне яшчэ паўтара месяца.

Алесь глядзеў на жоўтую сьцяну новае хаты па той бок вуліцы. Яму яшчэ няёмка было называць яго „на ты“. Першы раз гэта было—пазаўчора вечарам, калі пасьля кароткае нарады наконт дню, у які трэба было пачаць на полі працу, яны ўдвух пашлі да дзяўчат. Каля крайняе хаты ціхае вуліцы рагаталі хлопцы і дзяўчаты.

— А праз паўтара месяцы куды?

— Дыплёмную працу здаваць паеду і справаздачу аб практыцы.

— А гэтая наша работа будзе табе залічана ў практыку?

— Думаю, што будзе.

Юлік Барановіч пасядзеў трохі на лаве, пабарабаніў пальцамі па стале і пашоў недзе ў кухню, дзе ўсё яшчэ ўпраўлялася каля печы з мацераю Ганна. Алесь і каморнік, стоячы каля вакна, абодва туманна адчувалі яе блізкую прысутнасьць і як-бы, бачачы адзін аднаго навылёт, не глядзелі адзін на аднаго. На абтынкованай сьцяне прараzьліва стукаў танны гадзіньнік. Ясьнеў дзень.

— Ты вучыўся дзе?—раптам запытаў каморнік.

— Вучыўся трохі.

— Дзе?

— Гарадзкое вучылішча скончыў... чатыры клясы.

— У які гэта час?

— У першыя гады рэволюцыі.

— А пасьля?

— А пасьля ваяваў з палякамі.

Цяпер яны абодва маўчалі.

Акно выходзіла на вуліцу, у цесны агародчык для кветак і расады, абгароджаны негаблёванымі вузкімі дошкамі. Пад самым вакном, у ім, зелянела і цьвіла сакаўная вяргіня, глушачы пад сабою ўсялякае дробнае зельле. У хаце каля вакна было прытульна, ціха і весела. Цішыня вуліцы звала ў поле, у прасторы іржышча, у бяскрайнюю волю чорнай ральлі і неба над ёю.

Алесь падумаў пра недасеяныя кавалкі жыта і пашоў у кухню прыкурыць. Запалкі дала яму Ганна, разагрэтая каля печы, з ружовым тварам.

— Гаспадыня з цябе,—пажартаваў Алесь.

— А можа скажаш, дрэнная гаспадыня?

— Да паўдня каля печы кошкаешся.

— Ну то і добра,—адказала яна з вострай дзявочай усьмешкай і чорным бляскам вачэй. Несьвядома-хітраю жаночаю засмучонасьцю вабіла яна да сябе.

— Вечарам я прыду да цябе, — сказаў Алесь ціха, аглядаючыся на прычыненыя дзьверы ў хату.

— Прыдзі,—сказала яна.

— Ты будзеш мяне чакаць?

— Буду.

Аднак твар яе пабялеў, і яна стала глядзець у печ, дзе датлявaў пад бельлю жывога попелу жар. Алесь заўважыў гэта і паглядзеў ёй у вочы. Зірку іх злавіць нельга было. Узяў яе за руку — рука была вялай і бязвольнай. Ён пагладзіў далоню рукі і пашоў назад да каморніка. Той, прысеўшы на край ложка, папраўляў на нагах гетры.

— Дык вечарам пагуляем дзе? — зноў сказаў каморнік.

— Хіба дзе так зьбяромся ды пасьпяваем.

— Сьпяваць я не магу. Голас у мяне...

Алесь падаў яму руку. Юнацкі твар каморніка ўпа у вакно на вуліцу. Алесь моцна стукаў ботамі па разламаным тротуары з аполкаў. Ганна падмятала кухню.

— Ведаеце што?..—сказаў каморнік, зьяўляючыся ў дзьвярах.

— Не, ня ведаю,—засьмяялася Ганна.

— Дык я-ж вам скажу... вечарам давайце мы з вамі пойдзем гуляць.

— Ну куды-ж?

— У прысады пойдзем...

— Я ня ведаю,—пачырванела яна.

— Чаму вы ня ведаеце?

— Ня ведаю.

— Ня ведаеце, чаму ня ведаеце?

— Пад вечар будзем бачыць...

І яна пашла ў сенцы.

— На пагоду выбіваецца, — сказаў Юлік Барановіч, уваходзячы ў кухню.

X

Пад вечар выбілася з-за хмар сонца і зноў летнім тварам зарадавалася зямля. Была ў гэтай радасьці задумёнасьць жоўтых даляй апусьцелага поля і трывога шуму сініх кустоў. Але клалася цішыня вонкавай бязутрапёнасьці і радасьць зямлі была магутнаю і неабдымнаю. Чарнелі дарогі вільготнай глебай і асеньняй травою зяляніліся іх каляіны. Жоўты ліст прыпадаў да травы, чуючы пад ёю зямлю і разам з усім, што было навокал яго—шэрым і яскравым, нязграбным і прыгожым—маліўся вялікай радасьці.

Неба сінела. Сонца абнімала захад. Далі зямлі вабілі жыць.

Летняя шырыня! І восень, восень!

Пахла поле і паплавы. І аброслыя мохам платы, і кара абветраных дрэваў.

Дзяўчына хадзіла босая па траве. Лёгкі холад жоўтага лісьця пад нагамі быў прыемным. Слаўна цямнела рудая сукенка яе сярод тонкіх садовых дрэў і шэрых сьцен. Салома шумела пад рукамі ў дзяўчыны і, перамешаная з зяленівам сухое травы, весяліла дзяўчыніны вочы. І вочы гарэлі чорнай глыбінёю, і ўсё было ў іх: як-бы сьвет адлюстраваў у іх усе глыбіні харатва, радасьці і смутку

для паказу таго, што самае жахлівае ў юнацкім смутку, гэта дзяўчыніны вочы.

На скананьні дню, упраўляючыся тут, чула яна, што сумуюць па ёй двое. Алесь быў моцным і прывабным. Каханьне першых часоў прытупілася за год, але зьяўляцца пачало нешта падобнае на прывычку да яго. Аднак-жа вострыя хістаньні надыходзілі вельмі часта і раптам неспадзяваны кватарант, раней бачаны некалькі разоў у горадзе і ледзьве знаёмы, узьняў цэлую буру і парушыў усё. Вобраз з Алеся стаў блёклым і затуманеным, шэрым. Днём білася ўстрывожана сэрца, калі кватарант памагаў цадзіць малако; дужа-ж хвалявалася горасьцю ўтрапеньня пачуцьцяў, калі Алесь стаяў каля яе ў кухні. І цяпер цьвілі ў душы піжмы і палыны. Бездапаможнасьць і нават безнадзейнасьць панавалі над ёю.

Скрыпела вочапам студня і павольна званілі ў царкве; амаль сканаў дзень—тады яна ішла з прыгуменьня ў хату. Трывожна было і страшна ісьці туды: мусіць чакаў там, каханы нават цяпер ужо, кватарант — ісьці гуляць куды. І Алесь-жа чакаў недзе, ці меўся прыйсьці.

Шастала пад нагамі салома, пахлі—трава, вечар і восень. Калаціўся ў апошніх хвілінах сваіх дзень. У змроку навіслых гольлямі дрэў, плакала дзяўчына.

У царкве ўсё званілі. Бацькавы крокі чуваць сталі на дварэ. Дзяўчына зьняла з галавы хустку, выцерла твар і пашла насустрач.

Бацька быў у новых ботах і зусім ня кульгаў.

— Надвор'е пагодлівае стане,—сказаў ён,—нага ў мяне зусім здароваю чуецца.

— Хто ў хаце?—запытала дачка.

— Нікога.

— Дзе-ж мама?

— Хто яе ведае, куды яна пашла... А каморнік на вуліцы сядзіць на лаўцы.

Яна цішком увайшла ў сенцы, сьпяшаючыся памыла ногі і абула чаравікі. Ускінула на плечы вялікую хустку і пашла агародамі, каб ніхто не заўважыў яе.

— Куды ты, Ганна?

Бацька замыкаў гумно і распускаў дзягцяны пах ботаў.

— Гуляць пайду з дзяўчатамі.

— То чаму ты вуліцаю ня ідзеш?

Яна нічога не адказала. Бацька паглядзеў на яе і сказаў сам сабе:

— Дурыць дзяўчына, сама ня ведае чаго хоча.

Ён доўга глядзеў ёй усьлед, аж пакуль ня зьнікла постаць яе ў змрочных агародах. Вышаў ён за гумно і бачыў, як меркне поле, чуў, як маўчыць балота; і ўсё глядзеў, як блёкнуць густыя колеры захаду. Пасьля, зьняўшы шапку і пагладзіўшы лысіну, пасьвістаў:—фюй-фюй...—і рушыў у двор і на вуліцу. Каморнік усё сядзеў на лаўцы.

— Вы пойдзеце куды ці будзеце дома?

Каморнік залажыў нагу на нагу і паглядзеў з маўклівым запытаньнем яму ў вочы.

— Я гэта таму гавару, што нікога дома няма, а я таксама падацца куды-небудзь думаю.

— І Ганны няма?

— Пашла.

Каморнік памаўчаў і пашоў вуліцаю.

— Добры хлопец,—сказаў, гледзячы на яго, Юлік Барановіч.

Увайшоў у двор, замкнуў сенцы, падлажыў ключ пад ганак і павольна закрочыў змрочнаю вуліцаю. Неўзабаве павярнуў ён на рыначны пляц. Каля панурага будынку народнага дому быў крык

і рогат. Юлік Барановіч падышоў бліжэй і пільна разглядзеў, як белагаловы Клемусь прапускаў у сярэдзіну людзей. З застылаю ўсьмешкаю аб нечым марыў каля ганку міліцыянэр.

— Што гэта будзе тут?—запытаў Юлік Барановіч.

Міліцыянэр перакруціўся на аднэй назе:

— Спэктакль... „Асінае гняздо“ ставіцца.

— Асінае гняздо?

Юлік Барановіч пашоў далей, ціха пасьмейваючыся:

— Асінае гняздо?.. Шпільтак.. Шпільтак нейкі, трасца іх матары. Шпіталь вар'ятаў!

— Праз хвіліны дзьве ён увайшоў у царкву.

У прытворы гарэла тоненькая сьвечка. Маўклівы твар Хрыста глядзеў у бяздоньне чорных сьцен. Пахла залежаласьцю і спакоем, бяз бур і трывог. Спакой гэты межаваўся з няйснаваньнем.

Ён пацалаваў у халоднае дрэва, дзе абшморгана была людзкімі губамі нага Хрыста і паправіў сьвечку перад Хрыстовым тварам.

У царкве, скупа асьветленай, дзяк чытаў кафізмы. Налева, каля сьцяны, кум прадаваў сьвечкі. Юлік Барановіч падаў куму руку:

— Як маецеся?

— Дзякуй богу. Як вы?

— Дзякуй за памяць...

— Што гэта за гвалт такі чуваць?

— Гэта-ж, адпусьці бог грэх, шпільтак.

— Ага.

— Ну але. Асінае гняздо.

— Яны яшчэ пашапталіся пра цану на позьнія гуркі, пра нямецкае войска і пра новую кадушку, якую кум пазаўчора купіў на капусту. Пасьля ўдвух запалілі яны панікадзіла і зноў пачалі пера-

шэптваццa. А палове службы сабралася трохі народу, тады Юлік Барановіч заўважыў куму, што ў панікадзіле адна сьвечка пахілілася на бок. Яны ўдвух вышлі на сярэдзіну царквы і агледзелі панікадзіла. Моцным шэптам, каб чуў народ, кум сказаў:

— Будзе гарэць... нічога.

Юлік Барановіч не згадзіўся:

— Аплыве.

— Не, не аплыве.

— Я кажу, што аплыве і падлогу закапае.

Аднак ён быў далёкі ад таго, каб спускаць панікадзіла і папраўляць сьвечку. Так яны памеркавалі і, пaглядаючы на ўсіх, падаліся назад да сьвечнае шафы.

Пасьля службы яны прайшлі з дзяком пад дзякоўскі дом і пастаялі ўтрох каля варот. У агародчыку перад вокнамі чарнела вяргіня і гусьцілася каля сьцяны і плоту мята.

— Цёпла,—сказаў дзяк.

— Ну але, цёпла.

— А я хрыпаю.

— Што-ж такое?

— У мяне была сьпеўка перад нядзеляю, дык я ўпацеў і адчыніў вакно. От мяне і прабрала.

— Спацець трэба.

— Я пацеў, але хрыпата не праходзіць.

— Як-жа вы сьпяваеце?

— Я перад тым, як ісьці на клірас, выпіваю штукі тры яец.

— А я вам параю гарэлкі з мёдам... Самагонка добра... Ачышчае голас, нават і чыстая, бяз мёду.

— Чыстая яшчэ лепш,—пацьвердзіў Юлік Барановіч,—я даўней, як ахрыпну, дык чарак дзьве выпіваю, дык яно і разаграе чалавека, і голас

ачышчае. А вам, пры вашым, можна сказаць, рамястве, дык няйначай трэба для ачысткі голасу мець рацэпт.

— Дык, як вы кажаце, чыстая самагонка?

— Ну але, чыстая самагонка. Дык ня трэба вам, я-ж кажу, ні яец, ні шмаец. Я спрактыкаваўся.

Чорны быў вечар. І весела было гаварыць тут ім утрох.

— Калі ў вас няма, дык я магу дастаць вам самагонкі,—сказаў Барановічаў кум.

— Знойдзецца,—адказаў дзяк.

Быў ён сутулаваты і вясёлы, з выцягненаю ўніз барадою. Разьвітаўшыся з ім, Юлік Барановіч ступіў колькі крокаў, азірнуўся і сказаў куму:

— Можна сказаць, самавіты ён чалавек, яй-богу.

XI

Нібы лета імкнулася нагадаць сонечныя дні.

Пакоша на паплавох паабрастала сіняватай атавай; дзе была скошана—зноў пачынала адрастаць. Нават і птушак зьявілася шмат за апошнія пагодлівыя дні. Падыходзіла да канца сяўба. Месцамі-ж зелянела і сінела, чырванаватая, кволая, жытняя рунь.

І маўчала, і шумела, і думала—усё, аддаючыся апошнім лагоднасьцям сонца.

Вялікая шырыня ляжала на ўсім.

Сонечнаю раніцою на вуліцы рыкалі каровы і ніводнага зялёнага лістка ня было на дрэвах. Радасна пахла полем. У садзе пад нагамі шумела маўчаньнем лісьцё.

Сінія Юзікавы вочы гарэлі глыбынёю думак. Юрка, прыпёршыся плячом да разгатае грушы, расказваў:

— ...Я адно як падрасту, дык усё будзе іначай... Калі-ж тата вельмі сярдзіты нейкі, што ты яму ня скажаш, дык ён калі закрычыць!

Юзік задуменна сказаў:

— Ну, бо ты яшчэ малы. Вельмі ён цябе будзе слухаць!

— Няхай сабе я малы, але-ж за што на мяне крычаць. Што я вінават.

— І на мяне тата крычыць. Пазаўчора мне вельмі захацелася было сала, дык я сам палез у суднік ды адрэзаў сабе кавалачак, дык тата калі ўбачыў, дагнаў мяне каля хлява, ды калі дасьць мне нечым па руках, дык я аж заплакаў. Яй-богу.

— А ў вас сала многа?

— Нашто ён мяне біў? Я-ж і сам бачу, што сала да каляд асталося толькі адзін кавалак, ну можа там на якіх дзесяць гаршкоў будзе на акрасу... Але-ж мне вельмі захацелася было сала. Аей як. Я вельмі даўно ня еў сала.

— А з чым вы варыце?

— На абед дык крупнік з малаком, або картопля з малаком. А раніцою—дык у нас расол ёсьць і гуркі.

Юрка памаўчаў і зноў пачаў гаварыць:

— Каб я адно скарэй вырас, дык от паглядзіш, што іначай я ўсё буду рабіць. А то—нашто гэты крык заўсёды ў хаце, часам аж страшна ў хату ісьці. Яй-богу. Ні то, што я бацькі баюся, але калі пачне сварыцца з мамаю ды як паднімецца на ўсю хату гвалт, дык, здаецца, на сьвеце ня жыў-бы. Яй-богу праўда. Дык я тады стараюся з хаты ўцякаць. Каб я так жыў.

— А я дык свайго таты баюся.

— Ну, бо твой тата б'ецца.

— Ён мала калі і б'ецца, але так я нейк...

— Мой тата дык думае, што ён вельмі разумны і спрытны, лепшы за ўсіх. А тут сам ня ведае, што як пачне ён гэты свой розум паказваць, дык аж сьмешна робіцца.

— Мой таксама вельмі мацак вялікі ў сваёй хаце, а калі прыдзецца дзе перад людзьмі абазвацца, дык увесь гэты яго мацунак прападае. А ў хаце сваёй, дык ён вельмі храбры, аж страх.

— Або мой тата, калі пачне праклінаць усіх! У нас гэта што грэчкі трохі згніло на полі пад дажджамі, дык ён нават мяне кляў, адно што ня біўся. Летась, я памятаю, ня ўсьпеў усяго гною павазіць увосень, дык мама нешта сказала, а ён калі дасьць маме па галаве. Дык я гавару—тата, ня беце мамы,—а ён на мяне калі крыкне;—маўчы, бо й табе дам!—Я свайго бацькі ня люблю. А калі ён захварэе, дык мне так шкода яго, што ня дай божа.

— Бо, вядома, бацька.

— Ну але.

Нейкі час яны маўчалі. Юрка разглядаў сінюю асеньнюю муху ў сябе на назе, Юзік стараўся зьбіць тонкім дубцом каліўё сухога зельля. Абодва слаўна адчувалі ласкавую цяплыню асеньняга сонца. Памаўчаўшы, Юзік сказаў:

— Юрка, каб гэта ўзяў ды ў комсамол запісаўся.

— Ну але, каб гэта ўзяў ды запісаўся.

— Давай запішамся.

— Нас ня прымуць, бо мы яшчэ малыя.

— А ў піонэры?

— У піонэры—вялікія. Хіба як падрастом, дык тады ў комсамольцы пазапісваемся.

— Тата будзе крычаць.
— Ну але будзе.
— Нічога, запішамся.
— А Хоня свайго хлопца кожны дзень лупцуе, калі ён позна дадому прыцягнецца. Ён-жа прыходзіць чуць ні кожны дзень позна ўночы.
— А дзе-ж ён цягаецца?
— От, то ў клюб пойдзе, то яшчэ куды.
— Ён-жа ўжо комсамолец.
— Не, ён яшчэ піонэр.
— А, ну але піонэр. Гэта я забыўся.
Яны зноў памаўчалі. Юзік дашчэнту зьбіў каліўе і разам з ім схвастаў дубец. Раптам Юрка, як-бы што прыпомніўшы, дзіка глянуў на траву і сказаў ціхім голасам:
— Мая мама хворая.
Юзік працягла спытаў:
— Хворая?
— Хворая.
— Яна-ж ходзіць і робіць усё.
— Мала што ходзіць і робіць усё, але хворая. Яна раніцою як устае, дык заўсёды енчыць, што галава баліць... А часамі і жывот ёй баліць. Кажа, што ёй у вачох цёмна. Галава кружыцца, калі яна паднімае што цяжкое, або пасядзіць доўга ды ўстане. Вельмі-ж ёй цяжка даставаць з пограбу картоплю.
— Ну дык чаму ты ёй не памагаеш?
— Я-ж памагаю. Але калі яна нейкая... От калі занатурыцца, дык ня хоча, каб я памагаў ёй,—я, кажа, сама. Яна мяне шкадуе.
— А чаму твой тата не памагае ёй даставаць з пограбу картоплю?
— Тата часам памагае, але вельмі яму час ёсьць, або ў галаве гэта яму. Ён-жа такі.

— Які?

— Ён адно крычаць умее.

— То няхай-бы твая мама пашла да доктара.

— Вельмі ёй час ёсьць. Яна-ж дурная, ня хоча кінуць работы, ды ня пойдзе...

Падумаўшы, ён дадаў:

— Я ёй скажу, каб яна пашла да доктара... Я ўкраду, каб тата ня бачыў, жыта, ды прадам, ды дам грошы на доктара.

— А хіба тата шкадуе ёй на доктара?

— Ён то не шкадуе, але цішэй у хаце будзе, калі ён бачыць ня будзе.

— От дурны твой тата.

— Дык ён-жа не шкадуе, яй-богу не!

— А чаго яна хворая?

— Дзіва што будзе хворая, гэтак жывучы. Ніколі ня высьпіцца, не пад'есьць. Ды заўсёды яшчэ ў жорнах меле.

Нядзіцячы бляск раптам зьявіўся ў Юркавых вачох. Вострым агнём загарэліся яны. І адзнакі непермаожнага жаданьня прайсьці скрозь усё, у скалыхнулі ўсе рысы яго дробнага твару. Так ён стаяў, шчуплы і ўзбуджаны, поўны немымі бурамі.

— Юзік!

— Чаго ты?

— Хадзем пад рэчку.

— Чаго?

— Рыбу лавіць.

— Ня будзе брацца.

— Будзе... Хадзем.

— Ну хадзем... Але я яшчэ ня сьнедаў.

— Дык я цябе пачакаю.

— Добра, пачакай.

— Дык ты ідзі хутчэй.

Юзік пашоў. Юрка застаўся адзін. Ён усё глядзеў на свае ногі, чорныя і патрэсканыя.

Раніца рабілася позьняю. На вуліцы чуліся сьвяточныя гаворкі.

Юрка ўсё стаяў адзін. Пахла трава, і лісьцё, і сонца адчувалася ўсёю істотаю. Вострае было яно і поўніла душу радасьцю сьвятла і волі.

Юрка пашоў да плоту, узлёг грудзьмі на пералаз. Глядзеў у вулачку між гумён і платоў, усю аброслую зельлем і закіданую жаўцізною лісьця. Так глядзеў на ўсё, што было перад вачыма, і чуў наскрозь, навылёт, ад карэньняў да верхавін, ад пачаткаў і да канцоў. І вялікае кіпеньне поўніла ўсё: усё бачанае і нябачанае і разам з усім яго.

Каля рэчкі яны былі доўга. Адрослая і зноў зьбітая быдлам пакоша рачных берагоў весяліла, іх і яны забываліся на ўсё. Хадзілі паўз рэчку, кідалі ў яе чыстую ваду траву, пробавалі купацца ды вада была вельмі халоднаю. Нявыказаная воля душы ўзбуджвалася пастарамі паплавоў і поля, густою жаўцізною пахучых кустоў. І ўсё пахла, востра і шырока. І ўсё калацілася нязвычайнай чуласьцю ў успрыйманьнях.

Крываносы Мікалай ішоў аднекуль з таго боку рэчкі.

— Дзе тут, хлопцы, кладка ёсьць?

— А дзе вы былі, дзядзька?

— У Чучаны хадзіў.

— Чаго?

— Трэба было... Ах, які ты цікавы.

— Тут няма нідзе кладкі.

Яны глядзелі, як Мікалай пераходзіў бродам рэчку, пасьля глядзелі яму ўсьлед, як ён ішоў, проста трымаючы свае пляскатыя плечы. Сонца, белаватае ад восені, шырыла далягляды. Зямля

была ў дрымоце і салодкім забыцьці. Аддаўшы ўраджай, яна поўнілася цяпер глыбокадумным хараством бурнае цішыні.

— Мікалай у нас жыве цяпер,—сказаў Юрка.

— Ведаю.

— Яму Юлік сорак капеек пераплаціў, як ён малаціў у яго.

— От добра, што скупяньдзя гэтая пераплаціла.

— Хадзем дадому.

— Пачакай яшчэ трохі.

— Я ўжо есьці захацеў. Хадзем, пакуль зойдзем...

Яны ішлі куставою дарогаю. Крушына і алешына абсыпалі іх багацьцём жоўтага багацьця свайго. Лісьцё на дубовых кустох трымалася яшчэ моцна. За кустамі журылася поле; іржышча і ральля межаваліся з чырванаватаю жытняю руньню.

— Вы ўжо, Юрка, усё сваё жыта пасеялі?

— Не, яшчэ можа з які пуд пасеем.

— А мы-ж ужо ўсё.

— Бо ў вас конь лепшы... Каб у нас быў добры конь, дык я адзін усё парабіў-бы.

— Ты яшчэ малы.

— Але я падрастаю... От каб гэта конь добры. Каб скарэй адно я падрос. Няхай сабе тады бацька, што хоча робіць. Яй-богу-ж праўда. От паглядзіш. Ты думаеш не?

— Унь, Юрка, твая мама.

— Дзе?

— Унь каля рову каровы гоніць.

Жанчына была адзета ў ватовы кароткі руды каптан і паволі падганяла карову.

— Пастухі забыліся выгнаць,—сказала яна.

— Давайце я заганю.

— Ідзі, сынок, гуляй. Ты ў будзённы дзень напрацуешся, то хаця сёньня пагуляй. Ідзі сабе. Ідзі

паабедай, дома ў печы знойдзеш. Я заганю і вярнуся скора.

Юрка азірнуўся некалькі разоў на мацеру і ўсё ішоў, гледзячы на свае ногі.

— Чаго ты, Юрка, азіраешся?

— Так.

Але ён яшчэ больш пільна паглядзеў на свае ногі і раптам твар яго загарэўся вастратою чалавечых глыбынь. Нядзіцячым на некалькі момантаў зрабіўся гэты твар.

— Унь поп ідзе,—заўважыў Юзік.

Нізкі чалавек клапаціўся каля платоў.

— Што ён тут робіць?

— Мусіць, аглядае, каб дзірак ня было ў плоце.

Яны прайшлі паўз нізкага чалавека, маўкліва паглядаючы на яго.

— Трасца яго матары,—сказаў Юрка,—ён мне раз чуць быў вуха не адарваў.

— Гэта тады, калі ў яблыках быў злавіў?

— Ну але, тады...

Дайшоўшы да канцавое хаты, Юзік яшчэ раз азірнуўся на нізкага чалавека і дробна заморгаў вачыма. Вочы сталі раптам чырвонымі і твар пабялеў.

— Чаго ты, Юзік?

— Я памятаю, як ён спавядаў маму, як яна ляжала і як хворая памёрла.

І пастараўся забыцца на гэта, подбегам ідучы па вуліцы.

XII

Сабастыян быў рад. У адчуваньнях цяплыні жыцьця была яго радасьць. З самага ранку загадаў ён пастушку, якому была чарга цяпер тыдняваць у яго, падмесьці двор. І з самага-ж ранку, назіраючы гаспадарскім вокам за цішынёю ў двары

і гумне, слаўна адчуваў лёгкасьць чыстых ануч на нагах у новых ботах. Тупаў каля хаты, падглядаў, як клапаціліся каля печы жонка з нявесткаю і стала пакручваў вусы.

Госьці павінны былі сабрацца па паўдні, калі скончыцца абедня.

Ужо званілі ў царкве, як быў ён у Мацьвея. Мацьвей сядзеў на парозе сянец, босымі нагамі на двор і чухаў іх.

— От ты ўжо і ўнука прыждаў,—усьміхнуўся Мацьвей, гледзячы брату ў твар.

— Але... Прыходзь на радзіны сёньня.

— Калі?

— Так, пад абед.

— Гэта сёньня гуляць хрысьціны будзеце?

— Але... ці не дастану я ў цябе паўпрыцы. Раскідаліся жорна, хоць ты што хочаш. А заўтра чуць сьвет трэба будзе вобмешкі ўмалоць. У цябе, здаецца, паўпрыца другая была.

— Можна... Юрка, дзе наша паўпрыца другая?

Юрка выскачыў з хаты і адразу ўспомніў:

— Наша, другая паўпрыца на гары каля коміна. Дастаць?

— Дастань.

Сабастыян сеў на парог.

— Ну, як твая маецца? Нездарова нешта была, мая гаварыла.

— Нешта ўсё ёй далягае, ніяк адолі ня возьме.

— Дык так, пад абед, падыйдзі, братка...

— Толькі от што ты мне так позна гаворыш, усё роўна як чужому. Мая-ж там памагла-б штонебудзь каля печы, каб ты раней сказаў, а то нічога не гаворыш, хто там вас ведае... Ты сказаў-бы дзён за два, дык я прыгатаваўся-б, а то як-жа гэта з пустымі рукамі ісьці...

— Ат, нічога. Мы-ж з табою родныя. Ня ў тым тут музыка, што з пустымі рукамі, ці ня з пустымі. Мы з табою браты... Жыта адсеяў?

— На гэтым тыдні яшчэ клінок пасею. Нямнога там засталося. Нейк сяк-так паадсяваў... Колькі там, праўда, тае сяўбы ў мяне! Яно, каб добры конь, дык гэтая мая сяўба—плёвая справа. Гуляючы можна адсеяцца—і скончана дзела. Гэта ні то-што...

— Ну пэўна... Дзе ты сабе дубка такога дастаў?

— Дастаў. Шула ў пограбе пастаўлю, а то столь гатова ўламацца. Спарахнела ўсё. На той год, калі жывы будзем, трэба будзе пограб новы майстраваць. От тут каля гэтае грушы выкапаю, а то ў сенцах вельмі-ж нявыгадна. Цесна, не павярнуцца.

— Ну пэўна што.

Сабастыян узяў паўпрыцу, паважыў у руцэ і падаўся дадому. Сонца стаяла пад асеньні поўдзень. У царкве званілі ў адзін звон. Высокі гук доўга нудзеўся і як канчаўся нараджаўся зноў.

— На верую звоняць,—сказаў Сабастыян у хаце,—зараз абедня скончыцца. І павысіў голас, да жонкі і нявесткі:

— Ці ўправіліся вы?

У бакоўцы, адгароджанай у хаце цалёўкамі, заплакала дзіцянё.

Сабастыян быў рад. Спакойная вясёласьць апаноўвала ім. Такім ён сустракаў і частаваў гасьцей.

Поп прышоў пазьней за ўсіх.

— А мы не маглі прычакаць,—сказаў Сабастыян, гледзячы захмялелымі вачыма на паважнага госьця.

— Добра што і не чакалі.

Ён прытрымаў рукаў расы і блаславіў Сабастыяна, пасьля адшукаў вачыма гаспадыню і блаславіў яе.

І раптам зноў стала шумна. Неўзабаве поп весела ўжо грукаў басам:

— Гэта нічога, гэта нічога не парушае. Хрысьцілі ў тую нядзелю, хрысьціны спраўляем у гэтую — гэта і весялей. Таінства савершано, гуляць можна калі хочаце.

У другім кутку дзяк, ня менш грымучым голасам, даводзіў:

— Я гэтага не цярплю. Трэба выпіваць да дна, Калі вам страшна, вы разам хлопніце—і дзелу канец. Сьмела!

Дзяўчына, пачырванелая і прыгожая, саромліва адмаўлялася.

— Я-ж вам кажу, вы сьмела, разам. Яй-богу!.. Дзівачка вы!

— Я лепш другім разам.

— Што значыць—другім разам.

Раптам дзяк, стараючыся трымаць галаву роўна, грукнуў вясёлаю актаваю:

— Гор-р-р-ка-а-а!

— Ціха ты,—штурхануў яго ў локаць белабароды Павал,—тут табе не вясельле. Што ты, чалавеча, ацапеў?

— Выбачайце, я ўпусьціў з віду,—сказаў дзяк і ўспомніў перарваную раней гаворку:

— Кабыла? Што кабыла! Што значыць кабыла! Раз яна добрага заводу, тады яна і добрая будзе.

Белабароды Павал таксама ўспомніў перарваную на поўслове гаворку:

— Завод, кажаш? Калі ты добры гаспадар, дык табе і завод ні пры чым.

— Правільна! Калі ён добры гаспадар, тады ён і коняй трымае добрага заводу.

— Ня гэтак.

— А як?

— А так, што калі ты добры гаспадар, дык у цябе і дрэнная кабыла будзе добраю, бо яна ў цябе заўсёды дагледжана будзе.

— Падлу колькі не даглядай, яна на век-вечны падлаю застанецца. З паскуднае кабылы толку ня будзе. Гэта факт.

— Я табе таксама пакажу факт.

— Пакажы... Толькі цьвёрды факт.

— Пакажу цьвёрды.

— Які факт?—падаў голас Сабастыян.

— Ці можа з паскуднае кабылы толк быць?

— З паскуднае кабылы толк?.. Бацюшка, як вам здаецца?

— Што?

— Пра кабылу гаворка ідзе.

— Пра чыю?

— Пра завадзкую і простую.

— Раней вып'ем яшчэ па адзінай.

— Ну але, госьцейкі,—заклапацілася Сабастыяніха.

— Чаму не па дзьве?—усхваціўся Сабастыян.

— Раней закусім, а тады па другой. Блаславяю. Бо і ў пісаньні сказана,—ня выпіўшы—не закусвай.

Белабароды Павал раптам устрапянуўся:

— Хоць ты і бацюшка, але я не пабаюся сказаць табе ў вочы—бязбожнік ты, мяцежнік! Дамакрат!

Поп пакінуў есьці, уцягнуў галаву ў плечы і як злосны кот утаропіўся вачыма ў Паўла.

— Бязбожнік. Кагадзе абедню адслужыў, а сам што гаворыш?.. Што ты з сьвятога кпіны строіш

Ня можа быць, каб у пісаньні так было сказана. Пакажы мне зараз-жа. Усенародна пакажы, дзе гэта сказана, ткні пальцам, і больш нічога.

— Ты мяне папракаць яшчэ ўздумаў? А сам колькі год у споведзі ня быў?

— Не тваё дзела.

— А чыё-ж дзела?

— Не тваё. Канаць буду, а да такога азіята, як ты, да споведзі не пайду. Я даўно чакаў прычыны выказацца пра цябе ўсенародна. Кат ты!

— Ты чаго хочаш?—страшна ўскіпеў поп, усхваціўшыся за сталом.

— Згубіцель ты! Ты ўсё мястэчка прыгубіў! На што ты лес спляжыў?..

— Бо лес тады быў мой. А пасьля рэволюцыі, калі ён стаў ваш, я ніводным дубцом з яго не пакарыстаўся.

— Ня твой, а царкоўны. А царкоўнага секчы ня меў права.

— Не царкоўны, а мой!

— Ня віляй... ты гавары—нашто лес спляжыў?

— На што? Пры мне быў яшчэ цэлы, а от як вам у рукі папаўся, дык цяпер нават дубца на венік не засталося.

— Пры табе быў цэлы лес? Каб твая галава была такой цэлай, як гэты лес быў пры табе цэлым.

— Галавы мае не чапай. За зьнявагу будзеш адказваць перад судом. А што я пажартаваў словам, успомніўшы сьвяшчэннае пісаньне, дык у царкве—я сьвяшчэннаслужыцель, а тут—я такі самы чалавек, як і ўсе.

— Бацюшка, сядзьце вы,—угаварвала Сабастыяніха,—вядома п'яны. Ён як працьвярэзіцца, дык прабачэньня папросіць.

Павал пачуў:

— Што, я ў яго буду прасіць прабачэньня? Не даждаў ён, каб я ў яго прабачэньня прасіў. Рызыкант. Ён думае, калі дачку аддаў за армейскага камандзіра, дык ужо вельмі вялікі асэсар? Многа я іх бачыў. Я яшчэ з яго спаганю тыя два рублі, якія ён з мяне зьдзёр.

— Брыдка, Паўла. Ты-ж сам ведаеш, што твае каровы нарабілі ў мяне ў агародзе шкоды не на два, а на дзесяць рублёў. Пабойся бога, трэба-ж мець сумленьне. Што ты, ня маеш бога ў сэрцы?

— Паўла сілком пасадзілі на лаву. У агульным тлуме, поп вылез з-за стала, зьбіраючыся ісьці. Некалькі мужчын і баб упрошвалі яго:

— Бацюшка, плюньце вы.

— Ліха яго бяры, от ён ужо зусім зваліўся. П'яны-ж ён.

— Пабудзьце хоць трохі.

Раптам дзяк зноў пачаў гаворку пра кабылу.

— Не, не, я табе дам на рукі факт,—блытаў словы Павал, стараючыся пачухаць пераносьсе.

Поп сеў на сваё месца.

— Ты для мяне ноль!—раптам схіліўся да яго Мацьвей—чуеш? Ты для мяне ноль. От што!

— А ты яшчэ чаго?

— За дзяцей сваіх, от што! Ты нашто майго хлопца за вушы круціў?

— А ты не прывучай свайго хлопца да зладзейства.

— Што ён у цябе ўкраў?

— Мала ён у мяне яблык папакраў?

— Ён у цябе яблык калі і ўкраў, дык на капейку.

— Я яго і за вушы накруціў ня больш, як на капейку.

— Не, ты не жартуй. Калі ты яго злавіў, дык няхай-бы прышоў ды мне сказаў. Я яго сам-бы ўшчунуў, калі трэба-б было.

— Ты, Мацьвей, не рабі капеечных крыўдаў.

— Мне і капейка дорага. Гэта табе можа капейка нічога ня варта. Якое табе ліха адходзіць. Я цябе не пасаромлюся і не пабаюся. Ты для мяне ноль!

— Яно так,—гаварыў кум Юліка Барановіча, адапхнуўшы Мацьвея.—Я-ж кажу. Тут, бацюшка, такая справа, што, тымчасове, народ наш, можна сказаць, цёмны. Гэта цемнікі, а ня людзі. Кожнаму ўсё мала. Кожны ўсё, разявіўшы горла, стараецца ўварваць, дзе толькі льга. Няма, каб, тымчасове, усё рабілася памяркоўна, пачалавечаму і пабожаму. Я, бацюшка, такі чалавек—мне няхай сабе хто што хоча, а я, калі пэвен у чым, дык зьнімай ты мне галаву, а я не адступлюся. Я люблю, можна сказаць, праўду і парадак. У Сабастыяна нарадзіўся ўнук, то няхай бог гадуе. Сабраліся, тымчасове, як добрыя людзі, выпілі, закусілі, пагаварылі сабе— а нашто вэрлах паднімаць?!. Нашто наднімаць, тымчасове, вэрлах? Праўда ці не? Начорта гэтая работа? Раз ты чым незадаволены—падавай у суд. А ні то, што. Ён тут мне ўзьнімае лямант! Няма, каб усё памяркоўна... Я, калі хочаце, бацюшка, устрою штуку—Павал зараз-жа будзе ў вас прабачэньня прасіць.

— Ня трэба. Ніякіх штук ня трэба.

— Чаму? Я на яго націсну, калі хочаце... А ты, Мацьвей, таксама.

— Што?

— Ня ўмееш ты трымаць сябе ў кампані.

Дзяк глянуў цераз стол наўскасы і сказаў:

— Весела жывуць... Забіяцкі народ.

Пачуўся голас:

— Які ён забіяцкі. У нас народ запечны. Гэта толькі здаецца. Толькі слава тая, што народ!

Дзяк падаў тлумачэньне:

— Ну, пэўна, што няма тут сярод нас вельмі выдатных герояў.

— А дзе яны ёсьць вельмі тыя героі?

— Чаму, яны ёсьць... Ёсьць такая казка—наеўся цыган кіслага малака, ды вельмі-ж бараду ў гэтае малако абрабіў...

Барановічаў кум раптам зацікавіўся:

— Хэ-хэ, няхай ён запаветрае з сваёю барадою. Няўдалы нейкі, хэ-хэ.

— ...Ну, абліў ён, значыць, кіслым малаком бараду і лёг спаць на дарозе. А сонца калі прыпякло, дык на гэтую яго бараду нешта з семсот мух села...

— А хто гэта вылічыў, што якраз семсот? А можа там было ўсяго сто. Хто гэта знайшоўся такі, што якраз-бо вылічыў?!.

— Пачакай ты, дай чалавеку сказаць.

— ...Дык мухі сабе сядзяць ды жывяцца ў цыганскай барадзе. А цыган, калі чамярахнуў рукою!..

— Ня з гэтага расказваць пачаў, гэта пасьля ўжо ён малако еў...

— ...Дык ён калі чамярахнуў, дык іх усе і падушыў.

— Усе зараз? Семсот?!

— Так зараз піша на паперы—за адным махам семсот галоў пабіяхам...

Кум узьнепакоіўся:

— Цьфу! Нашто за сталом усякае паскудзтва гаварыць. Пакіньце.

— Няхай раскажа.

— Нашто, тымчасове, я-ж кажу, за божым, можна сказаць, дарам пра ўсякае паскудзтва...

Дзяк вычысьціў вусы і ўстаў.

— Куды-ж вы?

— Каня трэба напаіць ісьці

І пашоў, вясёлы і спрытны.

— Можа і нам пайсьці,—сказала Мацьвеіха,— дагледзець там усяго дома. Вечар на дварэ.

— Хадзем,—сказаў Мацьвей, вылазячы з-за стала.

Госьці пачалі разыходзіцца, каб праз гадзіну сабрацца зноў.

XIII

Сонца блізка стаяла да захаду свайго. Сьвятло яго было блёклае і ціхае, як-бы яно нудзілася і сумавала па тых днёх, калі бурнаю радасьцю шырокага лета раскашэльвалася яно ў палёх.

Вуліца была сухая, з пагодлівым тварам.

— Мікалай казаў, што заўтра будзе вецер,— сказаў Юрка, сустракаючы ў варотах бацькоў.

— Як гэта ён пазнаў?

— Паглядзеў на неба дый пазнаў.

Мікалай крываносы сядзеў у дварэ на прызьбе. Мацьвей пашоў упраўляцца каля жывёлы. Мацьвеіха ўправілася хутчэй.

— Зноў, мусіць, пойдзеце да Сабастыяна?—запытаў Мікалай, гледзячы сабе пад ногі.

— Пойдзем яшчэ,—адказала Мацьвеіха, садзячыся на сонечны парог.

— Шмат гасьцей на радзінах?

— Уся радня, і так... суседзі, знаёмыя...

— Мусіць, выпіўкі здорава?!

— Шмат, няхай яна прападзе. Мяне сілком прымусілі выпіць—цяпэр яшчэ ў галаве кружыць, як у дурное.

— Ды пэўна, што Сабастыян гарэлкі ужо не пашкадаваў. Ён рад, што ўнука прычакаў. Мусіць, рад вельмі Сабастыян. Вельмі весела вусы падкручвае—бачыў я яго сягоньня каля крам. Зранку...

Апошнія словы сказаў ён цішэй, сам сабе. І, сказаўшы, пачаў зацягваць сабе пад нос сваю песьню—доўгую, як сумныя дні, бяз слоў, пачатку і канца. Варушыў наском правай нагі і ўсё цягнуў, ні на кога ня гледзячы.

Юрка пакручваўся каля мацеры. Дзьве дзяўчынкі селі каля яе на парозе. Сонца пачынала заходзіць.

— Мама, вы зноў з татам пойдзеце да дзядзькі?— запытаў Юрка.

— Пойдзем

— І я пайду з вамі.

— Чаго-ж ты, сынок, пойдзеш. Там тваіх таварышоў няма. Там усе старыя. Ты от лепш пайдзі да Юзіка ды пагуляй трохі, а пасьля неўзабаве прыходзь ды кладзіся спаць... Кладзіся сёньня ў хаце, бо, мусіць, ноч будзе здаровая.

— Не, я ў адрынцы. Там мне цёпла, у сене.

— У сене цёпла і здаравей,—заўважыў Мікалай, не пакідаючы варушыць ботам. І зноў засьпяваў.

Дзяўчынкі прытуліліся да мацеры.

У хлеве Мацьвей крычаў на каня. Палахліва засакатала на цёмным седале курыца. Мікалай падаў голас:

— От бо чалавек! Крычыць на ўсе жылы, ня можа цішком каня дагледзець. Аж страх. Удзень не шкадуе пугі, а ўвечар крыку... Вельмі-ж гаспадар, а-яй! От бо...

— Ня крычы ты гэтак сіберна,—сказала Мацьвеіха.

Але Мацьвей, мусіць, не пачуў у хляве. Юрка сеў каля мацерыных ног на камені. Маці пачала гладзіць па галовах дзяўчатак. Меншая ўзьлезла ёй на калені. Большая прысунулася бліжэй. Маці глядзела на іх белыя галовы, на чорныя Юркавы ногі. Сказала:

— Няхай-бы ты, Юрка, ногі памыў.

— Я іх некаторага дня мыў з Юзікам у цэбры.

— Дык ты іх зноў памый.

— Чорт іх...

— Падрывае?

— Падрывае. Вельмі-ж тузае.

— Прамый ды завярці, я табе чыстае анучкі пашукаю.

— Ня трэба, і так зажыве.

Ён выцягнуў нагу, нагнуў твар да яе і стараўся разгледзець больку. Разгледзеўшы, сказаў:

— Нічога, зажыве.

— Пакуль жаніцца, дык загаіцца,—сказаў Мікалай.

І зьвярнуўся да Мацьвеіхі:

— Яму варта было-б з старых халяваў лапцікі пашыць на восень, па полі хадзіць. Здаравейшыя ў яго ногі былі-б... Дастань з гары халявы, дык я яму заўтра пашыю.

— Халяў няма.

— На гары ляжаць... старыя.

— Гэта на зіму яму прышвы будуць. Бяз ботаў-жа ён зімаваць ня будзе.

— Ня трэба псаваць халяў,—сказаў Юрка,— на зіму боты мне прышыюцца. Тата сам гаварыў. На чорта мне тыя лапці. От, ня бачыў лапцей. Я ня хачу.

— Ніхто цябе сілком не прымушае.

І Мікалай зноў зацягнуў свой бясконцы мотыў.

Навокал ціха было. І прытульна ад асеньняга вечару. Пахлі асеньнія грушы. Сумавалі платы. Весяліўся ў ружовасьці захад.

Мацьвеіха ўсё бліжэй прыгортвала да сябе дзяўчатак. Востра глядзела на іх. Сказала:

— Галава кружыцца.

— Чаго?—запытаўся Юрка.

— Гарэлкі выпіла ў дзядзькі.

І, гладзячы меншую дзяўчынку па галаве, засьпявала:

Весялушкі-ж мае,
Дробны птушачкі.
Шчабятушкі-ж мае,
Шчабятушачкі.

Голас яе быў сумным, няпрывычным для дзяцей.

— Мама, не сьпявайце,—заплакала большая.

Маці сьціхла. І глядзела на процілеглую сьцяну, за грушамі. Вочы яе блішчэлі ад сьлёз.

— От, дзеткі,—сказала яна ціха,—у жываце ў мяне баліць, у грудзях... І так усё нядобра мне...

— Бо нашто вы ў дзядзькі гарэлку пілі,—сказала большая дзяўчынка,—няхай-бы сам піў, калі гэтакі разумны.

— Хто?

— Дзядзька... Канешне прымушае піць...

Юрка-ж зразумеў усё. Паглядзеў у мацерын твар, выцягнуў шыю і, усхваціўшыся, пашоў у хату. Паглядзеў з цёмнае хаты праз вакно на вуліцу і зноў вышаў на двор. Ня ведаючы, дзе дзецца, ён патупаў каля мацеры і выбег на вуліцу. І там ня ведаў, што рабіць яму. Стаяў каля варот і чуў, як нешта цьвёрдае і цяжкае сьціснулася ў яго ніжэй грудзей і не давала дыхаць.

— Чаго ты, Юрка, месца сабе ня знойдзеш?— сказаў Мікалай.

— Нічога.

Мікалай устаў з прызбы і вышаў на вуліцу.

— Дурны ты, малы.

— Чаму?

— Дурны ты, мала што, калі, каму, што забаліць. Маці паправіцца. Якая там хвароба. Яна-ж ходзіць і робіць усё. Ты-ж сам бачыш. Гэта-ж ня дзіва, што чалавеку забаліць што.

Юрка раптам кінуўся на вулічную прызбу і закалаціўся ад сьлёз.

— Чаго ты, дурны?

Мікалай падышоў да яго бліжэй.

— Я ведаю, што яна доўга не пажыве.

— Адкуль ты дазнаўся... Выдумляеш.

— Яна пазаўчора вечарам у каморы плакала і гаварыла, а я чуў праз сьцяну, сплючы ў адрынцы.

— Каму яна гаварыла?

— Сама сабе.

— Выдумляеш ты.

Юрка сядзеў некалькі хвілін на прызьбе. Пасьля ўстаў, паглядзеў на Мікалая і пашоў вуліцаю. Мікалай застаўся адзін стаяць ля варот. Цямнела раптам. Мікалай пастаяў, пакуль Мацьвей не пашоў да Сабастыяна.

— Адзін ідзеш?—сказаў Мікалай.

— Адзін. Ей няма як ад дзяцей.

— Чаму ты яе да доктара ня выправіш? Яна-ж нездарова.

— Няўжо-ж я яе ня пускаю? Можна падумаць што я азіят які.

— Дык ты яе выпраў.

— Як-жа ты яе выправіш; яна сама ня ведае ці што? Што гэта, дзіцянё малое, што трэба вы праўляць?

— Яно можа і так.

Мацьвей пашоў, а Мікалай увайшоў у хату:

— Ідзі ты заўтра, Наталя ў анбулятору.

— Пайду.

— Пайдзі, ратуйся ты.

— Трэба якога рубля грошай.

— На чорта той рубель, ня трэба. Так павінны лячыць.

— Ня вельмі ён так налечыць. Дасьць якіх парашкоў адчэпнага... можа хіба яму каўбас з пару занясьці...

— Дай лепш няхай дзеці зьядуць.

— Пайду, заўтра пайду.

Яна прыставіла з коміна на прымурку газоўку і стала наліваць дзецям вячэраць. Мікалай зноў вышаў на вуліцу. Стаяў і глядзеў у асеньні змрок.

XIV

Жыта скончылі сеяць да паўдня. Вецер абвяваў сонечную ральлю, мякка выбаранаваную. І абвяваў Юркаў твар, прывыклы да ўсялякіх ветраў і дажджоў. Юрка патузваў лейцы, гукаў на каня і ўсьлед за ім, вельмі паволі, хадзіў за бараною. І думаў, ці пашла маці да доктара, ці не. Пасьнедаўшы, як выбіраўся ён з бацькам ехаць на поле, яна выбіралася ісьці.

Вароны падляталі ўсьлед за бараною, крычалі-ж яны і над блізкімі абветранымі кустамі.

Пасьля баранаваньня конь пойдзе на пашу. Дома, паабедаўшы, абіраць грушы прыдзецца. Весела было-б, калі-б ня гэтая справа з маткаю.

А матка скончыла паліць у печы, падмяла хату і выбіралася.

Амбуляторыя стаяла за мястэчкам, дзе пачыналася голае цяпер поле. Некалькі фурманак стаяла каля брамы. Чакаць давялося нядоўга.

Пах лякарства закружыў ёй галаву. Галава кружылася ўвесь час, пакуль сядзела яна перад доктарам на нізенькай канапцы, сядзела і думала— ці страшнае што скажа доктар, ці не. Доктар-жа пачаў пісаць рацэпт.

— Вельмі страшна гэта ў мяне?

Доктар моўчкі скончыў пісаць, паправіў на носе акуляры і пачаў гаварыць. І зусім нельга было зразумець — злуе ён ці заўсёды гэта ён так гаворыць.

— Заўсёды трэба берагчыся. А то ў вас робіцца так—калі сёньня здароў, дык і заўсёды думаеце так будзе. Не, згубленага здароўя ня вернеш. Вам трэба было адразу пачаць лячыцца, калі не маглі вы ўберагчыся. Вам здароўе сапсавалі няўмекі. Вы не сьцерагліся. А цяпер—скажаце, я вінават, ня ўмею лячыць! Колькі ў вас дзяцей?

— Трое

— А колькі ўсіх было?

— Шасьцёра.

— А колькі вам год цяпер?

— Трыццаць восем.

— Ня трэба вам цяпер нічога паднімаць цяжкага, не таміцца, мала рабіць, добрую і лёгкую яду ўжываць. І лячыцца. Праз нейкі час вам трэба будзе опэрацыю рабіць. А цяпер вы бярэце гэтае лякарства і два тыдні ляжэце ў пасьцелі.

— Як-жа я вылежу, няма ад каго.

— Ну, а што-ж я вінават. Трэба ляжаць.

— Я на поле не пайду, а па хаце буду паволі соўгацца. Памалу і ў печы выпалю... Дзеці памогуць. Нічога цяжкага я паднімаць ня буду. І лякарства буду браць. Толькі ў хаце буду паволі варушыцца.

— Ня можна і так. Зусім ляжаць трэба. Каб вы пры радох берагліся, каб гэтыя вашы бабы не памагалі вам... Для гэтага ёсьць акушэркі і дактары.

— Дык гэта-ж усё грошы каштуе, а я бедна жыву.

— У вас калі апошняе дзіця было?

— Пазалетась.

— Акушэрка была?

— Не.

— Чаму?

— Усё роўна ўжо я і так хворая ад ранейшых дзяцей. А тады гэтае акушэркі зусім тут нідзе ня было. А прывезьці якога доктара ці каго—дык дзе-ж грошай набрацца.

Доктар сьціснуў губы і працёр акуляры.

— Індыкі на градах кветкі пасклёўвалі,—сказала работніца, адчыніўшы дзьверы.

Доктар глянуў паверх акуляраў і вышаў. На хаду ён сказаў:

— Я працую на чатыры гадзіны ў суткі больш, чым мне паложана. Так, так, чатыры гадзіны. І не магу я за ўсякімі індыкамі наглядаць. Вы за мяне аглядаць хворых ня будзеце, а я за вас павінен мець клопат—індыкоў адганяць з кветніку. Можаце ісьці стаць на маё месца ў амбуляторыі!

Работніца ішла папярадзе. Яго ня было хвілін дзесяць. Доўгімі яны былі. На сьцяне нудна і роспачна цікаў гадзіньнік.

— Божа-ж мой,—уздыхнула жанчына і заплакала.

Прышоўшы, доктар пачаў нанава перачытваць рацэпт. Жанчына падышла да яго:

— Падлячэце мяне хоць трохі, хоць так, каб я ў хаце магла сёе-тое рабіць. Цяжкое работы я ня буду рабіць... Абы ў хаце. Я буду старацца, як мага, аддзякаваць вас...

— Пры чым тут просьбы,—сказаў доктар,—я павінен паводле абавязкаў службы лячыць вас. А цудаў я не раблю. Наколькі навука ў сілах зрабіць, усё будзе зроблена.

У жанчыны прыметна падняўся настрой:

— Можа гэта і не ад гэтага. У мяне суседка, дык таксама бяз ніякіх акушэрак і дактароў, тая самая баба была, што і ў мяне, аднак здаровая, як бура, і дзяцей ня менш, як у мяне.

Доктар паглыбіўся ў тоўстую кнігу, і жанчына вышла.

— Ну, што ён сказаў вам?—аступілі яе хворыя.

І яна пачала расказваць.

Дома-ж ня было нікога. Дзеці гулялі на агародзе. Хата была асьвечана сонцам. Яна дастала з печы чыгун паранае бульбы, насекла ў карыце і замяшала сьвіньням „Доктар сказаў не паднімаць цяжкага“,—падумала яна і ня выносіла карыта на двор, упусьціла сьвіней у сенцы і, седзячы на парозе, пачакала, пакуль яны зьядуць. Тады, выгнаўшы іх, зачыніла сенцы, пашла ў камору і лягла на палку пад цёмным ваконцам. Сонца залатою істужкаю лілося праз ваконца на процілеглую сьцяну, некалі моцную і смольную, з запыленымі махрамі высахлага моху. Пры ёй на паліцы ляжалі дзьве булкі хлеба, стаялі збанкі і на іржавым цьвіку віселі пучкі сухога, сьвянцонага і несьвянцонага зельля—піжмы, чабру і цантуркі. Пук сухое мяты ўткнуты быў у ваконца.

Адчуваючы слабасьць, яна драмала і ўсё думала. Вострая ўзбуджанасьць думак не давала ёй забыцца на ўсё ў моцным сьне. Юрка стаяў у ваччу яе, з чорнымі і нямытымі нагамі, сінявокі, шырокатвары, малы.

— Хоць-бы прыждаць, калі ён, як мае быць, узьнімецца на ногі,—сказала яна моцна і сама спалохалася свайго аслабелага раптам голасу.

Пасьля ўсё-ж ёй удалося заснуць. Спала яна больш гадзіны і ўстала пад самы вечар. Юрка распрагаў на дварэ каня, Мацьвей там-жа стукаў нечым і гаварыў з Юркам.

— Былі ў доктара?—запытаў Юрка, калі яна вышла на двор.

— Была.

— А што ён сказаў?

— Нічога. Казаў, што ўсё зараз пройдзе.

— Скажэце праўду.

— Дык праўда-ж.

Юрка весялей глянуў на яе і павёў паіць каня. Мацьвей падышоў да яе:

— Ну як?

— Казаў нічога цяжкога не паднімаць, цяжка не рабіць.

Мацьвей дзіка глянуў вакол.

— Нічога, тады папраўлюся.

Мацьвей нічога не сказаў і пацягнуў саматугам пустыя драбіны ў агарод пад грушы. Яна глянула на вуліцу і бачыла, як Юрка весела сьмяяўся з хлопцамі пад калодзезям. Такім-жа вясёлым ён прывёў каня дадому і такім быў усе наступныя дні.

Пагодлівыя і ветраныя-ж былі яны гэтыя дні. Два тыдні стаяла гэтакае надвор‘е. Увесь гэты час выбіралі бульбу. Мацьвеіха чула сябе лепш і была

на полі. Юрка гробся ў зямлі побач з ёю. Гаварылася нейк мала. Мацьвей моцна крычаў на каня, які ня мог браць цяжкіх вазоў.

Пыл узьнімаўся на прысохлай ральлі. Пылелі-ж і дарогі. І шумелі кусты.

Бульба была выбрана ў канцы другога тыдня. Надвор'е не зьмянілася. Здароўе-ж Мацьвеіхі пагоршылася.

Мікалай крываносы, прыходзячы вечарам з падзённае работы, гаварыў:

— Ня варта было табе, Наталя, на поле езьдзіць. Выбралі-б гэтую бульбу і без цябе. Што ты, Мацьвей, за чалавек. Каменнае сэрца ў цябе, халера цябе ведае. Дапраўды.

Мацьвей пачухаў шыю.

— Я і сам ня ведаю, што мне рабіць.

— От як прыдзе бяда, тады навучыць, што табе рабіць.

— Добра...

— Што добра... Да чаго ты гэта дапускаеш.

— Я-ж кажу, што добра... Кончана. Цяпер няхай ляжыць, няхай нічога ня робіць.

Мікалай яшчэ нешта гаварыў, але Мацьвей, каб ня чуць і каб забыцца на ўсё гэта, узяўся на двары за нейкую работу.

З таго дня Наталя ляжала. Дзень было ёй лепш, дзень было горш. І ўвесь час пагодлівым стаяла надвор'е. Пасьля некалькі дзён засаб было ёй горш.

— Ну, як вам?—пытаўся Юрка, даючы ёй адвараную бульбу, хлеб і паранае малако ў шклянцы.

— Мне добра, неўзабаве папраўлюся.

Юрка бег гуляць на вуліцу. Работы цяпер было яму менш. Ночы былі месячныя. У белай віднаце маўчала і пахла ўсё. І ўсё клікала радавацца дыхаць.

XV

Уночы конь вельмі чухаўся аб сьцяну і моцна грукаў нечым на ўвесь хлеў. Аж у хаце чуваць было Мацьвею ня спалася. Кагадзе ён даваў Наталі малако і пасьля таго ніяк ня мог заснуць. Варочаўся на сьвежым сяньніку і прыслухоўваўся да стуку ў хляве.

Месяц быў поўны і белы, дзьве лапіны сьвятла яго ляжалі ад вокан на зямлі, і ў хаце быў белы змрок.

Наталя была зусім слабаю; трэці ўжо дзень ёй было ўсё горш.

Юрка з Мікалаем спалі ў каморы разам.

Наталя застагнала, у хляве застукала мацней. Мацьвей устаў, ускінуў на плечы сьвітку і вышаў на двор. Маўчалі грушы каля суседняе сьцяны, пахла над імі вялая трава. Мацьвей увайшоў у цёмны хлеў і вобмацкам знайшоў каня. Конь усё дзёрся шыяю аб сьцяну і жолаб.

— Мала яшчэ, дык от кароста, мусіць, напала,— сказаў моцна Мацьвей,—і так падла была здохлая.

Пастаяўшы так трохі, ён пашоў назад і ўжо ў сенцах пачуў, як варушылася Наталя на сяньніку.

— Можа трэба што?—запытаў ён панурым голасам.

Ніхто нічога не адказаў.

— Наталя!

І ён запаліў газоўку. Падышоў да жонкі—яна выцягнулася ўся, шырока глядзела ў сьцяну над печаю, і рот у яе быў так, як ніколі, разяўлены.

Мацьвей зразу не зразумеў, пасьля-ж кінуўся да стала запальваць лямпу. І пакуль запаліў, Наталя захрапла разоў тры, і вельмі хутка кончылася. Мацьвей моцна застагнаў; на печы заварушыліся дзеці, тады ён раптам уцяміў усё становішча рэчаў;

аглядзеўся вакол, уссунуў на галаву шапку, вышаў на двор і замкнуў сенцы. Да Сабастыяна ісьці было недалёка. Ён пастукаў у вакно. З хаты пачуўся голас:

— Хто?

— Сабастыянка, братка, выйдзі сюды.

— Мацьвей?

— Але.

Сабастыян вышаў у сенцы.

— Памерла.

— Наталя?

— Але, кагадзе што.

Сабастыян выткнуўся на двор, паглядзеў на неба, на вуліцу, на новыя весьніцы і сказаў:

— Ты от што... Ідзі ты дадому і распараджайся там. Папрасі мыць, а выкапаць дол і зрабіць труну я паклапачуся. Як разьвіднее, я падыду. Неўзабаве сьвітаць пачне. Я зараз бабу прышлю сваю.

— Ну, але, зараз дзень нахопіцца.

Дома Мацьвей пабудзіў кватаранта свайго Мікалая. Юрка пачуў гэты нязвычайны клопат:

— Што?

— Нічога, ты сьпі сабе.

І Юрка заснуў. Мікалай пачухаў галаву і стаў усьцягваць на ногі боты.

— Усё ў іх у сярэдзіне паадрывалася,—сказаў ён.

— Дзе гэта?—запытаў Мацьвей.

— У ботах, няхай на іх паляруш, на нагу не ўсьцягнуць. Трэба хутчэй новыя спраўляць.

І яны ўдвух пачалі клапаціцца. У хаце ўжо Сабастыяніха грэла на комінку ваду. Мацьвей пазваў дзьвёх суседак, і Наталю пачалі мыць.

— Худая якая,—сказала Барановічыха, мочачы Наталі плечы.

— Гаравала, небарака,—адказала Сабастыяніха.

Трэцяя жанчына дадала:

— Ня дай божа. Дзеці засталіся дробныя, як боб.

І ўвесь час, пакуль абмывалі, гаворка ня спынялася:

— Гэта ні то што, як у каго пасьля сьмерці дзеці застаюцца дарослыя...

— Унь як Паўліха памерла, дык там дзеці, як той казаў, у крапіву не папаўзуць, а гэта ня дзеці, а гарох.

— Дый гарох пры дарозе, хто ідзе, той і ўскубне.

— Ну, дзякаваць богу, бацька-ж застаўся, у крыўду не папусьціць.

— Ат, гэты бацька сам заўсёды ў крыўду падаецца. Хлеба кавалка на стале ня мае. Ужывуць небаракі-дзеці гора бяз маткі.

— Яе, небараку, жывот часта хватаў.

— Гэта яшчэ ад першага дзіцяці. Не сьцераглася...

— Бо ня было пры кім і пры чым вельмі тут сьцерагчыся...

— А ён-жа не спагадае... Дый што мужчына ведае вельмі ў гэтых справах... Яму што...

— Раз ажаніўся—павінен ведаць!

— Ён то павінен, але каб яны гэтак жылі, як нягэта ім у галаве. Унь Мацьвей, здаецца, нязграбны, няздатны нейкі, а да Каршуковае Настасі пробаваў даходжваць, пакуль людзі не пачалі гаварыць.

— Ну, а твой Юлік! Дарма што кульгавы і дачку пара замуж аддаваць...

— Ну, а твой Костусь!

— Ну, і мой Костусь. Я гэта сама скажу, мы суседкі, разам-жа і гадаваліся, расьлі разам, гулялі некалі... Тут між намі можна ўсё сказаць...

І пакуль памылі, перагаварылі ўсё.

На дварэ хутка разьвіднялася. Юрка ўстаў і, не ўваходзячы ў хату, павёў пад калодзезь напаіць каня. Вярнуўшыся назад у двор, убачыў, як Мікалай разглядаў у агародзе дзьве рыдлёўкі. Мацьвей неўзабаве прынёс аднекуль трэцюю.

— Гэта лепшая,—сказаў ён,—я ў Юліка ўзяў. А гэта Сабастыянава—дрэнь. Капаць табе паможа Тамаш, я папрасіў...

— Няхай-бы ты Алеся папрасіў—гэты маладзейшы.

— Я думаю папрасіць Алеся, каб памог труну рабіць. Робіць яе Сабастыян з сваіх-жа дошчак, дзякуй яму, і толькі трэба яму на помач каго пазваць.

— Ну, вядома, хто-ж паможа, як ня брат.

Узышло асеньняе сонца, агарод і двор быў ясным і здаваўся прасторным.

У Юркі раптам нешта сьціснула за горла, дыхаць стала цяжка. Страшная загадка шавяльнулася ў ім. Ён, як стаяў, павярнуўся і роўна пашоў у хату. Спачатку, з торапу, нічога і не заўважыў. Толькі дзіўна было—чаму гэта цётка Сабастыяніха паліць у печы. Яна скварыла сала на вялікай скаварадзе. На палку, каля печы, сядзелі дзьве сястрычкі, прыціснуўшыся адна да аднае і, нічога не разумеючы, маўкліва глядзелі на цётку. Цётка-ж, расчырванелая каля агню, гаварыла ім:

— От зараз, дзеткі, я дам вам пасьнедаць картоплі з скваркамі. Вы любіце гэтую яду?

— Любім.

— А тады вы пойдзеце на агарод гуляць. Сёньня сьвеціць сонейка, цёпла будзе. Там жоўценькі пясочак у вас у агародзе насыпаны, будзеце сабе гуляць там, на сонейку, у зацішку.

— Мы і ўчора там гулялі.

— Будзеце гуляць сабе там... Пасьнедаўшы...

І раптам Юрка ўбачыў: на покуці, няпрывычна—чыста-адзетая, вялікая нейкая, белая, незнаёмая—ляжала маці. Ногі яе былі яшчэ босыя, але адзетая яна была ў той цёмны гарнітур, які надзявала на вялікдзень, калі ішла ў царкву або да дзядзькі Сабастыяна ў госьці. Твар быў белы і чуць зеленаватым здаваўся пад адценьнямі белае-ж хусткі на галаве. Дзьве асеньнія мухі поўзалі па гэтым новым твары; сонца ляжала на цёмным гарнітуры, пакідаючы твар у сіняватых ценях. І страшны неспакой, так нявыкананых жаданьняў і мэтаў—назаўсёды ляглі на твар страшнай застылаасьцю.

Юрка ўтаропіўся вачмі ў гэты нябачаны ніколі і неспадзяваны малюнак. Пачаў паволі падыходзіць да покуця, роўна, ня гойдаючыся ў бакі і ня ківаючы галавою.

І раптам з немым енкам кінуўся на яе босыя— такія бел'я, такія чыстыя ногі.

XVI

Гэтая гаворка адбылася ў тым-жа пустым, асьветленым сонцам, Мацьвеевым агародзе, дзе гулялі на пяску дзеці. Мацьвей сядзеў каля суседняй сьцяны на старым бервяне і глядзеў на драўляную барану, прыстаўленую да плоту. Кагадзе прыходзіў Алесь і сказаў, што труна гатова. Сабастыян прышоў з дому, убачыў у агародзе Мацьвея, падаўся да яго, сеў побач з ім, спусьціў вочы між сваіх кален у зямлю і сказаў:

— А я кагадзе дома каровам сечкі ўрэзаў, салому папалам з канюшынаю мяшаў... Пайдзі ты

цяпер вальнейшаю часінаю да папа, загадзя пагавары з ім, патаргуйся.

Мацьвей маўчаў.

— Скажы, што так і так, няма тут лішне з чаго вельмі даваць, папрасі, каб лішняга ня браў. Каб пабожаму... Ды ён і сам, праўда, ведае, што яму тут лішняе гаварыць. Не павінен і сам дорага браць...

— Не пайду,—панура перарваў Мацьвей Сабастыянаву гаворку.

— Чаму?

— Чорт яго пойдзе.

— Ну, а як-жа будзе?

— Няхай як хоча, так і будзе.

— Ты што гэта, з глузду зьехаў?

— А чорт яго ведае, ці быў яшчэ ў мяне той глузд. Можа тут ня было з чаго і зьяжджаць. Няхай яно, бог дасьць, выгарыць.

— Чаго ты праклінаешся. Нічога гэтым не паможаш.

— А ты мне парай чым памагчы.

— Не гарачыся. Будзь трохі халаднейшым. Халаднейшым будзь, я табе кажу. Будзь халаднейшым. Ідзі дагаварыся з папом. Слухай мяне.

— Ня буду я ні з якім папом дагаварвацца.

— А як-жа? Так?

— Як будзе, так і будзе. Нейк-жа будзе.

— Без папа?

— Няхай сабе і без папа.

— І бяз крыжа? Без царкоўнага звону? Як нехрысьць? Як жывёліна якая? Як не чалавека, не раўнуючы, ліха ведае што?.. Ты рад, што яна памерла? Азіят ты! Ты якога-небудзь пуда жыта ня хочаш на яе ў апошні час патраціць! Гэта-ж ужо апошні раз. Разумееш?.. Апошні раз!

— Нічога не памагло ёй жывой, не паможа і памерлай.

— Мацьвей!..

— Ніхто не памог ёй жывой, ніхто не паможа і няжывой.

Сабастыян пільна агледзеў халодныя рысы Мацьвеевага твару і павольна пачухаў калена. Устаў і пашоў да папа. Зьбіраліся людзі. Алесь з Тамашом прынесьлі труну. На дварэ неўзабаве стала цесна і шумна. У хаце Юрка не адыходзіў ад мацеры і ня мог ніяк выплакаць усіх сьлёз сваіх. З самага ранку ён усё стаяў тут, калаціўся ў немай роспачы, і нясупынныя сьлёзы яго былі то ціхімі, то бурнымі. Босыя ногі яго былі, як і заўсёды, непамытымі, у засохлай зямлі. Сабастыяніха цішком падышла да яго:

— Ідзі абуйся, сынку, зараз у царкву за маткаю пойдзеш.

Ён маўчаў, нічога не зразумеўшы. Тады яна раптам успомніла ці здагадалася, што ў яго няма чаго абуць на ногі. І яна сказала:

— Памый, сынок, ногі, я табе нальлю ў ночвы вады, а то нядобра ісьці ў царкву з такімі бруднымі нагамі.

Ён паслушна пашоў у камору, пабоўтаў трохі нагамі ў вадзе, абмачыў унізе калошы палатняных портак сваіх і ня мог сабраць сваіх думак аж да самае ночы. Толькі, як ішоў ён за труною ў царкву, перадвячэрняе паветра трохі асьвяжыла яго. Ён пачуў, што баліць галава. Ён некалькі разоў выходзіў з царквы і назад ўваходзіў. І ў гэты час пачала ажываць і вырастаць у ім пачуцьцёвая сьвядомасьць, што жыве ён сярод усіх гэтых людзей адмысловым нейкім, асобным, напружаным жыцьцём. Бачыў ён, як бацька стаяў

каля прытвору, з халоднымі рысамі твару, чуў, як кум Юліка Барановіча стукаў ботамі, узлазячы на званіцу, і як пазваніў трохі ва ўсе званы. Пасьля, зьлезшы з званіцы, падышоў да натоўпу мужчын каля цьвінтарнае брамы і гаварыў пра нейкія папары:

— У нас папарцы смачныя, так што нам ня трэба балота пускаць пад пашу. Нам сена, тымчасове, патрэбна.

— Папароў мала і нічога ты на іх не пасееш,— чуўся голас Тамаша.

— Папароў мала? Можна зрабіць, каб было больш. Пад жыта, тымчасове, добра.

— Нічога ня добра.

— Я вам, мужчыны, скажу, што запусьціўшы папарэц, ды, тымчасове, калі бог дасьць здароўе...

— А Алеся няма,—сказаў нехта з мужчын,—у царкву нават і носа ня ткнуў.

— Ён-жа труну рабіў.

— То, што, што рабіў. Мог-бы падыйсьці разам з усімі, як-бы яму самому ніколі не давядзецца ўміраць.

— Куды ён табе, пойдзе. Комуністыя ў царкву ня ходзяць. Ня маюць, тымчасове, права. У іх такі закон, калі пашоў раз у царкву, выкідаюць, значыць, з гэтага іхняга цэху. Ня можна! Тымчасове, як-жа ён табе пойдзе. Труну—дык ён памог зрабіць. Гэта, дык нічога—гэта ў іх можна... Тымчасове, зараз трэба лезьці будзе на званіцу, на вечную памяць пазваніць.

— Кажуць, што Мацьвей не хацеў у царкву нясьці, так хацеў пахаваць.

— Ну, але, не хацеў, гэта ўсё Сабастыянаў быў клопат, а яму мала гэта абходзіла. Сабастыян сам

казаў. Не памог ёй,—кажа,—ніхто жывой, не паможа ніхто ёй і памерлай. От як!

— Хто яго тут разьбярэ, можа яно трохі і праўда. Ёй ужо ўсё роўна, як ты па ёй не сьпявай і куды ты яе не нясі.

— Ну так, але для людзкога вока патрэбна-ж нешта, каб было. Як-жа ты так пахаваеш, бяз нічога, узяў ды закапаў, як жывёліну якую. Гэта-ж табе чалавек.

— А калі чалавек грэшны, то трэба-ж, тымчасове, памаліцца.

— Якія там у яе грахі! Адкуль яны ў яе?

— Добра кажа, адкуль тыя ў яе грахі.

— Чаму, усякі чалавек грэшны. Няма нікога без граху.

— Ат, хто яго ведае, што тут грэх, а што не. Разьбяры тут.

Кум Юліка Барановіча раптам зноў загаварыў пра гаспадарскія справы:

— Тымчасове, я зноў пра гэтыя самыя папарцы. Яны ў нас такія, што пашы з іх павінна хапіць— уг-га! На чорта нам гэтыя выдумкі—папары заўсёды былі, і нашто гэтую моду ўводзіць, каб без папароў заставацца... Што галава—то розум. Яны хочуць давесьці гаспадарку чорт ведае, тымчасове, да чаго. Сказаць, поле добра ты вырабляй, угнойвай яго, не лянуйся, дык радзіць будзе. Я сам нажынаю, тымчасове, жыта—на маю сям'ю даволі. А ёсьцека людзі, што і пабольш поля маюць. Нашто тут лішне мудрагеліць. Хто гэта выдумаў, каб папары зводзіць?.. Калі ты добры, я-ж кажу, гаспадар...

— Ну, а калі не гаспадарыцца—усё з рук валіцца.

— Чорт яго ня возьме, ня валіцца ўсё з рук. Не выпускай з рук, калі яно ў цябе валіцца.

— А калі ня ўтрымаць? Унь Мацьвей, жонку на гэтым сьвеце утрымаў ці не? Утрымаў?!.

— Ну, бо тут гэта суджана. Што суджана, тымчасове, чалавеку, то тут нічога чалавек не парадзіш. От што! Гэта, як сьвет сьветам і бог богам, дык гэта заўсёды было і будзе.

— Ну, а калі-б ён жонку вылечыў, то як-бы тады з гэтым суджаным было? Як-бы тады з ім?!.

— Ну, то тады, значыць, было-б суджана яму вылечыць яе. На паправу тады-б усё пашло-б у яе... Дык памятайце, мужчыны, што няма нам тут лішне чаго чыіх галоў слухаць—папары павінны быць, як і былі. Як табе, Тамаш, здаецца?

Тамаш нічога не адказаў, прадзьмухаў вішнёвы свой папяросьнік і закурыў.

— Што ты Тамаша чапаеш, Тамаш у комуністыя сам думае зараз падавацца. Ён нанава зараз гаспадарыць пачне. Яшчэ ажаніцца гатоў.

— Што мне, колькі там мне засталося пажыць. Ты ведаеш, колькі мне ўжо гадоў?

— Можна, тымчасове, дагадвацца.

— Ну, от-жа. То што ты маеш да мяне?

— Нічога. Што мне да цябе мець. Жыві сабе на здароўе.

— Я і жыву.

— Добра робіш. Адно не баламуць лішне сьветам.

— А што я дзе баламачу?

— З Алесем разам баламуціце. Таварышы, тымчасове, знайшліся! Можна сказаць—аднаму жаніцца пара, а другому ўміраць. Хэ-хэ! Фацэцыя дый годзе. Тымчасове, усялякія перарэзкі і перамеркі—гэта-ж з вас усё сьвет гарыць.

— Папытайся, што Мацьвей на гэта скажа.

— Мацьвею гэта можа выгадна. Што ён згубіць?! У яго ўсё роўна ня родзіць. І радзіць ніколі ня будзе, бо ён такі гаспадар.

— Які-ж ён гаспадар?

— Нядбайны.

— Нядбайны? Памагчы яму трэба, тады ўсё яго нядбайства ліха ведае куды дзенецца. Пасадзі цябе на яго месца,—пабачым, як ты тады паскачаш. Папрабуй.

— Я да гэтага не дапушчуся, каб ты і хацеў.

— Каб я хацеў? Я хачу?

— А хто цябе ведае, што ты, тымчасове, думаеш.

— Я думаю тое, чаго табе ніколі ня думаць.

— Які ты ўжо думальнік вялікі!

Тамаш адвярнууся і пачаў глядзець цераз паркан на вуліцу.

— Ты думаеш! А хто дык ня думае. Ты адзін за ўсіх думаеш. Дзякуй табе.

— Спажывай на здароўе.

— Ты ўсё аб нечым дбаеш. А ў самога боты на нагах—адны чарапкі. Як ты іх на ногі ўсьцягаеш. А ўсё думаеш, а ўсё дбаеш, я-ж кажу, тымчасове, аб нечым... Яшчэ ён вучыць будзе некага, як жыць! І без цябе пражывом. Спраў боты хаця сабе... Тымчасове, гэта ўсе людзі скажуць... Ты ўсё спадзяешся нейкага дабра, усё дбаеш, гаворыш... Чалавек!

Тамаш раптам адарваўся ад паркану:

— Дабра?! Дбаю?! Кажаш боты пашыць!?. Я можа іх і не пашыю, можа і Мацьвей не пашые, а хлапчук яго, што унь босы за няжывою маткаю ў царкву прышоў—той пашые. І такія боты, пра якія ніхто з нас ніколі і ня сьніў. Чуеш?.. Пашые!

Шкада, што не дажыву, хоць паглядзець на яго тыя новыя боты... Не дажыву...

— Ну, пэўна, калі заробіць на боты, дык і пашые. Падрасьце, заробіць,—чаму!

— Не дажыву да тых яго ботаў. Стары я чалавек... Не дажыву... Ай, не дажыву! А пасьля мяне, пасьля нас—у добрых ботах будуць людзі хадзіць... Жыць будуць!..

І Тамаш пашоў паволі па цьвінтары да брамы, пасьля ўбачыў Юрку, які пашоў з-пад брамы ў прытвор, і сам застаўся стаяць каля ганку. Юрка як-бы паспакайнеў і стаў халодным і маўклівым.

Труну хутка паставілі на воз. Барановічаў кум зноў трохі пазваніў, Сабастыян з Мацьвеем і Юркам селі на драбінах на аглабіны, Сабастыянаў конь пашоў размашнымі крокамі.

Заходзіла сонца, як яны апускалі труну ў зямлю. Крываносы Мікалай чакаў каля выкапанай ямы.

— Выгаладаў?—запытаў Сабастыян.

— Але,—адказаў Мікалай,—нічога... Таго, другога, я даўно адправіў.

— На пахаваньні быў.

Рэшту часу яны маўчалі. Моўчкі апусьлілі труну ў зямлю. Першая рыдлёўка пяску стукнулася аб новае века цяжка і гулка.

Заходзіла сонца, маўчалі могілкі, сінела і туманілася асеньняя трава. Зелянілася трава пад асеньнім сонцам. Позьняе зельле цьвіло ў позьнюю восень.

Юрка бачыў, як засыпалі труну.

Крываносы дзядзька Мікалай утомлена кідае зямлю; засопся і з натугай паглядае пад ногі свае. Таксама павольна б'е рыдлёўкаю ў зямлю дзядзька Сабастыян. Бацька нешта заклапаціўся каля каня, каля пустое фурманкі. От яны ўсе зьліваюцца ў

адно—варушацца, дзейнічаюць, нешта падначальваюць, некаму падначальваюцца...

От яны ўжо селі на воз, на памятую, пацёртую салому. Чакаюць яго—малога, маўклівага. Ён-жа глядзеў, як яны клалі на воз рыдлёўкі... Падышоў да насыпанага над зямлёю жвіру, як стары аглядзеў яго, і кінуўся на яго тварам...

Пахнуў пясок і трава каля яго, і восень, і зямля.

Як-жа яна пахла—зямля!

ЧАСТКА ДРУГАЯ

I

Усё ў тым-жа самым школьным будынку зьбіралася некалькі чалавек. Алесь на ячэйку пазваў Тамаша і настаўніка. Тамаш запазьніўся. Настаўнік—васпаваты і востраносы чалавек, худы і высокі, нэрвова паварушваў праваю палавінаю твару і, цярэбячы на галаве „вожык“, гаварыў Алесю:

— У горад хачу паехаць на які тыдзень, праветрыцца трэба, ды не прыбяруся ніяк. Гаспадарка заядае... Заядае... Гарбузы палажыў на страху, кожны дзень зьнімаць іх наноч часу няма і ахвоты, больш тае работы будзе, як тых гарбузоў. А так, дык падпільноўваць трэба, а то пазвалакаюць уночы са страхі, і прапала ўся мая, так сказаць, гарбузовая політыка.

— Політыка?

— Політыка. Я мяркую—высьпяліць гэтыя гарбузы—р-раз...

Пры слове „раз“ настаўнік пальцам правай рукі прыгнуў самы меншы палец на левай руцэ.

— ... Пасьля гарбузоў—у мяне другое: пудоў шэсьць з агароду аўса будзе, гэта два. З дзьвёх яблынь будзе трохі яблык, гэта тр-ры. З гэтага месяца пачынаю адкладаць па чатыры рублі з пэнсіі—гэта чацьвертая даходная стацьця. Цяпер, каб як вынайсьці пятую якую, так сказаць, даходную стацьцю. Каб як, хоць на рублёў дванаццаць ад-

шукаць, дык да новага году льга было-б паліто справіць. Чацьверты год зьбіраюся... Дык трэба гарбузы сьпяліць, жонка паехала да радні... А гарбузы, не падпільнаваўшы, прападуць. З агароду яшчэ пробавалі іх цягаць дзеці на гарбузікі... От як... Можа пачнем, а то я яшчэ думаю да вечара капусту ў агародзе пазрэзваць.

— Павінен прыйсьці Тамаш зараз.

— Вы бачылі сёньня яго?

— Сягоньня.

— Дома ў яго былі? Можа паслаць каго?

— Дома. Прыходзіў, а ён сядзіць на парозе і ногі чухае. Моцны стары. Здаровы.

— Здаровы?.. Ён не здаровы. Зусім не. Гэта, так сказаць, здаецца толькі. Затым што ён рухавы такі. Ён, так сказаць, як грыб стары, які ў сярэдзіне згніў увесь, а толькі зьверху здаецца цэлым і нечарвівым. Ён-жа зусім стары. Я год дзесяць, як сюды пераехаў, дык як і запамятаю—ён усё такі рухавы і сіваваты... Усё з сваім вішнёвым папяросьнікам... І ўсё босы, з падвязанымі калошамі. Ходзіць і глядзіць на ўсё, як-бы чаго дзе забыўшыся. Я яго адразу заўважыў тут. Знакаметны нейкі чалавек... Твар у яго такі.

— Мы то можам і не чакаць Тамаша. Пагаворым з вамі, давайце цяпер...

— Я слухаю.

— Гэта яна ў нас па гэтых справах.

Алесь паглядзеў на востраносую дзяўчыну. Дзяўчына падыйшла да іх.

— Я слухаю,—зноў сказаў настаўнік.

— Мы думаем вас скарыстаць для аднэй справы.

— Для якое?

— Каб вы загадвалі рэпэртуарам. Каб п'ес добрых маглі адшукаць. А то ўсё ў нас выпор-

ваюць застарэлыя—з порахам, з вінтоўкамі. Трэба якую-небудзь новую п'есу, каб з людзьмі...

Настаўнік раптам ажывіўся:

— Ага, з людзьмі? Вітаю, гэта, так сказаць, пачынаньне. Патрэбны жывыя людзі, а ня порах. Порахам чалавека не падменіш. Порахам, так сказаць, чалавека можна зьнішчыць, а каб паказаць яго жывога, дык гэта куды цяжэй. Тут патрэбна культура. Культура патрэбна! І гэта самае важнае, што мы ўжо загаварылі пра гэта. Сам-мае важнае, таварышы. У нас, так сказаць, гэтай культуры ня было. Калі можна так выказацца, мы адмаўлялі культуру. І, нарэшце, мы зразумелі. У нас заўсёды так—мы можам зразумець толькі нарэшце. І добра хоць гэтак... Нарэшце! Што значыць гэтае нарэшце? Гэта значыць, пасьля таго, як мы ўбачылі, што нічога ня выходзіць, што трэба ўзяцца за культурнае выхаваньне...

Востраносая перабіла яго:

— Раней нам трэба было замацаваць пазыцыі.

— Не спрачаюся. Трэба было. Але занадта пораху ў нас там, дзе яго зусім ня трэба. Порахам чалавека ня выхаваеш. Гэта павінна быць ясна, як два ды два, так сказаць, чатыры. Вы мне выбачайце, я праз хвілін пятнаццаць вярнуся—залажу пайду разгародку ў плоце—баюся, каб гусі капусты не папсавалі.

Ён некалькі разоў засаб варухнуў палавінаю твару і вышаў. Востраносая дзяўчына адышлася да вакна. Алесь пашоў за ёю. Пусты агарод і за ім іржышча—былі перад вакном. Вуліца рабілася палявою дарогаю і ішла пад гору. За агародам сірацела капліца. Неба было чыстым і высокім. Дзяўчына глядзела на сінія істужкі далёкіх лясоў.

— Чаго ты сумуеш, Волька?

Алесь стаяў поплеч з ёю, усьпёршыся локцямі на адчыненае вакно.

— Чаго-ж мне сумаваць.

— А хто цябе ведае... Ты нейкая невясёлая, ці як сказаць...

— Так сказаць, як гаворыць настаўнік Цімашук,—пажартавала яна, сумна ўсьміхнуўшыся.

— Не, ты скажы, чаго ты сумуеш?

— Я сама ня ведаю, ці гэта я сумую, ці гэта так я... Нешта ўсё... Ліха яго ведае... Сама ня ведаю...

— А хто ведае?

— Можа і ніхто ня ведае.

— Скажы, дык от я ведаць буду.

— А нашто табе ведаць.

— Ты што, закахалася ў каго, ці як?

— Ні то што закахалася...

— Ну, а як-жа?

— Так нейк... Нашто ты дапытваешся?

— Ну то я ня буду.

Некалькі хвілін маўчалі. Волька задуменна вадзіла пальцам па ваконнай шалёўцы. Пасьля сказала, ня гледзячы на Алеся:

— А як у цябе справы з Барановічаваю Ганнаю? Ты-ж яшчэ вясною гаварыў, што будзеш жаніцца?

— Я і сам ня ведаю, якія ў мяне з ёю цяпер справы.

— Каханьне прапала?

— Не, яшчэ больш. Вось-жа і бяда ўся ў гэтым.

— Яна кахаць пакінула?

— Нічога ня ведаю. Не магу разабраць, што з ёю робіцца. Са мною, здаецца, такая сама, як і была, толькі часам.. як калі...

— Я чула трохі. Гаворкі ходзяць. З каморнікам гуляе яна цяпер вечарамі. Ты яе даўно бачыў?

— Дзён чатыры ня бачыў.

— Дурны, чаму-ж ты так. З дзяўчынаю ня можна ніколі так. Каб каморнік хутчэй выехаў, тады-б усё і скончылася. А цяпер ты, калі ня пойдзеш нейкі час, дык горш будзе. Таго яна ня любіць, а мусіць падабаецца ён ей. А гэта самае страшнае ў яе гады, калі хто ей падабаецца. Год праз пяць яна пачне любіць іначай, а гэта ў такім узросьце, яна сама ў сабе разабрацца ня можа. Ты толькі ласкавым будзь з ёю, каб яна аж раставала пры табе.

— Дзякуй, сястрыца, за навуку.

— Ты ня сьмейся. Я такую пору перарасла, я ведаю. У такім узросьце—чорт яго ведае, што робіцца. Калі і цяпер...

— Калі і цяпер сумуеш каля вакна.

— Чаго ты ўсё жартуеш.

— А што-ж мне, плакаць?

— Плакаць ня трэба, але чаму ня быць трохі далікатнейшым.

— Ты выбачай, я-ж сам, кагадзе, гаварыў табе аб каханьні... Дык чаго ты сумуеш? Ты скажы выразна, патаварыску.

Волька пільна паглядзела яму ў вочы і, падумаўшы, сказала:

— Каханьня хочацца... Каго-небудзь кахаць хочацца.

— А каго, ня ведаеш?

— Ня ведаю. Выразна—нікога няма. Так пачуцьцё каханьня мучыць. Разумееш ты гэта? Ведаеш?

— А ты каго-небудзь кахала калі?

— Кахала... А можа і не. Прайшло. Дык цяпер і разабрацца цяжка—ці гэта каханьне было, ці гэта так. Можа і каханьне... Усё праходзіць...

А калі ўсё праходзіць, дык можа і каханьне гэта было.

Чалавекі тры сядзела на ганку і чуваць былі іх галасы. Тамаш прышоў позна, калі ўжо ўсім надакучыла чакаць яго. Ён быў у новых ботах і трохі захмялелы. І гаваркі:

— Ты, браце Алесь, выбачай...

Пасьля зьвярнуўся да Волькі:

— Выбачайце і вы.

Памаўчаў і адвёў Алеся ў бок:

— Я табе, браце, раскажу, як гэта ўсё было. Зроду на мяне ніхто ніколі не чакаў... Доўга мяне чакалі?

— А так, нішто.

— Ну от бачыш... Прынёс боты Хоняў швагер. Я яму казаў—калі, кажу, пашыеш боты добра і за тры дні (каб я, значыць, босы не хадзіў доўга), дык барыша пастаўлю. Я думаў, што ён і да барыша такі самы нядбалы, як і да ўсяго. Аж ён узяў ды пашыў, як на тое ліха, пастараўся. Так дык ён шые боты тыдняў два, а я думаю, калі скажу яму пра барыш за тры дні, дык можа за якіх дзён дзесяць пашые. А тут от як— ты толькі ў мяне з хаты пашоў, аж ён—тыц у хату з ботамі. І добрыя боты пашыў. Дык я і паставіў барыша. А пасьля сон мяне змарыў, я лёг і заспаў, прызнацца. Прачнуўся, бачу вечарам пахне... Бач, якія галоўкі прышыў. Добры тавар. Надточкі падаваў. А халявы старыя, але моцныя. Будуць насіцца, чорт іх ня возьме... І пашыў зграбна. Бачыш?

Астаткі хмелю ў яго шпарка прападалі.

На сходзе было сем чалавек. Настаўнік і тут ня мог ніяк згуляць, ён стаяў каля адчыненае шафы

і парадкаваў кніжкі. Пасьля сходу Тамаш чуў у сабе нездавальненьне нейкае.

Ужо разышліся ўсе, толькі Алесь ды Волька засталіся, як ён сказаў Алесю:

— Стары, браце, я зусім.

— Бачу, што не малады.

— Дык я да таго гэта гавару, што цяжка мне жыць на сьвеце цяпер. Як быў я малодшым, дык— недастачы якія—гэта для мяне ноль, можна сказаць. Еў я, ці ня еў, але вясёлы і моцны. А гэта сёньня ад трох чарак гарэлкі з ног зваліўся... Можа-б мне ў гэты камітэт ня ўлазіць. Усім не ўнаровіш, на старасьці год ворагаў сабе нажываю...

— Наравіць усім і ня трэба...

— Нажываю сабе ворагаў. Каля царквы, як Мацьвеіху хавалі, дык мяне аж лаяць пачыналі...

— Няўжо ты, дзядзька Тамаш, здрэйфіў?

— Не, браток, ня здрэйфіў, але...

— То ты-б, дзядзька, і гаварыў проста, што табе не пад сілу займацца гэтымі справамі, што адпачываць табе трэба...

— Ні то што адпачываць, і ні то што я ня здолею, чаго там, але, ліха яго ведае, думаў, што на старасьць прычакаю чаго лепшага.

— А хто з тваіх таварышоў...

— Ведаю, што хочаш сказаць. Усе гэтак... Нішчымніцаю ўвесь век душыліся і—той памёр, а той...

— Ты, дзядзька, усялякую веру згубіў і ў сябе і ў людзей.

— Ня згубіў я...

— Памятаеш, як мы ўсё мястэчка ўзварушылі на перамер зямлі. Колькі ворагаў мы нажылі?.. А гэта да канца падыходзіць перамер гэты і неўзабаве нам-жа дзякаваць будуць.

— Будуць, гэта правільна.
— Само-ж нічога ніколі ня зробіцца. Нічога не рабіўшы, дык так і пасьля нас будзе ўсё гібець век.
— Не гавары ты мне гэтага. Што ты мяне, як малое дзіця, угаворваеш. Я стары чалавек, і раз я прыстаў да вас маладых...
— Я нічога дрэннага не падумаў...
— Я не кажу, што ты падумаў... Я казаў каля царквы, як Мацьвеіху хавалі, казаў усім, што мы не дажывом, можа, а Мацьвеяў хлопец некалі ў добрых ботах хадзіць будзе. Добра будзе жыць некалі. Я згубіў веру? Што я не працую!?
— Табе, дзядзька, адпачыць трэба, гэта відаць.
— Магу і не адпачываць. У труне неўзабаве адпачну.
— Што цябе, дзядзька, за думкі сёньня апанавалі?
— Крыўда ў мяне сямейная. Калі я сёньня паставіў барыша Хоневаму гэтаму швагру, дык і дачка і сын, як выходзіў з хаты сюды ісьці, аблаялі мяне за гэта, збэсьцілі. От што. Ты ня ведаеш гэтае крыўды. Некалі ўведаеш.
— Можа і ня ўведаю. Як буду я старым, тады людзі жыць будуць іначай.
— Можа і ня ўведаеш. А ў нас цяпер народ жыве,—божа мой, міленькі! Страхоцьце, а ня жыцьцё... Колькі гэта ўжо будзе год, як твой бацька памёр?
— Чатыры гады.
— Я от табе хачу ў вочы сказаць. Быў твой бацька рамесьнікам, пражыў век—і калі ён дабро тое бачыў? От ты мне што скажы. Я табе скажу адкрыта. Мы тут мераем зямлю, камітэты гэтыя, значыць, робім, каб памагаць каму трэба, я нават стары ў гэтую кашу ўмяшаўся...

— Шкадуеш, дзядзька?

— Не шкадую, дай ты мне сказаць... Дык от робім усё, стараемся, каб як найлепш, і будзе лепш, аднак-жа от, скажам, сын мой ці дачка—усё роўна будуць грызьці мяне, як іржа жалеза, хоць каб і прычакалі мы найлепшага ўсяго. Што ты іх, перародзіш нанава, ці што?

— Самі тады перародзяцца.

— Можа і перародзяцца, хто яго вѐдае... Вам, маладым, відней... Я, дык хто яго ведае, я-ж кажу... Галава мне баліць, выпіў, лёг, заснуць не заснуў, адно сон перабіў... Цьфу... Няхай яно, дасьць бог, праваліцца скрозь зямлю...

— Што?

— Ды от усё. Дома мяне вылаялі дзеці, вакол усе, як на воўка пазіраюць...

— Страшна?

— Ні то што страшна.

— Ну, дык што?

— Ня страшна. Не. Весела, як мы гэта аруем. Зямлю ўсю перамерылі, увесь, можна сказаць, народ узварушылі. Толькі што от стары я. Эх, браток-жа ты мой, каб я быў малодшы. Каб мне хоць год дзесяць назад вярнуць. А-я-яй! Родненькі мой! А то, ты думаеш, я доўга пажыву на сьвеце?

— Невядома.

— Што ты мяне, як малога, цешыш?

— На цябе сёньня, дзядзька Тамаш, найшло нешта.

— Нічога на мяне не найшло. Так гэта ўсё. Бывае гэта ў чалавека; у думкі лезе ўсё... Жаніцца ты зьбіраешся?

— Ня ведаю і сам.

— Можа ня хочаш ты пры Вольцы гаварыць?

— Я і ёй, кагадзе, гэтае самае казаў.

— Дурыш ты, хлопча. Я табе казаў і кажу, ня траць сілы дарэмна, бяры хутчэй дзяўчыну якую сабе. Бяры ды жыві здароў. Дзівак ты, чаго ты чакаеш. Я табе яшчэ раз кажу—упусьціш ты з рук Ганну, а тады за хвост ня зловіш. З дзяўчынаю ня можна так кошкацца... З дзяўчынаю—ня сьпі ў шапку. Жаніся, ды от пакуль яшчэ я жыў, дык мы з табою справаў наварочаем... Я от усё пра алейню думаю, няўжо мы яе не скляпаем?.. Жаніся, ды дзяцей гадуй...

Раптам Тамаш памаўчаў з хвіліну і заклапаціўся.

— От разышліся ўсе, забыўся я сказаць перад усімі.

— Што?

— Чаму гэта ніхто гэтае плоймы ня ўніме.

— Якое плоймы?

— Урвіцеляў гэтэх, комсамольцаў. Яны, праўда, ня ўсе такія, але ёсьць, што каб на іх паморак, каб на іх. Унь гэты Валька, пярвейшы басяк, фулігант, а ўсім запраўляе. Я яго так-бы заправіў, што ён назад ня выбраўся-б ніколі... Ён гэта з табою, здаецца, Волька, цягаўся пазаўчора вечарам па прысадах... Нашла з кім валачыцца, сталая дзяўчына. Ты, канешне, на мяне можаш і злавацца, але, Волечка ты мая родненькая, ці табе з ім хадзіць...

Ён памаўчаў.

— Алейню, дальбог, зрабіць трэба.

— Трэба.

— Ты от адно ў гаворцы—трэба ды трэба, а ніколі нідзе слова пра гэта не закінуў.

— Раней з зямлёю скончым.

— Скончылі ўжо, колькі там засталося. Ён-жа і выяжджае гэтымі днямі, каморнік гэты. У нядзелю паедзе... Ты от глядзі, каб ён тваe дзяўчыны не павёз з сабою, ты глядзі. Што ты за хлопец, яй-богу... Я пайду.

Тамаш вышаў і каля самага ганку, на вуліцы, спаткаў Барановічавага кума. Той гнуўся, нясучы на сьпіне напакованы нечым мяшок. Моцна ступаў зьвязістымі нагамі.

— Што ты гэта валачэш?

— Капусту ад бацюшкі.

— Гэта табе бацюшка капусту дае?

— Гэта я яму памагаў высякаць.

— А-а-а, гэта ты яму памагаў высякаць, значыць.

— Але, памагаў... А ты што тут рабіў у школе?

— А гэта быў сход, каб алейню зрабіць сваю.

— Ну і што?

Тамаш хітра прыжмурыў вока і зьнячэўку спалохаў Барановічавага кума:

— Па рублю з хаты, і будзе алейня.

— Гэта ўжо напэўна?

— Як два ды два—чатыры.

— Гэта каму алейня гэтая патрэбна, табе?

— І мне таксама патрэбна, думаеш адно табе?!

— Начорта яна нам, тая алейня. Калі ў каго які з гарнец канапель ці семя ёсьць, дык ён выцісьне якую бутэльку алею і ў Тадулічах. Завязе і выцісьне. Колькі нашаму народу таго алею патрэбна.

— Нічога, будзем пабольш алею гнаць.

— Як ты ўжо, ліха табе, алею захацеў? Мала табе, не наеўся. Яшчэ па рублю з хаты! Дакуль ты будзеш круціць сьветам? Чалавек. Пражыў ты век, і нашто табе на старасьць тая алейня. Колькі табе таго алею трэба!

Пасьля, як Тамаш мінуў яго, ён паставіў мяшок ня зямлю, падапёр яго каленам, высмаркаў нос і сказаў:

— Каб цябе чэрві, бог даў, елі гэтакага чалавека, як ты гэтага алею не наеўся за ўвесь свой век. Па рублю з хаты, жартачкі!

І, увайшоўшы ў свой двор, яшчэ паглядзеў, як Тамаш, далёка ўжо, ішоў вуліцаю, у такт крокам варушачы шырокімі плячыма сваімі.

Пачынаўся вечар. Тамаш пашоў у прыгрэбку і да цямна ўсьпеў яшчэ павысыпаць з мяшкоў у пограб бульбу. Змрокам ужо вышаў ён за гумно на агароды, пазабіраць калкі з разгароджанага плоту. Ледзьве прыметная плынь паветра з паплавоў абвеяла яго лёгкім холадам. Ён скінуў шапку і правёў пальцамі ў густых валасох сваіх. Моцна харкаючы і адплёўваючыся, пашоў назад. Галава пакінула балець і сплываў цяжкі настрой, што быў днём. Балелі ногі, трохі муляўся ў пальцы левы бот, але ўсё адчувалася лёгкім. І ўжо ня думалася аб сваёй старасьці.

— Дзе гэта калкі з-за гумна падзяваліся?—запытаў сына, уваходзячы ў адчыненыя сенцы.

— Я ў прыгрэбку пазносіў,—адказаў той панурым басам і падцягнуў угару высокія халявы ботаў, стараючыся, яны каб былі вышэй кален. Халявы зараз-жа зноў аб'ехалі ўніз.

— Куды-б тут пайсьці, хіба да Алеся,—сказаў Тамаш, калі павячэраў.

— Знайшоў таварыша,—адказала нявестка,— да Алеся ён пойдзе. Патрэбен ты Алесю. Той да дзяўчат пэўна недзе пашоў. Будзе цяпер Алесь дома сядзець!.. Да Алеся ён пойдзе!

— Ты мне ня ўкажаш куды ісьці,—абазваўся Тамаш.

Вышаў на вуліцу і не сьцярпеў:

— Каб на яе немач, на гэтую кабеціну, от заўсёды, ліха ёй, душу сапсуе.

II

Яшчэ завідна Алесь прышоў дадому. Маці сядзела каля вакна і латала кашулю. На ложку сядзела Барановічыха і расказвала, як Хоняў хлопец быў ускочыў у цэбар з лугам і не апарыўся толькі затым, што луг быў халодны. У хаце цямнела. Каля печы задзіраў галаву певень і раз-по-разу сьпяваў.

— На перамену надвор'я певень сьпявае,— заўважыла Барановічыха, і зноў расказвала пра хлопца і пра халодны луг.

Сагнуўшы левае плячо, у хату, бокам нейк, увайшоў старац. Яшчэ па дарозе пачаў сьпяваць:

Пакрый, госпадзі,
Зямлю травою,
Мора вадою,
Рыбу лускою,
Неба зорамі,
А чалавека шчасьцем...

І раптам перарваў сам сабе:

— А-а-а, добра ваш певень сьпявае.

— Нішто сабе сьпявае,—адказаў Алесь.

Старац сьпяваў далей, таксама перарываючы сябе:

Памяні, госпадзі,
За галоснымі званамі,
За яснымі сьвячамі...

— Мусіць галагуцкага заводу ваш певень?..

За бажасьцьвеннымі імшамі,
За добрымі душам...

— Ці няма ў вас кіслае стравы?

Каб іхнія душачкі адпачывалі,
І каб усім жывым шчасьце прыгукалі...

— Гэта што луг быў халодны, ня мог ён бяды сам сабе нарабіць, ускочыўшы ў яго. А от у Астраўку была штука—дзяўчына лыткі апарыла...

І каб таму злыдню памерці,
Хто ня мае бога ў сэрцы.

Тут ужо Барановічыха перарвала яго песьню:

— Ну і што-ж было з тэй дзяўчынаю?

— Нічога. У бальніцы пакачалася трохі, а пасьля ўсё зажыло... Апарыць, дык апарыла, можна сказаць, ніштавата, да самых цягляў заняло... Ці няма ў вас кіслае стравы?

— Ёсьць.

— Ці ня ўлілі-б мне, калі ласка ваша, сербануць з лыжку якую?

— Пачакай, я зараз увальлю.

— А ці ня пусьцілі-б пераначаваць?

— Начуй.

— Няхай вам пан бог пашле збавеньне, шчасьце і долю, каб вымелі заўсёды тое, чаго самі ад бога найвышшага хочаце... Тут у аднэй хаце мяне прагналі—няма чым, кажа, дарыць, няхай твая торба згарыць. Усялякія людзі ёсьць на сьвеце. Сьвет вялікі, але-ж і людзі на ім!—ня было яшчэ такое галавы, каб пералічыла ўсіх... Што чуваць на сьвеце, людзі добрыя, можа вайна будзе, ня чулі?

— Ня чулі,—адказала Барановічыха,—а хіба вайна маецца быць? Ты па сьвеце ходзіш, то табе лепш і павінна быць вядома.

— Чаго ня ведаю, таго не скажу. Пра вайну нічога ня чуў. Мусіць такі ня будзе яе, нешта ня чуваць нідзе нічога.

Яму налілі есьці, і ён сьцішыўся ў мыцельніку на лаве, пільна ўслухоўваючыся, што гавораць у хаце. Алесь дастаў з камінку тытунь і стаў закурваць. Запалілі лямпу, паставіла яе высока—на край печы, каб сьвятло было па ўсёй хаце. Тады і прышоў да Алеся Тамаш. Барановічыха пачала расхвальваць кватаранта свайго:

— Гэты наш каморнік, дык гэта залаты чалавек. Спакойны, добры, далікатны. От ён жыве ў нас ужо каторую пору, а каб калі ён нам надакучыў чым!? Усё роўна, як свой родны... А прывыклі-ж мы як да яго. Проста шкода, што ад'яжджаць яму трэба. Ён-жа па нядзелі паедзе ўжо. Ведаеце?

— Чулі.

— А як-жа, па нядзелі паедзе! У горад паедзе. Ён-жа там служыць. Ён там па земляной часьці начальнікам.

— Ведама, каморнік.

Барановічыха паглядзела на Алесеву мацеру:

— Апроч таго, што каморнік, дык ён яшчэ і так, гэта яму цяпер новую пасаду далі... Ён-жа толькі-што ў гэтым годзе вучыцца скончыў, яшчэ нават казаў нашай Ганьне, дзюплёму нейкую будзе здаваць гэтаю зімою, а ўжо і начальніка яму далі... Залаты чалавек.

Барановічыха ўсё паглядала на Алеся. Тамаш заўважыў гэта, дзьмухнуў у папяросьнік і сказаў:

— Хто яго ведае, ці ён залаты, ці не залаты, гэты каморнік. Але што ён панаваты, то гэта відаць. А раз панаваты, то і сьвінаваты.

Барановічыха пакрыўдзілася:

— А дзе гэта відаць, што ён сьвінаваты? Дзе ён што насьвініў каму?

— Ён панаваты. А панаватыя заўсёды сьвінаватыя бываюць. Ну, можа ён і не такі. Я ня ўручаю. Можа і не.

— Такога чалавека пашукаць. Ён-жа з простых людзей, а да чаго сам дайшоў. На каморніка выбіўся.

Відаць, што Барановічыха раззлавалася на Тамаша, паглядзела на Алеся і сказала:

— Дабранач.

— Хадзеце здаровы,—адказаў Тамаш, зацягаючыся Алесевым тытунём.

Старац пазіраў на ўсіх і моўчкі даядаў з міскі. Тамаш глядзеў на свае ногі і гаварыў:

— За зяця, мусі быць, прагне ўзяць яго. От абы толькі пападуць каго, дык адразу і старыя і малыя ліпнуць, як мухі, шануючы вас, на гэтае самае... Разьвяла гаворку баба — а залаты! а спрытны!.. Ах, як ужо там спрытнасьць у яго, дык аж зайздрасьць бярэ... Залаты чалавек, ай-яй! што там за золата ўжо!

— Вядома, што залаты,—сказала Алесева маці,—вучоны, грошы бярэ, далікатны, чыста адзеты...

— Няхай сабе будзе золата, мне што.

— Добры вечар.

Нечакана зьявіўся ля парогу дзяк, з басавістаю сваёю гаворкаю:

— У самы раз папаў. Гэта-ж і вы якраз тут.

— Якраз тут,—адказаў Тамаш, працягваючы яму руку.

Дзяк патрос усім рукі, сеў на лаву і палажыў на стол жоўты партабак:

— Закурвайце... Табак першага сорту. Два гады ляжаў, усё мацунку набіраўся. Цяпер вышаў не

табак, а адэкалён. Пахне... Табаку, дык няма чаго грашыць, маю. Агарод ёсьць, сам стараюся... А ўсё іншае, дык праваліцца яно няхай. Жыцьця няма. Жыць цяжка. Што-ж я, сярод духавенства я пролетар. Бо і сапраўды, што такое дзяк?! Я з вялікаю радасьцю кінуў-бы ўсю гэтую работу. Даволі. Адмаўляюся ад усяго. Надакучыла быць бясправўным; голас хачу мець. Які я к чорту духоўнік, думаеце што?! Я да дзякоўства,—чым я займаўся? Музыкантам быў, капэляю кіраваў, вясельлі граў, на сцэне выступаў колькі раз. Скрыпка і флейта—от на чым я выяжджаў. Гэта мой канёк. Я і цяпер пра гэта думаю—нашто, каб мне хто ў вочы пальцам пароў, што я дзяк. Я-ж кажу, надакучыла гэтае бяспраўе, хачу рэальную карысьць прыносіць. У мяне шэсьць душ сям'і, а каб мне хоць-бы зямлі далі на душ дзьве-тры. А там я можа як-небудзь падабраў-бы хлопцаў, ды зноў-бы капэлю скляпаў-бы, заняўся-б сваім даўнейшым талентам. Жыў-бы... Дзякоўства па баку. Даўно ўжо ў мяне пераварот адбыўся.

— Нашто-ж вам шукаць якіх-небудзь там хлопцаў для капэлі, калі тут гатовае ўсё ёсьць.

— Што гатовае?

— Струмант хлопцы нашы справілі духавы і ня ведаюць, што рабіць з ім. От бярэцеся навучыць іх граць.

Дзяк больш яшчэ ажывіўся:

— Дзякоўства дык я кіну, няйначай. Гэта ўжо, як бог сьвят. Кончана, гавару адкрыта. А капэлю, дык гэта раз-два і можна арганізаваць. У мяне нават і ноты ёсьць. Я ім усю тэорыю і практыку... Рэгулярна ўсё будзе ў мяне... Магу!.. Справілі струмант?

— Купілі на восем чалавек.

— На казённыя грошы, ці скlаліся?

— Ад спэктакляў даход быў, пажарная дружына памагла, трохі скlаліся...

— Дык гэта значыцца грамадзкая капэля? Гэта яшчэ лепш. А пра маё дзякоўства, дык я магу публічна заявіць, перад усім народам. Магу напісаць і перачытаць перад усімі, перад сходам.

— Толькі трэба гэта падумаць, каб назад пасьля не варочацца.

— Дзе вы бачылі. Раз толькі я займуся грамадзкаю працаю...

Ён доўга яшчэ грымеў вясёлым басам, пастукваючы пальцамі па жоўтым вечку партабака свайго. Накурыўшыся і нагаварыўшыся, дастаў з кішэні гадзіньнік:

— Сем, от бо вечары доўгія ўжо.

І пашоў, лёгка і спрытна.

— Што ты на гэта скажаш?—марганув Тамаш Алесю.

— Няхай навучыць хлопцаў іграць.

— А пра зямлю?

— Пагаворым... Чаму яму ня даць, калі так. Патрэбным чалавекам можа быць.

Алесь адзеў жакетку і шапку.

— Ідзеш?

— Пайду.

— Хадзем.

І яны з Тамашом пашлі з хаты.

— Я цяпер выпіў-бы зноў,—сказаў Тамаш,— адну чарку. Тады днём нашча піў, а цяпер-бы нічога... У тваіх гадох я любіў часам пацягнуць. А цяпер аслабеў, чорт яго ведае.

Ён пашоў далей вуліцаю, у свой бок, моўчкі кіўнуўшы Алесю галавою. Алесь завярнуў у Барановічаў двор. У хаце было цёмна. Кухоннае-ж

вакно было асьветлена. Асьветлена было перад ім на дварэ непадмеценае сьмецьце—дробна скрышаны сухі лом, сухое вецьце і кара. У кухні, напроці вакна, Ганна нешта разглядала на стале, прыгнуўшыся над ім. Яна была адна і ўздрыганулася зьнячэўкі, калі Алесь стукнуў дзьвярыма. Азірнулася на яго і ўстала насустрач.

— Я думала мама... Яна да вас пашла.

— Пашла ўжо ад нас... Ты адна?

— Як бачыш.

— Рада, што я прышоў?

Яна паглядзела ў вочы яму і каб ня думаў ён пра каморніка, быў-бы ўпэўнены, што рада яна яму.

Цікаў павольна за сьцяною гадзіньнік, каля печы ляжалі вяслы цыбулі. Ціха было.

— Я цэлы дзень цыбулю сёньня зьвязвала,— сказала Ганна, і голас яе зьлёгку дрыжэў.

— А я зранку зямлю мераў.

— А днём?

— На сходзе быў... А вечарам да цябе прышоў.

— Бачу, што прышоў.

— Рада?

— Нашто ты пытаеш.

— Бо ты стала зусім іншаю, як раней была... Ты-ж сама павінна ведаць. Ну прызнайся... Гэта-ж так?

Моцна цікаў гадзіньнік за сьцяною.

— Хіба-ж я ня праўду кажу?

— Якую праўду?

— Нашто ты перапытваеш? Ты-ж добра ведаеш, пра што я гавару. Ты-ж ведаеш... Ведаеш.

— Алесь...

— Што, Ганна?!

— Ты... пачакай.

— Што?.. нашто?

Надзвычайна моцна цікаў гадзіньнік у цёмнай хаце, недзе па той бок адчыненых дзьвярэй. І ўсё-ж было ціха, надзвычайна ціха. Цішыня гэтая стаяла па кутках, стаяла каля адчыненых і зачыненых дзьвярэй, ляжала на сьценах, была ў чырвоным сьвятле малое лямпы. Доўгаю яна была і нярухомаю, і яшчэ большаю стала, калі Ганна заплакала. Ганна лягла ілбом на зложаныя на стале рукі.

— Ты скажы, Ганна, і я пайду... Ты скажы... Ня плач ты, не маўчы... Скажы... Гавары...

Ганна нічога не сказала. Бялела яе шыя пад адценьнямі валасоў, над тым-жа знаёмым усё рудым каўнерыкам.

— Ну скажы... Ну я пайду... Іду...

— Ня ідзі-і-і.

Ён палажыў ёй руку на галаву.

— Ня ідзі ты, Алесь...

— Ганна, што з табою робіцца?.. Чаму ты такою стала?.. Ганна?..

— Нічога...

Яна выцерла рукавом вочы, паправіла лямпу. Устала з-за стала. Алесь стаяў блізка каля яе. Хмурны, пануры.

— Гэта я так заплакала, Алесь.

— Так ня плачуць.

— Чаго ты раззлаваўся на мяне?

І яна маўкліва паглядзела на яго.

— Родненькая, ня трэба так. Годзе ўжо...

Яна не дала скончыць. Падступіла на крок бліжэй, глянула роспачнымі вачыма ў твар яму. Тады ён узяў яе за плечы і прыціснуў яе да сябе, ілбом прытуліўшыся да яе растрапаных валасоў. І чуў, як стукала ў яе сэрца. Яна сама тулілася да яго.

— Ганна, ты-ж такая, як і раней была. Нікога няма больш... Годзе чакаць ужо.. Ня трэба больш... Разам будзем. Ты скажы... Скажы ты. Ну?.. Ганна...

Галава яе зноў затраслася ад плачу.

На дварэ нехта прайшоў цяжкімі крокамі.

III

Аднак назаўтра Алесь быў повен узбуджанасьцю трывогі. Як-бы недавер'е было да Ганны, ці адчуваньне нейкай яе няшчырасьці, незалежнай нават ад яе самой.

Быў той дзень апошнім днём перамеру зямлі. І мусіць адным з апошніх цёплых дзён. Ужо адчуваліся блізкія халады, і голыя дрэвы ў садох набывалі колер сухое глыбокае восені. Хоць і быў той дзень цёплым і ясным,—дзьмуў вецер.

Былі ўмяркованы ўжо ўсе спрэчкі і нездаваленьні зямлёю; з самае цеснае вуліцы, некалькі хат згадзіліся выселіцца, некалькі чалавек чужых узялі зямлю і плацы—і павінна была некалі на весну, вырасьці, трохі наводшыбе ад мястэчка, новая вуліца. Блытаная і цяжкая справа падыходзіла да канца.

Зранку прышоў белагаловы Клемусь—усьпеў дачуцца ўжо, што дзяк пачне вучыць граць; сам ён даўно ўжо выбраў для сябе клярнэт. Прышоўшы, ён адразу пастараўся ўпэўніцца ад Алеся, ці праўду гаварыў учора некаму вечарам дзяк. Ён распытваў нават пра ўсялякія дробязі ў гаворцы з дзяком, курыў звыклыя комсамольскія „пушкі“ і цыкаў сьлінаю праз зубы ў качэргі. Старац моўчкі заплятаў, навітымі з мочанага лыка вяровачкамі,

пратаптаную дзірку ў лапці. Клемусь быў рад, ня мог захаваць свайго захапленьня. Маці паліла ў печы.

— Давай, Алесь, вып'ем,—сказаў Клемусь.

У Алеся і самога да гэтага быў настрой. Але ён сказаў:

— Вы, сукіны сыны, п'яце і падрываеце аўторытэт.

Клемусь трохі засмуціўся, нават пачырванеў і адказаў:

— Хто табе сказаў?

— Гэта ня важна—хто сказаў.

— Не, ты скажы хто.

— А табе ня ўсе роўна, хто казаў?

— Брахня. Гэта мала калі бывае.

— Вы п'яце і чорт вас ведае, што робіце, п'яныя. Хуліганамі робіцеся, ліха вам... Тамаш гаварыў, калі ты хочаш ведаць! Пляваў, лаяў на чым сьвет стаіць. І праўда. Што гэта за работа, хлопцы! Ты гавары, што гэта было ў вас у тую нядзелю?

— У якую нядзелю?

— Што ты віляеш?

— А-а-а, у тую?

— У тую.

— Нічога ня было. Мы з Петрыкам выпілі, ды з дзяўчатамі дурэлі.

— А чаго Макаркава дзяўчына ўцякла адтуль з плачам?

— А чорт яе ведае.

— Дык от... Ня можна так, браткі. Калі выпіў дзе, дык спаць ідзі, каб цябе тады ня было ня відаць, ня чуваць...

Клемусю надакучыла гэтакая гаворка.

— Гэта сёньня з зямлёю канчаецца?

— Сёньня.

Алесь сеў абувацца. Клемусь усё цыкаў у качэргі сьліну. Алесь моўчкі накручваў на ногі анучы і ўсьцягаў боты. Пахла ў хаце гарачымі блінцамі і скваркамі. Ад агню ў пэчы грэла на ўсю хату.

— Гэта сёньня гаспадынька з хлебам?—сказаў старац.

— Але, хлеб сёньня пяку,—адказала маці.

Навала смутку па Ганьне душыла Алеся. Падазронасьць і трывога не прападалі. Вечарам думаў ён канчаткова сказаць, каб яна паведаміла бацьку пра вясельле.

— Алесь, давай вып'ем,—зноў падышоў да яго Клемусь.

— Давай,—сказаў Алесь.

— Я прынясу.

— Толькі—раз-два.

— Як бачыш.

Клемусь выскачыў з хаты і праз хвілін пятнаццаць прынёс у кішэні картовых галіфэ пляшку. Маці вынесла ў сенцы блінцоў і скварак, і сама разам з хлопцамі выпіла чарку. Хлопцы выпілі па дзьве вялікія чаркі. Неўзабаве зьявіўся з мокрымі вужышчамі пад пахаю Тамаш і таксама выпіў чарку.

— Люблю скваркі салоныя,—сказаў ён, кусаючы блінец.

— Дзе вы, дзядзька, вужышчы намачылі?—сказаў Клемусь.

— Забылі ўнесьці ўчора ў гумно, начавалі на прыгуменьні, дык ці гэта ад расы якое, ці ад туману.

Раптам дзяк зьявіўся ў сенцах.

— Добры дзень... Сьнедаеце?

— Сьнедаем. Калі ласка.

— Ежце на здароўе... я вас доўга затрымліваць ня буду. Я от заяву напісаў публічную. Я папрасіў-бы вас на момант у хату.

Алесь увайшоў. Старац абуваў лапаць.

— От я прачытаю.

Дзяк дастаў з кішэні паперку і ціхавата прачытаў:

„Служачы дванаццаць год дзяком, я пераканаўся ў тым факце, што бога няма, а рэлігія зьяўляецца сродкам для атручваньня народнае сьвядомасьці. Хрыстос, калі-б ён сапраўды быў, сам-бы асудзіў дзеяньні духавенства, якое, прапаведуючы бога, зусім аб ім ня думае і ў сваім асабістым жыцьці зьяўляецца фактычна пасьлядоўцам атэізму. Ня хочучы больш зьяўляцца дапаможнікам атручваньня народнае масы, я выракаюся рэлігіі, яшчэ раз пацьвярджаючы, што яна зьяўляецца ашуканствам і дурманам для народу. Былы дзяк Якуб Скварчэўскі“.

— Гэта мы выкарыстаем для антырэлігійнай пропаганды,—сказаў Алесь.

— Можна.

— Толькі каб трохі сталей напісаць як. Слова атэізм...

— Можаце перапісаць самі, а я падпішу. Як умеў, так пісаў. Што-ж я—клясаў не праходзіў.

— Ідзі, чалавеча, чарку на дарогу выпі, і пагрэйся,—сказаў Тамаш, усадзіўшы галаву ў хату і зірнуўшы на старца.

Старац, як дуж, шмарган уў у сенцы. Там яму засталося яшчэ на дзьве чаркі. Клемусь увайшоў у хату. Алесь апранаўся ісьці на поле. Дзяк разьвітаўся і пашоў.

— От каб была скрыпка, я вам заграў-бы,— чуўся з сянец голас старца.

Клемусь пачуў і вышаў у сенцы:

— Я ад Юрася прынясу,—сказаў ён.

— Прынясі, сынку,—падаў голас Тамаш.

Праз дзьве хвіліны Клемусь зьявіўся з скрыпкаю. Тамаш сеў на парозе і дастаў з кішэні вішнёвы папяросьнік. Старац патрумкаў пальцамі, падкруціў струны, прыпёр скрыпку да жывата і даў наотліў смыка па струнах. Заграў нешта падобнае да полькі і граў на дзьвёх струнах адразу. Клемусь сеў каля яго і пачаў пастукваць у тахт нагамі. Утуруючы сабе на дзьвёх струнах, старац засьпяваў:

Ды, божа-ж мой вышні,
Ды ці я-ж у цябе чалавек лішні,
Ды ці я-ж калі ў царкве бываю,
Ды ці я-ж калі карчму мінаю...

І раптам як-бы надакучыла яму гэта. Сьціх, падумаў і пачаў другое:

За гарою камяною
Расьце жыта з лебядою,
А пшаніца з асакою.
Там дзяўчына жыта жала,
Правай рукой серп дзяржала,
Левай сьлёзы выцірала...

І ўсё ўтураваў сабе на дзьвёх струнах.

— Заграў-бы ты што вясёлае,—папрасіў Клемусь.

— Вясёлае? Можна і вясёлае:

З-пад дубовага карэньня
Ручаінай вада бегла...

— Хіба-ж гэта вясёлае?

— А якое-ж табе вясёласьці патрэбна?

— Каб усё ходырам хадзіла.

— Ходыра-а-ам? На табе ходырам.

Заскачу, заскачу,
За старога не хачу...

— О, гэта самы раз!

А той усё граў і нават паварушваў у тахт плячом. А пасьля і лапцямі пачаў паварушваць. У сенцы пачалі зьбірацца суседзі. Маці, дастаўшы з печы скавараду, высунула галаву ў сенцы:

— Ціха, вар'яты, у будзённы дзень гульню распачалі. Зараз усю вуліцу зьбераце. Клемусь, гэта ўсё з цябе сьвет гарыць!

— Нічога, цётка, от няхай крыху падвяселіць народ. Нічога яму ня зробіцца. Няхай грае.

І прыбраў з стала пустую бутэльку, закінуўшы яе на гару. У дзьвярах чуліся галасы:

— От табе і музыка, хоць бярыся ў бокі ды скачы.

— Дык-жа ён, падла, лоўка грае.

— Ня так грае, як сьпявае.

— А што, ён, можна сказаць, з сьпеваў гэтых сваіх ды з модлаў хлеб есьць... Гэта ён сваю скрыпку носіць, ці гэта тут дзе дастаў?

— Даўней, дык старцы з лірамі хадзілі, а гэта з скрыпкамі пачалі.

— Не, гэта Клемусева скрыпка.

— Але граць умее.

— Старцы да гэтага здатныя.

— От смыкам пілуе...

Старац, тымчасам, ледзьве варушыў смыкам. Скрыпка кідала ўжо толькі кароткія, абрывістыя зыкі ўтуру, адзначаючы тахт новай яго песьні:

Маці, маці,
Салдат у хаце;
Грукае,
Стукае,
Не дае спаці.

Алесь стаяў зусім апрануўшыся. Глядзеў з хаты ў сенцы. Клемусь варушыў у тахт каленьмі, старац лапцем.

— Пакіньце, вар'яты,—угаворвала маці, завіхаючыся каля печы.

— Сапраўды, хлопцы, даволі,—сказаў Тамаш.

Старац палажыў скрыпку, устаў, паправіў на сабе порткі і нацадзіў з кагадзе прынесенае, амаль пустое бутэлькі яшчэ з чвэртку чаркі, сказаў вінавата, аглядаючыся на ўсіх:

— От яшчэ, з вашага дазволу, цмакану гэтую рэшту за ваша здароўе ды пайду сабе... Будзьце здаровенькі.

— На здароўе.

Выпіў, смачна крактануў, абцёр губы, і жуючы на хаду скварку, стаў начэпліваць на сябе накрыж торбы. Падпеοразаўся па сьвітцы вузкаю рыжаю папружкаю і падаўся з сяней.

— Бывайце здаровы, дзякуй, людцы добрыя, каб вы заўсёды мелі, у волю спажывалі і бедных надаралі. Каб вашым дзядом у зямлі лёгкае паляжаньне, а дзецям і ўнукам на гэтым сьвеце панаваньне. Жывеце здаровы, будзьце вясёлы. Заставайцеся здаровенькія.

— Хадзі здароў.

І ён пашоў з двара, шкрэбаючы па зямлі сухою сваёю нагою.

— Ну, то хадзем,—сказаў Тамаш.

— Хадзем,—адказаў Алесь.

Людзі пачалі разыходзіцца. Ідучы поплеч з Алесем, Тамаш гаварыў:

— От усё і скончылася. Усёй нашай і камісіі канец. Да халадоў управіліся, перамералі, перарэзалі. Няхай цяпер, хто нездаволены, прывыкае. Прывыкне, палаецца, падзякуе... Страшна было, як

браліся за работу, а гэта—неўзаметку прайшло... Ворагаў мы шмат з табою нажылі. Каб, скажам, палякі, ці што якое іншае, дык хоць і мне старому ўцякай—з сьвету зжывуць; Барановіч першы ўзяўся-б за мяне... Хоць ты яго дачкі не выпускай з рук, я табе апошні раз гавару.

— Страшна, што мы тут кашу гэткую варым?

— А нічога, добра. Што мне, я, можна сказаць, і пажыў толькі цяпер... Шкадую толькі аднаго—маладосьці ніяк ня вернеш. Немач мяне агортае, гэта я чую. Мацуюся-мацуюся, але і яна не падаецца: хто каго! Старасьць, браце, нічога не парадзіш.

— Цяпер дактары абмалоджваюць старых.

— Чуў я. Але дзе там к чорту ён абмалодзіць. Унь у іншага, як ідзе, дык ззаду парахня сыплецца. Як ён яго абмалодзіць к чортавай матары. Можа ён што-небудзь такое і зробіць, падлечыць так яго на год ці два,—я не кажу, але каб маладым зрабіць!..

— Маладзеюць і з бабамі справу маюць...

— Эт, гаворка.

Дзьмуў вецер і халадзіў зямлю.

IV

Сінь неба была чорнаю і густою. Усё большы ўзьнімаўся вецер. Яшчэ трымалася цяплыня над зямлёй, але чуліся блізкія халады. Поле было пустае, абветранае. Пад ветрам шумела сухая трава, гойдалася піжма і пробаваў зеляніцца, яшчэ цьвёрды, чабор.

Юрка з бацькам стаяў на каляіністай дарозе. Бацька гаварыў:

— Здаецца, гэты кавалак нам адзначылі?
— Гэты. Я на першай тычцы нажом знак зрабіў.
— Некалі вясною авёс пасеем.
— Авёс?
— Ува ўсіх ярына будзе... Хадзем.
— Я застануся.
— Чаго?
— Так.
— Заставайся, калі гэтак хочаш.
Юрка пашоў да кустоў, дзе стаялі і сядзелі на зямлі мужчыны.
— Чаго ты, малы, трэшся тут,—жартаўліва сказаў Тамаш,—зьмерзьнеш.
Юрка чмыхнуў носам і адказаў:
— Мне ня холадна.
— Цяпер спраўляй, сынку, добрую снасьць, набывай каня, ды...—бачыў свой кавалак?
— Бачыў. Я нават на тычцы нажом знак зрабіў.
— Маладзец, сынку.
Юрка сеў на травяную каляіну, поплеч з Тамашом. Тамаш даваў закурыць каморніку. Барановічаў кум зьбіраў і складаў каморніцкія прылады. Скручваючы сталёвую істужку, ён заўважыў:
— Чорт яго ведае, можа яно і лепш будзе цяпер.
Тамаш не сьцярпеў:
— А ты-ж раней охкаў усё, ды бедаваў.
— Не сказаць, каб я і охкаў лішне.
— Ну, то так лямант паднімаў.
— Калі гэта я паднімаў той лямант?!
Каморнік падышоў да Алеся і сказаў:
— Праз дзён чатыры я выяжджаю. Трэба гэтымі днямі нам разьлічыцца з сельсаветам.
Алесь вельмі панура зазначыў:
— Разьлічымся.

Каморнік нагроб сухога лісьця на дарозе і пачаў выціраць свае чаравікі. Жаўтаватая зямля расьціралася па іх і высыхала.

Мужчыны разыходзіліся. Шмат хто, як-бы за ўсё жыцьцё не наглядзеўшыся на зямлю, абыходзіў свой кавалак і аглядаў новыя межы, вызнachаные калкамі. Мужчыны хадзілі па полі. Барановічаў кум патупаў каля каморніка і сказаў:

— Вы таксама з нейкае вёскі родам?

— Ну так, я з сялян.

— І таксама бацькі займаюцца цяпер зямлёй?

— Таксама... Жывуць на зямлі па той бок граніцы.

— А вы адтуль родам?

— Адтуль.

— Дрэнна вам, што і паехаць туды ня можаце ніяк.

— Так, хочацца бацькоў пабачыць.

— Бацькоў—гэта, тымчасове, раз, а яно і гаспадарка-ж там ёсьць. Вы хоць і ня маеце патрэбы ў гаспадарцы бацькаўскай, а ўсё-ж яно сьмялей, калі за плячыма ёсьць свой, можна сказаць, тымчасове, куток, дзе прыперціся ўва ўсякую гадзіну льга. Гэта правільна. Вам цяпер, скажам, ідуць грошы кожны месяц, жывеце вы, дай божа на ўсякага добрага... Выбачайце, я, тымчасове, чалавек просты... Дык яно вам цяпер і не ў галаве... Чалавек вы малады... А тымчасам ніколі ня цурайцеся зямлі. Няхай яна будзе сабе ў вас за плячыма. Часам давядзецца, жывучы па сьвеце, прыперціся да яе. А яна заўсёды прыме, і не абы як прыме. Бо, можна сказаць, яна заўсёды гатова для чалавека,—прышоў да яе, не пашкадуй для яе поту, рук, і яна табе аддзякуе... Жывучы, чаго ня бывае на сьвеце. Усё здараецца, тымчасове, з

чалавекам. Дык прытулак заўсёды павінен быць, дзеля ўсякага здарэньня...

Каморнік абкручваў папераю свае прылады.

— Унь у нас жыве тут Мікалай Жыгунец, можа бачылі калі... крываносы такі чалавек. Дык ён, можна сказаць, чалавек, як верабей пад страхою, жыў, па сьвеце цягаўся, брадзяжыў, яго з бацькаўшчыны вайною выперлі. Рэзалі мы тут от зямлю гэтую, дык ён, тымчасове, і слухаць ня хоча. Начорта мне тая, кажа, зямля. Я і так пражыву. Займацца гаспадаркаю трэба, заводзіць усё—а клопат, а небыт,—а так вальней. Я гляджу на яго, дый думаю сабе—нічога, чалавеча, тымчасове, з гэтае гаворкі твае ня будзе. Пажывеш на сьвеце колькі год, дык сам тады пашкадуеш, што ня ўзяў зямлі сабе кавалка, калі людзі добрыя давалі. Вядома што. От пакуль што жыве, а тады паскача, як прыдзецца ў чужых людзей пад плотам уміраць. Як гэта жыць, каб свайго прытулку ня мець! Гэта не чалавек, а пасьвісьцёл нейкі, бізун, бадзяга... Валацуга... Ён, праўда, ня гультай, хоць-бы сабе і гэты самы Мікалай крываносы, Жыгунец. Ён робіць, ён і мае. От ён боты сабе новыя справіў, ужывае добра, пасьля работы заўсёды чарку вып‘е, гэта то правільна. Але гэта пакуль ён яшчэ сілу мае і працаваць можа. Ну, а калі, скажам, немач яго якая агорне, ці што. Тады-ж ён прапаў, як рызыкант на вясельлі. Гэта ні то, што які-небудзь рамесьнік, што ён мае да самае магілы свае талент у руках. Шавец, скажам, кравец... Ён сабе заўсёды сядзіць і калупаецца патроху. Калупаецца сабе. А ў гэтага—сёньня работа ёсьць, а назаўтра і няма. От што. Я ўсякае здарэньне бачыў на сьвеце, думаеце што?! Бачыў я, тымчасове, усялякіх. Іншы кажа, што ён—тое ды гэтае. А тут

выходзіць, што толькі і цымусу ў яго, што ён, тымчасове, пагаварыць умее. Языком папрацаваць, дык у яго на гэта хапае досьціпу. А калі дзе што якое, дык, тымчасове, клёку з яго жаднага няма. І быць ня можа. Калі гэта ўсё нясталыя людзі! За плячыма павінна што-небудзь у чалавека быць, каб заўсёды прыпёрціся да чаго льга было...

Каморнік злажыў прылады і разглядаў свае, абветраныя палявым пылам, гетры.

— Я чалавек, тымчасове, такі... Я, можна сказаць, пабачыў сьвету, пабачыў людзей... Я вас, таварыш каморнік, паважаю і нават гонар мне самому, што вы ў кума майго закватаравалі: ня трэба вам цяпер гаспадарка, дык на ўсялякае здарэньне дрэнна, што няма як, значыць, трымаць зьвесткі з домам... Я, здаецца, нічога тут такога не сказаў, я ўсё, як найлепей... Ну, на весну ярыну будзем сеяць. Памерана, здаецца-ж, стараліся. Каму якая крыўда і ёсьць, дык патроху забудзецца. Усё на сьвеце забываецца... От як мой Сымонка—сынок памёр, пухам яму зямля, дык думалася, што век нудзець буду, а тымчасам усё нейк згладзілася, душа нейк паспакайнела. І цяпер шкода, шкода і горна часам бывае, але ўсё-ж ня тое. Я гэта адкрыта гавару, бо ўсякі ведае, што ня вораг-жа я свайму роднаму дзіцяці... Усё забываецца, праходзіць. Таксама і тут, і ўсюды. Будзем жывы—меркаваньне нейкае прыдзе.

Тамаш падаў голас:

— Гэта ты сам крыўду зьбіраешся забываць, ці за нейкага іншага гаворыш?

— Я і за сябе і за ўсіх. Я то ня крыўдую ні на каго. Зямля як зямля. Я толькі—гэта да слова прышлося.

— Ды табе-то чаго крыўдаваць. Якраз-бо табе папалася такое месца, што няма чаго крыўдзіцца.

— Яно чаму няма. Самы ўзгорак, а там-жа пескавата, ліха яму. Каб трохі, дык адзін чвір.

— Дык, значыць, нядобра?

— Я не кажу, што нядобра.

— А як-жа?

— Нейк-жа будзем жыць і рабіць.

Каморнік апратаў свой плашч. Барановічаў кум зноў пачаў гаварыць:

— Ну пэўна, што каб вельмі была мне вялікая крыўда, дык я сказаў-бы. А калі там на які грош, як кажуць, мае пярэйдзе, дык таквеле бяды. Зноў-жа, я не кажу, што мяне пакрыўдзілі. Я на цябе, Тамаш, і на цябе, Алесь, і на таварыша каморніка, ды сказаць і на ўсю камісію не пакрыўдзіўся. Я нічога дрэннага не скажу. У мяне нават і ў думках няма...

Тамаш плюнуў:

— Цьфу, каб ты згарэў гэтакі чалавек. От гаворыць ён, гаворыць, будзе цэлы дзень гаварыць, а нічога ня скажа. Што ты мне тут зубы загаварваеш, ты мне гавары выразна.

Каморнік зарагатаў:

— Ты мне гавары выразна. Чым ты нездаволены?

— У мяне за ўзгоркам, у канцы кліна, лог нейкі. Жыта будзе пад мокры год вымакаць.

— То ты-б так адразу гаварыў.

— Я-ж гавару. Як-жа табе яшчэ гаварыць...

— Колькі там таго логу, як старой бабе сесьці. Крокаў пяць. Колькі там яго!

— Можа там і пяцёх крокаў няма, але чаму гэта канешне, каб мне папаўся клін з логам? Што

я за горшы? Няхай-бы вы, тымчасове, далі каму іншаму, дык не. Канешне мне!

— Ну, то давай памяняемся.

— Нашто нам мяняцца. Няхай будзе пры свойцы

— Дык як-жа?

— А так што нядобра вы, браткі, робіце.

Алесь раптам усхваціўся з зямлі:

— Падавай, дзядзька, на нас у суд ці куды іначай, што мы сабе лепшую зямлю пабралі, а табе і яшчэ каму самую горшую пакінулі. Падавай на нас, як на злачынцаў.

— Што ты, браце, пабойся ты бога. За што мне на цябе ў суд падаваць... На цябе ў суд? Няхай мяне бог крые.

— Ну, дык няма тут чаго лішне і разводзіць гаворку на паўдня, размазваць гэтыя свае крыўды.

— А што-ж, маўчаць?

Каморнік зноў зарагатаў. Сеў на мяжу і пабліскваў вясёлымі вачыма ад рогату. Алесь заспакоіўся і пацьвяліўся з Барановічавым кумам:

— Мы неўзабаве возьмем ды зноў перамер будзем рабіць, толькі іншы ўжо. Ніякіх нікому кліноў, усё будзе ўсіх.

— Гэта комуну, значыць, зрабіць?

— Комуну.

— З нашым народам гэтага ня зробіш, бо ў нас народ вельмі сквапны на чужое. Усякі ўсё будзе цягнуць сабе, як найбольш.

— Адкуль-жа гэта вядома?

— Як адкуль, ня відаць які ў нас народ, ці што?

Тамаш усьміхнуўся:

— Яно відаць, чаму не!

Каморнік устаў ісьці. Алесь заўважыў цьвёрды рух яго постаці, яго дасьціпнасьць у адзежы і думаў пра ўчарашняе спатканьне з Ганнаю.

— Пойдзем?—сказаў каморнік.

Тамаш на хаду пачаў закурваць. Юрка ішоў поплеч з ім, перадумываючы гаворку, якую чуў кагадзе. Ішоў і пахвоставў дубцом па белай саломе высахлай мятліцы.

— Ты, сынку, заўсёды з старымі кампануеш,— сказаў яму Тамаш,—сталы ты хлапчук. Гаспадар з цябе добры павінен быць. Спакойны ты хлопец... Шкадуеш мамы?

— Шкадую.

— Нудзіш?

— Аей як.

— Нічога, сынку, пераживецца. Выгадуешся, падрасьцеш, будзеш жыць. Лепш будзеш жыць за нас усіх.

Юрка маўчаў.

— Вучыцца табе трэба.

— Я-ж вучуся. Чытаць і пісаць ужо ўмею добра.

— Мала, трэба больш.

Каморнік і Алесь выперадзілі ўсіх. Ішлі поплеч па рыжых паплавох.

V

Яны адразу адчулі няпрыемнасьць блізкасьці адзін да аднаго.

— Я сьпяшаюся чым найхутчэй выехаць,—сказаў каморнік,—я вельмі заняты цяпер. Што-б там ня было, а ў панядзелак трэба ехаць. Так што ты, таварыш Алесь, націсьні там на ўсе застаўкі ў сельсавеце, каб да нядзелі нам разьлічыцца. Яно так па ўмове выходзіць.

Алесь моцна сказаў:

— Няўжо-ж не, разьлічымся!

Каморнік з непаразуменьнем паглядзеў на Алеся. І раптам здагадаўся. Ён хацеў як-небудзь застацца пазадзе, каб ісьці аднаму. Твар яго стаў такім, як-бы ён ня зьбіраўся больш сказаць ніводнага слова. Алесь толькі цяпер пачаў заўважаць яго простую постаць, моцную, сухую шыю, вастраваты твар. Ішоў ён спакойна, ступаў цяжка, хоць ногі меў тонкія і зграбныя. Зялёны гарнітур яго—галіфэ і фрэнч,—прызначаны, мусіць, для працы на полі, у некаторых мясцох пачаў выцірацца. Прыгожа вісеў цераз плячо скураны футарал з дробнымі каморніцкімі рэчамі.

Яны ішлі поплеч і маўчалі.

„Мусіць голіць шыю“, падумаў Алесь, гледзячы на стаўбунаватую каморніцкую шыю. Шыя ззаду была чырвонаватая ад загары і палявых вятроў.

Усю дарогу не сказалі ніводнага слова. Вуліца была пустою і шэраю. І раптам нудна стала ім— і аднаму, і другому. Як-бы зусім ня было кожнаму з іх за што рук зацяць. Як-бы ўсё было пустым і непатрэбным.

— Я пастараюся як найхутчэй, каб з табою разьлічыцца,—востра сказаў Алесь.

— Вельмі будзе добра,—так-жа сама адказаў каморнік.

І засталіся так стаяць некалькі хвілін напроці Барановічавае хаты. Абодва думалі пра адно. Цёмныя Ганьніны валасы над вузкім каўнерыкам рудое сукенкі яе на белай шыі—былі ў вачох кожнага. Яна адчувалася імі абодвымі—прывабная, вясёлая, сумная. Далёкая і блізкая. Усё было ў ёй і яна была ва ўсім.

Алесь. Ён ведаў яе з маленства, пасьля-ж раз нейк нечакана адрозьніў яе ад усіх іншых дзяўчат, і тады пачаў гарэць ёю, радавацца і сумаваць.

— Я вельмі маладая, каб цяпер ісьці замуж,— сказала яна раз яму,—можа яшчэ пачакаем трохі. Пачакаем яшчэ, ну... да канца першае зімы.

Ён радасна схваціў яе на рукі і паднёс некалькі крокаў.

Было гэта мінулай вясною.

Яна-ж адчувала ў ім сілу; радасную блізкасьць; гарэла яго блізкасьцю.

— Можа нам ня трэба адкладаць на такі доўгі час,—сказаў ён,—можа тады што-небудзь у нас пераменіцца.

— Можа і так,—адказала яна,—можа і ня трэба чакаць канца зімы... Можа і раней трэба.

— Увосень,—папрасіў ён.

— Увосень,—сказала яна.

І з гэтага часу, калі ўсё ўжо было вырашана, яны пачалі прывыкаць адно да аднаго. Яна прыбягала роснымі агародамі і паплавамі да яго кожны вечар, ён абхватваў яе рукамі, раскідаў тварам яе валасы, песьціў, насіў на руках і яна ўся дрыжэла ад гэтай шалёнай блізасьці мужчынскай сілы, тулілася ўся да яго, маўчала, сьвяціла вачыма; рабілася тут каля яго малою і кволай; і разам з тым вялікай і моцнай жаночасьцю сваёю.

Пасьля-ж, як устанаўляцца пачала прывыкласьць, ня так ужо моцна гарэлі агні і ня так востра хваляваліся буры.

— Трэба хутчэй,—гаварыў ён,—бо нешта халодзіцца між намі.

— Давай хутчэй,—адказвала яна.

Канец лета прынёс большую прывыкласьць, а восень—адзнакі лёгкага суму, як-бы па нечым далёкім, што толькі паманьваецца, ніколі ня прыдзе, бо можа і ня існуе, і прыносіць семнаццацігадовай дзяўчыне няведаньне чаго сама яна хоча.

А тут прышлі на дапамогу бацькі, пачаўшы нагаворваць ёй супроць Алеся. Што яна будзе гараваць за ім, што цяжка будзе жыць, бо ён толькішто гаспадарку заводзіць, што ён галетнік, што нават і пасагу шкада даваць яму.

Тады яна моцна пачала сумаваць.

Каморнік пазнаў яе днём на вуліцы, жывучы летам у суседняй вёсцы і прышоўшы раз у мястэчка. Назаўтра ён зноў, наўмысьля ўжо, прышоў, каб пабачыцца з ёю.

— Мы з вамі былі знаёмы ў горадзе,—сказаў ён.

— Былі трохі,—адказала яна.

Ён яшчэ некалькі разоў прыходзіў. Пасьля-ж, як пачаў тут мераць зямлю, закватараваў у яе хаце.

І сама яна тады ня ведала, да каторага з іх цягне яе. Гэты быў заўсёды на вачох. Алесь прыходзіў часта. Яна поўнілася жаданьнем каханьня і здавалася было ёй, што кахае яна іх абодвых. Пра гэта ёй хацелася сказаць тады Алесю, калі застаў ён быў яе адну дома і яна ўвесь час старалася адважыцца на гэта.

Пасьля таго, як пашоў ад яе ў той вечар Алесь, яна сумавала адна на цёмным дварэ. З таго часу толькі дзень прайшоў і вельмі доўга цягнуўся гэты кароткі час.

Каморнік увесь час гэты адчуваў, як усё больш і больш вырастала ў ім жаданьне, непераможнае і моцнае, быць з ёю. З таго часу, як бачыў ён у горадзе яе і мала заўважаў, яна вырасла, пахарашэла больш. Здалося яму (ці не заўважыў ён тады) што вочы яе пачарнелі, былі шырокія і вострыя адценьнямі сваімі. Ён ведаў пра Алеся і быў упэўнены, што Алесь на другарадным пляне ўжо ў яе. За апошнія дні ён часьцей, як калі,

памагаў ёй цадзіць малако, жартаўліва памагаў ёй і мацеры шаткаваць капусту, і сваёю дасьціпнасьцю ўсё больш падабаўся ёй і засланяў сабою Алеся. Яна менш нейк пачала гаварыць цяпер у хаце аб усялякіх хатніх справах. У гэты дзень, раніцою, маці заўважыла гэта:

— Што ты ўсё маўчыш... Нейкая ты маўклівая зрабілася...

— Чаму маўклівая... а што-ж гаварыць...

Яна адышлася ад стала, на якім перабірала фасолю і глянула як-бы ненаўмысьля ў хату з кухні. Спаткалася з яго вачыма і абое яны няпрыкметна ўсьміхнуліся адно аднаму.

Нядобра было ім абодвым маўчаць так і стаяць тут цяпер пасярод вуліцы, напроці Барановічавае хаты. Адзін аднаго бачылі і адчувалі навылет.

Каморнік тут, на вуліцы, ад усяго вакольнага вызначаўся сваім выглядам. І выцерты, і запылены гарнітур яго заставаўся ўсё-ж зграбным; і дасьціпным быў ён сам. Стаяў, зрэдку паглядаў на гетры, перацягненыя рамянямі і ня ведаў што сказаць, каб толькі перарваць гэтую маўчанку. Алесь напроці яго здаваўся нязграбным, у вялікіх ботах, картовым, парыжэлым гарнітуры. Твар быў абветраны і загарэлы таксама, але ня было на ім сьлядоў таго догляду, што вызначае твар чалавека, які мае час клапаціцца аб сваёй прыгожасьці. І от патроху Алесю пачала падабацца гэтая маўчанка. Ён бачыў, што каморнік ня ведае, як-бы найхутчэй разьвітацца з імі і пайсьці на сваю кватэру. Як-бы гэта адчуў Алесь яго слабейшым за сябе і сказаў:

— Пачакаем мужчын, унь засталіся ў канцы вуліцы. Няхай падыдуць, я пайду з імі разам... Пачакайма.

Каморнік нездаволена заўважыў:

— Яны стаяць там...

— Нічога, пастаяць ды падыдуць.

І яшчэ, паглядзеўшы ў твар каморніку:

— Век стаяць ня будуць.

Каморнік зразумеў і ўскіпеў. Працягнуў Алесю руку і сказаў:

— Часу мне няма чакаць іх. Бывай.

Алесь паціснуў яму руку і пашоў назад, у канец, да мужчын. Каморнік увашоў у вузкі Барановічаў двор. Адчуваў сябе лёгка, як чалавек, які скончыў цяжкую справу, і цяпер перад ім толькі добрыя вынікі. У адчыненых сенцах Ганна падсявала муку, запыленая ёю, рухавая, з голымі рукамі. Ён стаў на парозе, усьміхаючыся ёй.

— Толькі ня ўздумайце памагаць,—сказала яна жартаўліва.

— А от памагу.

— Ідзеце ў хату, а то я вас запылю ўсяго.

— Я не баюся.

— А от і пабаіцеся, як усяго абсыплю мукою.

— Абсыпце.

— Ах, які паслушны.

— Гэта як калі.

Памаўчалі.

— Сапраўды, ідзеце, а то...

— А то замінаю?

— Не...

— Не, не!..

Ён падышоў да яе і палажыў руку ёй на плячо, так, як рабіў часта, толькі цяпер больш рашуча. Гэтую цьвёрдасьць і сілу яго рукі яна адчула адразу... От ён палажыў абедзьве свае рукі ёй на плечы. Яна неяк разам апусьціла сіта на

зямлю, апусьціла ўніз вочы і загарэлася ўся яго блізкасьцю.

— Запыліцеся, я ўся ў муцэ.

Ён моўчкі ахваціў яе рукамі.

— Ціха, зараз увойдуць.

— Ня ўвойдуць, чаго ты баішся... любая...

Ён першы раз сказаў ёй „ты“ і гэта канчаткова зблізіла іх. І цяжка было ўжо разбурыць цяпер гэтую блізкасьць.

У наступныя хвіліны яна як мага хутчэй старалася дасеяць муку. Работа валілася ў яе з рук. Яна ледзьве прыбрала ў сенцах, хвалюючыся, блытаючы думкі, поўная трывогаю новага шчасьця. Успомніла Алеся і адчула, як вялікі і тупы камень лёг на душу. Пашла ў гумно, падграбці з току сена. Ускідала вілкамі на стоўп, маўчала, трывожылася. Пахла сена, пахла зяленіва сухое травы ў аўсянай саломе. Вясёлаю вільгацю пахнуў ток і мышынаю цішынёю гучэлі саламяныя куткі ў гумне. За гумном, за гумнамі, на агародах, і за імі, у полі, у лясох, у надхмарных бяздоньнях маўчала восень; весялілася, сумавала, радавалася. У садзе трымалася пад лісьцем вільгаць, раскашэльвалася на гольлі дзікае птаства. Нячутнымі вятрамі плакалі дрэвы, весела і прасторна.

Ружы, піжмы і палыны зацьвіталі і адцьвіталі, зеляніліся і вялі ў дзяўчыніным сэрцы.

VI

І хто гэта так выразна можа чытаць на людзкіх тварах? Хто гэта так умее залезьці ў чужое сэрца і дазнацца там пра ўсё? Можа яшчэ і сама Ганна ня ведала выразна, якая важная часіна ў яе

жыцьці надыходзіць, а ўсе ўжо ведалі. Ведалі больш за самую Ганну і гаварылі больш, як ведалі. Ведалі нават, што Ганна гатова адрачыся нават бацькоў, калі ня будуць дазваляць ёй ехаць разам з каморнікам, ведалі, з якога дню і як пачалося ў Ганны і каморніка каханьне, ведалі, колькі каморнік будзе браць гэтаю зімою пэнсіі і колькі будзе браць, паслужыўшы два гады, каб адно было спакойна на сьвеце. Выходзіла, што бярэ ён нешта чуць ні восемдзесят рублёў кожны месяц і от пачалі зайздросьціць і Ганьне і Барановічу. Нават кум Барановічаў, і той гаварыў раз:

— Я чалавек незайздросны. І нікому ніколі я не зайздросьціў і зайздросьціць не хачу. Якім я ўрадзіўся, такім і памру. Чужога мне непатрэбна, каб мне адно бог даў здароўе сваё спажыць. Але магу сказаць, што Юлік, хоць і кум мне, але чалавек ён от які! Ня мог хіба каморнік да мяне на кватэру застацца ці што? І ў мяне хата ня горшая, за яго. Дык не, наўзахапы пабег, каб адно чалавека да рук прыбраць. І прыбраў. Лепшага зяця з сьвечкаю ня знойдзеш. А хіба мая дачка брыдчэйшая ці горшая за яго Ганну?

Праўда, гаварыў ён гэта толькі сваёй жонцы, аднак-жа назаўтра Сабастыяніха, як сталая жанчына і гаспадыня, гаварыла суседкам:

— Бог з імі, на што мне ў чужыя справы ўмешвацца, не мая гэта справа. Каму якая справа да каго... Гэта, гэты самы Янка Вашыновіч, дык-жа ён злуе на кума свайго Юліка, што той маецца аддаваць за каморніка дачку. Памойму, чаго тут злаваць, калі і сапраўды, там дзяўчына як лялька, адно паглядзець на яе. Яна, як кветка, гэтая Юлікава Ганна. І вучоная, і прыгожая, і натуры добрае, і працавітая. Яна табе ўсё зробіць, усяго

дагледзіць. У яе ня будзе як у іншае ў хаце непарадкаў. Гэта не дзяўчына, а золата. Ні то што я штонебудзь маю проці Вашыновіча ці проці яго дачкі, яны мне аднолькавыя прыяцелі, і Вашыновіч і Барановіч і ня люблю я ў чужыя справы ўмешвацца, або ў чужую гаворку язык утыкаць, але далёка яшчэ той да Барановічавае Ганны. Гэта не абсудак, а праўда. Я не кажу, мае родныя, што Вашыновічава дзяўчына дрэнная ці якая-небудзь няўдалая. Не, нашто гаварыць, нашто выдумляць. Ї тая—і зробіць усё, і паслушная, і ўмее ўсё. Ї ня брыдкая. Але калі паставіць іх поплеч, дык вядома што Ганна... Няма чаго і раўняць.

На гэтым гаворка спынілася, але жонка Барановічавага кума назаўтра прышла сварыцца да Сабастыяніхі:

— Нашто ты гаварыла, што мая дачка нікуды ня варта. Што яна і няўдалая, і дурная... Ї нічога рабіць ня ўмее, і брыдкая.

— Калі гэта я гаварыла?

— Учора.

— Каму?

— Людзям. Думаеш я нічога ня ведаю?

— Бо і ня ведаеш.

— Ведаю.

— А ты чула, як я гаварыла?

— Чула.

— Каб ты гэтак царкоўны звон чула!

— Каб гэтак і чула... Усе людзі чулі, як ты маю дачку бэсьціла. Што табе мая дачка зрабіла, што ты яе абгаворваеш. Яна табе шкоды якое нарабіла ці што? Або я табе што прыкрае зрабіла?

— Чаго ты вяжашся да мяне?

— Людзі добрыя. Апалосквае чужыя косьці, ды яшчэ чаго вяжашся! Якая ты, ліха табе, сьвятая!

— Я пра тваю дачку нічога кепскага не казала.

— А што-ж, я гэта казала?!

— А можа і ты, чэрці цябе ведаюць. Чаго ты прыстала як смала! Я да цябе ня іду, паднімаць у цябе ў хаце гвалт.

— Гадаўка ты, каб ты сваіх унукаў не аглядала.

— Заткні ляпу, я цябе не чапаю...

— Каб цябе сарочка не чапала.

— От зараз як зачаплю... За каўтуны, ды з хаты.

— За каўтуны? Гэта-ж ты каўтунаватая.

— Брэшаш, у мае радні ніколі каўтуна ня было. Гэта-ж пра твайго дзеда людзі гаварылі, што і памёр з каўтуном.

— Каб твае ўнукі, дай божа, абкаўтунелі!

І Вашыновічыха вышла з хаты, моцна бразнуўшы клямкаю. Сабастыяніха нейкі час лаяла Вашыновічыху, пакуль даставала з печы хлеб, а пасьля пашла да суседак скардзіцца.

Пра Алеся гаварылі менш. Можа таму, што Алесь быў мужчына і, апроч таго, не заўважаў ніколі ніякіх гаворак і забываўся на іх. Усе шэсьць дзён да ад'езду каморніка гаворкі гэтыя даводзілі Ганну да сьлёз. І найцяжэйшымі былі тыя хвіліны, калі пасьля ўсіх гэтых гаворак прышоў Алесь і застаў яе дома. Раней два разы ён ня мог усё застаць яе. Цяпер яна была на прыгуменьні, а ён убачыў яе з агародаў. Убачыўшы яго, яна засмуцілася і вострая трывога яе павялічылася.

— Ганна, значыцца ўсё... Скончана.

Ганна маўчала.

— Канец усяму? Чаго-ж ты маўчыш?

— Не папракай мяне так... Нічога ня скончана... Чаго ты на мяне так глядзіш... Алесь... Ты паслухай...

— Ну, што?

— Алесь, родненькі, ты паслухай...
— Ну я слухаю... Слухаю я!

Яна раптам затраслася ад моцнага плачу, прыпёршыся плячом да яблыны. Алесь стаяў, узьлёгшы на нізкі плот і глядзеў на яе. Усяго некалькі хвілін цягнулася гэта.

— Алесь.
— Ну?
— Чаго ты такі злосны...
— Нязлосны я.
— Чужы...
— А якім-жа мне быць яшчэ?

Нешта яна як-бы хацела зрабіць ці то сказаць. Памкнулася падыйсьці да Алеся, зьняла з заплаканага твару рукі. Алесь маўкліва і жорстка глядзеў на яе. І яна зноў уздрыганулася ад плачу і, кінуўшы ўсё, пабегла ў двор. Алесь тут доўга не стаяў. Было яму прыкра, нядобра. Вярнуўся агародамі назад, папрабаваў узяцца дома за работу,—усё валілася з рук. Тады ён адзеўся чысьцей і пашоў у ячэйку.

Волька пералічвала старыя нейкія, запыленыя паперкі і сшывала іх суравымі ніткамі.

— Нікога няма яшчэ?
— Рана-ж яшчэ.
— Усе прыдуць, ня ведаеш?
— Адкуль-жа я ведаю, мусіць усе... Чаго ты такі?
— Які?
— Нейкі...

Ён сеў насупроць яе і заўважыў: нос у Волькі кароткі і прыгожы, чуць завостраны на канцы; вочы маленькія, рыжыя, твар з дробнымі рысамі. Як сьмяецца або гаворыць—відаць два рады густых зубоў і на перадзе ўверсе аднаго зуба няма— цёмная дзірка.

— Чаму цябе завуць востраносаю, у цябе не такі ўжо і востры нос. Хто гэта выдумаў на цябе?

— Чаму гэта табе раптам у галаву ўзбрыло?

— Няхай-бы ты сабе зуб уставіла, а то аж прыкра. Сьвеціш чорнаю дзіркаю.

— Што гэта на цябе найшло сёньня?

— Няхай-бы ты чысьцей адзявалася, клапацілася трохі больш аб сваім харастве. Ты-ж ня брыдкая, ты-ж нават прыгожая, каб ты адно адзелася, як мае быць. Напрыклад, рудую сукенку, з такім вузенькім паясом. Спрытны гэтакі, дасьціпны гарнітур. З вузенькім каўнерыкам ніжэй шыі. Табе вельмі ішло-б да тваіх чорных валос і рыжых вачэй. Слухай, Волечка, пашый сабе рудую сукенку.

— Што ты выдумаў?!

— Ну куды табе гэтая блюзка, памужчынскі пашытая; аж каўнер карак падпірае. Адзенься ты пажаночы.

— А што табе?

— Мне нічога.

— Дык нашто ты гэтак клапоцішся?

— Я так... Як сабе хочаш.

— Дык нашто так гаварыць?

— А ты ўжо так і зацікавілася. От баба.

— Пашоў ты!

Раптам Алесь адыйшоўся да вакна, паглядзеў на дрэнна зьбіты з ледзьве абгаблёваных дошчак стол і пачаў гаварыць ні то Вольцы, ні то сам сабе. Глядзеў у адно месца, паверх стала:

— Сам Тамаш падаў думку пра алейню. Дару-чым гэта яму. Няхай падумае. А я сам вазьмуся за сыраварню, ты разам са мною. Пра малочнае таварыства табе сярод баб давядзецца языком

папрацаваць. Праз год ці два—новы перамер зямлі!.. Я яшчэ буду доўга жыць на сьвеце!

— Нашто новы перамер?

— Знойдзецца шмат, што ў колектыў пойдуць.

— Тут табе давядзецца языком працаваць.

— Тут языком мала што зробіш. Раней зробім, а тады ўжо языком—„а што, бачыў кум сонца?..“ А Клемусь няхай каля капэлі свае круціцца. Я яму дзяка прыпаручыў, няхай граюць... Адно што, сукін сын, п‘е здорава Клемусь. Я яго адучу... Няхай выпівае патроху, калі яму так хочацца.

— У меру значыць? Хе-хе.

— Чаго ты?

— Што ты яму дазволіў выпіваць у меру. Таксабе, трошкі. І бога хвалі і чорта не гняві. Мерачка.

— Ніякай меркі, а павінен проста ўзяць сябе ў рукі.

Волька ўздыхнула:

— А ён добры хлопец

— Клемусь?

— Але.

— Ну пэўна, адно што маладзейшы за цябе на гадоў, мусіць восем.

— Ідзі ты!

— Дык, брат... Сёньня-ж пайду да Тамаша, няхай мне плян разгорне, пра гэтую сваю алейню, раз ён так з ёю носіцца... Чорт яго бяры ўсё. Усё ня важна.

— Што?

— Усё іншае... Іншае ўсё... Родненькая ты мая.

— Што гэта ты?

— Волечка, ведаеш ты што? Ганна мяне адцуралася... Мусіць з каморнікам паедзе. Каб ты ведала?..

— Я табе гаварыла.

— Нічога ты мне не гаварыла. І ніякія гаворкі тут ніколі нічога ня зробяць. Я гэта ведаю, сам ведаю, што тут ні гаворкі, ні развага...

— Каму-ж так ведаць, як ні мне. Ты мне от тлумачыш...

— Нічога я табе, сястрыца, ня тлумачу.

— Вельмі сумуеш?

— Ня ведаю, ці гэта сум, ці гэта толькі прыкрасьць такая.

— Унь здаецца ідуць.

— Заўсёды позьняцца.

— А нашто табе раней. От хаця пагаварыў са мною.

— Добра.

Пачала зьбірацца ячэйка.

VII

Юлік Барановіч перагортаў падатковыя квіткі і паказаў іх Вольцы. Белабароды Павал таксама рабіў на сваіх квітках адзнакі. Углядаўся ў іх, моцна прачытваў друкаванае, а пісанага ніяк ня мог расчытаць. Так і абмінаў; і нічога не разумеў, што ў квітку. Тодар мог чытаць лепш і разьбіраў пісанае. Ён і тлумачыў Паўлу пра скідку, пра надбаўку. Павал адхаркваўся і пляваў. Волька адбірала квіткі і запісвала ў кнігу. Тамашу ня было пільнай патрэбы тут, але таксама, ня маючы пільнай работы дома, ён паддаваўся прывычцы даведвацца ў сельсавет. Сядзеў каля вакна і маўкліва цягнуў з вішнёвага папяросьніка. Юлік Барановіч,

падцягваючы хворую нагу, падвалокся пад Тамаша, пачынаючы гаворку:

— Або сіберны холад пачнецца, або мокра стане на дварэ.

Тамаш дзьмухнуў у папяросьнік:

— Адкуль ты ведаеш?

— Нагу ў мяне зноў ламаць пачало.

— Чаму-ж ты яе ня грэеш як-небудзь, а па дварэ валочышся. Каб яна была ў цяпле, дык яна ня так-бы балела.

— Чорт-жа яго ўседзіць у хаце. Жывучы, трэба варушыцца. А работа, сказаць, ня цяжкая, падатковыя квіткі прышоў выправіць.

Белабароды Павал падаўся да Тамаша:

— Чаму гэта ты ў гэтым камітэце нічога ні гэтае. Раз цябе паставілі, дык ты, пакуль цябе ня зьнімуць, трэба каб вёў дзела як мае быць, а ні то што.

— Чаму, а што ты нядобрае ўгледзеў?

— А што-ж, гэта добра?

— Што?

— Чаму гэта Мікіта Базылёў мае права дарэмна мець карысьць ад Паўлічыных агародаў. Калі Паўліха памерла, дык які гэта Мікіта асэсар, што яму спадчына застаецца, бяз дай прычыны?

— А табе мала свайго агароду?

— Мне непатрэбна чужога, але я хачу дайсьці праўды.

— Ну то як-жа патвойму?

— Няхай арэнду плаціць. Невялікую, але плаціць няхай.

— А ты за свой агарод каму арэнду плаціш?

— Ён мой, спрадвеку.

— А гэты цяпер Мікіты Базылёвага.

— Чаму гэта ты распараджэньні гэтакія даеш?

— Ніякіх распараджэньняў я не даю.

— А хто гэта?

— Чаго ты мяне дапытваеш?

— А чаму гэта Мацьвей і вясною з камітэцкага аўса карысьць меў і цяпер яму падсунулі два пуды грэчкі. Гультай, ня хоча рабіць, а яму ўсё пхаюць. Што гэта за работа?.. Думаеш я ня ведаю, што Мацьвею грэчкі далі камітэцкае.

— Ніхто з гэтым не хаваецца.

— Або, чаму гэта яшчэ нідзе нікому нічога, а ён ужо мае квіток на гальлё з лесу? Начорта гэтыя хітрыкі.

— Тут бяз ніякіх хітрыкаў. Што-ж, каб ён прападаў?

— Ты яму колькі не давай, усё будзе, як вада ў рэшата. Як у тхлань.

— Як ты зайздросьціш яму на два пуды грэчкі!

— Я не зайздрошчу. Ён цяпер па Сабастыяну мне сваяком даводзіцца. Я нават рад, што яму помач ідзе.

— То чаго ты бунтуеш?

— Я табе сказаў чаго.

— Нічога ты мне не сказаў.

— Хіба ў цябе вушы чым пазатыканы?

Юлік Барановіч засьмяяўся, зрабіў твар радасным і нявінным, як у дзіцяці, і сказаў:

— А от нябожчык Сымон Скуратовіч заўсёды хадзіў з вушыма пазатыканымі ватаю, а чуў лепш за ўсякага таго, хто з роду вушэй нічым не затыкаў. Хэ-хэ.

— А нашто ён ватаю вушы затыкаў?

— Халера яго ведае, дактары нейкую гэта раду давалі... Гадкі быў чалавек, каб яму калом зямля, нікому ніколі дабра не зрабіў. Усё ў сваю кішэню цягнуў. Паскудны чалавек! Хоць пра памёрлага

і ня можна так гаварыць.. Але скажу, я добра яго ведаў.

Тамаш пусьціў з роту дыму, падняў галаву і падзьмухаў у дым. І сказаў:

— То ты, значыцца, чалавеча, на камітэт крыўдуеш, што Базылец пляцам карыстаецца, а Мацьвей два пуды грэчкі ўзяў?

Павал адказаў:

— Я ня гэтае.

— Якое,—ня гэтае, гавары мне выразна!

— Я ня крыўджуся. Я пры свойцы застаюся. Ніхто нічога ў мяне не забраў, чаго мне крыўдзіцца. Адно што ўсе людзі гавораць.

— Тваім людзям, мусіць, лепш было-б, каб які-небудзь Базылёў, або Мацьвей у вас пад бокам мучыўся ўвесь век.

— Ніхто чужое пакуты ня хоча.

— Ну дык чорт-жа цябе разьбярэ, чаго ты хочаш. Чым табе я не ўнаравіў.

— Я на цябе жаднае крыўды ня маю.

— Ну, дык чаго ты зьвягаеш, чэрці цябе ведаюць. Што гэта за народ халерны Трэба-ж каб дзела варушылася. Ня буду я, будзе хто іншы.

— А нашто табе так многа. Ты і ў сельсавеце, ты і ў камітэце гэтым.

— Будзь ласкаў, стань ты!

— Дык не аб гэтым ход.

— А аб чым-жа ход? Я ні там, ні тут грошай не бяру.

Пачуліся галасы:

— Што ты, Павал, сьветам брыдзіш. Што ты за чалавек. Ты выразна скажы, калі крыўду або патрэбу якую маеш, а то якраз як Вашыновіч— гаворыць, гаворыць, а нічога ня скажа.

— Чаго ты, Павал, галаву дурыш.

— Няўжо-ж, патвойму бедняку прападаць трэба. Хітры ты вельмі. Ты-ж сам ня ведаеш, чаго ты хочаш.

— Чаму гэта я ня ведаю.

— Ён то ведае, чаго ён хоча.

— Ну чаго-ж ён хоча?

— Чаго хоча? Хоча, каб яго самога выбралі за камітэтчыка.

— Ён-жа быў ужо камітэтчыкам.

— Калі?

— А як кагадзе што слабода прышла.

— Дык гэта не такі камітэт. То быў лясны камітэт, а гэта для дапамогі бедным.

— Няхай сабе лясны, абы быў.

— І яшчэ як быў. Каму воз дроў, а сабе, дык два. Яшчэ і цяпер бярозаю ў печы паліць. Бяроза, як звон.

— Каб ты гэтак жыў. Ідзі паглядзі, чым я ў печы палю.

— Чаго я пайду глядзець.

— Не, ты прыдзі паглядзі. А то нічога ня ведаеш, а язык так і матляецца за вушыма. Ты вазьмі сьведкі і прыдзі паглядзі.

— Чаго я пайду, чаго я ня бачыў!

— Пайдзі, пайдзі да яго. Паглядзі пайдзі, як ён зранку з бабаю перакідаецца.

— А ты што за правярайла гэтакі знайшоўся. Прычым тут з бабаю. Што ты мяне старога бэсьціш, смурод ты!

Хто зарагатаў, хто ўнурыўся ў каўнер. Падыходзілі ўсё больш людзі. Зьявіўся Алесь. Клемусь стаяў, уціснуўшыся бокам між Юлікам Барановічам і белабародым Паўлам і, як звычайна, варушыў каленьмі. Волька злажыла свае паперы і пашла, і дзень ужо пачаў братацца з вечарам. Тамаш

некалькі разоў чуў скептычныя заўвагі пра алейню, пра сыраварню, пра малочнае таварыства. І нават, нарэшце, пачуў, як Барановіч заўважыў некаму:

— Фацэтны чалавек. Стары, падла, а нейкі— чорт яго ведае. Унімку яму няма. Начорта яму гэтак старацца—у труну ўсё роўна нічога не забярэ.

— Ён яшчэ здаровы.

— Чорта ён здаровы, гэта адно здаецца.

Гаворка ішла наводшыбе ад усіх. Тамаш вышаў. Алесь агледзеў натоўп і запытаў:

— Ну то ці будзем за алейню і сыраварню брацца, ці не? Усе-ж чулі пра гэта, няма тут чаго тлумачыць.

— Начорта яна.

— Жылі, добра кажа, і так.

— Мала што яно добра. Добрага на сьвеце шмат, усяго не паробіш.

— Чаму не паробіш, захацеўшы ўсё можна.

— Можна? А грошы ты маеш?

— Гэтак сама як і ты.

— Няма чаго лішне гаварыць. Узяцца, дык і зробім.

— Ну але, зробім.

— Гулу ты асмаленую зробіш. Ім што, Алесь— комуністы, яму, вядома--ён гаворыць тое, ён гэтае, а мы павінны самі вымяркоўваць.

— Ну то што калі комуністы?

— Раз ён комуністы, значыцца ён на дабро дбае.

— А што я кажу. Я нічога і не кажу.

— А адкуль грошай узяць?

— Памеркаваць, трэба.

— Больш мы мяркуем як робім.

— А патвойму, дык найлепш—ні меркаваць, ні рабіць?

— Чаму гэта ні рабіць? Я гэтага не гавару.

— Хто ня робіць, той век прападае.

— Тут ні пра гэтую работу гаворка ідзе.

— А пра якую-ж?

— Пра якую!

Больш усіх крычаў белабароды Павал.

— Чаму на мяне ніякае ўвагі ні адкуль? Я арыштант! Я за прадналог сядзеў чатыры дні. Але я за савецкую ўласьць. А на мяне ніхто і ня гляне.

— Як-жа на цябе глядзець?

— Мала што я не тады, калі гаварылі, падатак выплаціў. Але я выплаціў. Я гаспадарку сваю вяду лепш за ўсіх.

— Не хваліся.

— Я ня гультаю, дык я і маю кавалак хлеба і да хлеба. Я не галодны, але я і не магнат, як іншы.

— Хто гэта?

— На каго гэта ты паказваеш?

— Нашто ты спавядаешся! Хто цябе просіць?

— Я не спавядаюся. Але я павінен-жа, жывучы на сьвеце, выказаць, што мяне рупіць?..

— Ну, дык выказвай.

— Я-ж выказваю.

— Нічога ты ня выказваеш.

— Як то нічога!?

— Бо і нічога. Ты от гаворыш-гаворыш, а і сам ня ведаеш, што ты тут выказаў, а чаго ня выказаў.

Павал раптам памякчэў:

— Няўжо я так няўдала гавару?

— Хто цябе ведае. От я слухаў-слухаў, а ня ведаю, чаго ты хочаш. Крыўда нейкая ў цябе ёсьць. А якая, ніяк ты выказаць ня можаш.

Гэта гаварыў Алесь. Павал паглядзеў на яго, паглядзеў на ўсіх, замаргаў вачыма і зноў загаварыў:

— Крыўда? Дзіва што крыўда. Ты думаеш, вы думаеце, што гэта тут тыя чатыры дні, якія я

адсядзеў за прадналог? Або той гусак, якога ў мяне Аляксандар забіў і за якога я з яго капейкі не магу спагнаць? Ня гэта. Ня гэта, браце! Усё тут. Усё! І гусак, і чатыры дні, і боль у сярэдзіне, і старасьць, і ўсё, што толькі ёсьць і можа быць. Усё, што было з малых дзён. Усе крыўды, усе сваркі, уся работа. Што зносілася на плячох... Ты думаеш гэта я тут з раскошы вялікае гусака дапамінаюся з Аляксандра? Што гэта мне на гэтага гусака сышло, ці што? Чорт яго бяры, з гусаком разам, згарыць ён няхай. От што!

— Дык ты гавары, дзядзька, якая ў цябе крыўда?

— Усё.

— Ну дык раскажы пра гэтае ўсё.

— Дык я-ж расказваю. Гавару, што ўсё. Усё, значыцца, уплялося сюды, ад самых малых дзён нараджэньня.

— Жыў бедна?

— Жыў.

— Гараваў?

— Гараваў.

— Дабра шмат бачыў?

— Якога там дабра!

— Перад начальнікам усякім шапку скідаў?

— Скідаў.

— Сьпіну гнуў?

— Гнуў.

— Нішчымны хлеб еў?

— Еў.

— Дык от ты дзядзька і крыўду сваю выказаў?

— Можна сказаць, што і выказаў.

— Ну от. Дык у цябе, дзядзька, проста злосьць, што век свой ты пражыў, дабра ня бачачы. Праўда ці не?

— Можа і праўда.

— Ну, а яшчэ што?

— От часам у вочы валяюцца.

— Хто?

— От, ні той, то гэты.

— Як гэта?

— Ды от усяк бывае. Калі я цяпер узьбіўся на добрую, можна сказаць, гаспадарку, дык ужо мяне багатыром лічаць. А тут усяго таго багацтва, што круглы год, як той казаў, хлеб маю і які кавалак сала. То што гэта, я багатыр? Магнат гэта я?

— Ды які ты там багатыр.

Мужчыны цесна абкружвалі ўзбуджанага Алеся. Алесь усё гаварыў:

— Дык як-жа, значыцца, з малых дзён нараджэньня крыўда? Аж да злосьці чалавека даводзіць?

— Даводзіць.

— Значыцца нядобра?

— Нядобра.

— Інач́ай трэба?

— Можа яно і трэба.

— Пабагацець цяпер трэба. Дык яно і мінецца ўсё гэтае, патроху. Праўда ці не?

— Я гэта і без цябе ведаю, што ты мне гаворыш.

— Дык чаго-ж ты крыўдуеш.

— А што-ж, мала я крыўды бачыў на сьвеце?

— А от я, таксама, хіба ня бачыў крыўды? Але-ж я ня крычу на Тамаша, і ня злую ні на кога бяз дай прычыны.

— Ну, бо ты малады. У цябе іншая справа.

— Унь Тамаш стары, а хацян каб вы ўсе гэтакія былі.

— Што ты нас старых перавучваеш.

— Хіба я перавучваю?

— І не перавучвай. Усё роўна нічога ня будзе. Якім чалавек нарадзіўся, такім і памрэ.

— Ну, а сыны твае?

— Што сыны?

— Як яны? З табою-ж, дзядзька, ня ладзяць. Ці гэта яны такімі ўрадзіліся, ці гэта што іншае?

— Яны ўрадзіліся такімі, якімі ім трэба было. А што ня ладзяць з сабою і са мною, дык з саладкага жыцьця сварыцца ні з кім чалавек ня будзе. Я табе гавару.

— Значыцца ўсё нанава трэба?

— Дык яно-ж усё нанава і робіцца.

— Значыцца лепш?

— Не спавядай ты мяне.

— Я так, пытаю.

— Нашто ты з мяне выцягваеш?

— Ды мне што.

— Гэта справа ваша, маладая.

— А каб гэта ты, дзядзька, абмаладзіўся?

— Бог ведае.

— А яно добра было-б.

— Табе лепш ведаць.

— Чаму канешне мне, усякі павінен ведаць.

— Гэта, як што.

— А ведаеш, дзядзька, у тваіх сыноў народзіцца слаўнае пакаленьне. Непадобнае на нас. І гэта мы ўсё стараемся, каб яно было, гэтае пакаленьне.

— Каб твае словы ды богу ў вушы.

— Значыцца добра?

Белабароды Павал зноў памаргаў вачыма.

VIII

У суботу пад вечар, калі заходзіла халоднае сонца, між Юркам і крываносым Мікалаем Жыгунцом адбылася гаворка. Мікалай дастаў з паліцы сыр, паскроб зьверху нажом і пачаў есьці. Юрка скроб моркву і храбустаў зубамі. Мікалай сказаў:

— Ідзі сыра пакаштуй.

Юрка каўтнуў сьліну і адмовіўся:

— Я не хачу.

— Чаму?

— Так сабе.

— Ідзі, дурны.

Юрка падышоў да стала і смачна пачаў есьці. Мікалай абуў новыя боты, добра нацягнуў угору халявы і дастаў з паліцы бубен. Адна бляшка на бубне была пагнутая і ён пачаў адгінаць. Юрка запытаў:

— Нашто вы бубен дасталі?

— Бубніць пайду.

— Калі?

— Як зьмеркне.

— Навучэце мяне бубніць.

— Вучыся.

Юрка памаўчаў і сказаў:

— Няхай яно згарыць.

— Што?

— Што ботаў няма. Тата ўсё кажа, што закажа прышвы і не заказвае.

— От я ў панядзелак заплачу за кватэру, дык будзе і на прышвы.

— На гэта знойдзецца іншая дзірка.

— Я сам тату скажу.

— Хіба скажэце, а то тату нават і не ў галаве.

— Я скажу.

У хаце нікога ня было. Кагадзе Юрка падмёў хату; трохі яшчэ пахнуў сухі пыл, але стала чысьцей і прытульней. Водблескі захаду жоўцілі зямлю і сьцены. Мікалай паправіў бубен, патрос у руцэ, загрымеў па бубне вялікім пальцам, паставіўшы яго старчком, і міргнуў Юрку. Абуваючы мацерыны чаравікі, Юрка ўсьміхнуўся.

— Куды ты абуваешся?

— Пайду пагляджу як вы бубніце.

— Ідзі сабе паглядзі.

— А дзе гэта гуляць будуць?

— Куды паклічуць... Па мяне павінны хлопцы зайсьці.

Хлопцы зайшлі яшчэ праз гадзін дзьве. Мікалай сярод іх быў, як бацька; гаварыў ціха і ўсё падкручваў свае рыжыя вусы. Юрка не пашоў усьлед, а вышаў на вуліцу і выпільнаваў куды яны пашлі. І сам пашоў, некалькі хвілін счакаўшы. Тады яшчэ музыкі ня было, а два музыканты падкручвалі струны на скрыпках, просячы хлопцаў не падсьпеўваць і даць настроіць скрыпкі. Было холадна, так, як можа быць холадна ў месячны вечар апошніх тыдняў восені, калі і туман сядзе за ноч кроплямі вады на платы, і позьнія яблыкі чырвоняцца яшчэ на дрэвах. Зямля ня мерзла яшчэ, была яна халоднаю, мяккаю, і пахла яна моцна і востра. Пусты сад каля сельсавету здаваўся прасторным і белым. Бялелі платы, бялелі лаўкі, паробленыя хлопцамі летам. Шумна было.

Музыканты ўсё падкручвалі струны. Мікалай быў тут ціхім і нават сарамяжным мог здавацца. Вакол яго былі ўсе маладымі і вясёлымі.

— Зараз пачнуць граць?—запытаўся Юрка, аціраючыся каля Мікалая.

— От можа-б табе дадому пайсьці,—адказаў Мікалай,—чаго табе тутака таўчыся, ці гэта твая канпаня? Дома бацька шукаць будзе.

— Я зараз пайду,—адказаў Юрка і ўшыўся ў кучу хлопцаў і дзяўчат.

І нечакана знайшоў там Юзіка. Той пабліскваў вачыма і глядзеў, як Клемусь трымаў за рукі Барановічаву Ганну.

— Здароў Юзік,—сказаў Юрка.

Хацеў падаць руку і не падаў.

— Здароў... Чаго ты прышоў?

— А ты?

— Так сабе.

— І я так сабе.

І абодва пачалі моўчкі глядзець на Клемуся і Ганну. І саромеліся глядзець адзін на аднаго. От Клемусь узяў Ганну пад руку і пашлі яны паволі па белым садзе. Юзік і Юрка разышліся ў розныя бакі. Мікалай пробаваў вялікім пальцам бубен і, патрасаючы яго, слухаў звон шамкоў і бляшак. Так маўчаў і глядзеў на ўсіх. Дзяўчаты хадзілі з хлопцамі, стаялі, сядзелі. Хлопцы жартавалі сваволілі. Музыканты гатовы былі граць, сядзелі з Мікалаем—тры скрыпкі. Мікалай пытаўся:

— Нешта-ж гэтая ваша палкавая музыка ня чутна нідзе. Струмант купілі, а нічога нідзе ні гэтае.

— Якая гэта палкавая?

— Ну што трубы справілі.

— А, гэта? Дзяк вучыць граць.

— Вучыць? Ну, як?

— Нішто сабе. Толькі, падла, зацягвае трохі работу. Адразу, сукін сын, па нотах вучыць пачаў. Няхай-бы раней бяз нотаў панавучваў што самае патрэбнае—ну вальца, там, польку, марш. А тады

ўжо можна было-б і па нотах вучыцца. А то ўжо другі тыдзень на адных гамах трымае. Цярпеньня няма, хочацца каб скарэй.

— Мала што хочацца. У нас, бывала, у палку капэльмайстар дык навічкоў па два месяцы на гамах трымаў. Але за тое музыканты выходзілі, дык проста калі заграюць, дык ня еў-бы, ня спаў-бы, а слухаў... Я папамаршаваў пад палкавую музыку. Бывала калі грануць! Або вечарам калі, як у Магілеве стаялі, выйдуць на пляц за казармы граць ды калі дадуць-дадуць! Поўгораду сыходзілася слухаць.

— Ты гэта можа там у бубен грукаў?

— Не, гэта я сам праз сябе... Давайце польку ўрэжам?

Урэзалі польку. На пляцоўцы, выразанай улетку комсамольцамі для футболу, некалькі пар пачалі скакаць. Каля музыкантаў стаялі і сядзелі дзяўчаты і хлопцы. Юрка стаяў там-жа непадалёку ад Ганны і, млеючы ад няведанага і незразумелага стуку ў галаве і грудзях, пачаў пільна глядзець на яе. На яе галаву, на постаць—там, дзе сукенка была перацягнена вузенькім поясам, ніжэй пояса, дзе гусьціліся тонкія фалды кароткае сукенкі. Нібыта ненала знарок, няпрыметна, падышоў яшчэ бліжэй і, нічога не разумеючы, адчуваў як кружыцца ў галаве, кружыцца ўсё перад вачыма, ад дзіўнай блізкасьці Барановічавае Ганны. Было ўсё нова, незразумела, таемна, ніколі няведана. І ён мучыўся ад жаданьня дакрануцца да яе сукенкі. Гінулі і туманіліся думкі.

От Клемусь зноў узяў Ганну пад руку і павёў па садзе. Музыканты ўсё рэзалі польку. Мікалай схіліўшы на бок галаву, грукаў у бубен—то пальцам, пастаўленым старчком, то выгладжанаю палачкаю.

Юрку раптам стала цяжка дыхнуць. Ён уздыхнуў і, як п‘яны, адышоўся ад музыкантаў. Нехта з хлопцаў падсьпеўваў музыкантам:

Цячэ рэчка праз мястэчка
Долам ня глыбока...

З другога боку нехта перабіў:

Як убачу Пятруся,
Дык у бокі бяруся.

Полька неўзабаве сьціхла. Каля брамы многа галасоў засьпявала:

Ня ведала зязюля, як у лесе жыць,
Ня ведала маці, як дачушку збыць.
Збудзеш мяне, маці, за адзін дзянёк,
Адно-ж не забудзеш за доўгі гадок.
Будзе мая лыжачка сухая ляжаць,
Будуць мае сьцежачкі травой зарастаць,
Будзеш, мая матачка, работку заступаць.
А я тваю месьцінку дзяцьмі засаджу,
А я тваю лыжачку сьлязьмі аблію,
А я твае сьцежкі сама пратапчу,
А тваю работку сама заступлю.

За брамаю зьбіраліся слухаць. Гаварылі, слухалі, самі памагалі сьпяваць.

У садзе зноў ішла полька, з нечаю прыпеўкаю:

Нашы хлопцы абы вечар.
Каля дзевак круцяцца.
Павал-жа з Сабастыянам
За камандзіраў вучацца.

Сабастыян, стоячы каля брамы з мужчынамі, забубніў:

— Урвіцелі, каб яны галовы паскручвалі, фуліганты, басякі! Песьні складаюць, каб яны галовамі панакладалі.

Хлопцы пачулі і наўмысьля разьвялі гаворку:
— Гэта які Сабыстыян, вусаты?
— Але.
— Вясёлы будзе камандзір.
— Ні так вясёлы, як баявы.
— Ды яны абодва нішто. Павал адно бараду зголіць.

Сабастыян падкруціў вусы і падаўся дадому. Юрка заспакоіўся, адшукаў Юзіка. Падышло больш яго таварышоў. Юзік быў вясёлы, свавольны. Падышоў да Мікалая і папрасіў:

— Дайце, дзядзька, я пабубню трохі.

Мікалай маўчаў, баючыся перарваць тахт. Як скончылі граць, тады ён адказаў:

— Ты ня ўмееш.
— Дальбог-жа ўмею.
— Зараз вальца будзем граць.
— Я ўмею і вальца бубніць.

Аднак Мікалай не пацешыў Юзіка,—сам стаў бубніць. Юзік адышоўся і засароміўся сваіх таварышоў, якія скублі яго за полы ватовае капоты:

— Пабубніў?
— Ну як, добра бубніць умееш?
— Бубнач!

Каб апраўдацца, і згладзіць уражаньне, Юзік успомніў:

— От, браткі, у Кудлатавага Амелькі грушы яшчэ ў садзе сьпеюць!
— Яшчэ?!
— Яшчэ. Я сам учора бачыў. Нейкія, мусіць, бэры.
— Хадзем.
— Ну але, хадзем!

І адразу ўсе пашлі. Перабеглі агароды, пералезьлі цераз плот у сад. У чатырох сталі каля

плоту вартаваць, двое селі на варотах у двор. Юзік і Юрка сталі ў дварэ пад вокнамі, гатовыя ў кожную хвіліну засьвістаць дзеля сыгналу і ўцякаць. Адзін палез на грушу і пачаў трасьці. Цьвёрдыя грушы застукалі аб халодную зямлю. Трывожна было і весела.

— Годзе, пакінь на заўтра.

— Заўтра ўсе сам абярэ.

— Трасі больш, калі так.

Страсянуў яшчэ разы са два і пачаў ссоўвацца ўніз. Усе гуртам шукалі ў месячным змроку на зямлі груш; пхалі ў кішэні і за пазуху. Трывога прайшла, засталася вясёлая ўзбуджанасьць. Амелька Кудлаты спаў недзе ў цёмнай хаце, і нічога ня ведаў. І гэта было нядобра, трацілася маладзецкая ўдаласьць. Тады вялікім гуртам падкраліся ціха пад вокны і, адчуваючы целам прыемны запах цьвёрдых груш, хвацілі весела і бяз рытму:

У Кудлушы
Гут'а грушы.

І невядома было ім, ці грозны Амелька Кудлаты выскачыў за імі з хаты, ці ня ўсьпеў, адразу ўсе сыпанулі ўцякаць, перакідаючыся цераз весьніцы, губляючыся ў шыраце белае ночы.

Сабраліся зноў у садзе каля сельсавету. Мікалай курыў, трымаючы на каленях бубен. Клемусь гаварыў:

— Якая гэта музыка! Што гэта за музыка, калі ніякай гармоні.

Мікалай абазваўся:

— Ну пэўна, каб сюды гармоню двухрадку...

— Не, не пра гэтую гармоню.

— А пра якую-ж?

— Гармоняю завецца—гэта як капэля добрая грае, дык гэта ўсё—усе галасы, разам з званкамі там, з бубнамі, бразкоткамі. Мы-ж цяпер па нотах вучымся. Дзяк вучыць. Неўзабаве граць як мае быць станем. Яй-богу. Скварчэўскі ў нас капэльмайстрам, а я загадчыкам капэлі.

— А бубен у вас які?

— Турэцкі.

— Новы?

— Зусім новы.

— А талеркі пры бубне ці асобна?

— Пры бубне талерка і асобна дзьве. Яшчэ званкі купім—такое жалеза гнутае ёсьць, падзвоньваць па ім трэба.

— Я ведаю, у нас у палкавой музыцы ўсё гэта было... Адно што, ці здолее Скварчэўскі быць добрым капэльмайстрам.

— Ён спэц.

— Можа быць.

— Ён у салдатах як быў, дык таксама граў.

— Ну, калі гэтак, дык добра.

Клемусь пашоў да дзяўчат. Юзік сеў побач з Мікалаем. Юрка пашоў за Клемусем, зноў убачыў Барановічаву Ганну і зноў стаў да яе блізка. З пакутнаю асалодаю адчуваў, як хвалявала яго гэтая блізкасьць. Зноў глядзеў на яе галаву і сукенку.

І яшчэ адчуваў, як рэжа левую нагу разарваны мацерын чаравік.

IX

Назаўтра такое-ж самае было надвор'е—яснае, халоднае, пахучае вятрамі і вадою асеньніх рэчак.

Волька ў той дзень праводзіла жаночую конфэрэнцыю. Узбуджаная, з затуманенымі пярэстасьцю

постацяй і твараў-вачмі, яна была прыгажэйшаю, яку звычайныя дні. Сход быў невялікі і было на ім больш мужчын і хлопцаў, чым дзяўчат. Алесь прывёў на сход Макаркаву Вольку. Алесева маці, паглядаючы на Барановічыху гаварыла:

— От так гэта гаворка адно. Што баба, дык яна павінна і вучыцца і ўсё. А от колькі ёсьць такіх, дык усяго і пакрасуецца тады, калі за бацькаваю галавою вучыцца. А пасьля, калі павучыцца трохі, дык усё роўна за гаршкі бярыся За каго-б яна там замуж не пашла, хоць сабе за якога і камісара, ні то што за каморніка якога-небудзь. Бабская доля, вядома. Адно гаворка... А дзеці як пойдуць! Мужчыну ніякае ліха. Што яму.

Пачуўся мужчынскі голас:

— Няўжо-ж ты хочаш, каб мужчына табе дзяцей раджаў, або пялёнкі мыў? Або ў печы паліў?

Волька застукала алоўкам па стале:

— Ціха, таварышы. Хто хоча сказаць, няхай слова возьме. Калі пачнем усе зараз гаварыць дык...

Аднак гаворкі ня сьціхалі:

— Вядома, што бабская доля горшая.

— Усіх доля роўная. Калі мужык здароўшы, дык затое ён больш і цяжэй робіць. Няхай баба папрабуе зрабіць мужчынскую работу.

— Баба больш робіць. Але бяда, што яе работа ня значна так, як мужчынская. Бо яна таўчэцца па хаце і каля хаты за ўсякаю драбніцаю... І за мытым, і за шытым, усё ёй патрэбна.

— Не пра гэта гаварыць трэба.

— Але начорта тут гэтыя крыўды выказваць. Усё роўна ўсяго ня выкажаш і мала што тут парадзіш.

— Нічога, а от скажу. Усё выкажу.

— Выказвай, ну...

— Бо і выкажу. Тут гэта што от гаварылі пра гэтыя колектыўныя кухні, дык яно, гаворачы, можа і добра. Хто яго ведае. Але трэба адно падумаць, як яно будзе выходзіць.

— Чаму?

— А таму, што хто будзе бліжэй стаяць да гэтае кухні заўсёды лепшы кавалак сабе або сваяку дасьць.

— Нагледачы будуць, мусіць.

— Добры інтэрас, адзін будзе рабіць, а другі будзе наглядаць. Вельмі лёгкі хлеб мецьме.

— Ня гэтак.

— А як?

— А што-ж, добра і гэта, што ў кожнай хаце кожную раніцу на чалавек якіх пяць ці дзесяць варыцца? А там адзін на сотню і можа больш будзе варыць, а рэшта займацца нават гэтым ня будуць.

— Ну але, выдзеляць табе там, як галоднаму сабаку.

— Карысьць вялікая, што цяпер табе ніхто не выдзяляе.

— Не, гэтак ня будзе. От выдумляюць.

— Вядома, што лепш будзе. Ніхто нікому падкідаць горшага кавалка ня будзе, бо тады гэта як-бы адна сям'я будзе.

— А як-жа зрабіць гэта?

— Як рабіць? На колектыўную гаспадарку перайсьці. Узяць от хатам дзесяці, ды злучыць разам у адно ўсю гаспадарку. Адзін будзе рабіць адно, другі—другое. І спорна будзе, і плодна, як той казаў.

— Гэта значыцца, побаку ўсё, што нажывалася за век. Адцурайся ўсяго.

— Ну дык можаш сабе не адцурвацца, а гібець сабе пры сваім. Сваёю нішчымніцаю душыцца.

— То гэта-ж і з зямлёю нанава ўся музыка пачнецца?

— Нанава.

— От табе і на.

— Што?

— Мералі, мералі, а гэта нанава пачынай.

— Ну але, найлепш, дык сядзі на печы ўвесь век, не варушыся. Тады само табе ў рукі прыдзе.

— Прыдзе—ня прыдзе, а добра кажа, сядзі рукі склаўшы, дык затое спакойна будзе.

— Душа на месцы будзе. Хе-хе.

Волька ўтамілася да канца сходу. Балела ёй галава, хацелася ісьці па дварэ, у вострым паветры. Ад пярэстасьці твараў, гаворак, галасоў усё мятусілася ў вачох. І ўжо, як чыталі рэзолюцыю, адчула Волька, як хочацца ёй, каб хутчэй была прачытана яна. Было і накурана ў вялікім школьным пакоі—мужчыны ўваходзілі і выходзілі.

Волька сядзела адна за сталом, як усе разышліся. Павольны вечар агортаў зямлю. Чарнявы Петрык пашоў з Макаркаваю Волькаю. Алесь падышоў да стала:

— Ня варта было так зацягваць сходу.

— Чаму?

— Трэба прывучаць жанчын да сходаў, а так дык утамляюцца, неахвотна пасьля хадзіць будуць. А кожная кідае хату, сьпяшае хутчэй дадому... Ня трэба лішне зацягваць.

— Яны самі зацягнулі... Нічога... Я сама вельмі ўтамілася. Галава кружыцца. Пасядзі... Заўтра ячэйка будзе?

— Будзе.

— Давай пройдзем па дварэ.
— Пройдзем... Паспацыруем?
— Давай.
Белы вечар быў цяплейшы за ўчарашні. Вуліца жыла гаворкамі і песьнямі. Абзывалася скрыпка. Прайшлі вуліцу і назад. Кончыліся канцавыя хаты. Прысады чарнелі голымі бярозамі.
— Як жывеш, Алесь?
— Нічога.
Здавалася, ім няма пра што гаварыць. Ішлі моўчкі.
— А ты як, Волька?
— Жыву.
— І я жыву.
— Як у цябе з Ганнаю?
— Ты-ж ведаеш.
— Таксама?
— Мусіць-жа.
— Каморнік-жа паехаў.
— Ну то што?
— А яна тут?.. Дома?..
— Дома. Што з гэтага.
— Ты ўжо забыўся яе?
— Не... Не забыўся.
— Ты выбачай, братка...
— Я вельмі рад гаварыць пра гэта з табою... Толькі з табою.
— ...Ты калі нудзіш па ёй—ідзі да яе. Той паехаў; а з дзяўчынай часамі гэта бывае... Часта гэта бывае ў яе гадох.
— Не, я да яе не пайду. Я не хачу навязвацца ёй.
— Не навязвайся, а дамагайся.
— Храбры рыцар, значыцца.
— Ты ня ведаеш дзявочае душы.

— Там і ведаць няма чаго... Сілком лезьці ёй у вочы я ня буду.

— Яна сама, думаеш, да цябе прыдзе?

— Я ня думаю, што яна прыдзе... Яна таксама мучыцца... Я не падыходзіў блізка да яе, калі апошні раз гаварыў з ёю... Яна папробавала гаварыць са мною і з плачам уцякла ад мяне.

— З плачам уцякла?

— Я з тае хвіліны рашыў ня ісьці больш... Што гэта будзе за жыцьцё, калі яна будзе жыць са мною, а думаць пра таго...

— Яна-ж яго можа і ня ведае добра?

— Можа... Можа як уведае...

— Дык ня будзе думаць пра яго? Можа.

Далей ішлі моўчкі. Маўчала ўсё вакол іх. Вярнуліся назад, ішлі галоснаю вячэрняю вуліцаю.

— Можа зойдзем да мяне?—сказала Волька.

— Зойдзем.

Падняліся на высокі, скрыпучы ганак. Нячутна адчыніла Волька дзьверы. Вокны малога пакою выходзілі на кірмашовы пляц. Яна доўга чыркала запалкамі, стоячы перад вакном.

— Дай я запалю.

Алесь адчуў у сваіх руках яе халодныя пальцы, што перадавалі яму запалкі. Чорны абрыс яе постаці варушыўся на фоне акна.

— На, запалі.

— Якія ў цябе рукі халодныя.

— Сэрца затое гарачае.

— Ня відаць нешта.

— А як-жа ты хочаш, каб было відаць?

— Як... відаць? Ведаеш што?.. Ну, каб было... ну от я і запаліў...

— Што ты хацеў сказаць?

— Не, нічога.

— Не, што хацеў сказаць?

— Якое ў цябе там сэрца гарачае.

— А ты ня ведаеш?

У сьвятле лямпы яна хітра, пажаночы ўсьміхнулася. Алесь сеў на палатанае фанэраю крэсла. Пахла ў пакойчыку вымытаю падлогаю.

— Я... от што...

— Што?

— Я, ведаеш, Волька... жаніцца буду... як ты думаеш?

— Што-ж я тут, братка, магу табе думаць? Як знаеш... Каго-ж ты браць будзеш?

— Знойдзецца хто-небудзь.

— Можаш і Ганну яшчэ ўзяць. Думаеш, яна да цябе ня вернецца?

— Сілком-жа браць ня буду.

— Нашто сілком? Пра гэта ніхто не гаворыць... Хіба можна сілком?

Зноў маўчалі.

— Адна так і жывеш?

— Або ты ня ведаеш!

— Дрэнна аднэй.

— Нічога... на тое лета вучыцца пайду.

— Ня пусьцім на тое лета. Работнікі патрэбны. Праз гады два, тады адправім куды сабе заждаеш.

— Няўжо добра, каб у ячэйцы былі работнікі-невукі?

— Нядобра, але іначай нічога ня зробіш.

— Дык гэта ты напэўна кажаш, ня пусьціце?

— Не.

— Пусьціце!

— Не, ня пусьцім.

— Алесь!

Яна крыкнула і падперла кулакамі бараду. Так і стаяла некалькі хвілін пасярод пакою. Вочы яе калолі яго і губы моцна сьціснуліся.

— Чаго ты крычыш?.. Волька.

Яна зноў крыкнула:

— Алесь!

І раптам зьдзівіла яго. Падышла да стала, узьлягла на яго локцямі і заплакала.

— Чаго ты?

— Нічога ты не разумееш.

— Што?

— Дзеравяны ты, каменны.

— Чаго ты плачаш... ну?

— Ня пусьціце вучыцца?.. Ня пускайце, толькі нашто ўсё так гаварыць заўсёды? Можа мне зусім і ня хочацца ехаць нікуды вучыцца, можа я пагаварыць аб чым такім з табой хацела... Утамілася я. Раніцою ўстаю і спаць мне заўсёды хочацца. Ты ведаеш, якая я ўтомленая?! У цябе што. Ты прыдзеш, сход ячэйкі правядзеш, правядзеш сход гаспадароў, пасьля паедзеш, паарэш на полі... Ты мужчына, ты здаровы... Не, і ня гэтак... ня тое... Адпачыць мне хочацца...

— Бяры водпуск, едзь да сваіх... У сваю вёску. А не, дык чакай вясны, у дом адпачынку пашлем.

Яна маўчала. Села за сталом, сядзела так, падпёршы твар кулакамі. За тонкаю дашчанаю сьцяною ў гаспадара кватэры рыжага Хоні цікаў будзільнік, плакала дзіця. Волька моўчкі адарвалася ад стала, зашмаргнула паркалёвыя фіранкі на вокнах. Зноў стала на ранейшае месца каля стала.

— Пачакай, сястрыца, вясны, тады доўгі водпуск возьмеш.

Цяпер яна ўсьміхнулася.

— Дурная я, плачу няведама чаго... Расклеілася. Зьнемаглася я, сам бачыш... Эх, ты, ліха яго бяры... Нічога, ня думай, што я такая вельмі далікатная, кволлая... Колькі часу цяпер?

— Нічога, ты заспакойся. Грошай у цябе хапае на пражыцьцё?

— Пакуль што хапае... Ведаеш, ты куды пойдзеш ад мяне?

— Дадому.

— Ідзі да Ганны. Ты-ж сумуеш па ёй.

Ён памаўчаў і сказаў:

— Сумую.

— Мне думаецца, што яна ўжо забыла пра каморніка.

— Ласкі яе мне ня трэба.

— Ласкі?—ніколі! Ніколі нічые ласкі ня трэба. Але тут хіба-ж гэта ласка можа быць?

— Я сам ня ведаю, што ты гаворыш. Калі яна заплакала перада мною, я да яе не пайду.

— Наадварот, пайдзі, калі яна заплакала. Прыгалуб.

— Ня будзем больш пра гэта. Можа яно як аформіцца.

Сядзелі моўчкі. Яна была поплеч з ім.

— Ты каго кахаеш, Волька?

— Я-ж табе нейк гаварыла.

Зноў памаўчалі.

— Ціха як.

— Не надоўга гэта. У гаспадара за сьцяною дзіця заўсёды мне спаць не дае. Трэба дзе кватэру зьмяніць.

Алесь заўважыў: валасы ў Волькі прыгожа кучараваліся над шыяй.

— Ты завіваеш валасы?

— Ніколі.

— Чаму-ж яны...

— Гэта так, раскідаліся.

Ён узяў яе за руку.

— Пачакай, я валасы папраўлю.

— Няхай будуць так.

Сьціснуў яе руку. Яна адказала яму гэтым-жа. Сеў да яе бліжай. Бачыў і адчуваў, як зачырванеўся, загарэўся яе твар. Раптам стала яму радасна і добра. Прыціснуўся ілбом да яе галавы. Яе валасы казлыталі яму вочы. Маўчалі абое, слухалі, чакалі. Сядзелі так блізка, прыціснуўшыся.

— Добра як,—сказала яна.

— Добра... Ціха... Волечка...

— Ну, чаго ты?

— Ціха, нічога не гавары.

Абхваціў яе рукамі, адчуваў, як гараць яе шчокі. Пацалаваў у твар. Цалаваў у вочы, у губы. Яна спачатку павісла на яго, пасьля моцнымі рукамі абхваціла яго за шыю, не адрываючыся ад яго.

— Родненькая...

І яшчэ была цішыня.

— Я патушу агонь?

— Не... Любенькі...

— Чаму?

Яна ціснула яго да сябе, абхваціўшы рукамі яго шыю. Дыхала цяжка, гарэла тварам. Ён схваціў яе на рукі і падняў.

За сьцяною заплакала дзіця. Плакала доўга, увесь час. Лямпа гарэла цьмяна. Яны нічога не памяталі, ня ведалі, апроч гэтае свае вострае блізкасьці.

Пасьля, як зноў села яна, папраўляючы валасы і сукенку, ён пацалаваў яе ў галаву, пагладзіў валасы:

— Волечка.

Яна ўсё падбірала пад грэбень валасы. Ціха было вакол. І слаўна было ім удваіх у гэтай цішыні.

X

Вецер зганяў пакурчаныя лісткі з дрэваў—чорныя, апошнія. Дзьмуў сіверам з сініх палёў. На картапляніку ў зацішку маўчалі сабакі, коні пасталі на сена.

Пад вечар Юзік вучыўся калоць дровы. Юрка стаяў каля яго, залажыўшы рукі ў кішэні.

— Дай я папробую.

— Ты ня ўмееш.

— Лепш яшчэ за цябе. Я дома заўсёды калю.

— Пачакай я з'ахвочуся.

— Чаму ты тупіцаю колеш?

— Бо тата не дае вострае сякеры. Кажа, што я яшчэ калена расьсяку сабе.

— Вельмі-ж баязьлівы нешта твой тата. Думае, што ты гэтакі няўдалы.

— Не, ён ня думае... Ой, утаміўся... Ты ўрокі ўжо выўчыў?

— Не.

— І я не. Буду вечарам. Вельмі-ж гэтая матэматыка, каб яна згарэла. Гадасьць нейкая. Цяжка вельмі.

— А мне-ж задачы, дык нічога.

— Уй, нічога! А ўчора дык і не рашыў, як настаўнік пад дошку выклікаў.

— Чаму гэта не рашыў?

— Бо і не.

— А от і рашыў. Гэта адно, што крэйда брыдкая, дык напісалася было нядобра, прачытаць цяжка было, дык я і не адказаў добра.

Юзік кінуў тупіцу пад паветку і засьпяваў. Юрка падсьвістваў:

Ой у полі-полі
Карчомка стаяла.

Пасьля ўдвох разам:

Трай-рай-рата-тай,
Карчомка стаяла.

Пасьля зноў Юрка падсьвістваў Юзіку:

А ў тэй карчомцы
Пілі два уланы...

— Юзік, што гэта за ўланы?
— Салдаты гэтакія.
— А-а, салдаты!? Ведаеш што!
— Ну што?
— Мусіць, наш конь зараз здохне.
— Чаму?
— Бо ўжо зусім нічога ня есьць. Адно ўсё галавой аб жолаб трэцца.
— Чаго-ж ён трэцца?
— Я ня ведаю. Мусіць, гэта яму сьвярбіць ці што.
— У яго ўжо зубоў, мусіць, няма.
— Няма. Пазьядаў.
— Хадзем паглядзім вашага каня.
— Хадзем.
Сівер шумеў у дварэ саломаю, кудлачыў шэрсьць на рыжым сабаку.
— Гэта, Юрка, ваш сабака?
— Наш.
— Дзе-ж вы дасталі?
— Гэта я яго з-пад разьніцы прывабіў. Тата раней крычаў, а цяпер не. Я яго картопляю падкармліваю трохі. А рэшту—ён сам жывіцца.

— Выдумаў, дзе ён табе тут вельмі пажывіцца.

— Чаму не. Сабака заўсёды знойдзе чым пажывіцца. Гэта-ж ганчак—ты паглядзі адно, якія ў яго ногі. Бачыш, які зад у яго—з гладкаю шэрсьцю, тонкі.

— Бо худы, дык і тонкі.

— От паглядзіш, як я яго адкармлю.

У хлеве конь глядзеў у жолаб. Стаяў і не варушыўся. Адно паварушыў вухам і прыгнуў яго ў той бок, дзе заскрыпелі дзьверы.

— Што вы тут робіце?—сказаў крываносы Мікалай, выходзячы з агароду. На плячы ён трымаў лапату.

— Нічога. Глядзімо, ці конь есьць.

— Дзе ён табе тут будзе есьці. Я казаў бацьку—на шкуру трэба прадаць, а то ён заваліць хлеў, тады адно клопату—вывалакай яго. А гэта—сам яшчэ зойдзе.

Зачынілі хлеў і стаялі ўсе ўтрох у дварэ, пад грушаю.

— Дзічка,—сказаў Мікалай, задзіраючы галаву на грушу.

— Яна лепш нават за фунтоўку або сапяжанку,—сказаў Юрка,—яй-богу-ж праўда. Я можа з дзесяць рэшатаў дзічак у сене нагнаіў, ужо можна есьці.

Мікалай цыкнуў праз зубы сьлінаю, папаў якраз на свой левы бот. Падняў нагу, падкурчыў, выцер аб халяву правага бота і пашоў да сянец,ківаючыся з нагі на нагу і паварушваючы плячыма. Па вуліцы ішоў Алесь. Мікалай гукнуў:

— Алесь, курыць маеш?

Алесь падышоў да варот. Мікалай падаўся туды.

— Дзе ты быў з рыдлёўкаю?

— От хадзіў... Шулы ў Хоні ўкопваў—вароты ад вуліцы ставіць.

— Нішто зарабляеш?

— От, так сабе... Чорт яго...

— Чаго ты?

— Нядобра нейк. От, усё, здаецца, ішоў-бы некуды, а куды, дык чорт яго ведае. Нешта не сядзіцца мне на адным месцы.

— Куды-ж табе ісьці?

— Ды так то нікуды. Ні то што мне трэба куды, а так... Цягне.

— Гэта значыць—добра там, дзе нас няма?

— Не, ня тое.

— А што?

— От, так сабе. Што-ж, ні да чаго я ня прывязан тут, нікога, сказаць, і роднага няма. Каб гэта дзе будоўлю якую вялікаю разузнаў, дык адразу туды падаўся-б. Каб дзе вялікая работа адкрылася, дык тут-бы доўга не сядзеў-бы. Унь як мы на ўсе масты пасьля вайны рабілі, пасьля палякаў, дык я там цалюткае лета, восень і нават пачатак зімы перабыў. Тады нейк і жылося інačай. Сказаць, чаго тут мне лішняе ліпець на адным месцы.

— Ты, значыцца, намерыў падацца куды іначай ад нас? Ці як гэта?

— Ні то што намерыў, але ўсё нешта рупіць мне. Здаецца, што ня там я знаходжуся, дзе мне належыць быць... А ты-ж як, жаніцца будзеш?

Алесь успомніў сваю ранейшую гаворку з ім і сказаў:

— Буду.

— Скора?

— Як скора. Пэўна што не сягоньня.

— Яй-богу ты, Алесь, не адцягвай. Я табе тады гаварыў і цяпер скажу, што табе самая пара. Ты-ж жывеш, можна сказаць... ты на сваім месцы, ты займаешся тым, што табе трэба.

Алесю не хацелася гаварыць пра гэта і ён папробаваў пажартаваць:

— Ну, а ты-ж сам?

— Я?! Я—брадзяга, куды там мне.

— І зямлі ніколі браць ня думаеш?

— А што я з ёю рабіць буду? Наўрад ці я тут прабуду больш, як да вясны. Куды-небудзь вялікіх работ шукаць пайду. Будоўлі дзе якое.

— Ну, а там?

— Гэтак сама і там.

— Усё як-бы дачасу?

— Не дачасу, а адна галава не бядна. Чуў прыказку?

— Ну, а як-жа ты так?.. бяз бабы?..

— Эт, што там. Жывучы, усё бывае. Для жывога чалавека—усё ўсюды.

І цыкнуў праз зубы сьліною на халодную зямлю.

XI

Толькі і бачылі Ганну ў той вечар у садзе на гулянцы. Перад гэтым некалькі дзён зусім яе нідзе ня відаць было. Таксама і пасьля таго вечару. Клемусь увесь той вечар не адыходзіў ад яе і цягнуў усё яе скакаць польку. Яна ўсё адмаўлялася, а нарэшце ня выбыла да канца і сказала Клемусю, што зусім пойдзе дадому.

— Дык я правяду цябе?

— Правядзі.

Клемусь пад руку павёў яе дадому, пастаяў на змрочнай вуліцы з ёю, напроці яе хаты, трымаючы яе за руку вышэй локця.

— Я чуў, што ты замуж ідзеш?

— Ідзі ты, ад каго ты чуў?

— Гавораць.

— Плешчуць языкамі, мусіць няма чаго рабіць людзям. Некаму дзела да каго, хто ідзе замуж, хто ня ідзе. Усіх апалошчуць...

— Дык гэта-ж ня я выдумаў.

— Я-ж на цябе нічога.

Клемусю не хацелася разьвітацца з ёю:

— Давай паходзім па вуліцы.

— Не, я пайду.

— Чаму? Яшчэ-ж рана. Ну паходзім?

— Мне трэба ісьці.

Ён сьціснуў яе пальцамі над локцем, пробуючы ісьці.

— Клемуська, пусьці.

— Якая ты ўпартая.

— Сам упарты, ды на каго складае.

Клемусь нехаця разьвітаўся з ёю, сьціснуўшы яе ўсю рукамі сваімі. Яна вырвалася ад яго і пабегла ў двор. Клемусь вярнуўся назад у сад. З таго вечару яна зноў нідзе не паказвалася. Днём суседзі бачылі яе, як упраўлялася яна ў дварэ і на прыгуменьні, а вечарам сядзела яна дома—і сумная і поўная трывожнага чаканьня. Раз вечарам здалося ёй, што пазнае яна ў дварэ крокі і стук Алесевых ботаў. Яна ўстрывожылася, ня ведаючы што гаварыць яму, як трымацца перад ім, гатовая моцна заплакаць. І паспакойнела, калі з сянец увайшоў Вашыновіч. Сядзела ў цёмнай хаце і слухала, як у кухні бацькаў кум, Вашыновіч, гаварыў з бацькам:

— Учора Хоня прыехаў з гораду і гаварыў, што бачыў там каморніка. Па вуліцы ішоў, кажа, выфранчаны, з жоўтаю палачкаю. Пазнаў, кажа, яго, сам скланіўся і дзяндобры даў.

Пачуўся голас мацеры:

— Далікатны чалавек. Вучоны, разумны.

Бацька запытаў:

— А чаго гэта Хоня быў у горадзе?

— Мала чаго балагол бывае. Вазіў некага ці нешта.

Кум, не сьпяшаючы, закурыў, памаўчаў і хітра запытаў:

— Можа што пісаў вам?

— Хто?

— Каморнік.

— Не.

— Можа Ганьне што пісаў?

Бацька памкнуўся быў сказаць не, але аб нечым здагадаўся, хітра паглядзеў на хітрага кума і адказаў:

— А хто яе ведае. Каб ёй і напісаў што, дык яна-ж усё роўна не пакажа.

Кум ядавіта ўсьміхнуўся і сказаў толькі адно слова:

— Ага.

І пачаў з бацькам гаварыць пра цану на конскія хвасты. Тады Ганьне стала горна і нядобра. Злосьць зьявілася і на бацьку за ўсю яго гэтую політыку, і на мацеру, і на хітрага дзядзьку—бацькавага кума, за яго гэтую нядобрую гаворку. Яна глянула ў вакно. Цёмны і пусты быў вечар. Яна апранула ватовую братаву кароткую капоту і пашла на двор. Зямля была цяплейшаю, як усе тыя дні, і ў цемені здавалася мяккай, як пасьля цёплага

дажджу. Пастаяла на вуліцы, пачула музыку. Пашла ў той бок. Музыка была ўсё ў тым-жа садзе, дзе быў сельсавет. Увайшла ў сад. Шумна было; людзей было шмат. Акно з сельсавецкага пакою было адчынена. Накурана ў пакоі было вельмі, і дым выплываў праз вакно. Знадворку ў вакно навісла куча хлопцаў. Дзяўчаты сядзелі на лаўках. У сярэдзіне было цесна і таксама шумна. Хлопцы сядзелі на сталох, на лаўках, на крэслах. Сядзелі цесна, глядзелі на расстаўленыя перад імі ноты. Дзяк Скварчэўскі стаяў перад імі, у тоўстым жаўтаватым фрэнчы, кусаючы ніжнюю губу. У руках трымаў белую, тонкую, кагадзе выструганую ім самім з жаўтаватага дзерава палачку. Выгляд у яго быў вясёлы; вочы сьмяяліся, зубы кусалі ўсё ніжнюю губу. От ён пастукаў аб стол сваёю палачкай, выцягнуў яе перад сабою, роўналежна з ёю выцягнуў і левую руку. Узварухнуў леваю рукою, адкінуў у бок правую руку з палачкаю. І нават паціснуў плячом, скрывіўшы на левы бок увесь твар свой. Грунулі медзяныя зыкі, і ў наступны-ж момант, звыклым ужо рухам рук, зноў сьцішыў Скварчэўскі ўсю капэлю:

— Габой, габой! У такт пападаць трэба... Флейты, сьмялей!

І зноў махнуў палачкаю. Цяпер хвілін дзесяць грымела капэля. Скварчэўскі, сочачы і вушыма і вачыма за ўсім, толькі ледзьве паварушваў рукамі, крывячы часта твар у бок флейты. Клемусь баязьліва глядзеў на яго, палохаючыся кожны раз, калі здаралася дзьмухнуць у трубу ня ў тахт.

— Ня курэце, грамадзяне,—папрасіў Скварчэўскі, скончыўшы.

— Акно адчынена, выцягне.

— Хто хоча курыць, можа на двор выйсьці.

Рыжы Хоня, стоячы каля дзьвярэй, пацягнуў з кулака і схаваў у пальцах зноў папяросу.

— Грамадзянін Хоня Залмановіч, я прашу ня курыць.

— Не, я ўжо скончыў.

Вакол зарагаталі:

— Хоня Залмановіч музыку любіць.

— Хоня і сам добры музыкант.

— З яго лепшы курэц, як музыкант.

Падаўшыся ў дзьверы, Хоня моцным шэптам растлумачыў усім, хто стаяў каля яго:

— Гэта я нёс збанок гуркоў ад сястры. З расолам. Іду, чую, граюць. Каму гэта няма ахвоты музыкі паслухаць!! Ого!

Ён перамяніў у руках, з левае рукі ў правую, збанок з гуркамі і падаўся на ганак. Скварчэўскі сказаў хлопцам:

— Будзьце гатовы.

І разлажыў перад імі новыя ноты.

От ён зноў пастукаў палачкаю аб стол. От зноў упіліся ў яго вачыма хлопцы. Зноў махнуў ён рукою, і кінулася ў сьвет грымучая весялосьць.

— От бо прыждалі,—сказаў Хоня, стоячы на ганку,—дзякуй богу прыждалі свае музыкі.

Нехта адказаў яму:

— Гэта ў іх апошняя рапяціца.

— А тады што?

— А тады як мае быць граць будуць.

У садзе было шумна. Цёмны вечар чула думаў, прыпаўшы да зямлі. Ветру ня было і раставаў лёгкі холад. Ганна стаяла ў садзе адна, ні пад кога не падыходзячы. Каля яе шатнуўся Юрка:

— Чаго ты, Ганна, стаіш адна?

— Так сабе.

Юрка пабег туды, дзе было цясьней і весялей. Ганна адышлася да варот. Узьлягла на нізкі жардзяны плот, глядзела на пустую вуліцу, чорную платамі і голымі дрэвамі. Музыка ўсё бегла шырокімі хвалямі ў сьвет. Магутныя зыкі ўскідаліся, беглі ў абнімку, рассыпаліся нязьлічонасьцю звонкіх кропель вады, у адзін момант зноў гусьціліся ў неабдымную хвалю і беглі, беглі. І здавалася, што ня сутулаваты гэта Скварчэўскі махае там рукою, і ня тыя-ж самыя хлопцы твораць там гэтую вялікасьць.

Сум, журба, захапленьне—вырасталі ў душы дзяўчыны. Цьвілі ружы ў дзяўчыніным сэрцы, чарнелі і вялі іх пялёсткі, і зноў зьмяняліся і ружавелі.

Маладосьць і каханьне поўнілі дзяўчыну. І цяжкасьці чалавечых бур паведамлялі ўжо яе аб нязьведанай глыбіні сьвету. У радасьцях і пакутах пазнавалася гэта.

XII

. . . .
. . . .
. . . . „от я ўжо некалькі дзён клапачуся пра ўсё гэта. Знайшоў ужо кватэру: вясёленькая кватэра. Вокнамі на рэчку. Толькі што над самым домам кожную раніцу ў манастырскай царкве па поўгадзіны ў звон б'юць, паспаць не даюць. І ход асобны з кватэры—замкнуў, ключ у кішэню і пашоў. Так што ты ведай адно—дзён праз пяць чакай мяне. Прызнацца, мне самому ня хочацца ехаць—уся

вуліца выбяжыць глядзець, як мы ад'яжджаем. Я думаў раней даць тэлеграму, каб ты выяжджала. Але я ведаю, што ня прыехаць ня можна. Папершае, у хаце ў вас будуць няпрыемнасьці, як гэта дачка ідзе замуж і маладога няма, сама да яго едзе. Падругое, можа нават цябе зусім з дому і ня пусьцілі-б так. Дык я прыступіў да працы ў зямельным аддзеле і адначасна падаў заяву, каб далі мне на двое сутак водпуск. Дык праз дзён пяць чакай мяне і сама рыхтуйся да выезду. Калі буду выяжджаць, паведамлю тэлеграмай.

Учора заходзіў да мяне Паўлік Кулікоўскі, той самы, з якім ты таксама, як і са мною, некалі бачылася ў горадзе некалькі разоў. Той, пра якога мы ўспаміналі раз, калі я жыў у вас. Ён гэтым летам ажаніўся, прывёз жонку з Менску. Мянчанка яна і родам. Прыгожая, але мне не падабаецца. Дык яна там служыла недзе, а тут не дае яму супакою, ня хоча жыць тут. Што гэта, кажа, за горад, усяго якіх-небудзь дваццаць вуліц і тыя амаль усе дзеравяныя. Грызе яго, каб стараўся перавесьціся ў Менск.

Я яшчэ больш цябе кахаю, калі само напрошваецца параўнаньне цябе з іншымі. Я памятаю, як ты муку сеяла і якая ты была ў тую хвіліну, калі я падышоў да цябе. Ты ўвесь час стаіш у мяне ў вачох, і я ўсё думаю пра цябе. Як у якім тумане. З тых дзён, калі выехаў ад вас, не магу ніяк сабраць думак, каб стала засесьці за работу. Калі ты прыедзеш, тады пачну працаваць над сваёй дыплёмкай. Цяпер пасьля зямельнага аддзелу спацырую каля свае кватэры па беразе рэчкі. На другім беразе стукае і шуміць новая электростанцыя, тут-жа бераг пусты і вада халодная. Сіняя вада і глыбокая. І я рад, што ў гэтым акруговым

горадзе займуся зараз дыплёмкаю і ты будзеш пры мне!

Я ўжо наглядзеў табе падарунак, куплю тады, калі прыедзеш. А што, не скажу, няхай гэта будзе табе сюрпрызам.

Паўлік Кулікоўскі часта да мяне заходзіць, асабліва цяпер пачаў, калі ў яго вельмі далёка зайшлі непаразуменьні з жонкаю. Прыходзіць і гаворыць аб чарговых справах нашага акруговага зямельнага аддзелу. Раней дык ён мог гаварыць аб усім, чытаў шмат, любіў музыку, а гэта высах нейк і ўсё як-бы куды сьпяшае. Да чаго можа дайсьці ў чалавека. Што значыць—павязе ці не павязе ў жыцьці, заўсёды гаворыць ён мне, калі мы пачном аб гэтым гаварыць. От я, кажа, разлучуся з жонкаю на вясну, тады мне і павязе. Паеду, кажа, кудынебудзь на вялікую практыку, займуся вялікаю работаю. Невядома, як гэта ўсё будзе, пабачым.

Дык чакай ад мяне тэлеграмы і зьбірайся. Я тады нічога з вашымі пра гэта ўсё не пагаварыў. І ты, мусіць, сама нічога не казала ім (ведаю я цябе!). Дык ты як-небудзь скажы, так, каб лішне доўгіх гаворак і разваг ня было. Калі на тое пашло, пачытай ім гэты ліст. Абы ўсё зрабілася без усялякіх там замінак і зацягваньняў. Каб ніякіх цырамоній ня было. Мусіць табе давядзецца яшчэ вытрымаць націск наконт шлюбу ў царкве. Трымайся і чакай мяне.

Я цябе кахаю вельмі моцна. Чакаю цябе; і ты чакай мяне.

12 лістапада. *Андрэй.*

Ганна дачытала ліст, заплюшчыла вочы. Прыціснула ліст да ілба.

XIII

І як гэта зноў усе зараз-жа ўсё ўведалі!? І якім гэта чынам маглі дазнацца, што было напісана ў тым лісьце, калі Ганна толькі і пачытала яго аднаму бацьку, а тады і ў хаце нікога ня было. І ня чытала нават усяго, а толькі ўрыўкі. А Юлік Барановіч—хіба калі каму што гаворыць пра свае сямейныя справы?

Перш за ўсё Сабастыяніха пачала шкадаваць, што гэтакая прыгожая і здольная дзяўчына гэтак непалюдзку замуж ідзе. Каморнік нават ня хоча, каб адбылася хоць якая-небудзь вясельная вячэра або абед з усімі сваякамі і сваячкамі, не гаворачы ўжо аб шлюбе ў царкве; што каморнік стараецца толькі як выхваціць Ганну з дому, каб яна больш сюды нават ніколі і ня глянула, каб адцуралася бацькоў, братоў, усіх родных, каб выраклася бога. І ўсё затым, што ненавідзіць, чамусьці, каморнік самога Юліка Барановіча. (О, гэты дык зяць!) І яшчэ вядома было Сабастыянісе, што каморнік пісаў Ганьне ў тым лісьце, каб яна нічога з дому ня брала, барані божа, каб нічога! Нават калі маці будзе даваць падушкі, дык каб узяла адну, ня больш. Бо, кажа, ён, што ў яго для Ганны знойдуцца і падушкі, і ўсё іншае, чаго нават дома ў свайго бацькі яна і ня сьніла. І што ён яе будзе на руках насіць, што яна будзе за ім панаваць, што ён не дазволіць на яе ветру павеяць. Але ўсё гэта будзе толькі ў першыя часы, а пасьля раптам мінецца гэтае Ганьніна панаваньне. Бо цяперашнія шлюбы нямоцныя, бо каханьне адно ня трымае, надоўга ня зьвязвае людзей. Патрэбен бог і сумленьне. Закон патрэбен. Тады хоць і апрыкраюць адно аднаму, хоць і цяжка жыць разам, хоць і

ненавідзяць адно аднаго, але жывуць, трымаюцца. І такім чынам трымаюць сям'ю, выхоўваюць дзяцей, якія ведаюць, што трэба жыць часам з квасам, парою з вадою, што гэтага ніколі ў жыцьці ня мінеш, адно трэба быць добрым і літасьцівым усюды і заўсёды. Пасьля-ж, як пасівее галава, тады спакойна ўжо будзе дажывацца век, бо за доўгія гады прывыкнецца, пераживецца, усё будзе добра, спакойна і ціха. Каморнік-жа думае і жыве інакай, і ніколі Ганна ня знойдзе з ім свайго шчасьця. Ён так выразна напісаў Ганьне. Так і напісаў.

І адкуль гэта Сабастыяніха магла дазнацца пра ўсё гэта?

Барановічаў кум Вашыновіч гаварыў дома жонцы:

— Я не зайздрошчу, я кажу: няхай, тымчасове, здаровы жывуць. Я такі чалавек. Але не магу не сказаць, што нешта гэта робіцца ня так, як трэба. Калі ты хочаш быць зяцем, дык ці гэта гэтак робіцца? Ён-жа нават з бацькам ні разу, як з чалавекам, не пагаварыў. Не пагаварыў, тымчасове, ні разу, як мае быць! Што гэта, бацька не такі чалавек, якога яму трэба ці што? Яна-ж гэта сама пра ўсё і гаварыла з бацькам, а ён хоць-бы слова казаў! Але яна таксама. От-бо маладыя цяпер якія! Я-ж кажу, няхай здаровы жывуць, ды разжываюцца. Я не зайздрошчу, няхай мяне бог крые, у мяне нават, тымчасове, і ў думках нічога гэтага няма; не такі я, дзякуй богу, чалавек. Табе яна ўпадабалася, то ты бяры яе сабе на здароўе, але будзь ты чалавекам! Ты ведаеш, што ён напісаў ёй?

— Чула,—адказала жонка.

— А дзе ты чула?

— Сабастыяніха гаварыла.

— Гэта што табе Сабастыяніха гаварыла, дык гэта плюнь ты на гэта. Мала табе там баба якая нагаворыць. Бабы заўсёды языкамі любяць трапаць. Мала што там Сабастыяніха нейкая гаварыла. Я і сам, бяз ніякае там Сабастыяніхі, ведаю, што Юлік павінен тут паставіць на сваім і ніякіх тут бабскіх плётак мне не патрэбна.

— Сабастыяніха гаварыла праўду.

— Якую?

— Што так, пасабачаму аддаваць дачку замуж нельга. Бо ўсё роўна не надоўга гэтая музыка.

— А гэта, як бог дасьць, вельмі вы ведаеце, бабы. Тут можа не надоўга, а можа і якраз надоўга. Хто ведае. Тут ня ў гэтым уся музыка. А ў тым, што Юлік павінен быць цьвярдзейшым і зрабіць усё, як мае быць. Каб не рабілася ўсё на сьмех людзкі. Мне ніякага дзела да гэтага няма, але калі з гаворкі прышлося, дык я скажу. Скажу гэта самому Юліку ў вочы. Я яму, тымчасове, не зайздрошчу і нічога дрэннага яму не жадаю. Бог з імі, няхай ім бог памагае, мне што! Я, тымчасове, такі чалавек...

І доўга ён яшчэ гаварыў аб тым, што ён такі чалавек, што нікому ён не зайздросьціць, і што ніколі ня трэба слухаць бабскіх плётак. Гаварыў, стараючыся задушыць у сабе вострыя прыступы нездаваленьня, што Юлікава дачка, маладзейшая за яго дачку, так добра замуж ідзе.

Алесева-ж маці сказала раз, нясьмела паглядаючы на Алеся:

— Гэта такі праўда, што Барановічава Ганна замуж ідзе за таго самага каморніка.

Алесь, стараючыся больш не гаварыць пра гэта, сьціснуўшы губы і памаўчаўшы, адказаў:

— Ну няхай ідзе, каму якое дзела.

Маці ўздыхнула і сказала:

— Загарадзі ты, сынок, у садзе каля вуліцы тую граду, пакуль зямля не замерзла. А то вяснюю таксама не прыбярэшся, як і цяпер, і таксама ня будзе дзе расады пасеяць.

— Чаго вы, мама, злуеце?

— Я ня злую.

— Не, злуеце.

— Калі бо ты гэтакі гаспадар.

— Які-ж я гаспадар?

— Такі, што за ўсю вясну ня прыбраўся нават плоту загарадзіць.

— Але-ж вы нікога не наймалі плот гэты загараджваць!?

— Не наймала, але без свае расады была.

— Я вам дастаў чужое, але лепшае за гэтую вашу сваю.

— Табе нічога ня трэба. Калі заводзіш гаспадарку, дык ня гэтак трэба займацца ёю. Трэба пільнавацца яе, а не прападаць вечна на гэтых сваіх ячэйках.

— Чаго вы ад мяне хочаце?

— Жаніся ты. Я не магу адна ў хаце, старая. Не гады мне. Табе пра мацеру і галава не баліць.

— Чым я вас калі крыўдзіў?

Яна яшчэ нешта пачала гаварыць, стараючыся давесьці сваю праўду. Алесь моцна стукнуў дзьвярыма і пашоў з хаты. Хацеў пайсьці да каго з суседзяў, але пабаяўся, каб не патрапіць на гаворку пра каморнікава вясельле з Барановічаваю Ганнаю. Пастаяў на вуліцы, пакурыў. Падышоў да сельсавету. Там было цёмна і пуста. Нядобра было яму

так, аднаму.—Зайсьці да Волькі?—падумаў ён. У яе гарэла сьвятло. Пастукаў з вуліцы ў дзьверы. Адчыніла Волька—прыбраная, ружовенькая, у белай палатнянай блюзцы, з вышытым каўнерыкам і паяском.

— Заходзь, Алесь.

На ложку сядзела незнаёмая дзяўчына, падобная трохі на Вольку. Толькі белая, з сінімі вачыма.

— Будзь знаёмы, мая сястра прыехала пагасьціць.

— Надоўга?

— На дзён пяць.

Алесь глянуў на дзяўчыну:

— Чаму на такі малы час?

Голас у яе быў прыемны, пявучы:

— Некалі зімою прыеду, будзе тады павальнейшы час... От прыехала паглядзець, як яна тут жыве. Даўно ня бачыліся мы з ёю.

Алесю яна спадабалася. Прывабная яна была, слаўная. Такою ўяўлялася яму. Ён сеў, памаўчаў. Волька перакладвала ў куфэрку нейкую бялізну. Паглядала на яго з-пад ілба. (З таго вечару яны ня бачыліся яшчэ). Ён адчуў, што нешта між імі існуе і што трэба разбурыць некалькімі словамі. Так было нядобра. Ён паглядзеў на Вольчыну сястру. „Слаўная якая“,—падумаў ён і сказаў:

— Ну я пайду.

— Пасядзі, Алесь.

— Другім разам зайду.

— Пасядзеў-бы.

— Пайду.

Волька паглядзела на яго. Ад яе зірку яму зрабілася лепш, чым было дагэтуль. Але ён пашоў, бо цяпер, у прысутнасьці сястры, нельга было якнебудзь іначай пагаварыць з Волькаю.

На дварэ пробаваў дзьмуць нясьмелы вецер. Алесь зашпіліў каўнер. Вольчына сястра стаяла ў яго вачох. І раптам вялікі сум па дзяўчыне агарнуў яго. Па дзяўчыне такой радаснай, жывой, якою ўявілася Вольчына сястра.

„Калі яна паедзе?.. Заўтра зайду“...—думаў ён.—„Куды цяпер пайсьці?“

Ішоў цёмнаю вуліцаю. Побач з цёмнымі абрысамі царквы, у Скварчэўскага, сьвяціліся вокны.— Хіба зайсьці?—падумаў. Пастаяў. Рашыў увайсьці.

Скварчэўскі сядзеў за сталом, разварочваў запыленыя скруткі нот. Сказаў весела, гледзячы на Алеся:

— З гары дастаў. Усё роўна, як на дарозе знайшоў. Ведаеце, што гэта за п‘есы? От вам увэртура з опэры Кармэн. Бачыце? Чулі калі? Я сам у палку на флейце граў, а самую опэру ў Менску ў тэатры чуў. Я, ведаеце што?..

Скварчэўскі раптам ўсхваціўся, шмаргануў па твары рукамі, нэрвова прабегся па пакоі. Стаў перад Алесем:

— Я вам зараз... у двух словах...

— Кінь гэтае—вам, гавары—ты.

— Ты? Дык от...

Яшчэ бліжэй падышоў:

— Я дастаў рукапіс. Я заўсёды цікавіўся. У Менску, як быў... Знаёмы адзін музыкант перапісаў мне. Увэртура да пастаноўкі дзяржаўным тэатрам п‘есы... От забыў якога пісьменьніка... Чужаземнага нейкага... Спадчына, завецца п‘еса тая. Увэртура, капэля і хор галасоў разам. Ведаеш?.. Мы клясычныя рэчы будзем тут граць. Я кажу. Ведаеш ты, таварыш Алесь, я жыць цяпер пачаў...

Раптам глянуў у кухню:

— Люба!

Жонка глянула ў адчыненыя дзьверы.

— Люба, ты нам, з таварышам Алесем, гарбаты.

Зноў да Алеся:

— Першая задача—год з капэляю працырамоніцца.

— Год!?

— Ня менш. Сапсаваць ня штука. Але каб правільна разумелі музыку!

— Ну, а пасьля?

— А пасьля хор. Гэтых самых, што са мной у царкве сьпявалі. Я іх на іншыя рэйкі перавяду!

Алесь маўчаў.

— Толькі... Я от усё зьбіраюся сказаць...

— Ну, гавары.

— Тут справа простая. Праз які-небудзь год, ці можа хоць і больш, на курсы якія-небудзь трэба мне. Калі там тое ў мяне было! Я адстаў ад сучаснае музычнае школы.

Алесь панура сказаў:

— Грошай няма. Што ты зробіш.

Той як-бы і не заўважыў:

— Хоць гады праз два.

— Тады пабачым.

— Трэба, няйначай. Бо я—займаюся, от і адчуваю, што маглі-б тут увесь сьвет зьдзівіць. Чуў нашу апошнюю рэпэтыцыю?

— Гэта ў сельсавеце?

— Не, тут, у мяне.

— Ня чуў.

— Трэба было паслухаць. Хлопцы здольныя. Таленты. Я іх усіх на рэйкі паставіў. Цяпер простыя рэчы ідуць у нас, просьценькія. Пасьля будзем на іншы маштаб пераходзіць.

Алесь выпіў з ім гарбаты, маўчаў, слухаў. Той усё гаварыў, разьвіваў пляны, стараўся ўцягнуць у гаворку жонку.

Адыходзячы, Алесь паглядзеў на твар гэтага оптымістага. Твар яго быў сьветлым, жыцьцёрадасным.

Трохі расьсеяўшы ранейшыя нядобрыя настроі свае, Алесь вышаў. Ціха было на вуліцах. Каля пажарнага складу гарэў ліхтар і варушыліся каля яго чорныя постаці. Чуваць была гаворка. Недзе, за некалькі вёрст, быў пажар,—ружовы промень ледзьве трапятаўся на чорным небе. Алесь падышоў. Каля помпы стаялі ўчатырох. У помпу была ўпрэжана пара коняй. У тры бочкі было ўпрэжана па каню. Хлопцы, падпяразаныя пажарнымі паясамі, спрачаліся:

— Ну, лезь на бочку.

— А ты?

— Чаму канечна я. Чаму-ж ты ня хочаш!?

— Слухай, ты, лезь на бочку.

— А ён?

— Што ён?

— Чаму-ж гэта ён ня хоча?

— Ён на помпу сядзе.

— Які ён разумны. Няхай папробуе на бочцы.

Пастаялі, памаўчалі і зноў пачалі спрачацца. Закурылі. А водблескі пажару пачалі меркнуць.

— Ну то паедзем ці не?

— Ну, а як-жа?!

— А можа ўжо ня варт?

— Як гэта ня варт! Чаму гэта ня варт! Дурны!

— Дык-жа патухла ўжо.

— Дзе яно к чорту патухла!

— Паглядзі-ж.

Непаваротлівая постаць узьлезла на бочку, глянула паверх нізкіх стрэх і платоў.

— Ну але, мусіць, тухне ўжо.
— Чэрці, каб на вас халера! От заўсёды гэтак. Якія з вас пажарнікі!.. Абібокі, таўкачы.
— А ты. Чаго-ж гэта ты не хацеў на бочцы трасьціся? Эйш ты галава!
— А ты што?!
— Глядзі на сябе!..
— Пажарнікі, каб на вас агні.
— Ну але.
— Трасца матары вашай.

XIV

Алесь адпачываў ад усяго.
Дні былі хмурныя, мяккія. Па высокім небе плылі абрыўкі хмар, і ўсё было прасторным на зямлі.
Коні паволі ішлі мяккаю дарогаю. Ідучы поплеч з Алесем, Тамаш гаварыў:
— Нават Лявон і гаварыў дома, куды ты, бацька, паедзеш, я сам, кажа, наважу дроў. А я думаю—няхай лепш малоціць... Гэта ні то, што калодкі якія, гальлё магу і я прывязьці... Ну то як з алейняю будзе?
— От, каб як на гэтай гары вазоў не паварочаць.
— Эт...
Тамаш задыміў з вішнёвага папяросьніка. Гаворка ня клеілася. Моўчкі праехалі гору і рэчку...
— Добры дзень,—сказала дзяўчына, сыходзячы з дарогі на бакавую каляіну.
— Дзень добры,—радасна адказаў Алесь і азірнуўся.
Дзяўчына ішла ўжо далей, і вецер, трэплючы яе сіняе плацьце, рабіў постаць яе рухаваю. Хутка яна схавалася за гарою. І Тамаш азірнуўся:
— Што гэта за яна?

— Знаёмая.

— З Чучаноў?

— Але.

— Я недзе як-бы бачыў яе.

— Чучаноўскага Зьмітра дачка. Што Аляксандру на палавіну поле рабіў.

— Я гляджу, што знаёмы твар нейкі.

І зноў гаворка больш ня клеілася. Алесь маўчаў і думаў пра спатканую кагадзе Зьмітровую Маню з Чучаноў. Хацелася вярнуцца назад і ісьці з ёю.

— Чаму яна босая ходзіць? — раптам сказаў Тамаш, — а чаравікі ў руках нясе.

— Босай лягчэй.

— Не.

— А чаму?

— Каб чаравік у гразь не запэцкаць. А падыйдзе пад мястэчка, сядзе, абуе чаравікі і пафарсіць па мястэчку ў выглянсаваных чаравіках. Бо як-жа іначай. Босай-жа ўжо халодна ў ногі.

Алесь нічога не адказаў, і Тамаш зноў змоўк.

Раптам Алесь ускінуў вочы ўгару, агледзеў усё. Паглядзеў на Тамаша. Той нахаду роўна гойдаў плячыма. І запытаў Алесь:

— Вы, дзядзька, як, пра што вы цяпер думаеце?

— Цяпер ці заўсёды?

— Заўсёды найбольш?

— Што ты, браце, пытаеш, хто-ж яго скажа табе адразу. Жывучы—усякае думаецца. А ў маіх гадох...

— Тамаш раптам ажывіўся.

— ...а ў маіх гадох, дык самому не разабраць, што ва мне робіцца. Бо...—Ён яшчэ больш ажывіўся... бо гады, сказаць, праходзяць... Прайшлі. можна сказаць, гады. Гадоў назад ня вернеш. Скончана! Вядома, што чалавек ня рад гэтаму. Прайдзі

ты сьвет, то гэта табе заўсёды было і будзе. На гэтым сьвет стаіць... Дык от усякае думаецца. Думаецца і аб гэтым. Здаецца, размахнууся-б на ўсе, як той казаў, застаўкі, а тут—а куды ты! Ведай сваё месца. От што! Пераждылося ўсё, мінулася... Ты думаеш, я ня чую, што доўга на сьвеце не пажыву? Ведаю, браце, што яшчэ якіх пара год, яшчэ пара, і ўсё яно ідзецца да... сам ведаеш да чаго. Каб мне гадоў з дзесяць ды вярнуць назад... Братка-ж ты мой!

Алесь маўчаў.

— От думаецца ўсё. Пражыў век—дабра ня бачыў. Па смалакурнях, па балотных равох, па панскіх маёнтках усю маладосьць пражыў. Не агледзеўся, калі прайшло ўсё. А з жонкаю як жыў? Ты думаеш добра жыў гэта я? Як я жыў? Ні я ёй ня люб, ні яна мне. А чаму?! Бо галота страшная, бядота нясусьветная. Часам і кавалка хлеба ў хаце ня было. Нічога ня было. Душу ня было чым пражывіць. А калі і было чым, дык гора якое падкоціцца, што і кавалак той у рот ня лезе. Кавалка хлеба ў душу ня ўбіць. Ты думаеш што. Ад гэтага ўсё, гэта ясна, як божы дзень. Вядома, што... Тут яно, што важна? Што чалавек ад чалавека далёка, што чужым ён робіцца другому. От хоць-бы і ў мяне. Гэта пасьля ўжо, дзяцей пагадаваў, у заработкі яны пашлі былі, дык памацнеў трохі. А то часамі кашулі ня было перамяніцца. Ты паверыш? Было тое, што вошы заядалі. Яна, бывала, наваліцца, што я жыць ня ўмею, што я няўдалы, а я— што ты ёй на гэта скажаш і чым ты ёй давядзеш? Лаяцца? Пробаваў і гэта... Так яно вот і пражылося. Пасьля, я-ж кажу, дзеці павырасталі, пашлі ў людзі. А як яны выросталі. Ці гэта гэтак трэба чалавеку выростаць?! Ават і цяпер часам старэйшы

возьме ды ўспамяне: мы, кажа, пры табе ніколі дабра ня бачылі. Як-бы гэта я тут вінаваты ў чым. Малодшы, дык усё вучыцца хацеў. Намагаўся, аж страх. А тымчасам, дзе той у мяне дастатак для гэтага? Мне яго і шкада было, і тады і цяпер. Я дык усё адмоўчваўся перад ім. Раз толькі ня вытрымаў, сказаў нешта груба, а ён мне ў адказ: калі, кажа, на гэткае жыцьцё, дык начорта ты мяне на сьвет пусьціў. А ты ведаеш, што гэта значыць, калі дзіця папракае бацьку, што ён яго на сьвет пусьціў? Ведаеш ты, што гэта? Дык от я і дадумаўся. Трэба на сьвеце, каб было так, што каб дзіця дзякавала бацьку за тое, што зьявілася яно на сьвет. Гэтак ці не? Ты скажы, праўду я кажу? Ну, так яно от усё. Вядома, што ўсё гэта чалавека вучыць. А сілы ў мяне было—чорт яго ведае. Так я яе ўсю і ўвагнаў ва ўсякія там смалакурні і куды ты сабе хочаш. І бяз толку ўсё. Што-ж ты скажаш!.. І шкода ўсяго, самога сябе шкода, як падумаеш. Каб гэта я радзіўся пазьней крыху! Што-ж, немач мяне цяпер агортае ўжо. Гады. Дуб і той ломіцца. Камень і той крышыцца. А то—чалавек! Дзіва вялікае! А гадоў ня вернеш. Усё чалавек можа на сьвеце, а гадоў ня вернеш і роднага бацьку з маткаю за грошы ня купіш.

Тамаш дыхнуў Алесю ў твар дымам з вішнёвага свайго папяросьніка. Ішоў моўчкі, пахвостваючы на хаду пугаю па сухой мятліцы на каляінах разьежджанай дарогі. Памаўчаўшы, зноў:

— Ты, браце... От хочацца сказаць, ды часамі адразу выказаць нейк не магу. От што...

Алесь маўчаў. Тамаш папрабаваў скрывіць твар нясьмелаю нейкаю ўсьмешкаю:

— Жыві ты, браце, ды пладзі дзяцей...

І яшчэ памаўчаўшы:

— Іначай жыць яны будуць. Я гэта сам удзёўб сабе ў галаву і ўсім дзяўбу. Усюды гавару.

І пачаў пра нешта думаць. Шырока ступаў новымі, разношанымі ўжо ботамі. Бесьперастанку курыў. Зноў:

— Цяпер от той на мяне воўкам глядзіць, а той чакае, што з гэтага ўсяго будзе... А я...

Моцна і здорава ўздыхнуў.

— ...а я раблю і шкадую, што гады прайшлі. Што доўга не давядзецца ўжо на сьвеце пажыць.

Алесь востра блiснуў вачыма:

— Невядома.

— Што ты, браце, жартуеш!

— Хіба сябе дрэнна чуеце?

— Я-ж казаў табе, што немач мяне агортае.

— Падлячыцца.

— Што ты тут падлечышся... Прайду трохі—ногі млеюць. Як разварушацца пры рабоце, дык яшчэ нічога. А так, дык хоць і сядзі на адным месцы, як, усё роўна, ланцугом прыкованы... Не даюць веры, кажуць усё, што я здаровы, што я рухавы, а ў сярэдзіне ў мяне здароўя няма. Каму лепш ведаць, як ня мне самому. А скажы ты каму!

— Менш рабіць трэба.

— Гэта вядома.

— Ёсьць-жа, здаецца, ад каго.

— Ды яно ёсьць. Я-ж ужо і гаспадар дома так сабе, прышый, як той казаў, кабыле хвост. Сын.

— Што, з сынам ладу няма?

— Не, што ты!

— Ну, а што?

— Запраўляе ён усім. Ну, а мне што. Няхай гаспадарыць. Я от памагаю адно. Колькі магу.

Зноў закурыў. І ўсё схвостаў пугаю сухую мятліцу на каляінах. Алесь нічога не гаварыў.

Стукалі калёсы, трасьліся вазы.

Хмары ўсё плылі па высокім небе. Гусьціліся на даляглядах, сінелі і цямнелі над зямлёй. Гойдаліся вятры на дрэвах, зямля маўчала, слухала ў чулай дрымоце і вострай чуласьці. Поле пахла ветрам. І шырынёю сваёю жадала сонца. Сінелі лясы, ціха і нявінна. Так, як падзіцячаму сьвецяцца конскія вочы на палявых дарогах.

XV

Даўно ўжо абветралі дарогі; пашарэла ральля і добра ўрунела жыта. Поле сумавала пад густымі вятрамі, пад радасным пахам ялоўцу. І сьледу не засталося ад курлыканьня жураўлёў, плаўнага руху гусей. Балоты жаўцелі ў хмурнасьці сініх дзён, маўчалі і шырыліся асеньняю воляй. Пахла зямля карою дрэваў, халодным карэньнем мокрага зельля з рэкавых берагоў і з дна рэчак, чыстых і ціхіх, як конскае вока.

Яшчэ часамі пастушкі гналі авечкі ветравым полем і туманілі неба дымам сухога картапляніку. Пробавалі сьпяваць салдацкія песьні. Пасьля маўчалі, аддаючыся задуменнасьці сухое саломы і пажаўцелай травы.

І якая-ж трава маўчала на полі! І ў якіх-жа туманох вырастала яна і сохла!

Пыльнае сьцябло было ў травы! Абпыленае летняю гарачынёю, размахамі асеньняе волі. Веснавымі вятрамі, сонцам; і нястрымнасьцю дарог. Ляжалі дарогі, беглі ў сьвет. І гойдалася трава каля іх. У карэньнях травы, у земляной прытульнасьці летавалі мурашкі, поўзалі па траве і жылі. Вятры атрасалі іх з травы, дажджы палівалі траву

і лашчыла яе сонца. Зьядалі траву коні, і сіні куст выростаў і купчасьціўся зноў.

На хмурных дарогах надоўга асталявалася восень. Жыла ў неабдымнасьцях сьвету і цешылася радасьцю зямлі.

Зьбіралася ўміраць восень! І ў павольным скананьні яе хваляваліся буры і кіпелі імкненьні. І ў пажоўклай траве была радасьць гэтых і ўсякіх дзён; жыла і кіпела—у пахучай зямлі, у каменьнях, у лісьці.

Асеньнія туманы ўзьнімаліся і асядалі. Разыходзіліся яны па зямлі, кроплямі вады сядаючы на дрэвы, на камень. Зыкі доўга гучэлі ў туманох і ўсё чулае і радаснае, задуменнае і сумнае, жывое, трымала ў сабе іх вясёлую сілу.

Дні праходзілі, мерклі і нараджаліся.

Які туман стаяў на дарозе!

Перавесіўшыся набок, каб не абмуляцца, паволі ехаў сабе конна Юрка. Толькі чуў, як пахне яловец і за пяць конскіх крокаў ад сябе нічога больш ня бачыў у густых засьцілах туману. Пацмокваў губамі на каня, паплёўваў паабапал яго шыі і ўсё пачынаў цягнуць бясконцую, як зямныя дарогі, песьню:

Эй ты, э-э-эй.
Эй, ты, э-э-эй.
Фью-ю-ю-ю.

І думаў: „колькі гэта будзе ўжо, як мама памерла? Ці месяц, ці паўтара, ці можа і два? А пасьля пачаў думаць пра каня. Глядзеў, як конь трос шчуплаю грываю і шкадаваў яго. Пасьля пачаў развважаць сам з сабою:

— Прышвы павінны быць добрымі і калі папраўдзе гэта шавец праз тры дні, як казаў кагадзе,

пашые, то ў нядзелю можна будзе абуць іх. Толькі няхай ужо тады сам тата ідзе па іх. Бо на кані зноў ехаць, дык толькі абмуляюся, а на драбінах, мусіць, такі праўда, што не заедзеш. Задняе калясо і вярсту не праедзе. Хіба пацяплее на дварэ, тады босы пайду, а калі будзе гэтак холадна, дык як-жа я зайду ў гэтых маміных чаравіках. Адно ногі паабрэзваю... Адно каб як гэта дастаць дзе трохі грошай на ваксу, дык вельмі-б добра было, каб паваксаваць боты. Новыя яны і так добра, але як трохі паносяцца... Невядома, колькі гэта капеек вакса каштуе?

І зноў засьвістаў:

Фью-ю-ю, фью-ю-ю.
Фью-ю-ю, фью-ю-ю...

І засьпяваў:

Ой у полі-полі,
Карчомка стаяла...
Фью-ю-ю, фью, ю, ю...
Фью, фью-ю, ю...

На агародзе спаткаў яго рыжы сабака. Ішоў збоку, падбягаў, падскакваў, стараючыся лізнуць яго ў твар. Твару дастаць ня мог і аблізваў усё нагу.

— Пашоў! ня ліжыся!.. пашоў вон!

Сабака на момант адбягаўся, выпярэджваў каня.

— Фью, фью, на-цю-на. Хадзі сюды, куды ты. Фью, фью...

Сабака варочаўся і бег насустрач.

Каля школы таварышы не далі яму праехаць

— Чаму ты сягодня вучыцца ня прышоў?

— Чаму ўрокі прапусьціў?

— Дзе ты быў, Юрка?

— Чаму твой конь такі худы?
— Куды гэта ты езьдзіў?
— Гэта твой сабака?

Ён толькі ўсьміхаўся і ехаў далей. Юзік дагнаў яго і ішоў поплеч:

— Дзе ты быў, Юрка?
— У Чучанох.
— Чаго?
— Езьдзіў даведвацца, ці боты гатовы.
— Чаму-ж вы ў Чучаны аддавалі шыць?
— Там таней шыюць.
— А што, не гатовы?
— Не яшчэ.
— А калі будуць гатовы?
— К нядзелі... колькі гэта каштуе вакса?
— Ня ведаю. Мусіць дзесяць капеек.
— Не, здаецца, сем.
— Ну але, мусіць, сем. Нашто табе?
— А от як боты будуць...
— А-а-а...
— Бяз ваксы ня добра.
— Дурны ты. Дык ты можаш прасіць у Мікалая. Ён-жа кожную нядзелю боты ваксуе.
— Дык ён дасьць раз ці два, а пасьля возьме ды ня дасьць. Найлепш сваю мець.
— А вы, як перад вялікаднем калолі япрука, дык шчаціньне прадавалі ці не?
— Не, ляжыць у сенцах на бэльцы. Тата, як заколе цяпер зімою другога, дык тады разам прадасьць.
— Дык ты вазьмі трохі шчаціньня ды занясі на места прадаць. От табе і будзе на ваксу.
— А як тата агледзіцца?
— Вельмі ён пазнае.
— Дык я так і зраблю хіба.

— Зрабі.

— А калі тата запытае, дзе я ўзяў грошай на ваксу?

— Скажы, што знайшоў на месьце дзесяць капеек.

— Ня дасьць веры.

— Дасьць.

— А чаму гэта ты так рана з школы ідзеш?

— Цяпер матэматыка засталася. Няхай яна згарыць. Яна мне страшна. Я дома ўчора задач не рашыў.

— Дык уцякаеш?

— Няхай яно згарыць. Яшчэ настаўнік возьме ды пад дошку выкліча, тады хоць плач.

— А калі папытае заўтра, дзе ты з школы падзеўся быў сягоньня?

— Скажу, што галава забалела.

— А ён возьме ды папытае ў цябе сёньнешніх задач. От ты тады і паскачаш перад ім.

— Не папытае.

— А калі папытае?

— Скажу, што вывучыў, але праз дзень забыўся. А калі папытае ў цябе, чаму ты сёньня ня быў?

— Скажу, што ботаў ня было.

— А як раней хадзіў?

— Раней цяплей было... Што ты будзеш цяпер рабіць?

— Нічога. А ты?

— І я нічога.

— Можа пойдзем куды?

— Куды?

— Куды-небудзь.

— Ну, добра.

Пад'ехалі пад хату.

— Абмуляўся?
— Трохі.
— Гэта і сабака за табою бегаў?
— Не, спаткаў на дарозе... От паабедаю і зайду па цябе. Добра?
— Добра.
— Адно будзь дома.
— Буду.
Удвух увялі яны каня ў хлеў. Конь адразу пачаў церціся губамі і шыяю аб жолаб. Пераступаў з ногі на нагу.
— Еж!
Конь нічога ня браў у рот.
— Чаму ты не ясі?
— Можа ён піць хоча?
— Як ехаў, пробаваў паіць у рэчцы.
— Піў?
— Не, нават і губ не памачыў... Бачыш, які худы. Нейкі хворы ён. Думаеш, не?
— І стары?
— І стары.
— Дык што будзе?
— Нічога... Мусіць, здохне скора.

XVI

Быў той дзень утрапёны, нялюдзкі. Цягнуўся той дзень доўга.
Раней на дварэ падмарожвала, нават зусім было ўкавала ўсю гразь і ваду. Нават сьнегам было пацярусіла трохі зьверху. А гэта зноў пусьціла, зноў цёпла стала і мокра. У садох і агародах зелянілася сьцябло пачарнелага на маразох зельля, барвенак на градах і пад дрэвамі ў садох

весела распоўзаўся па зямлі. Плакалі стрэхі і моцна пахлі намоклыя няпілованыя дровы.

У двары, у разгароджаным агародзе пад грушаю мокла расьцярушаная салома. І нудна было Юрку глядзець на яе. Горка было і крыўдна. Сьлёзы былі ўсе выплаканы, твар быў ад іх чорны, закарэлы, з чырваньню пад вачыма. Нянавісьць да бацькі душыла яго. Бо і гаворка тая з бацькам была ненавіднаю і агіднаю:

— Гавары, гэта ты ў шчацiньнi корпаўся?

Юрка маўчаў.

— Гавары, нашто шчацiньне браў?

Чуючы такую жорсткасьць бацькі, ён сказаў:

— Не, гэта ня я.

— А хто-ж гэта тут мог лазіць?

— Я ня ведаю. Можа ніхто.

— А дзе-ж дзелася больш палавіны шчацiньня?

— Не палавіна, а ўсяго трохі...

І раптам, адумаўшыся, паправіўся:

— Гэта вам здалося, шчацiньне цэлае.

— Гавары.

— Яй-богу-ж ня я.

— Прызнавайся, сукін сын.

Бацька паволі ўзяў за вуха і пакруціў.

— Татачка, гэта ня я.

— Брэшаш, ты!

— Каб я так жыў, што не.

— От я табе зараз пакажу. Тады ты пазнаеш, як красьці, а пасьля таіцца.

— Я не таюся, бо я ня браў.

— А от зараз паглядзімо.

Трымаючы яго за вуха, бацька праваю рукою расьперазаў папружку, патрос ёю ў яго перад тварам з крыкам:

— Зараз-жа прызнавайся!

— Татачка, ня я гэта.

— Калі прызнаешся, дык менш буду біць.

— Ня я.

Бацька павольна, не сьпяшаючы, так, як абівае аб калодку сноп жыта, адвёў руку і сьвіснуў папругаю па целе. Скрозь палатняныя порткі папруга востра прыстала ніжэй сьпіны.

— А-яй, ай, татачка!

Бацька трымаў за каўнер і не пакідаў хвастаць. Выгінаючыся ва ўсе бакі, каб як вылузацца або ўхіліцца ад рэменя, Юрка енчыў:

— Татачка, ня буду ніколі больш.

Радасным голасам бацька зароў:

— Ага, прызнаўся, сукін сын, як дапякло. От я-ж цябе зараз адвучу, як чапаць тое, што да цябе не належыць. Я цябе навучу, урвіцель паршывы, гадзіна.

Юрка калаціўся, дрыжэў і выгінаўся.

— Дзе шчэць падзеў?

— Прадаў.

— За колькі прадаў?

— За восем капеек.

— Гавары праўду!

— Каб я так жыў, што за восем.

— Дзе грошы?

— Я сабе ваксы купіў.

— Ваксы?! Яшчэ ваксы захацеў?! Няма, каб падзякаваў бацьку за новыя боты, дык яшчэ ваксы?! А смурод-жа ты паршывы!

— Татачка, я больш ніколі ня буду, колькі буду жыць... Ніколі ня буду нават і ваксы купляць.

— Жартуеш, гад.

Мацьвеевы вочы гарэлі раптоўнай азьвярэласьцю, яму хацелася больш усё біць. Трымаючы ўсё за каўнер Юрку, ён раптам закрычаў:

— Дзе гэта ты порткі падраў?! Гавары!

Юрка дрыжэў і галасіў.

— Гавар-ры!

І зноў пачаў біць.

— Аяй, аяй! Ня буду больш... Самі парваліся!.. Аяй-аяй! Аяй-аяй!

І з немым крыкам рвануўся, стукнуўся галавою бацьку ў жывот і вырваўся. І зразу кінуўся ўцякаць у агарод. Ня бачыў ужо, дзе дзеўся бацька, ня чуў нічога. Прабег цераз агарод, ускочыў цераз плот у суседні сад і, ня могучы стрымаць моцнага плачу, выбег на вуліцу, прабег усю яе ўпоперак і выбег на паплавы. У новых ботах, рашпіленым кажушку і бяз шапкі.

Вецер асушыў на твары яго сьлёзы. Ён паволі ішоў парыжэлымі паплавамі, плюхаў ботамі па вадзе, моцна гаворачы:

— Чорт яго бяры, з ботамі разам. Няхай пляжацца. Няхай псуюцца, калі ён гэтакі разумны, падла гэтая старая, няўдалая, здохлая! Трасцы і хваробы яму! Будзе некалі ўміраць, папросіць, каб дараваў, ніколі не дарую. Ён у мяне здохне, як сабака. Тады ўспомніць!..

Ён нарочна выбіраў, дзе больш вады і з усіх сіл пляскаў ботамі. Адчуваў, як тонкі тавар прамок і халодзіць ногі. Так ішоў аж да самых далёкіх кустоў пад рэчкаю. Прыпыніўся на мокрым беразе, прайшоў трохі ўздоўж паўз рэчку. Вады на беразе ня было, толькі макрэла зьедзеная і зьбітая жывёлаю трава. Пакінуў гаварыць, пашоў назад, галасна і роўна плачучы. І патроху адчуў, якая гэта вялікая асалода для яго плакаць. І якая вялікая асалода ў тым, што баліць і ные зьбітае бацькам цела. Асалода ад сьлёз і болю, бо быў слабым

перад бацькам, бо ня мог узяць над ім верх. Галасна ўсё плакаў. Пасьля пачало шкода рабіцца новых, спляжаных у вадзе, ботаў. Падцягнуў вышэй халявы і пашоў сушэйшым месцам. І ўжо хацелася яму захварэць цяжка, мучыцца, лежачы ў пасьцелі. І каб гэтая хвароба была якраз ад таго, што бацька біў яго. От ён будзе ляжаць хворы, пакутаваць, а бацька будзе ведаць, што гэта ад яго збойства. І будзе ўсё старацца як-небудзь загладзіць сваю вінаватасьць. Але ён, хворы, будзе адварочвацца ад яго. Ніводнага слова ня скажа яму. Пасыходзяцца людзі, будуць глядзець на ўсё гэта. Бацька будзе стаяць перад судом усіх, усе будуць гаварыць пра яго зьверскі ўчынак...

Недалёка было да вечару, калі ён зьявіўся каля свае хаты. Ціха прайшоў паўз весьніцы, глянуў у двор. Пуста было і ціха. Тады ён стаў на прызбу і паглядзеў у вакно. Тры сястрычкі яго гулялі ў хаце. Качалі па зямлі два перасьпелыя гарбузы. Большая трымала ў руках міску і нешта ела з яе вялікаю лыжкаю. Бацькі ня было відаць. Ён ціха ўвайшоў у двор і пакінуў, на ўсялякі выпадак, адчыненымі весьніцы. Пахла на дварэ карою і мокрым дрэвам. З двара глянуў яшчэ раз у вакно. Бацькі ня было. Увайшоў у сенцы і быў насуплены, як вожык. Адчыніў дзьверы ў хату і запытаў:

— Дзе бацька?

Большая сястрычка адказала:

— Панёс шчаціньне на места прадаваць.

— Аг-га.

Вышаў на двор і сеў на бервяне пад грушаю. Слухаў, як крычаць у агародзе вераб'і і як нудзіцца ў суседзяй цяля. Раптам пачуў—нехта застагнаў у хляве і нечым застукаў. Тады кінуўся ў хлеў, заскрыпеў дзьвярыма і ўбачыў: конь ляжаў на

гнаі, вышчаранымі зубамі грыз ножку ад жолаба, стагнаў і качаўся. Пярэдняя нага была падкурчана. Ён падлез пад каня і памог яму выпрастаць нагу. Аднак, конь ня ўстаў. Юрка закрычаў:

— Конь дохне!

І выскачыў з хлява. Угледзеў на вуліцы Юліка Барановіча:

— Дзядзечка, наш конь дохне!

Барановіч пашоў за ім. Увайшоў у хлеў. Штурхануў каня ў жывот, зайшоў з другога боку, прысеў, упёрся нагою ў сьцяну, плячом—у каня каля сьпіны і папяўся. Конь страсянуў галавою і пачаў паднімацца. Паднімаючыся разам з ім, Юлік гукаў:

— Яшчэ, яшчэ... Эх, разам!

І памогшы каню падняцца:

— Гэта ён, сынку, закаціўся быў. Калі бо ў вас тут гной няроўна нейк. Чаму ты гэтае ямы не затохціш гноем. Узяў-бы сахор ды затахціў-бы. Вучыся гаспадарыць, сынку.

І вышаў на двор. Заткнуў адну ноздру пальцам, чмыхануў у другую і, абцёршы нос, пачаў глядзець на суседнюю страху:

— Перакрываць трэба. Згніла.

Перавёў вочы далей па страсе:

— А тут яшчэ гады чатыры будзе трымаць. Бач, як лебяда і мох пачалі расьці. Як паўростала. Гэта—будзе трымацца.

Юрка падаў голас:

— Тут улетку нават тры калівы жыта расло.

Барановіч не зьвярнуў увагі на гэтую заўвагу малога. Няўдала плюнуў, абцёр бараду рукавом і падаўся на вуліцу. У варотах заўважыў кучу вераб'ёў, крыклівых, рухавых. Прыпыніўся,

залажыў пальцы ў рукавы і пачаў глядзець на іх, павольна ўсьміхаючыся:

— Бач, як жывяцца. Недзе, падлы, схвацілі ў некага з карыта картоплі і дзяўбуць, ліха ім... Хватаюць, аж душацца... Эйш ты!

І радасна расплыўся ўсьмешкаю:

— А тоўсты які, сыты... Жыў-жыў, каб ты здох!

Тупнуў хвораю нагою і гукнуў:

— Фр-р-р!

Вераб'і раптам прапалі па той бок гумен. Нясучы на твары павольную ўсьмешку, Барановіч паклыбаў вуліцаю, разважаючы сам з сабою:

— Каб яно бог даў згарэла было, на зіму бяз шчыгла застаўся.

Спаткаў кума Вашыновіча. Кум запытаў:

— Што ты гаворыш?

— Гавару, што не ўдалося нідзе шчыгла зла віць, няхай-бы сьпяваў. І каноплі ёсьць, еў-бы ды сьпяваў. Летась, дык аж два шчыглы зімавалі ў мяне. Сьпявалі ўсю зіму, аж разьлягаліся. Бывала, чым-небудзь возьмеш ды пашамечаш—сухім зельлем, або торбаю з сухім аўсом, ці жонка пачне пасьцель перасьцілаць, ды сяньнікам зашамеча, дык яны калі заціўкаюць, ды калі засьпяваюць, дык здаецца хата раскідаецца. А гэта нейк не злавіў, а цяпер позна ўжо. Што-ж, дзякуй богу, зіма на носе.

— Зіма,—адказаў кум.

— Дзе ты цяпер таго шчыгла зловіш.

— Чаму, захацеўшы, тымчасове, можна.

— Дзе?

— У мяне за гумном лопуху чорт ведае колькі зазімавала. Дык як усмаліць холад, дык яны, тым-

часове, паналятаюць ваўчкі кляваць. Можна будзе тады і ўпляніць з пару якую.

Барановіч зацікавіўся:

— Няўжо?

— Дзівак ты. Дык-жа і летась гэтае самае было. Хлопцы лавілі.

— Бачыў ты!?

Кум зьмяніў гаворку:

— Ну, як Ганна, праўда гэта, што зараз разьвітаецца з табою?

— Яшчэ, як мае быць невядома... Гэта, як бог дасьць.

— А я чуў, што каморнік зараз зьявіцца па яе. Ліст, кажуць, нейкі быў ад яго, ці што. Гавораць.

— Эт, пісаў там нешта.

— То мусіць-жа праўда?

— Праўда.

— Ну, дай божа, час добры.

— Дай божа.

— Няхай сабе жывуць здаровенькія. Слаўная дзяўчына Ганна. Гэтакае дзяўчыны адно пашукаць. Гэта дзяўчына!

— А так, яна ўдалая дзяўчына.

— Дый ён чалавек, можна сказаць, залаты.

— Здаецца, ніштаваты.

— І самае важнае, што чыста жыць будуць. Гэта ні то, што ў гаспадарцы, гной разьбіваць, або ў зямлі корпацца. Лягчэйшы хлеб. Смачна, тымчасове, зьесьць і чыста, можна сказаць, сходзіць...

— Ды будуць нейк-жа жыць.

Раптам Барановіч раззлаваўся:

— Я на цябе, браце, нічога не скажу і нічога да цябе ня маю. Але што гэта ў людзей за мода ўмешвацца ў чужыя справы. От кроку ня ступіш,

каб ня было ўсім вядома. Якое каму дзела, хто з кім жэніцца ці за каго замуж ідзе. Дык не, усё перагаворацъ, усё перапытаюць, да ўсяго дакапаюцца. Няма, каб усякі глядзеў свайго, як той казаў. От-бо народ. Хоць ты яму кол на галаве чашы, усё роўна ты яго не перайначыш. Цёмны народ у нас.

Кум згадзіўся:

— Гэта правільна. У нас, тымчасове, народ такі. Дзе што якое пачуюць, дык адразу ўсе разам як загавораць, як паднімуць гаворку. Усіх па костачках разьбяруць, усіх апалошчуць. З нашым народам кашы, тымчасове, ня зварыш.

Барановіч узьеўся:

— Тымчасове, тымчасове! А сам ты які. Колькі ты плётак пусьціў пра маю Ганну? Хто-ж гэта, як ня ты, усё распытваеш, ды ўсьміхаешся ўвесь час хітра, мусіць, думаючы, што гэта толькі каморніцкія жарты. Не, кумок, мая дачка ні то што за каморніка, за каго хочаш можа пайсьці. Я выхаваў яе, як належыць, я вучыў сваю дачку.

Вашыновіч адказаў:

— А-яй, твая дачка! Што-ж там твая дачка. А чые, дык ня дочкі!? За губарнатара можа сваю дачку выткнеш.

— Губарнатары на тым сьвеце.

— То можа за глаўнакамандуючага якога сваю дачку, тымчасове, усадзіш.

— Глядзі сябе і сваіх дачок.

— Я і гляджу, што мне, тымчасове, трэба.

— Дык чаго-ж ты?

— А ты чаго?

— Апрыкрала мне ўся гэта музыка.

— Хто-ж табе вінават?

— Каб хто яшчэ, а то яшчэ і ты, усё на ней-кія хітрыкі бярэш, усё распытваеш. Начорта табе гэта!

— Я пасваяцку гэта, а табе—халера цябе ведае, што табе здаецца.

— Нічога мне не здаецца, а я гавару так, як яно ёсьць.

— І я гавару так, як яно, тымчасове, ёсьць.

— Гаворыш ты!

Пастаялі так адзін напроці аднаго, паглядзелі коса адзін аднаму ў твар і разышліся кожны ў свой бок. Назаўтра-ж Сабастыяніха расказвала, што Вашыновіч вельмі заядла пасварыўся з Барановічам, бо зайздросьціць, што Барановічава дачка ідзе замуж за каморніка, а да яго дачкі ніхто нават і ня сватаецца. І дадавала, што сварка пачалася за тое, што Барановіч нібыта хацеў прысвоіць Вашыновічавы дошкі, якія яны напалавіну рэзалі летась. А калі суседкі пачалі сумнявацца, што ні Барановіч, ні Вашыновіч ніякіх дошчак у гэтыя гады, здаецца, не пілавалі, Сабастыяніха стала даводзіць, што гэта такія людзі, што ня толькі дошкі пілаваць, а яны табе што хочаш зробяць, і ніхто нічога і ведаць ня будзе. Пасьля гэтага суседкі, і нават ня-суседкі, падумалі: „наўрад ці гэта была праўда, што Вашыновіч з Барановічам сварыліся. Мусіць, гэта выдумала Сабастыяніха“. Але, ня гледзячы на такую думку, назаўтра яшчэ шпарчэй пашла пагаласка, што Вашыновіч з Барановічам біліся за дзьве старыя дошкі, якія некалі Вашыновіч пазычыў у Барановіча і не хацеў аддаваць назад. І больш усяго вінавацілі Барановіча, бо ён вельмі-ж выявіў сваю нечалавечную зайздрасьць.

А Юрка ў той дзень доўга сядзеў на прызьбе. Балюча і горна было яму. Пасьля пашоў ён у двор, стаяў пад грушаю і нудна глядзеў на расьцярушаную пад ёю салому. І не заўважыў, як бацька падышоў з агароду:

— Што, сукін сын, стаіш?!

Юрка адскочыў да весьніц і глядзеў адтуль на бацьку. Бацька яшчэ мармытнуў нешта і пашоў у сенцы. Юрка пашоў да Юзіка ў двор, сеў на няпілованым дзераве пад паветкаю, сядзеў так і маўчаў. На змроку заўважыў яго там і падышоў да яго Юзік.

— Чаго ты сядзіш тут?

— Так сабе.

— Хадзем на вуліцу.

— Не хачу.

— Чаму?

— Так.

Юзік падышоў бліжэй.

— Чаму ў цябе твар заплаканы?

— Нічога.

— Скажы чаму?

— Тата біў.

— За што?

— За ваксу.

— Ну! А твой-жа тата сягоньня прадаў шчэць і прапіў.

— Як ты ведаеш?

— На месьце бачыў яго п'янага. Бачыў, як ён і шчэць прадаваў.

— Хлусіш.

— Яй-богу. Усе бачылі.

Юрка вылез з-пад паветкі, шмаргануў па твары рукавом. Пашоў на вуліцу. Юзік не пасьмеў ісьці за ім.

Доўга стаяў Юрка на змрочнай вуліцы, глядзеў, як прабіваліся скрозь хмары ружовыя істужкі захаду і баяўся ісьці ў хату.

XVII

Ніхто і не спадзяваўся, што ўсё гэта будзе так урачыста, і што столькі назьбіраецца гасьцей. Барановічыха пасьля гаварыла:

— Здавалася, што нікога і ня будзе. Ажно-ж— то сват, то брат, таго пазваць трэба, а таго не пазваць ня можна, дык яно, дзякуй богу, і назьбіралася цэлае застольле.

Былі ўсе сваякі. Быў і Вашыновіч з Вашыновічыхаю. Запрашаючы яго, Барановіч гаварыў:

— От тады, кумок, мы з табою пасварыліся трохі былі на вуліцы падвечар, то ліха яго бяры. Жывучы ўсё бывае.

Вашыновіч адказаў:

— Яно-ж гэтак. Жывучы ўсё бывае. Няхай нас, як той казаў, бог крые, навек, тымчасове, быць ворагамі.

— Барані божа.

— Я таксама такі чалавек.

— Дык от падыйдзі, кумок, з жонкаю.

І Вашыновіч прышоў, з жонкаю і з дачкою. Гасьцей назьбіралася поўна. Праўда, былі некаторыя нездаволены, што абыйходзіцца ўсё не палюдзку, без царкоўнага шлюбу і што ўсё гэта нават і да вясельля непадобна—толькі ўсяго і будзе, што паабедаюць, і маладыя зараз-жа паедуць. Але як выпілі, усё гэта пачало забывацца, засталіся, як вынік гэтага, гаворкі. Каб не пакрыўдзіць маладых, Вашыновіч не гаварыў выразна, што

хацеў сказаць, а ўсё круціўся з гаворкаю вакол галоўнага:

— Даўней, я памятаю, як Алесяў бацька жаніўся, дык тры дні гулялі—дзень у маладое і два дні ў яго. Я сам за шафіра быў, вянец трымаў. А музыка два дні была. Скакалі да сёмага поту.

Вашыновічыха сказала:

— Ат, што там скакалі. Калі, бог дасьць, усё добра, дык яно і так, і так—ня кепска будзе.

Вашыновіч глянуў на яе і маргнуў у бок каморніка. І яна змоўкла. Вашыновіч падняў чарку:

— Ну, то няхай бог дасьць маладым шчасьце і долю... Каб яны жылі шчасьліва і ў добрым здароўі ўнукаў прыждалі.

Госьці адказалі:

— Дай-жа божа.

Выпілі. За другою чаркаю Вашыновіч сказаў:

— А каб Юлік здароў праўнукаў прычакаў.

Выпілі. Барановічыха заўважыла:

— Бог ведае. Вельмі-ж хваравекаваты ён зрабіўся. Рабіць ніяк ня можа. А яшчэ нага гэтая яго мучыць.

Выпівалі і гаварылі. Маладыя павылазілі з-за стала. Каморнік вышаў у кухню закурыць. Курылі ўдвух з Ганьніным братам і гаварылі нешта. Ганна цішком гаварыла з сваёю таварышкаю, Вашыновічаваю дзяўчынаю:

— Я ўжо хачу, каб хутчэй выехаць. Ты ведаеш, колькі я папаплакала ад усялякіх гэтых гаворак. А то і цяпер, усе вачыма колюць, глядзяць, як на нейкае дзіва, а пасьля-ж таксама яшчэ папагавораць.

Дзяўчына ўсьміхнулася:

— А колькі ў нас у хаце гаворкі было пра гэта.

— Ты думаеш, я ня ведаю.

— Прыяжджай-жа хаця сюды часта.

— Буду прыяжджаць...

Узяліся за рукі і пашлі спацыраваць па дварэ і па прыгуменьні. Сонца хварэла блёклым сьвятлом.

Вашыновіч у кухні падышоў да каморніка:

— От вы, тымчасове, і зноў у нас.

Каморнік усьміхнуўся:

— Ненадоўга.

— Я-ж ведаю. Сягоньня паедзеце?

— Сягоньня.

— Чаго вы так сьпяшаеце. Пабылі-б трохі, пагулялі. Пагасьцілі-б у новых сваякоў. Я-ж Ганьне даводжуся дзядзькам. Можна сказаць, на маіх вачох выгадавалася.

Каморнік дастаў папяросы. Вашыновіч ня сьціхаў:

— Дзіўна нейк, калі падумаеш.

— Што?

— От усё... нейк на сьвеце, тымчасове, робіцца.

Каморнік глядзеў на яго.

— От мералі вы ў нас зямлю. Прыехалі бог вас ведае адкуль. Ніхто вас ня ведаў, і вы, сказаць, тымчасове, нікога ня ведалі. А гэта ўсе вас уведалі і вы ўсіх. Нават сваякамі парабіліся. Ганна з маёю дачкою таксама вельмі таварышкавалі заўсёды. Хаця-ж прыяжджайце ў наш бок часта... Можа некалі зноў давядзецца мераць тут што, дык мы-ж ужо адразу да вас, як да свайго чалавека. Наша дзела, тымчасове, гаспадарскае... Наша справа роўная, ціхая... Вы, тымчасове, надоўга асталяваліся ў нашым горадзе?

— Ня ведаю і сам добра.

— Ды яно пэўна. Служба. А служба ня свой брат. Хоць і добрая служба, а ўсё-ж ня свой брат. Справа казённая. Я сам служыў, сам ведаю.

— Дзе вы служылі?

— Служыў дзесяцкім, як у дварэ равы капалі, ды яшчэ і раней—у салдатах служыў.

Ён яшчэ закурыў і захацеў з каморнікам выпіць. Пашлі да стала. Вашыновічыха памагала гаспадыні падаваць гасьцём гарбату.

Ганна ўсё хадзіла з таварышкаю па прыгуменьні, па мокрай траве. Была рада, што прышла яна—толькі і была яна адна тут з усіх таварышак.

Усё знаёмае было вакол. І дзіўна было ёй, што зараз усё гэта яна пакіне, можа нават ніколі ня ўбачыць, а калі і будзе бачыць, дык рэдка—раз у год ці ў два гады. Хвалявалася радасьцю чаканьня нечага невядомага, блізкага, якое шмат дакляравала, вабіла, і афарбоўвала ўсё ў ружовыя колеры. І разам з тым шкода было нават гэтай саломы, яшчэ ўчора дрэнна падгрэбенай ёю-ж самою каля гумна. Шкода абмоклых дрэваў, гэтых паплавоў і агародаў. Пратаптаных сьцежак цераз паплавы да рэчкі, пасеенага з братам ня вельмі даўно жыта. Кульгавага і нездаровага бацькі, клапатлівае мацеры... От тут яна стаяла тады, калі апошні раз прыходзіў Алесь, калі яна была заплакала і пабегла ў двор.

Раптам ёй страшна сумна і нядобра зрабілася.

— Чаго ты такая стала?—запытала таварышка, трымаючы яе за руку.

— Ня ведаю і сама.

— Каля вачэй у цябе чырвона нейк стала.

Ганна абняла яе за шыю і заплакала.

— Чаго ты?

— Нічога... Вядома, пакідаеш усё.

Таварышка пацалавала яе.

— Дзякую, сястрыца.

І мацней абняла яе рукамі.

— Ты адна блізкая мне з таварышак.

Абняўшыся, пахадзілі яны яшчэ. Госьці пачыналі разыходзіцца. Вашыновіч і Вашыновічыха пашлі, дзяўчына засталася.

Кончыўся дзень; брат рыхтаваўся ехаць, аглядаў воз, высьцілаў саломаю.

Як усе пашлі, у сенцах заплакала маці. Пацалавала Ганну, каморніка пацалаваць не адважылася. Сказала, глытаючы сьлёзы:

— Жывеце добра.

Падышоў бацька:

— А як-жа хаця там з кватэраю?

— Прыедзеце калі, паглядзіце.

Маці выцерла рогам хусткі сьлёзы. Барановіч адставіў нагу, доўга глядзеў на маладых. Раптам твар яго зморшчыўся, барада ад'ехала ўніз. Ціха чмыхнуў і ня стрымаўся — падышоў, абняў іх абоіх, пацалаваў Ганну ў твар, зяця ў губы.

— Хаця-ж нас старых не забывайце... Бо я немагушчы, стары. І нага ў мяне баліць... Жывеце добра...

Зяць пацісьнуў яму руку. Ганна пацалавала ў нябрыты, жорсткі яго твар.

Выехалі перад самым змрокам. Трымаючыся за воз, бацька правёў да канца вуліцы. Папробаваў рукою, ці добра прывязаны ззаду ўкручаныя ў дзяругу падушкі і пашоў паволі дадому. Ганна ўзяла пад руку Андрэя, прыціснулася да яго. Брат сядзеў у перадку, паволі памахваў лейцамі.

Ехалі хутка. Чарнела мяккая дарога. Пахла поле жытняю руньню; весялілася поле вячэрнім змрокам. Узьнімаліся ў полі дзівосныя сьцены далёкіх лясоў, маўчала каля дарогі сухое зельле. У вільгаці зелянілася трава, бялела наперадзе жвірыстая дарога.

Восень, восень!

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

I

Якія дарогі ў полі ляжаць! І якія туманы ўстаюць над зямлёй! Неба—халоднае і звонкае, як сонечны дзень. Вятры дзьмуць над дарогамі.

Што гэта—сонца і мяккая зямля!? Што гэта—прастор і вецер!? І трава, і дрэвы, і паўтоптваны ў зямлю жоўты ліст! Па дарогах імчацца, ідуць і паўзуць жывыя істоты.

Ці не ад сонца гэта і ветру так востра сьвецяцца вочы ў чалавека—у чалавечага дзіцяці?

Вецер трэпле на ім адзежу, так, як з самага ранку трэпле гольле ліп і бяроз. На ветры кажушок—той усё самы, без каўняра—пахне тым-жа ветрам і воўнаю. Пад барадою ў кажушку чорны гузік, на жываце—выламаная з веніка цурачка. Так і зашпілены гэты кажушок. Чорныя і каравыя пальцы барабаняць у шыбу:

— Юзік, Юзік!

Вецер б'ецца ў дах суседняга сьвірна, скрыпіць коваратам пад студняю, гойдае яго. Голыя ліпы і клёны шумяць. За шыбамі ў хаце ціха. Дым ідзе з коміна—пахучы, здаецца, хваёвыя лапкі гараць. І скрозь цёмную шыбу відаць, як трапечыцца ў печы агонь. А ніхто не адзываецца. Зноў стук у шыбу і няроўны голас:

— Юзік, Юзік!

З хаты чуецца доўгі сьвіст:

— Фью-ю-ю...

Бразгае клямка ў сенцах. Сенечныя дзьверы адчыняюцца, і на ганак выпоўзае малая постаць— цыбаты хлапчук, стрыжаны, белагаловы. У новых палатняных галіфэ, босы.

— Гэта ты, Юрка?

— Гэта я.

— Чаму-ж ты адразу ў хату ня ідзеш?

— Я думаў, што ў вас там што робяць у хаце, дык нашто, канешне, замінаць. Думаў, што ты апранешся ды выйдзеш... Ты сьнедаў?

— Не яшчэ. А ты?

— Ужо.

— Баіцца ісьці ў хату. От дурны! Ідзі.

— Ці я-ж баюся?

У хаце пабеленымі дошкамі была адгароджана кухня. Пахла скваркамі і блінцамі. Жанчына клапацілася каля печы:

— Ты сьнедаў, Юрка?

— Сьнедаў.

— Што-ж ты сьнедаў?

— От... еў...

— Ідзі еж блінцы.

— Я не хачу.

— Ідзі еж.

— Я пад'еў.

Тады Юзік сказаў:

— Ідзі, разам будзем есьці.

Юрка памаўчаў, паглядзеў на стол і сеў на лаву. Жанчына палажыла яму на блінец дзьве скваркі. Елі моўчкі, пагладаючы адзін на аднаго. Памаўчаўшы, Юзік сказаў:

— Я люблю нядзелю. Хаця рабіць нічога ня трэба. А ты, Юрка?

— І я таксама.

Жанчына засьмяялася:

— Ах, як вы перадалі лішне з работаю. Паўвярэджваліся, небаракі.

Юзік апраўдаўся:

— А што-ж, ня лішне мы і гуляем.

— От маладцы! Работнікі.

Юзік пакрыўдзіўся:

— Яшчэ і сьмяюцца.

Моўчкі даядалі. Жанчына адумалася, каб не пакрыўдзіць Юрку, гледзячы на Юзіка, сказала:

— От Юрка, дык праўда, што ўсё робіць дома, ён і на полі ўсё робіць. За восень—усё жыта пазабараноўваў. А ты, дык адно кніжак сваіх глядзіш. Добра, што хоць вучышся. І за гэта маладзец.

Юзік пачырванеў, пакрыўдзіўся. Жанчына заўважыла гэта:

— От ты ўжо і надзьмуўся нямаведама чаго... Еж, я табе яшчэ скварак падлажу.

— Больш не хачу.

— Дзякуй,—сказаў Юрка.

Пазашпільваліся, панадзявалі шапкі. Юзік стаў шукаць свае палкі.

— Я сабе ўчора вельмі добрую ялаўцовую палку выразаў.

— Дзе?

— У кустох.

— Чаго-ж ты там быў?

— Коні хадзіў з жыта зганяць.

— А зямля-ж умерзла.

— Не, добра ня ўмерзла, дык выгружваюць. Я стаяў ды падпільноўваў. Вельмі-ж Паўлаў конь, каб ён здох, каб ён. Тут яго выганіш, а ён зноў, а ўсе коні за ім.

Жанчына ўмяшалася ў гаворку:

— Павал адно як чыё чужое канянё ўгледзіць дзе трохі ў шкодзе, дык гвалту наробіць на ўвесь сьвет, дурань белабароды. А свайго ніколі ня бачыць. От-бо гадкі чалавек.

Стала падмятаць кухню. Саладкавата запахла пылам; у падпечку засакатала курыца. Загула муха на асьвечанай сонцам шыбе.

— От, каб яна здохла, і халадоў на яе няма. Абы сонца прыгрэла трохі, дык і загула.

Густы быў вецер, сіверам слаўся на стрэхі. Марозная бель ляжала на траве ў садзе. Вада замерзла зьверху і не раставала. Сонца залаціла стрэхі і тонкія іголкі лёду; на непапілованай на дровы асіне сярод двара крычалі рухавыя вераб'і. Не варушачыся, каб не спалохаць іх, Юзік сказаў:

— А, памерзьлі... Хадзем, Юрка, дамо ім аўса.

— Знойдуць і самі. У нас у гумно паналазяць заўсёды пападстрэшшу і адно стаўпы гнюсяць.

Раптам забыліся на гэтую гаворку сваю, пашлі ў сад. Паселі за сьцяною на старым бервяне. Зацішна было на сонцы. Гольле гойдалася і шумела пад ветрам, скрыпеў клён каля плоту. Расьцярушаная салома варушылася каля сьцяны. Сядзелі, слухалі вецер, бачылі падмарожаную траву, халодную зямлю, сіняе сонечнае неба і гаварылі. І мусіць, адчувалі яны ці думалі аб нечым большым, чым гаварылі. Прыпёршыся да сьцяны плячыма, Юзік пагойдваў нагамі, бегаў вачыма па траве, платох і сьценах, і ўсё гаварыў:

— От гэтая цётка, гаворыць, ліха ведае што. Яна хоча, каб я рабіў так, як стары. Я-ж вучуся, і нават яшчэ трохі і жыта баранаваў.

— Дык гэта яна так сабе гаварыла.

— Але, добра так сабе.

— От дурны ты.
— Чаму?
— Каб яна цябе набіла, дык тады-б нядобра было, а то сказала, а ён ужо і думае ліха ведае што. Мала што хто скажа... Мяне бацька, як гэта тады набіў за ваксу быў, дык гэта балела. А што табе... Клопат вялікі, што хто там дзяўкне. Што гэта, зашкодзіць? Чорт яго бяры...
— А ты тады доўга плакаў, як бацька набіў?
— Не.
— Не!? А я-ж нават бачыў, як ты назаўтра раніцаю ў агародзе каля сьцяны сядзеў і плакаў.
— Бо балела. Ты думаеш, не балела?
Скрыпелі ўсё дрэвы пад ветрам. Жоўты пясок, насыпаны каля сьцяны, пылеў, біўся ў салому, абсыпаў яе.
— Юрка, Юрка!
Праз плот глядзеў у сад твар. Даўно няголены, укрыўся рудым шчаціньнем. Шапка ссунута на вочы—зашмальцованы, разарваны і дрэнна сшыты казырок.
— Чаго вы?
— Ты ідзі ў хату, парасят накармі, а я пайду на места. Я, можа, там доўга і ня буду. Глядзі дому.
І пашоў—роўна і лёгка ступаў нагамі, трымаў рукі ў кішэнях. Вецер кудлачыў нерасчэсаныя валасы, што каля вушэй павылазілі з-пад шапкі. Кружыў вецер сухое лісьце ў садзе і на агародзе.
— Чаго гэта, Юрка, твой тата на места пайшоў?
— Нечага, мусіць, трэба.
— Я пайду з табою к вам.
— Хадзем.
— Будзеш парасят карміць?
— Буду.

У хаце было трохі чадна. Пахла подмазка ад скаварады пад прыпекам, згорбіўшыся, сядзеў над ёю кот і еў, моцна чаўкаючы.

— Каб ты здох, каб ты. Як нікуды ад цябе не ўхаваешся. Памаўзьлівы, ліха яму.

Кот блíснуў вачыма і замармытаў.

— Еж ужо, каб ты выдах, калі пагнюсіў.

Вокны ад двара былі ў сонцы, на ваконнай трухліне, вільготнай і мяккай, зелянілася доўгая, белаватая трава. Юзік стаў разглядаць яе:

— Што гэта ў вас расьце на вакне, якраз як жыта.

Юрка ўсьміхнуўся:

— Гэта авёс. Я зрабіў спробу, ці будзе ўсю зіму зялёны, ці пасохне. Узяў ды ўваткнуў у гэтую трухліну пяць зярнят. Бачыш—пяць каліў узышло.

— Вакно яшчэ больш згніе.

— І так гнілое, чорт яго бяры... Клопат.

Узяў венік і пачаў падмятаць хату. Юзік падаў раду:

— Пакрапі вадою, а то вельмі-ж пылу нарабіў.

І ўдвух пачалі крапіць вадою хату. Сястрычка абазвалася з печы:

— Юрка, унясі ў хату гарбуз... Мы гарбузікаў дастанем.

— Няма мне часу, трэба парасят накарміць.

Паселі ўдвух з Юзікам каля ражкі, вылілі з гаршка памыі, накідалі сечанае паранае бульбы і, закасаўшы рукі, сталі душыць рукамі бульбу.

— Нечым кіслым бульба пахне.

— Пракісла, тры дні стаіць.

— Ты заўсёды парасят корміш?

— Не, найбольш тата.

— А хто ў печы паліць?

— Тата.

— І есьці варыць?

— Ну няўжо-ж само зварыцца. Вядома, што варыць... От каб цётка Наталя жыва была, дык цяпер у нас жыла-б.

— А чаго яна памерла?

— Я мала памятаю. Я тады яшчэ малы быў.

Занесьлі начоўкі ў сьвінух, паселі на парозе і глядзелі, як парасяты тыцкалі лычамі ў цеста. За сьцяною чуваць было, як уздыхаў конь, зрэдку шараваўся аб сьцяну ці аб жолаб. Зачынілі сьвінух, пашлі паглядзець каня. Пад нагамі ў каня было сена; вісела яно вехцямі і на краёх жолаба. На сьценах віселі старыя абручы, хамут. Жардзяная загарадка была забруджана курамі. За загарадкаю жаўцела ячменная салома. Шумныя вераб'і шмыганулі з яе пазастрэшшу на двор.

— Няўжо яны што ў гэтай саломе знаходзяць?

— У каня з жолаба авёс выбіраюць.

Селі на парозе, гаварылі пра ўсё, што пападалася толькі на вочы і ўзыходзіла на думку. І не хацелася ім нікуды адсюль ісьці, як-бы гэта тут знайшлі яны для сабе пачаткі ўсяго, чым жывуць яны.

Узьдзёртая ветрам, шамятала на суседняй страсе салома, пад цьвёрдым гольлем голых груш. Чорная была салома на страсе. Гойдалася на ёй змарожаная лябяда, бялела салома трох каліў жыта Шэрая зямла была пад чорным лісьцем. Расьцярушана была салома, раскіданы дробна пасечаны лом. Чыстае было неба высокае.

— От, каб у нас быў лепшы конь, я езьдзіў-бы ў фурманкі куды. І зарабляў-бы.

— Думаеш, вельмі лёгка гэта.

— Я ведаю, што не.

Памаўчалі. Глядзелі на ўсё.

— Сонца яшчэ і цяпер грэе трохі.

— У зацішку дзіва што грэе. Яно і зімою грэе.

— Дзе ты бачыў, каб табе зімою сонца грэла.

— Бо і грэе. Ідзі папробуй стаць, дзе ціха. Дык адразу цяплей табе на сонцы стане. Абы каб ветру ня было.

— Я заўтра пайду на могілкі.

— Чаго?

— На рове нарэжу лазы. Тонкая там расьце. Вербалоз, з чырванаватымі дубцамі.

— На што яна табе?

— Буду сяўнік плясьці.

— З саломы?

— Але.

— Ці ты-ж умееш?

— От, важнасьць вялікая... Ведаеш што, Юзік?

— Ну што?

— За каго ты хочаш быць, як некалі вырасьцеш?

— За настаўніка, або за доктара.

— А я за каморніка. За каморніка лепш. Хаця поле мераеш, ды ўсё... Але як гэта ён вылічвае? Паставіць нейкую прыстройку, паглядзіць і ведае...

— А я думаў, што гэта чаго іначай на могілкі пойдзеш.

— Ты сваю маму памятаеш?

— От дзіва.

— А я дык нейк не магу прыпомніць, які твар быў у мае мамы. Не магу ўздумаць. Усё нейк прападае з вачэй. От, як Алесяў бацька памёр, дык у Алеся здымак застаўся. Яны ўдвух з бацькам зьнімаліся былі. Дык ён паглядзіць і ведае. А я, дык ніяк не магу прыпомніць. Нейк ні то што я гэта забыўся, але каб як мае быць успомніць, дык не магу.

— У нас таксама няма здымку мамінага. Як тата пастарэе, дык я з ім здымуся. Як памрэ, дык каб здымак застаўся.

— А я з бацькам здымацца ня буду.

— Чаму?

— Бо для мамы будзе крыўдна, што яе твар я забыў, а бацькаў заўсёды буду памятаць. Мама ня любіла сварыцца... От была добрая!

— Дзе гэта Мікалай?

— Няма. На рабоце недзе, ужо трэці тыдзень.

— А бубен яго дома?

— Бацька дык цяпер агледзеўся. Усё гаворыць, што маці была добрая. Няхай-бы ён тады гэтак гаварыў. Цяпер дык і ён разумны зрабіўся, як пабачыў сам. Гэтак некалі пашкадуе, што біў мяне. Ды позна будзе тады, я ніколі не забуду гэтага. Аж тры тыдні пісагі на мне былі ад папружкі. Падла старая гэтая, дурная. Гад.

— Ня можна так на бацьку.

— Чорт яго бяры з гэтакім бацькам. Каб было за што, а то я там шчацінья трохі ўзяў. Ды я-ж купіў ваксы. Мала што можна бяз ваксы абыйсьціся, але калі я купіў, дык не зьбяднела ад гэтага яго гэтая гаспадарка. А сам, дык у той-жа дзень пашоў ды ўсё шчацінье прапіў. На гэта дык ён маўчыць. А пасьля дык ужо ліжацца: можа, кажа, табе, Юрка, новую шапку купіць. Як-бы ён сам ня ведае, што мне шапка патрэбна. Адно гаворка. Каб хацеў купіць, дык пашоў-бы, ды моўчкі купіў-бы—і ўсё. Дык яшчэ папагаворыць раней. І ўсё роўна ня купіць. Адно цьвеліцца. О, гэтак усё. Сядзе на лаву, ды сам з сабою гаворыць-гаворыць, як дурны які. Або начорта гэты конь гэтакі. Усё роўна ім няма ўжо больш як рабіць. Няхай-бы прадаў. Лепш ужо без каня быць, як гэтакага каня

трымаць. І як гэта ён жыве, гэты конь, нічога ня еўшы.

Падышлі да жолаба. Пастаялі. Юрка адгарнуў сена ў адзін бок, прынёс з сянец аўсянае мякіны з аўсом, усыпаў у жолаб. Мякіну конь пачаў есьці. Зьеў яе хутка. Палажыў морду Юрку на плячо, ляпаў губамі ў яго над вухам.

— А братачка-ж, от ляпае!

Юзік паслухаў і згадзіўся:

— Ну але... Ая-яй.

— Ён яшчэ больш мякіны хоча.

Прынясьлі яшчэ, насыпалі ў жолаб і зачынілі хлеў. Пашлі ў хату, дасталі з паліцы Мікалаеў бубен, пачалі бубніць і скакаць па хаце. Сястрычкі пачалі на печы сьмяяцца і рагатаць.

— Весела,—крычалі яны ўдвух і бегалі па хаце. Зьнячэўку адчыніліся дзьверы і ўвайшоў бацька.

— Што гэта вы робіце? Нашто вы пылу гэтулькі нарабілі.

Бубен зараз-жа апыніўся на паліцы.

— На табе шапку,—сказаў бацька.

Юрка ўзяў шапку, адразу памераў. Шапка была сівенькая, зімовая.

— Ну, што, якраз?

— Якраз. Колькі вы далі за яе?

— Пяць злотых... Думаю, ліха яго бяры. Табе, сынок, шапка патрэбна. Студэнт, вучышся добра, і каб у парванай шапцы хадзіў. Насі здароў... Парасят накарміў?

— Накарміў.

Удвух вышлі яны зноў на двор. І было несамавіта Юрку перад Юзікам у новай шапцы, купленай кагадзе бацькам. Яны ішлі абветранаю, сонечнаю і халоднаю вуліцаю ў канец, дзе на сухім лопусе лемантавалі дробныя птушкі.

II

Так яно ўсё і рабілася, кожны дзень, дзень за днём. Скончыўся шум восені і была весялосьць яе—халодная, калючая. Ішлі сваёю дарогай дробныя здарэньні, шэрыя падзеі і гаворкі пра іх.

Ветраныя былі дні.

Вецер дзьмуў шмат дзён. Перагонамі сыпаліся на зямлю сьнегавыя крупы, пасьля зноў глядзела на зямлю сонца. Сьнегавыя крупы мяшаліся з пылам, чарнелі і прападалі. Востры холад трымаўся ўвесь час.

Заўсёды дзень пачынаў меркнуць ужо, як прыходзіў Юрка з школы. Даставаў з печы гаршок, еў і ішоў у гумно памагаць бацьку малаціць. Таміўся хутка і, пакуль бацька ператрасаў у салому акалочаныя на два бакі аўсяныя снапы, рад быў пастаяць і аддыхацца. Зараз-жа зусім цямнела і бацька зачыняў гумно. Юрка паіў каня і карову і ішоў да Юзіка—чытаць назаўтра школьныя заданьні. Але перад гэтым абодва з Юзікам выходзілі яшчэ на вуліцу, сьвісталі, стоячы за вуглом, хадзілі і зазіралі ў чужыя двары. Некалькі дзён засаб бачылі, як Алесь прыяжджаў з лесу і, паставіўшы ў хаце на вакне лямпу, каб сьвяціла на двор, скідаў з возу дровы. Раз падышлі да Алеся:

— Алесь, дай мы наабдзіраем з гэтага гальля калматага моху.

— Нашто ён вам?

— Мы паробім сабе з гэтага моху вусы і бароды і будзем палохаць.

— Каго?

— Каго-небудзь... Усіх.

— Абдзірайце.

А раз стаялі ў Алеся ў дварэ і слухалі, як Тамаш, трымаючы рукі ў кішэнях аблезлае браваркі сваё, гаварыў Алесевай мацеры:

— Ты кажаш, родненькая, што памрэш зараз, што ня можаш нічога? Ну, праўда, ты за мяне на гадоў пяць старэйшая, але-ж і я мусіць зараз дуба дам. Мы з табою некалі разам гулялі. Памятаеш? Даўно было. Ледзьве памятаю, як сьню.

— А што ў цябе, Тамашка?

— Старасьць мусіць. Ногі млеюць, слабасьць нейкая. Нічога рабіць не магу. Тады гэта з лесу ледзьве прыехаў. На ліха, не абуў ботаў, а лапці— усё ботаў шкода было, каб яно згарэла. Прамачыў ногі; каб гэта раней, дык таквеле бяды—пера-абуешся дома і скочана дзела. А гэта—здароўе ня тое. Дык от з таго самага часу і агарнула мяне хвароба нейкая. Я-ж кажу, ніяк адолі не вазьму. Хрыпаю і баліць ва мне ўсё. Косьці ломіць. У галаве кружыць. Удзень, як расхаджуся, дык яшчэ нічога. А раніцаю, дык хоць з пасьцелі не ўставай. Калі пачне нейкая трасца стукаць у галаву.

— Няхай-бы ты на печы, у цяпле вылежаўся. Выграўся, як мае быць, і паздаравеў-бы. А то ходзіш.

— Пярун яго ўлежыць на адным месцы. Каб гэта ўжо зусім абнямог, то ўжо тады ляжаў-бы. А гэта, чорт яго ведае, ні хвароба, ні здароўе...

І больш яшчэ нешта гаварыў Тамаш з Алесеваю мацераю, але Юзік з Юркам пашлі на вуліцу, каб выказаць адзін аднаму сваё ўражаньне:

— Гэта-ж некалі Тамаш і Алесева маці гулялі разам.

— Ну але. Можа нават калі і пад ручку хадзілі.

А другі раз, таксама ў Алесевым дварэ, абдзіраючы з дроў зялёны мох, стараліся не прапусьціць ніводнага слова з гаворкі Алеся і Клемуся. І Алесь і Клемусь сядзелі на нізкім жардзяным плоце і курылі. Клемусь гаварыў:

— От, братка, Вольчына сястра, што тады прыяжджала, от прыгожая дзяўчына. Я аж закахаўся быў у яе.

Алесь моўчкі глядзеў на мокры сьнег. Сьнег раставаў патроху і з-пад яго чарнела зямля.

— Я разоў пяць тады заходзіў да Волькі. Раз у прысады хадзілі з яе сястрою. Хацелі да цябе зайсьці.

— Чаму не зашлі?

— Яна не захацела. Вядома, мала знаёмая. А ў нас у мястэчку няма добрых дзяўчат. Усё на далікацтва б'юць. Далікаціцца-далікаціцца, а глянеш ты на яе, дык, як індычка, выцягнуўшы шыю. Больш тае фанабэрыі, як таго чаго. Што, ня праўда? Адно і была ў нас адна добрая дзяўчына, гэта Ганна Барановічава...

І раптам глянуў Клемусь на Алеся і пакінуў гаварыць, пасьля хацеў паправіць сваю памылку:

— Дурныя ўсе нашы дзяўчаты, нічым ня цікавяцца, адно як хлопцамі.

Алесь паглядзеў на Клемуся:

— Хадзем каторага дня ў Чучаны да Зьмітровае Мані.

Клемусь радасна ўстрапянуўся:

— Братачка, яй-богу хадзем.

І ажывіўся яшчэ больш:

— Ты ўспамінаеш Ганну ці ўжо не? Скажы праўду.

Алесь панура адказаў:

— Н-не.

Клемусь не паверыў:

— Ты праўду скажы.

Алесь устаў з плоту і вынес з сяней пілу. Удвух з Клемусем пачалі яны пілаваць дровы. На вуліцы Юзік заўважыў Юрку:

— Гэта-ж Алесь цяпер сярдзіты, мусіць, на Барановічаву Ганну за тое, што не захацела ісьці за яго замуж.

— Не. Ён мусіць будзе браць цяпер Маню з Чучаноў. Тую, што ў Аляксандра ўсё поле баранавала. Ведаеш?

Падышлі пад Юркаву хату. Юрка сказаў:

— Тамаш учора глядзеў нашага каня. Казаў, каб прадавалі. А бацька, ліха ведае, нашто трымае яго. Усе гавораць.

І забыліся на ўсё гэта. Пашлі на агароды і кідалі мокрымі сьнежкамі на варон. Сьмехам абуджвалі вячэрні змрок.

І шмат дзён было такіх—хмурных, сьнегавых і мокрых. Мокры сьнег ня ўвесь растаў. Ляжаў пад куп'ямі ў ямах. Зямля была пярэстаю. Але ўсё памерла пад гэтым сьнегам; на траве сьнег не растаў.

Яшчэ досьвіткам пачыналі цупаць у таких цапы. Пасьля ўвесь дзень стукала імі ўся вуліца і на ўсю-ж вуліцу пахла пылам з растрэсеных снапоў. Каля адчыненых гуменных варот бялела салома і зьяўляліся людзі з абпыленымі тварамі, чорнымі вусамі і барадамі. Чуючы цяплыню на двары, у хлявох рыкалі каровы і пад вечар каля калодзезяў зьдзіўлена абнюхвалі сьнег. У дварох іржалі коні. У дварох-жа стаялі драбіны з чорнымі ад прымерзлай гразі калясьмі. І побач з імі наладжаныя сані чакалі свайго хуткага часу.

Вечары прыходзілі з густою сіньню неба, з рэдкімі зорамі і кудзельнымі абрыўкамі хмар. Тады чарнелі блізкія і далёкія кусты, дзівоснай сьцяною ўзьнімаліся лясы. Больш шорхла гразь, і поле маўчала чорнай цішынёю. А як ноч добра агортала зямлю, у кустох вылі ваўкі і трывожылі сабак. Сабакі па дварох не маглі супакоіцца, нэрвова слухалі, абнюхвалі сьнег і з смуткам самі пробавалі выць. Пасьля ўсю ноч заходзіліся брэхам на агародах і паплавох.

Сады былі мокрыя і голыя. Сьвежасьцю веяла гольле дрэваў, калівы шчуплае і зялёнае травы, што зрэдку дзе высоўваліся з-пад чорнага лісьця, перамешанага з мокрым сьнегам, весялілі людзкое вока.

У дварох пылілі церніцы, грызучы перасохлы лён, каля сушань пылу ільнянога было больш. І хлопцы пад вечар прыходзілі сюды памагаць канчаць дзяўчатам завіхацца каля ільну.

Плугі і бароны былі пахаваны да вясны. Зьвінелі пілы і стукалі сякеры. Шасталі сячкарні. Некалькі малатарань гуло з цямна да цямна.

А поле веяла воляй, і дарогі ўсё звалі ісьці. Плюхала і спакойна цякла рэчка, сіняя, халодная. Жаўцела жвірам на плытkіх мясцох і ў сіняе бяздоньне хавала дно сваё ў вірох. Маўчаў над ёю алешнік і крушыньнік, весела зеляніўся яловец. Кроплі сьнегавое вады і кавалкі abледзянелага сьнегу блішчэлі на яго калючым вецьці. Над ім пахлі хвоі, у спакойным шуме сваім, хаваючы слабы рух зімовага птаства.

У непарушным спакоі лясным далёка чуваць было стук клапатлівага дзятла, і свавольная вавёрка дасьціпна рабіла свой кожнадзенны спацыр.

Начамі сава прылятала да самых хат, сядзела ў прысадах на бярозе і плакала, падманваючы зайцоў. Старыя бабулі ў вёсцы палохалі гэтым савіным крыкам малых унукаў сваіх. А раніцою зьнікала недзе сава, а можа моўчкі заставалася сядзець да цямна на тэй-жа самай бярозе.

Сьнегавымі сьлязьмі выплаквала раньняя зіма сьмерць позьняй восені.

III

Прытульна было ў Барановічавай кухні. Пахла цыбуляю і селядцамі. Барановічыха сядзела на лаве і глядзела на мужчын. Парэзаныя на кавалкі селядцы з цыбуляю ляжалі на тарэлцы. Кварта гарэлкі была ўжо ў палавіне. Смачна жуючы селядцы, Вашыновіч гаварыў:

— Вы, мужчынкі, тымчасове, скажэце самі, чым я ня добры чалавек. Аб якой-небудзь кварце гарэлкі я не цануюся. У аўторак Павал на мяне быў узьняў крык, што са мною меркавацца ня можна. А тут усяго, тымчасове, і было тае крыўды, што я падаў голас за Аляксандра. Раз ён злавіў быў гусака ў сваёй капусьце, дык меў права выцяць гусака дубцом. Чорт-жа яго ведаў, што якраз-бо попадзе па галаве і што ад гэтага, тымчасове, гусак здохне. Чорт яго, тымчасове, матару бяры, з гэтым гусаком разам, няхай ён, бог дасьць, здохне другі раз. Тут не аб гусаку ход. Тут, тымчасове, як той казаў, чалавек павінен праўды дайсьці. От што, і скончана дзела, а ня то, што... Я, тымчасове, братка Юлік, кумок ты мой, купіў у цябе кабылку, а ты не захацеў барыша паставіць, дык прышлося, тымчасове, мне ставіць. От муж-

чыны няхай будуць сьведкамі. Кума дастала каўбасы і сала, то няхай бог дасьць здароўе. А я сам селядцоў прынёс. Налівай, кумок. Як той казаў, ні калі было, ні калі будзе. Абы, бог даў, кабылка жарабят вадзіла.

Барановіч тут-жа яго абнадзеіў:

— Ты пра жарабята будзь спакоен. Кабыла свае гадоўлі. Я табе благога не пажадаю. Што я— азіят які ці што?

— Я, кумок, гэтага не кажу... Будзьма здаровы. Дай божа, тымчасове, як той казаў, у добры час выпіць і каб усё ішло чалавеку на карысьць.

— Дай божа.

— Я, кумок, гэтага не кажу, што ты мне благога жадаеш. Калі я калі што, тымчасове, гэткае скажу, дык няхай са мною добрыя людзі не гавораць. Мужчыны ведаюць. Праўда, Мацьвейка?

— Праўда, на гэта тут няма чаго лішне гаварыць.

— Ну але. От і Мацьвей кажа. А пры людзях заўсёды лепш усё рабіць. Які дзе інтэрас, дык пры чалавеку яно іначай. Кабылка—яна ніштаватая. І што ты, Юлік, пазваў у сьведкі Мацьвея і Міколая, дык ты, тымчасове, добра і зрабіў. Вядома што. Мы людзі памяркоўныя і ня лішня тут у нас, што якое павінна заварвацца, значыцца, гэтае, тымчасове, адным словам, і больш нічога. Будзьце здаровы, мужчынкі.

— Дай божа, каб ты з кабылы карысьць меў. Каб ты, пакуль яна ў цябе і будзе, з яе цешыўся.

Вашыновіч даеў селядца. Барановічыха прынесла яшчэ сала.

— Няхай-бы, тымчасове, кума выпіла.

— Дзе бачылі, мне і ад тае чаркі ў галаве кружыць.

— Ай, што там, кумка. Што гэта самі. От давайце, тымчасове вып‘ем, і тады сабе ляжаце адпачываць На здароўе... Кабылка гэтая павінна быць добрая, я і сам гэта бачу. Я яшчэ жарэб‘ем яе ведаў. А, тымчасове, у мяне яна будзе заўсёды, як мае быць, дагледжана, лішне перасільваць работаю яе ня буду ззамаладу. Бо што, тымчасове, за карысьць, як у іншага там конь ледзьве каля жолаба стаіць. Ніхто яму не вінават, што ён такі гаспадар. А тымчасам у камітэт першы ідзе, каб яму давалі. Чорт яго, тымчасове, усім выстарчыць. Ты, Мацьвейка, ня думай, што гэта я пра цябе тут гаворку пачаў. Ты мне нічога кепскага не зрабіў, то што я лішне буду тут гаварыць. Дай божа табе, каб як найлепей. Я чалавек не зайздросны. Давай, Мацьвейка, вып‘ем з табою.

— Выпіць то яно можна. Але да чаго ты тутака гэты камітэт прыпяў?

— Ні да чога я яго не прыпінаў гэтага камітэту, і прыпінаць, тымчасове, ня думаю. Я гавару проста. Я не пасаромеюся каму сабе хочаш у вочы сказаць. Тут няма чаго вачэй заплюшчваць, як гэта іншы робіць. Я не такі. Раз я што, тымчасове, намерыў, я тут табе хоць што ты хочаш, а выкажу і ня буду тут лішне мудраваць. Тымчасове, праўда ці не? Няхай мужчыны скажуць.

— А калі мне камітэт памог, дык папрабуй, пажыві ты гэтак, як я жыву. Тады пазнаеш.

— Нашто мне пазнаваць тое, што да мяне не належыць.

— Ага, да цябе гэта не належыць?!

— Вядома, што не належыць. Я да гэтага не дапушчуся.

— А я гэта сам дапусьціўся?..

— Я не кажу, што і ты гэта сам.

— Ну дык нашто ты крыўдуеш?

— Я, сказаць, і ня крыўдую.

— Ну, а як-жа?

— Ніяк. Няхай, тымчасове, той крыўдуе, у каго якая крыўда на каго ёсьць. А маё тут дзела—старана.

— Дык чаго ты мне ўсё выгаворваеш?

— Хто гэта выгаворвае? Ніхто не выгаворвае. Тамаш захварэў, ляжыць хворы, то дай божа, каб ачуняў. Ён, сказаць, табе ня мала дабра зрабіў, як пабыў у камітэтчыках.

— Што ты тут Тамаша ўспамінаеш?

— Прышлося да слова, то чаму ня ўспомніць, калі яно так падыходзіць, бо якраз.

— Ат, што з табою гаварыць.

— Можаш сабе, тымчасове, не гаварыць. Ты за сьведку пабыў, як я ў Юліка купіў здаровую кабылку, ня хворую, як мае быць, то і дзякуй табе. Зроблена ўсё пасуседзку. Юлік цябе пазваў, я паставіў барыша, бо мы гэтак у цане сышліся. Што тут лішне гаварыць. Я чалавек, тымчасове, такі, калі дзе што ня так, я люблю лепш памаўчаць. От што. Чуў ці не?

Крываносы Мікалай заўважыў:

— Аб чым тут, браткі, ход?

— Тымчасове, ні аб чым.

— Дык нашто гаварыць адзін насупроць другога?

— Жывы чалавек, тымчасове, можа пагаварыць.

Мацьвей памог у гаворцы:

— Языка ня прывяжаш. Няхай меньціць, колькі ахвоты будзе.

— Ах, які ты ўжо, тымчасове, сьвяты. Ты за Тамаша пакрыўдзіўся? Я Тамашу кепскага не хачу і нічога на яго не скажу. Тамаш—сьвяты чалавек.

Ён захварэў, ляжыць цяпер хворы, то я-ж кажу, каб бог даў паправіўся і пажыў яшчэ на сьвеце. Бо чалавеку жыць трэба. На тое чалавек, каб жыць. Усё жывое на тое жыве на сьвеце, каб жыць. А чалавек яшчэ больш. Ён, хоць-бы сабе і гэты, тымчасове, Тамаш. Захаладзіўся, а чалавек ён стары, от яго і забрала. А што яму суджана, хто яго ведае. Наперад чалавек нічога ня можа ведаць. Ні я, ні ён, ніхто ня можа ведаць, што заўтра можа быць. Гэта, як сьвет сьветам, гэта заўсёды так, і ніхто ніколі гэтага не перайначыў. Як той, тымчасове, казаў, вышэй самога сябе ня скочыш. Калі суджана памерці, дык нічога не парадзіш, чалавек, памрэш. А калі суджана папраціцца, дык папраўішся. А тымчасам, цяпер яно, хоць і старому, скажам, а пажыць—самы раз. Хоць спакою на сьвеце няма, але яно—вайна пражылася... Яно, праўда, невядома, што яшчэ будзе. У нядзелю на месьце гаварылі, што Англія гатова надумацца, ды на нас Кітая сунуць. Або, скажам, Польшча. Гэтая, каб на яе агні, сквапная, горла ў яе, можна сказаць, пражорлівае, а сэрца каменнае. Але калі яно на тое пойдзе, дык можа і адапхнецца гэтая, як той казаў, суседка.

Мікалай заўважыў:

— Як гэта адапхнецца?

— А хто яе ведае. Ну каб далей трохі, значыцца, а то вельмі-ж блізка расьселася, гадаўка. Калі што якое, дык яна і тут. Яна, па апісаньню сказана, і даўней усё мецяжы заварвала, дык думае, што і цяпер гэта тое самае. Гэта ўсё панская штука. Гэта ўсё яны арудуюць, каб іх, бог даў, агонь высмаліў там, дзе яны ёсьць. Я на работу ў двор хадзіў ззамаладу... Ну, тут яшчэ па аднэй засталося. Давайце перакулім і пойдзем спаць.

Падкруці, Юлік, агонь у лямпе, вельмі нешта пстрыкаць пачаў. Газы мусіць мала... Ну, як ад Ганны, можа якая, тымчасове, вестка прышла?

— Піша, што жыве нішто.

— Вядома, што будзе жыць.

— От, нейк-жа будзе жыць.

Вашыновіч устаў і пачаў падпяразвацца. Барановіч сказаў:

— Няхай-жа табе мая кабыла пойдзецца.

Ківаючыся ў бокі ад хмелю, Вашыновіч падышоў да Барановіча і пацалаваўся з ім.

Ідучы дадому, Мікалай гаварыў Мацьвею:

— Вашыновічава дзяўчына прыгажэйшая за Ганну. І лепшая. З ёю некаму лепш будзе жыць.

Мацьвей, з абыякавасьцю ў голасе, адказаў:

— Можа.

IV

Дрэнна аб'ежджаная дарога глуха скрыпела сьвежым мёрзлым сьнегам пад палазамі. Алесь сядзеў на развалінах, выцягнуўшы ногі з боку над сьнегам. Клемусь стаяў уперадзе, моцна нацягваючы лейцы.

— Пускай яе вольна,—сказаў Алесь.

Клемусь адказаў:

— Трэба яе прывучыць да лейцаў, так трудна аб'езьдзіць... Бач, рвецца.

Жарабіца ўскідала галаву ўгору і бегла, жуючы цуглі. Весела імчаўся паабапал саней сьнег. Клемусь раптам закрычэў:

— Эй, з дарогі!

Сані адно мільганулі за ўзгорак, і на ўзгорку засталася ісьці сабе паволі Маня. Алесь адно

ўсьпеў многазначнай усьмешкай і ўзмахам рукі да казырка прывітацца. Яна адказала на прывітаньне такой-жа ўсьмешкай. Алесь яшчэ гукнуў:

— Пачакай, Маня, падвязом.

Але яна пашла, мусіць, не пачуўшы.

— Вярні назад,—скамандаваў Алесь.

Яна адышлася трохі ад узгорку, пакуль Клемусь прыпыніў жарабіцу, пакуль завярнуўся і дагнаў яе.

— Садзіся, Маня.

— Гэта вы куліка езьдзіце ці што?

— Аб'яжджаем жарабіцу.

— Бачу.

Яна была ружовая ад холаду. Спрытна ўскочыла на сані. Алесь злавіў яе рукамі і пасадзіў поплеч сябе. Клемусь абярнуўся і весела падмігнуў.

— Куды ты, Маня, ідзеш?

— Да Аляксандра.

— Чаго?

— Старыя там яшчэ справы.

— Калі назад?

— Хутка.

— Я цябе правяду?

— Можа ня варта.

— Правяду.

— Ну добра. А дзе-ж ты мяне спаткаеш?

— Буду бачыць, як ісьцімеш вуліцаю.

Захватвала дух—так імчаліся санкі. Адно кружыўся і бег сьнег паабапал саней і з-пад капытоў узьлятаў, дробна пабіты. Маўчалі. Алесь глядзеў на Маню. Яна трохі саромліва глядзела на дарогу. Твар у яе быў шырокі, сінявокі. Сьветлыя валасы выбіваліся з-пад канаплянае хусткі. Уся яна вабіла сваёю жаночасьцю. І здавалася яму, што яшчэ больш прывабная яна ад таго, што такі

гаматны на ёй ватовы, кароткі, чорны каптан і такая-ж гаматная цёплая хустка. Яна павярнула трохі твар да яго і спаткалася з яго вачыма. Блiснулі дзявочым агнём яе вочы, і зноў яна пачала глядзець на сьнег, захопленая роўным імчаньнем. Так моўчкі ўехалі ў вуліцу. Яна зьлезла каля Аляксандравае хаты. Алесь з Клемусем яшчэ праехалі раз па тэй-жа самай дарозе. Клемусь сьпяваў. Алесь быў яшчэ пад уладай радаснага ўражаньня ад нядаўнага спатканьня з дзяўчынаю. Нейкая, мала калі вядомая, нецярпялівасьць апаноўвала ім. Нэрвова чакаў, каб хутчэй ісьці з ёю разам.

Яна ня бавілася. Ён вышаў ёй насустрач, і яны пашлі. Ня вельмі лёгка ісьці было па неаб'еджданай дарозе.

— Чаго ты сьпяшаеш так, Маня?

— Я не сьпяшаю. Можна павальней. Работы нагальнае дома няма.

— Што ты робіш цяпер?

— Праду. Буду кросны ставіць неўзабаве... Калі вечарам прыходзь, Алесь, гуляць.

— Калі?

— Хоць калі.

Педмерзлы сьнег рассыпаўся пад нагамі. Зялёны ядловец сіратліва спатыкаўся пры дарозе. Роўным было сьнежнае поле. Гаворка ня ішла лёгка.

— Раскажы што-небудзь, Алесь... Што ты робіш цяпер, чым займаешся?

— Ты раскажы.

— Што-ж мне пра сябе расказваць. Я-ж табе гаварыла—праду, кросны пастаўлю. На вячоркі хаджу, часам вечарынкі бываюць. Весела ў нас у Чучанох... у нас у Чучанох дзяўчаты прыгожыя.

Алесь глянуў на яе твар.

— Праўда, што прыгожыя.

— А ты-ж усіх ня ведаеш.

Ускінула вочы на яго, спаткалася з яго вачмі і больш яшчэ паружавела, сказала:

— Чаго ты так прыглядаешся на мяне?

— Ты прыгожая.

— Ну але, прыгожая.

— Ты адно сама сябе не хвалі.

— Але я сама сябе і ганіць ня буду.

Абое засьмяяліся. Маня зусім весела, Алесь трохі задуменна. Яму хацелася быць блізка з ёю. Далёка так прайшлі. Яна сказала:

— Хіба вярніся ўжо, Алеська. Прыходзь гуляць.

— Прыду. Калі прыйсьці?

— Калі сабе хочаш.

— Гэтымі днямі прыду.

— Глядзі-ж, каб прышоў.

Разьвітваючыся, затрымаў яе руку ў сваёй, скрозь халодныя ад марозу пальцы адчуваў гарачыню яе цела.

— Я яшчэ правяду цябе да таго ўзгорку.

З радаснаю ўсьмешкаю яна кіўнула галавою. Сінія вочы яе слаўна абвеялі яго жаночаю пяшчотаю.

Разьвіталіся на ўзгорку. Зноў ён затрымаў яе руку. І нейкая маўклівая згода адразу ўстанавілася між імі.

— Прыду.

— А я чакаю.

Пашоў назад, ахоплены радаснаю трывогаю нядаўняй блізкасьці дзяўчыны і іхнім маўклівым разуменьнем адно аднаго. Марознае паветра вясёлым хмелем кружыла галаву, пах ялоўцу поўніў усё прасторнай прытульнасьцю. Хацелася яму сьпяваць і бесьперастанку ісьці марозную роў-

насьцю сьнегавога поля. Пашоў хутка і адчуваў, як усё больш і больш узьнімаецца ў ім бязьмежнае ўзбуджаньне.

V

— Дзе гэта быў, Алесь? У Чучанох?

— Але.

— Інтэрас які маеш?

— Але.

— Садзіся ў сані, што ты маеш блытацца па гэтым сьнезе.

Алесь сеў. Барановіч цішэй пусьціў каня. Ногі ў яго былі накрыты і ўкручаны кажухом.

— А я гэта ў Ніскавічах быў, там, казалі, чалавек ёсьць, што знае нейкае зельле ад раматусу. І так, калі ў каго ногі баляць, дае нейкія прымочкі.

— І вам даў?

— Даў. Такое зельле, што я яго і ня бачыў ніколі. Разам з каранямі Мачыць у гарэлцы і нагу выціраць... Я-ж, паверыш?—ледзьве на сані ўскаціўся, так мне баліць цяпер гэтая нага, аж тузае. Да сэрца боль даходзіць. Ужо каторы дзень. Горш стала, ліха яму. Я без валенкаў на двор ня выйду, укручваю яе суконкамі, у цяпле заўсёды гэтую нагу трымаю, а ўсё роўна нічога не памагае. Трымціць нейк, рве. Як-бы хто яе сьвярдзёлкам куціць. Што ты зробіш!

— А ляжаць ня пробавалі? Каб гэта ў пасьцелі даць ёй спакою. Можа яна натруджана вельмі?

— Яно, можа, гэта і добра было-б, але ці гэта-ж чалавек улежыш? Жывы чалавек варушыцца павінен. От я ўжо думаю ў нядзелю ляжаць цэлы дзень. Пасьнедаю і лягу.

— Вы папрабуйце з тыдзень паляжаць

— Хто яго ведае, можа прыдзецца так, што каб і хацеў устаць, дык ня ўстану. Вельмі-ж разьбірае. Здаецца-б, на сьвеце ня жыў, такая боль. На ноч дык яшчэ горш. Ня дай божа нікому добраму. От я проста рвуся, каб рабіць што-небудзь, а тут ня можна. Я не магу, рукі склаўшы, сядзець. Я ззамаладу прывык да работы. Я хоць, сказаць, і не малады ўжо, але яшчэ рабіў-бы, каб не нага гэтая. Абы адно мокра і холадна на дварэ, дык боль пераходзіць у сьпіну. Тады сагнуцца не магу, так і варушуся, як слуп. Шануючы цябе, не магу і портак падцягнуць... А жыць трэба, і рабіць трэба. От у мяне меншы хлопец усю гаспадарку ўжо можа ўправіць, але хлопец хлопцам. Калі бацька не паглядзіць, не пакамандуе, дык яно ўсё і робіцца па канец рук. Ты сам гаспадарлівы хлопец, ты сам павінен ведаць. Тут трэба над усім гаспадарскае вока.

— Вядома што.

— Пакінь ты гаспадарку бяз дагляду—яна табе ў два дні на пшык зьедзе. У мяне от двое коняй. Дык хлопцы гэта іх цяпер і кормяць і пояць. Сядзі ты, кажуць, бацька ў хаце, ды ня рыпайся, без цябе, кажуць, дагледзім. А я потым разоў тры ў дзень выходжу паглядзець, ці ядуць хаця коні. Можа што ня так, можа што ня гэтак. Можа гной ня роўна ў хлеве, можа не падаслана. А можа замала харчы дадзена. От як. Ну, падумай ты сам, не дагледзь, папробуй. Што тады будзе? Жывёліна-ж без языка, яна табе ня скажа, што ёй далягае, чаго ёй не хапае. Яна табе не паскардзіцца. Гэта-ж табе, не раўнуючы, не чалавек. Ого, гаспадарка бяз дагляду—усё роўна як нямаведама што... Бывала от, быў я яшчэ малодшы, дык на начлег

езьдзіў. Адзін раз, памятаю, ноч, як палатно, ясна ўсюды, бела, відната. Раса, як боб на траве. Халодная раса. І туман так сабе ўстае наводдалек над балотам, як малако. Густы туман, як сьцяна. А мы пасом сабе коні ў зарасьніках. Трава, я-ж кажу, росная. А для коняй гэтая раса—лепш, як аўса. Конь улетку толькі і аджывае, што ўночы на роснай траве...

— Дык што там было?

— Начлег добры. Коні папад'ядалі і адпачнулі. Якраз, памятаю, снапы тады вазілі. Як я люблю начлегі! Як пачаў я з дванаццаці год езьдзіць на іх, дык от пакуль сыны на ногі не ўзьняліся, тады ўжо радзей езьдзіў. Ого! Конь табе сам ведае, любіць яго гаспадар ці не. Над каня і над сабаку няма на сьвеце разумнейшае жывёліны. Даўней у мяне быў сабака чорнае масьці, дык цыгане яго былі зләвілі ды завязьлі некуды. Цэлы год ня было. А пасьля прыбег, небарак, з рассечаным вухам. Дзе ён быў—хто яго ведае, ён-жа ня скажа табе, не паскардзіцца. Але прыбег дадому праз год, нікога і нічога, небарак, не забыўся. Усё як мае быць памятаў.

— Гэта Вашыновіч купіў у вас чырвоную кабылу?

— Але, я яму прадаў.

— Нашто вы прадалі?

— Я, сказаць, і шкадую цяпер, што збыў гэтую кабылу. Але няхай яна яму здаровая будзе. На гаспадарцы-ж так, калі пойдзецца, ды калі жывёла здаровая, дык і ўсё іншае добра будзе. Хіба, ня пры нас казана, у сям'і што здарыцца—захварэе хто, ці што, ці як. Я думаю, калі бог дасьць здароўе, некалі на вясну, калі здароў прычакаю, усю дзялянку пад авёс пусьціць—няхай расьце.

Коням авёс патрэбен. Пушчу яшчэ адно канянё на той год—ад старое кабылы жарэбчыка прадаваць ня буду. Жарабца гадаваць буду. Няхай будзе свой жарабец. Будзе, як той казаў, і сабе і людзям. Калі я на яго пушчу аўса, дык на гэта вярну. Ён сам сябе аплаціць. А тымчасам, нейк аж весялей, калі жарабец у хляве стаіць. У нас ніхто ня мае моды трымаць жарабца. Дурні. Жарабец заўсёды сам сябе аплаціць. Гэта-ж прыбытак. Гэта-ж жывая выгада... Ай божа-ж мой, божа, як-жа мне нага баліць! Яй-богу, да сэрца боль даходзіць. Круціць мяне, цісьне. Ай! Аж у ваччу цёмна робіцца... Страшэнна я люблю коні.

— А што дактары кажуць?

— Што яны кажуць! От яны гэтак і кажуць. Адзін кажа, што рапарацу трэба рабіць, другі кажа, што і гэта не паможа—трэба было, кажа, адразу думаць пра гэта, кажа, што позна, нічога ўжо ня будзе. Так, мусіць, давядзецца і век свой зьвекаваць. От падлячу трохі, каб ня так яна мяне мучыла, а там вясна, цяпло—тады інačай будзе. А там, пасьля вясны, будзе відаць, што і як яно будзе. Некалі давядзецца мне ня так яшчэ з нагою гэтаю папакутваць, але што ты зробіш. Буду падлечвацца як-небудзь... Бач, якая рунь зялёная з-пад сьнегу відаць каля дарогі. Ці гэта вецер зьдзьмуў сьнег і прытапталі яго, ці гэта адграбло што? Бачыш ты, якая рунь?!

Уяжджалі ў вуліцу.

VI

Алесь і Клемусь увайшлі ў хату ня зусім рашуча, як уваходзяць спакойныя хлопцы першы

раз у незнаёмую хату, дзе ёсьць дзяўчаты. Гарэла лямпа і дзяўчаты пралі. Бацька Мані—Зьмітрок— ляжаў на палатках, паволі сабе пакурваў і зрэдку падаваў з палатак сваё слова, пацьвельваючыся з дзяўчатамі. Клемусь увайшоў першым і ўзяў адразу тактыку вясёлага нахрапу:

— Добры вечар у хату.

— Добры вечар,—адказалі ўсе ў адзін голас. І дзяўчаты разам глянулі на абодвых.

— Алесь прышоў,—сказала Маня.

Усе сталі разглядаць Алеся. Клемуся ведалі ўсе даўно. Зьмітрок раптам яшчэ больш ажывіўся на палатках:

— Ты мусіць, Алесь, ніколі ў нашых Чучанох і ня бываеш.

Клемусь адразу-ж адказаў за Алеся:

— Мы бываем усюды, дзе толькі дзяўчаты ёсьць.

Зьмітрок аж сеў на палатках:

— Што ты, хлопча, брыдзіш сьветам. Нашы Чучаны стаяць на трэцяй вярсьце ад вашага мястэчка, а я цябе першы раз у сваёй хаце бачу.

— А хто-ж вам, дзядзька, вінават, што я ў вас ніколі ў хаце ня бываю?

— Як гэта?

— Трэба было тэлеграму даць, што ў вас тут у хаце заўсёды поўна дзяўчат, тады нас-бы доўга не чакалі. Нас-бы адсюль за нос ня вывеў-бы.

— Гэта праўда, што я не здагадаўся. Гэта трэба было, добра кажа—не тэлеграму, а ў газэтах публікацу пусьціць, што ёсьць у Чучанох на выбор дзяўчаты, і калі трапіцца добры хлопец, дык нават па сходнай цане льга на першы пачатак аддаць з пару якую замуж.

Дзяўчаты зашчабяталі:

— А от затанна ня лішне нас возьмеш замуж. Раней няхай парогі паабіваюць, ходзячы.

— Вы думаеце, для дзяўчат толькі і думак, што пра хлопцаў!

— Толькі ўсяго і думак, што замуж!

— Гэта, гледзячы, які хлопец будзе.

Зьмітрок, зьвесіў з палатак ногі і не даслухаў да канца дзявочага шчэбету:

— А яны-ж у нас гэтакія—абы ўгледзіць хлопца, дык гатова за ім на край сьвету бегчы. Бач, унь тая, што каля вакна сядзіць. Як толькі ўбачыла, што хлопцы ўвайшлі, дык аж самлела.

Дзяўчына пачырванела:

— Чаго мне млець. Ня бачыла ніколі хлопцаў!

Зьмітрок ніжэй спусьціў ногі з палатак:

— А хто цябе ведае, чаго ты млееш. Табе лепш самой ведаць, як мне старому. Я тут ня пры чым.

Дзяўчаты зноў зашчабяталі:

— Гэта-ж хлопцы заўсёды па дзяўчатах млеюць.

— Заўсёды хлопцы за дзяўчатамі бегаюць.

— От вы, дзядзька, заўсёды, ліха ведае, што прыдумаеце!

— Паслухаць адно вас!

Зьмітрок зьлез на палок і, чухаючы ногі, засьмяяўся:

— Гляньце, хлопцы, адно на яе, аж галава ў яе кругом ходзіць, прыглядаецца як на вас.

Дзяўчына больш яшчэ зачырванелася, апусьціла вочы і пачала моўчкі прасьці. Таварышкі за яе ўступіліся:

— Яна ў нас самая прыгажэйшая.

— Яна абы з кім і гуляць не захоча. Думаеце што.

— Зьмітрок усьцягнуў на ногі боты і пашоў на двор. Алесь і Клемусь памагалі ўжо дзяўчатам прасьці. Рогату была поўна хата. Зьмітрок увайшоў, сьцягнуў з ног боты і зноў палез на палаткі. Курыў, падаваў свае заўвагі. Сказаў:

— Для вас дык вядома з навіны—апараніліся вы трохі, браткі.

— Чаму?

— От зараз, пачакайце, дык поўна хата хлопцаў будзе. І нават малых панашываецца, адкуль толькі яны і бяруцца. Яно дарма, што малое, як вош, а да дзяўчат і яго ўжо, ліха яму, цягне. Хэ-хэ.

Неўзабаве пачалі сыходзіцца чучаноўскія хлопцы. Пазнавалі Алеся і Клемуся:

— Здаровы, браткі.

— Да чучаноўскіх дзяўчат гуляць? Бач ты!

— Здароў, Алесь!

— Як гэта вы трапілі?

Зьмітрок падаў голас з палатак:

— Як трапілі, дзівак! А як ты, блізкі сьвет, аж у Астрэйкі дапінаеш да дзяўчат. Галава!

Хлопцы прынясьлі гарэлкі, пачалі частаваць дзяўчат. Сілком прымушалі піць. Дзяўчаты рагаталі, пішчалі, ня пілі. Тады хлопцы папрымошчваліся ў мыцельніку на лаве:

— Дзядзька Зьмітрок, злазьце—вып'ем па чарцы.

Зьмітрок спусьціў ногі з палатак:

— Ад добрага я не адказен.

Сышоў на зямлю і ўмяшаўся ў хлапечы натоўп. Хлопцы прывялі пад рукі дзяўчыну:

— Калі ня хочаш піць, дык хоць папробуй.

— Ай, адчапіся!

— Ну хоць губы памачы.

— Ня буду.

— А яшчэ і замуж прагнеш.

— Адкуль ты ведаеш!

— Ня відаць ці што.

Пасадзілі дзяўчыну на лаву. Дзяўчына вырвалася. Дзяўчаты рагаталі. Гарэлку выпілі і паставілі бутэльку на вакно.

— От табе, Маня, спадкі.

— Ты тут гаспадыня ў хаце, няхай табе і застаецца.

— Пустая бутэлька. Дзякуй. Каб поўная.

— Чорт з вамі разьбярэ. Адну ніяк ня ўпросіш, каб выпіла, а другая крыўдзіцца, што пустая бутэлька.

— От каб музыку дзе справадзіць.

— Чаму ты, Клемусь, скрыпкі ня ўзяў?

— Ты, здаецца, цяпер на клярнэце граеш, няхай-бы ўзяў.

Неўзабаве прывялі аднекуль скрыпача. Ён прышоў у белых палатняных портках, падпяразаны шырокаю папругаю па кароткім кажушку. Пацерабіў стрыжаную бараду і падсівелыя вусы і сказаў:

— Што-ж, браткі, так граць.

Зараз-жа дасталі яму недзе ў Зьмітра дзьве чаркі гарэлкі, і ён пачаў граць. Зьмітрок пасьміхваўся, лежачы на палатках. Дзяўчаты папакідалі прасьніцы. Але скокі нешта ня ладзіліся. Маня сядзела поплеч з Алесем. Гаварыла:

— А я думала, ты ня прыдзеш.

— Прышоў.

— Прыходзь часьцей.

— У нядзелю прыду.

— Глядзі-ж, каб прышоў.

Нейкая маўклівая згода і разуменьне адно аднаго ўстанаўлялася між імі.

— Ведаеш што, Маня.
— Ну гавары.
— Давай цяпер пойдзем па вуліцы паходзім.
— Не.
— Чаму?
— Нядобра.
— Але чаму?
— Будуць усе думаць ліха ведае што, гаварыць.
— Ну дык што, чаго ты баішся? Няхай гавораць.
— Гэта табе толькі здаецца, што нічога.

Клемусь весяліў усіх. Стаяў пасярод хаты, тлумачыў пра нейкую новую гульню. Гаварыў сьмешна, сьмяшыў усіх. Падышоў да Алеся. Алесь сказаў яму:
— Можа ўсе гуртам па вуліцы пагуляем?

Клемусь зразумеў Алеся:
— Зараз, усе.

І сказаў усім:
— Вечар, як звон. Давайце ўсе на вуліцу.

Хто згадзіўся адразу, хто не згадзіўся, таго прымусілі згадзіцца. Хата апусьцела. Шумна стала на вуліцы. Алесь ішоў з Маняю.
— Я, Маня, заўтра прыду.
— Ну прыходзь.
— Вячоркі будуць?
— Не. Заўтра ня будзе.
— Ты будзеш дома?
— Каб ведала, што ты напэўна прыдзеш, дык была-б.
— Напэўна прыду.
— Дык я буду чакаць.
— Я трохі пазьней прыду, як сягоньня.
— Добра.

Узяў яе пад руку. Адчуў яе моцную руку, гарачую, здаровую. Мацней прыціснуў руку да сябе.

Яна з жаночым задорам глянула яму ў вочы. Ён сьціснуў яе пальцы. І яшчэ мацней. Засталіся ад усіх, адны на сьнегавой вуліцы. Бачылі толькі сьнег пад нагамі, ноч на пустым небе і адчувалі адзін аднаго. Вярнуліся назад. Першымі ўвайшлі ў хату. Бацька спаў на палатках. Цішком селі на лаву. Нічога не гаварылі. Ён гладзіў яе галаву. Валасы ў яе былі каштанавыя, ушпіленыя трыма грэбнямі. І гэта не спадабалася на адзін момант яму. Успомніў Ганьніны косы. І раптам прайшло ўсё. Усё забылася. Усё адагнаў ад сябе. Прытуліў Маню да сябе, чуў, як пахлі ружовым мылам яе валасы. Раптам яна апусьціла галаву ніжэй, абхваціла яго за шыю рукамі. Ён адчуў здавальненьне і зусім забыўся на ўсё, што дзе калі-небудзь было. І моцнае жаданьне зьявілася ў яго, каб стала яна блізкаю для яго і каб разумела ва ўсім яго. І моцнае жаданьне гэтае межавацца пачало са смуткам.

— Ведаеш, Маня?

— Што?

— Слаўная ты.

— Ты-ж мяне добра ня ведаеш.

— Можа.

— Ну от бачыш, а гаворыш.

— Мне здаецца. Я думаю, што гэтак.

— Раней часу ніколі ня трэба гаварыць.

— Раней якога часу?

Ружовая, разагрэтая, яна засьмяялася:

— Я і сама ня ведаю.

І моцна яны абняліся.

— Памятаеш, як я ў Аляксандра жала, а ты здалёк крычаў мне дзяндобры? Ну, скажы.

— Што?

— Чаго ты маўчыш?

— Давай памаўчымо.

— Ну добра.

І ўжо ўвесь час маўчалі, прыціснуўшыся адзін да аднаго, аж пакуль не зазьвінелі ў дварэ галасы. Дзяўчаты пачалі разьбіраць свае прасьніцы. Трэба было зьбірацца дадому.

VII

Назаўтра ня было вячорак. Алесь адзін прышоў бяз Клемуся. Бацька Манін стаяў каля стала над лямпаю і глядзеў на агонь. Узрадаваўся Алесю:

— А старая мая на вячоркі сышла недзе. Воўну прадзе. А я от закурваць зьбіраюся. Часам гэта бывае ў чалавека—стаіш, як чапля ў вадзе, глядзіш на што-небудзь і цяжка табе вачэй на што-небудзь іншае адвесьці. Ад чаго гэта бывае часамі ў чалавека?

— Ну, але гэта бывае.

— Ты гэта да Мані гуляць прышоў, мусіць?

— Да Мані.

— Ну то прыдзецца-ж табе, браце, пачакаць. Давай будзем разам закурваць.

— А дзе-ж Маня?

— Ой, браце, далёка. Не палохайся, у Амэрыку не паехала. Ня так далёка, як глыбока. У пограб па капусту палезла.

Стукнулі дзьверы.

— Добры вечар,—сказала Маня.

Выцерла рукі, падышла да лямпы і падала Алесю руку. Рука была халодная, макраватая.

— Куды вы, тата, сабраліся?

— От куды-небудзь высунуся з хаты.

— І пашоў. Чуваць было, як кашлянуў і плюнуў на вуліцы. Пахла ў хаце шаткаванкаю і курадымам з лямпы. Маня падкруціла большы агонь.

Узяла венік, падмяла каля печы дробную кару з дроў.

— Што ты робіш цяпер, Алесь?

— Малачу.

— Што ў вас там робіцца?

— Ня ведаю. Нідзе ня бываю, у хаце сяджу.

Памаўчалі. Абодвым хацелася зноў так сядзець, як учора. І нейкая як-бы саромлівасьць была трохі ў іх абаіх.

— Сядзь, Маня, тут.

Маня села і прапалі ў іх адзнакі лёгкай саромлівасьці. Сядзелі блізка. Гаварылі пра ўсялякія нязначныя і дробныя рэчы. Шпарка бег час. Шмат было выгаварана за вечар слоў і нічога ня было сказана пра самае важнае. Але было адчута і высьветлена яно само ў іх абаіх. І гэта было вядома ім. Алесь пашоў у той вечар дадому радасны і шчасьлівы Маняю. Ішоў хутка сьнегавою дарогаю. Ад хады і марозу весела захватвала дух. Дома здалося душна, празьмерна цёпла ў хаце. Не запальваючы лямпы, стаў класьціся спаць. Думаў пра Маню. Думаў пра тое, што можа яна прынясьці яму сваю жаночую радасьць. І доўга ня мог заснуць. Хацелася, каб хутчэй прайшла ноч, а там раніцою дамалаціць з Мікалаем авёс і пайсьці да Клемуся, разьведаць, як капэля. Пайсьці да Тамаша, разьведаць пра алейню і камітэцкія справы. Заснуў пад дзень. І прачнуўся як зусім відно было. Усхваціўся.

— Заспаў.

Маці сказала:

— Хіба ты нездароў?

— Позна прышоў.

— Ці гэта-ж пяршыня табе позна прыходзіць?

— Галава баліць.

— Спаў ты дрэнна. Качаўся ўсё. Я чула.
— Доўга заснуць ня мог.
— Глядзі, ці здаровы ты?
— Здаровы.
Маці паглядзела на яго:
— Цяжка мне аднэй у хаце. Старая я. Мне ўжо і каб лягчэй крыху было, не пашкодзіла-б.
— Ведаю.
— Хіба ты ажаніся.
Алесь змоўчыў.
— Ты ня шукай лішне якое панаватае, бо яна табе жыць спакойна ня дасьць. Пашукай сабе дзяўчыну простую, добрую, працавітую. Каб яна гора людзкое ведала, каб яна бяду разумела. Дык з гэтакаю табе і жыць будзе добра. І ў хаце лад будзе.
Алесь памаўчаў і сказаў з нейкаю раптоўнаю рашучасьцю ў голасе:
— Я ўжо знайшоў сабе дзяўчыну.
— Каго?
— Будзеце бачыць.
— Тутэйшую?
— Але.
— Прыглядайся-ж добра да яе. Каб у бяду ня ўскочыў.
І доўга яна яшчэ гаварыла, тупаючы па хаце. Ён-жа пашоў да Клемуся і прасядзеў там да самага вечара. Крываносы Мікалай прыходзіў дамалачваць авёс і пашоў назад. Пад вечар прышоў Алесь з Клемусем, удвух зьбілі два астатнія пасады аўса і пашлі да Скварчэўскага на капэлю.
Дзён праз два зноў хадзіў Алесь у Чучаны. Назад Маня правяла яго аж за вёску. Ішлі і гаварылі, як зусім ужо блізкія. Абое адчувалі радасьць ад свае адно да аднаго блізкасьці.

Пасьля ўсё пачало ўваходзіць у сваю ранейшую каляіну. Роўна пашла ранейшая работа.

VIII

Тамаш ляжаў на палку каля печы, па самую бараду ўкрыты сваёю браваркаю. Глядзеў на сьцяну і то заплюшчваў, то расплюшчваў вочы. Алесь увайшоў у хату па паўдні. Тамаш перавёў на яго вочы, і твар яго не зьмяніў спакою сваіх рыс.

— Два тыдні ня бачыліся.

— Але.

— Увесь гэты час ляжу.

— Страшнае што?

— Халера яго ведае. Дактары нічога не прызнаюць такога. Захаладзіўся—больш яны нічога не гавораць.

— А як на паправу, ідзецца?

— Як-бы лепш трохі.

Пахла падмеценаю кагадзе хатаю. У падпечку сакатала курыца.

— Выгані ты яе, браце, у сенцы, няхай на яе паморак, аж у вушшу ляскае. Як на тое ліха, сышлі ўсе з хаты.

Вылез раптам з-пад браваркі, спусьціў ногі на зямлю. Пасядзеў з поўхвіліны і зноў лёг:

— Не магу, а так, здаецца, устаў-бы ды пашоў-бы. Устаць хочацца. А тут сілы няма. Што ты зробіш... Каторы ўжо дзень ня курыў, адваротна ўсё было. Дай хіба там, браце, на комінку тутунь, папробую пацягнуць разоў колькі, можа ад сэрца адляжа. Там і папера недзе павінна быць.

Увайшоў у хату сын яго.

— Здароў, Алесь.

Падкруціў вусы, прыгладзіў перад люстэркам валасы. Падцягнуў вышэй халявы.

— Ну, што чувацъ, Алесь?

— Нічога.

— Што робіш цяпер?

— Авёс скончыў.

— Чорт яго ведае, гэтая гаспадарка душу дастане.

— Чаму?

— Самая паскудная справа. Робіш і нічога няма.

— Нейк іначай трэба рабіць усё.

— Нанава мераць і рэзаць усё? Ведаю, можа яно і зусім добра тады будзе. Адно што няма нешта ў мяне хэньці да ўсяго гэтага. Бывала, як служыў я, дык адбыў сваё, а тады ляжы ды пасьвіствай.

— А я ня ведаю і дагэтуль, дзе ты служыў?

— У Лунінцы на вакзале. У буфэце. Жылося тады. І піў, і еў, і гуляў. А гэта—апошняя справа. Я куды-небудзь усё роўна выеду. Чорт яго будзе тут сядзець. Чаго ты, Алесь, тут гібееш. Колькі ў цябе тае гаспадаркі, што ты яе пільнуеш гэтак. Куды-небудзь рушыў-бы, няпраўда, знайшоў-бы кавалак лягчэйшага хлеба. Што гэта—корпацца век у гэтым гнаі.

— Каму-ж-небудзь ды трэба корпацца.

— А нашто канешне табе? Або мне? Няхай корпаецца той, хто нічога на сьвеце ня ведае. Іншы ні да чаго няздатны, апроч як у зямлі корпацца. Таму якраз і добра. Гэта хто да чаго здатны.

Закурыў і зноў падкруціў вусы. Тамаш абазваўся:

— Гэта гультайства, разбазыранасьць.

— Ты, бацька, хворы, ляжы. Няма за што мяне ўпікаць. Ня трэба калатні ў хаце.

— Не, ня трэба. Я сам не хачу, ніколі не хацеў. Я можа зараз памру, дык цяпер яшчэ больш трэба, каб у хаце ўсё добра было.

— Але, ня трэба, ні пра гэта, ні пра што гаварыць.

Тамаш зморшчыў твар, востра глянуў паверх каўняра з браваркі. Маўчаў доўга і глядзеў у адно месца. Нудна пахла падмеценым у качэргі сьмецьцем. Дзень ясьнеў, на столі жаўцелі водблескі ад сьнегу.

— Нудна,— сказаў Тамаш.

Алесь панура паглядзеў на яго.

— Нудна. Нядобра. Жыць хачу.

— Ачуняеце.

— Мусіць, не.

— Няўжо вам так кепска?

— Наўрад ці ачуняю. Дыхаць цяжка.

Кінуў на зямлю недакурак. Невядомая раней трывога апанавала Алесем:

— Заўсёды гэтак хвораму здаецца. Гэтак заўсёды. Вядома, што ў хворага ня можа быць добрага настрою.

— Ой, чаму не. Бывала, захварэеш часам, ляжыш, і ўсё ў табе кіпіць, варушыцца. Жыве ўсё. А гэта нуда мяне агарнула.

Сын падышоў да ложка:

— Нічога, тата. Вас забрала моцна, дык вам усё так і здаецца. Самі-ж казалі, што лепш трохі ўжо.

— Яно лепш, але ўсё роўна ратунку, мусіць, няма ўжо мне больш.

— От праз дзён тры іначай загаворыце. У вас нават твар пасьвятлеў за гэтыя дні. Я гэта ўчора яшчэ заўважыў.

— Хто яго ведае.

— Пэўна што так. Дзіва, што чалавек занядужае... Пайду сечкі ўрэжу.

Тамаш паглядзеў, як зачыніліся дзьверы, уздыхнуў і сказаў:

— От як пагаворыць пачалавечы, дык аж лягчэй на сэрцы стане. Здаецца, хата іншаю робіцца. А то ўсё нядобра яму, усё бубніць сабе пад нос. Гэта ён, што пры табе, дык загаварыў гэтак... Яно і беднасьць ня так страшна, як гэтая калатня ў хаце. Горш за ўсё, каб яно згарэла, калі пазіраюць у хаце адно на аднаго коса. Няма горш.

— Вядома што.

— А тут, ліха на яго, як ты ня круці, не пазбавіцца ад гэтага. Колькі жыў, дык усё думаў—некалі пачалавечы гаварыць хоць адно з адным у хаце сваёй будзем. Ажно-ж не дачакаўся.

— Вы вельмі ўсё да сэрца прымаеце.

— Чалавечае сэрца ўсё прымае. Жывы чалавек іначай ня можа. А мне цяпер хвораму, можа, трэба было-б, каб яно іначай трохі было.

— Нічога. Усё ўладжваецца.

— Уладжваецца. Гэта я сам бачу. Але мне суджана, мусіць, ніколі дабра ня бачыць. Я і сам ня ведаю—ці павінен я на сваіх дзяцей крыўдаваць, ці не. Ці гэта яны павінны на мяне крыўдаваць. Ён мяне яшчэ даўно быў раз упікнуў, што я яго на сьвет пусьціў. Што ты тут скажаш.

— Чаго ня бывае, жывучы на сьвеце.

— Адно каб ачуняць мне. Дык усё, добра кажаш, нічога. Усё заўсёды перажывалася. І жылося патом. Кепска было і добра было. А ўрэшце ўсё добра. Жывому чалавеку ўсё добра, і можа нават усё патрэбна... Ня можа быць, каб я яшчэ не ачуняў. От так, як падумаеш, дык і так, і так здаецца.

— Ну пэўна, што вы гэта самі на сябе страху нагналі. У вас зусім выгляд не такі страшны, як вам здаецца.

Тамаш захацеў усьміхнуцца:

— Што ты мяне цешыш.

Паглядзеў на Алеся, паволі зажмурыў вочы і пачаў драмаць. Алесь сядзеў нейкі час каля яго, занудзіўшыся нейкаю незразумелаю трывогаю. Тамаш заснуў. Алесь вышаў ціха з хаты. Пашоў у адрынку, паглядзеў, як рэзалі сечку, папробаваў даваць у нажы:

— Нешта цягне дрэнна.

— Старая сячкарня.

Пашоў паволі ў свой бок вуліцаю. Мароз адлягаў. Неба цямнела, хмурылася палавымі засьцілямі. Пад санямі на вуліцы цішэй скрыпеў сьнег. Спаткаўся Сабастыян:

— Ідзі, Алесь, сала купляй.

— Дзе?

— У Юстына.

— Чаму гэта?

— Салам пачаў гандляваць. Думае—забагацее. От-бо народ!

— Можа і забагацее.

— Дзе-б бачыў. Хто тут лішне тое сала ў яго будзе купляць. Што гэта горад. Гаворка. Уздурнеў чалавек. Адразу прашпэціцца.

Сабастыян зарагатаў, пасьля твар яго застыў у гумарыстычнай усьмешцы. І такім пашоў ён у свой двор—здаволены нечым, нечага радасны. Пашоў і—чуваць было на вуліцы—загаварыў з нейкім моцна ў двары. Харкануў і плюнуў.

Алесь пашоў у гумно ператрасаць салому. Пахла жытнімі снапамі. Узяў вілкі, паварушыў салому. Вышаў у вароты, закурыць. Лёгкі повей ветру

зьдзьмухнуў тутунь з паперкі, абвеяў мяккасьцю твар. Ужо сінелі далі над паплавамі, узьнімаўся і плыў адтуль вецер—шырокі, мяккі. З сініх і далёкіх лясоў ішоў вецер.

І вострая радасьць закалацілася ў Алеся. Радасьць ад таго, што недзе ў Чучанох ёсьць—блізкая—Маня.

IX

І колькі зноў гаварылі. Можа і ня рада была Барановічыха лёсу свае дачкі ад гэтых гаворак. А можа яшчэ больш гордай стала за сваю дачку. Ніхто пра гэта ня ведаў, бо Барановічыха цяпер, як ніколі раней, старалася ня ўмешвацца ні ў якія гаворкі. Яна адно слухала, як даходзілі яны да яе, чула, як пілуюць яны яе матчына сэрца. І яна пытала ў меншага сына:

— Ну, дык што-ж Ганна казала?

— Казала, што можа пад весну, калі Андрэй паедзе здаваць свой дыплём і рыхтавацца далей вучыцца, дык Ганна можа да восені прыедзе дадому. А можа і не. Яна і сама добра ня ведае.

— А як-жа хаця жывуць яны?

— Добра.

— Ці хаця-ж глядзіць ён Ганны?

— Здаецца, добра ўсё. Я-ж у іх там два дні быў, нічога дрэннага не заўважаў у іх... Начорта вы, мама, слухаеце гэтых плётак?

— Я ня слухаю, сынок, але мацерынаму сэрцу ўсё здаецца. Мацерына сэрца баліць.

— Баліць дзе трэба, дзе і ня трэба.

— Ты, сынок, калі сам будзеш некалі мець дзеці, толькі тады пазнаеш... І нашто-бо яму яшчэ больш вучыцца. От-бо маладыя гэтыя, ця-

перашнія. Выўчыўся, дык няхай-бы жыў. Дык от-бо не. Яшчэ мала. Яшчэ каб больш. І што яны там научацца ўжо. Што там ужо за навука гэтакая... Няхай-бы ты, сынок, угаварыў там як яго, каб ён ня вучыўся больш. Няўжо ён ня можа пражыць з гэтае свае навукі? Ён-жа служыць, улетку мераючы зямлю, таксама не дарэмна гэта рабіць будзе. Няўжо яму на гэта сышло, што от канешне больш яшчэ вучыцца. Гэта ў яго няйначай у галаве закруціла, або можа зводзіць гэта хто яго. Ганна-ж яму не растлумачыць, яна-ж спакойная гэтакая. Ён можа што калі і скажа на яе, дык яна-ж назад не адкажа.

— Ня думайце, мама, што ў іх так можа быць, як у вас. Адзін на аднаго нічога ня будуць гаварыць. Калі што якое ня так, дык патаварыску пагавораць і дагаворацца, да чаго ім трэба.

— Гэта, сынок, адно здаецца гэтак. А жывучы, дык яно, патом, усяго бывае. Бачыла я і гэтых панаватых, як яны жывуць.

— Чаго вы, мама, гэтак убілі ў галаву сабе нешта, самі сабе страху нагналі і ўсё думаеце ліха ведае пра што.

— Калі-бо языкамі чэшуць вельмі. Як гэта ўсё дазнаюцца! Ты адно ў сваёй-жа хаце сказаў, што на весну можа Ганна прыедзе дадому, калі ён вучыцца, ці давучвацца там, паедзе, а тут ліха ведае, што ўжо гаварыць пачалі. Гавораць і гавораць.

— Што гавораць?

Што гэта Андрэй зусім Ганну кінуць хоча, што гэта адно адгаворка, што давучвацца яму трэба ехаць. Каб, кажуць, трэба было ехаць давучвацца, дык мог-бы і жонку з сабою ўзяць або пакінуць там, на кватэры. Не, мусіць, гэта, кажуць, зусім ён з ёю расквітацца хоча...

— Мала што плятуць. Языкоў не папрывязваеш.

— А як гэта мне слухаць!

— Вам, мама, і слухаць ня трэба.

— А калі ўсё гэта праўда?

— Ня можа гэтага быць. Ганна вясёлая, здаровая. Так-бы яна інакшаю была-б, каб гэта ўсё праўда.

— Каб-жа ўсё добра было.

— Кіньце вы.

Юлік Барановіч пачаў злаваць:

— От гэтак заўсёды—выдумае якую-небудзь злыбеду, а потым аж млее, бабская галава... Дурная. Што гэта за інтэрас яму браць жонку на месяц. Што гэта. Ды яшчэ і бацькоў ашукваць. Ня мог-бы ён дзе ў горадзе сабе знайсьці, калі-б ужо на тое пашло ў яго. А гэта, як мае быць, чалавек сталы... Ты пакінь енчыць. Што ты гэтых бабскіх плётак слухаеш. Начорта гэта мне, каб была ў хаце гэтая работа. Сьціхні ты, ды не ўспамінай больш чорт ведае чаго!

Пасьля гэтага Барановічыха падумала, што і сапраўды нічога ня здарылася гэтакага, што-б магло наводзіць на сумныя думкі аб Ганьне. І адно калі-ні-калі ўздыхала:

— Каб хаця-ж усё добра там у іх было.

І паволі рабіла сваю хатнюю работу, заспакоеная і маўклівая.

Гаворкі-ж тыдняў два ня сьціхалі. Сабастыяніха некалькі разоў гаварыла пад калодзезем:

— У Барановічавае Ганны, мае вы родныя, нелады з гэтым каморнікам. Хлопец іхні езьдзіў туды, дык гаварыў, што нават Ганна гатова неўзабаве да бацькі прыехаць, бо каморнік вучыцца зьбіраецца ехаць надоўга. Заграніцу некуды паедзе. А ў гэтых-жа гарадзкіх гэтак, калі куды выяжджае,

дык жонку пакідае, усё як-бы да часу. От табе яна і пашла замуж. Вельмі зайздросьцілі ўсе, што вучаны, разумны, далікатны... Ай, што там ужо за золата!

Пасьля гаворкі гэтыя пачалі заціхаць, але адзін раз, калі пралі ў Вашыновічавых вечарам, гаворка зацягнулася за поўнач:

— Кажуць, што вельмі кватэра ў Ганны добрая.

— Ну, пэўна, што абы ў якой кватэры каморнік жыць ня будзе.

— Ды чаму ня будзе. Гэта як да чалавека.

— Ну пэўна што, але хлопец іхні, Барановічаў, гаварыў, што вельмі-ж там ужо ўсё ў іх дасканальна.

— А от Юлька Сымонава таксама заходзіла да іх як на суд езьдзіла, дык гаварыла, што нічога там вельмі гэтакага і няма. Голыя, кажа, сьцены. Адно, кажа, канапка стаіць і дыван перад ёю пасланы. Гэта то ўжо вядома, папанску, але-ж, акром гэтага, нічога больш і няма. Столік адзін. Нават ложка, кажа, няма. Ну, падлога новая ў хаце, вокны памаляваны... Чысьценька ўсё... Мусіць, гэта адно гаворка была, што ён шмат зарабляе.

— А што-ж табе здаецца. Гэта-ж усё трэба з капейкі. Ён-жа свайго хлеба не нажаў, не намалаціў. А ў горадзе ўсё купіць трэба. Ну, а як паедзе, як той Барановічаў хлопец казаў, здаваць нейкую дыплёму, дык дзе ён лішне набярэцца, пакуль-жа ў новым месьце, ды яшчэ вялікім, асталявацца...

— Не, мае сястрыцы, не кажэце! Каб хацеў ён з ёю жыць, дык не адпраўляў-бы яе да бацькі. Лепш—горш было-б, але, патом, узяў-бы з сабою, каб на добры лад. Не кажэце, мае родныя.

— А я чула, што гэта прыедзе яна на трохі, пакуль ён там знойдзе кватэру і асталюецца, як

мае быць. Тады забярэ яе. А пакуль яна будзе ў бацькі, дык колькі магчыма, дык памагацьме ёй; прысылаць будзе ёй грошы. Ну, многа ня прышле, а так, колькі будзе выходзіцца ў яго.

— Колькі выходзіцца! Што гэта ты гаворыш? Каб ён добры быў, дык прысылаў-бы ня колькі выходзіцца, а пакінуў-бы сабе колькі выходзіцца. Бо гэтая-ж самая Юлька гаварыла, што Ганна ўжо загрубела.

— Якое дзіва, што загрубела, міленькія мае. Яны яшчэ з летку зналіся.

— Не, ня можа быць. Ганна!

— А што цяперашнія маладыя—ні за грэх гэта ў іх ня лічыцца, ні за сорам.

— А хто яго ведае.

— Што?

— От усё.

— Ну, пэўна што.

— Казала Юлька, што і твар нават Ганны паблажэў.

— Не, патом ён яе не павінен пакінуць. Гэта-ж адно падумаць... Дый гэтакая-ж дзяўчына.

— Гэта нам так здаецца. А яму можа зусім іначай здаецца. Усякі пасвойму. Папраўдзе.

— Не, мае родныя, гэтакае дзяўчыны адно пашукаць.

Сам Вашыновіч зьлез з печы, пашоў у мыцельнік, выпіў кварту вады, пасьля вышаў на двор і, вярнуўшыся, пачаў гаварыць:

— Каморнік? Тымчасове, бог яго сьвяты ведае. Мы нічога ня можам гаварыць, бо мы, сказаць, нічога ня можам і ведаць. Як яны там жывуць, што ў іх там, тымчасове, робіцца—гэта ім вядома лепш, як нам. Так што мы тут лішне гаварыць— хто яго добра, кажа, ведае, можа і ня можам.

Няхай сабе, тымчасове, жывуць, як ім найлепей. Я адно, што магу тут у гэтым, можна сказаць, дзеле, сказаць? Тое, што, хто яго ведае, што яно можа тут быць. Часам можа быць, што, ці то суджана гэта, ці што, але чалавеку саўсім іншае пачне здавацца, як раней здавалася. Раней здаецца добра, а пасьля іначай. Гэта, тымчасове, можа быць. Гэты каморнік яе можа і ня кіне, хто вам казаў гэта, што канешне ён яе кіне! Але жывучы— яно ўсё можа быць. А ўрэшце, тымчасове, чорт яго тут ведае. Юлік вельмі-ж хваліўся. Ні то, што хваліўся, але вельмі-ж нос угору задзіраў. Няхай сабе, як хоча, мы да гэтага нічога мець не павінны. Начорта гэта каму ўмешвацца ў гэты, тымчасове, інтэрас! Не маё гэта, можна сказаць, дзела, і не хачу тут я гэтых плётак. Бо гэта чалавеку жаднае карысьці не дае і даць ня можа. Да чаго гэтая ўся гаворка!

Жонка не сьцярпела:

— Людзі-ж, мусіць, ведаюць, калі гавораць. Людзі-ж хочуць усё, каб як найлепей.

— Ат, гэтыя твае людзі. Нічога, тымчасове, гэтыя людзі ня варты. Я раз назаўсёды скажу. Начорта мне ўся гэтая работа. Начорта яна, тымчасове, мне. Я жыў і жыць буду бяз ніякае гэтае, тымчасове, гэтае. Я такі чалавек. Гэтыя бабскія гаворкі заўсёды праз бок, добра кажа, вомегам вылазяць, от што.

Пачухаў жывот і зноў палез на печ.

X

Тамаш апрануў наапашкі браварку і запытаў:

— Што на дварэ сёньня?

У хаце адказалі:

— Галялёд.

Тамаш апрануў браварку на рукавы і вышаў з хаты. Адчыніў з сянец дзьверы на двор. Чыста былі замецены сенцы, высыпаны чвырам. Чвыр ляжаў зьмерзлымі камякамі пад лаваю ў запасе. Тамаш вышаў на двор. З поля ішоў вецер. Варо-ніным крыкам сумаваў хмурны дзень. Тамаш глянуў у адрынку:

— Сечка рассыпана, ня могуць яны падмесьці. Глуміцца пад нагамі, а ім і ня ў голаў.

Узяў мятлу і падмёў сечку да сяцяны. Сын унёс вязку саломы:

— От усьцягнуўся, бацька, дык у хаце сядзеў-бы, ато яшчэ зноў горш будзе. Без цябе тут пад-мялі-б, чаго ты лезеш туды, куды цябе ня просяць.

Тамаш выцер рукавом губы:

— Як я табе вялічан зрабіўся.

— Ня ўмешвайся ты, бацька, не ў свае справы. Ня можаш памагчы, дык лепш памаўчы.

— Я ўжо адрабіў сваё.

— Ну, дык і не пазірай тут коса.

— Хто гэта пазірае?

— А што ты тут бубніў, што нядбалыя, ды ня-ўдалыя, каліва там саломы ці сечкі пад нагамі ўгледзеў, дык нядобра. А-яй, заўбожаеш! Маёнтак прападзе! Ідзі, бацька, у хату.

Тамаш пашоў з адрынкі. Увайшоў у сенцы, па-стаяў. У галаве ў яго кружылася ад хваробы. Ногі ў каленях дрыжэлі. Уздыхнуў і падаўся ў хату. Прылёг так у браварцы на ложак, паляжаў хвіліны тры. Не ляжалася яму. Хацелася ўзяцца за якую-небудзь работу і разам з тым слабасьць апаноў-вала яшчэ. Устаў, прайшоўся па хаце. Здалося, што ўсё ўжо мог-бы рабіць. Убачыў, што ў вядрэ няма вады. Узяў вядро і пашоў па ваду. Кружы-

лася ў галаве, але радасна было яму ісьці так паволі з вядром па абгалялёдзелай вуліцы. Перайшоў яе ўпоперак—да калодзезя. Стаў чэрпаць ваду, паволі апускаў жэрдку ў калодзезь. І адчулася яму пасьля трох тыдняў хваробы ў душнай хаце, як моцна пахне з калодзезя гнілым дубам, вадою. Поле і паплавы нагадаў яму гэты пах. Сэрца застукала ў грудзях мацней, радасьць жыцьця ўскалыхнула яго. Перамагаючы слабасьць, выцягнуў ваду, наліў вядро і панёс. Паволі сыходзіў з ледзяной абмерзласьці навокал калодзезя. Раптам нага пакаўзнулася, на другой назе адзержацца ня мог— і паехаў уніз, упусьціўшы вядро з рук. Увесь абліўся і зьехаў уніз плячыма. Крэкчучы, падняўся, у вачох раптам стала цёмна, калючыя вострыя іскры забегалі ў іх. Нейк абмацаў каля сябе вядро, напружваючы ўсе сілы, каб зноў не паваліцца, пашоў з пустым вядром дадому. Ледзьве дайшоў да хаты. Вядра ня мог больш нясьці, паставіў у варотах, прыпёрся да хатняе сьцяны. Уздыхнуў разы тры і ўпоўз нейк у сенцы. Доўга мацаў клямкі, каб адчыніць дзьверы ў хату. У хаце адразу паваліўся на ложак. І ўсё рупіла яму, што вядро засталося на вуліцы ў варотах. Пачаў зваць сына:

— Лявон, Лявон.

Цяжка было яму крычаць. Ніхто ня прыходзіў. Зусім стала цяжка крычаць. Маўчаў, і здавалася яму, што гэта ня ён, а Лявон паставіў вядро ў варотах, наўмысьля, каб хто забраў і каб пасьля ўсё ўскласьці на яго—на бацьку. Чуў голас, востры і грымучы:

— Дзе вядро дзелася?

Паварушыўся, каб адказаць і скоранька прагаварыў:

— У варотах на вуліцы. Ты-ж сам паставіў.

Чуваць было пасьля, як на дварэ Лявон гаварыў сястры:

— Бацьку горш стала. З гарачкі гаворыць. Вядро вынес на вуліцу і паставіў нямаведама нашто ў варотах.

І голас гэты ўваходзіў у сьвядомасьць, як нешта незразумелае, цяжкае, калючае. Так і ляжаў да самага вечару ў браварцы. Здавалася яму, што гэта на полі гэтак ціха. Ветру няма, але ідзе аднекуль плынь паветра, з ялоўцавых кустоў і з крушынавых надрэчных зарасьнікаў. І дымам аднекуль цягне. Можа гэта дзе за ўзгоркамі пастушкі наклалі агню і дурэюць каля яго. Раптам узьнімацца пачаў вецер і пагнаў дым за кусты. Узварушыў чыстую застаялую ваду ў каляінах, дажджавую ваду. Разышліся некуды і пастушкі. Адно папялішча засталося разьвявацца ветрам. А ён сам з Алесем сядзяць на мяжы і гавораць пра гэты вецер, які можа павыдзьмухаць жыта, што кагадзе пасеяна на сыпучай ральлі. Але Алесь весела ўпэўнівае, што нічога, зерне добра забаранавана і застаецца ў зямлі ўсходзіць і расьці. Яшчэ каморнік паволі прайшоў па полі. Пасьля Мацьвеіха з Юркам. Падышла да іх і гаворыць:

— Пільнуй, Тамашка, майго хлопца.

І ён адказвае:

— Буду пільнаваць.

— Упільнуй-жа хаця яго.

— Упільную.

Раптам усё гіне, прападае. Хочацца крыкнуць, каб яшчэ сказала Мацьвеіха, што ёй патрэбна больш. Нехта за плячо штурхае. І голас як-бы Лявонаў. Пасьля ўсё сьціхла і заспакоілася.

Калі паволі расплюшчыў вочы, вечар быў у хаце і слабасьць ва ўсім целе. Салодка было ляжаць,

не варушачыся, і страшна было паварушыцца. Лявон стаяў над тварам:

— Дай я з цябе, бацька, скіну браварку. Крычыш нешта з гарачкі. Можа заўтра доктара пазваць?

— Пазаві.

Даў Лявону скінуць браварку і боты. У палатнянай бялізьне здаваўся вялікі, магутны. Адно нерасчэсаная, памятая барада псавала панурую прыгожасьць твару. Дачка накрыла яго кудзельнаю коўдраю.

— Можа даць, тата, чаго зьесьці?

Цяжка было адказаць. Сагрэўся і ціха задрамаў.

XI

Вечарам ў Мацьвея сядзеў за сталом Сабастыян і выціраў рукі. Мацьвей пёк на прыпеку скваркі і гаварыў Сабастыяну:

— Няхай-бы ты мыла ўзяў, а то сала так не адмываецца.

— Нічога, я мыў гарачаю вадою... Дзе гэта Мікалай?

— Малоціць у Аляксандра.

— Да самага цямна?

— Ну, можа адхіліўся куды. Што яму, адзін душою.

Зьняў з трыножкі скавараду:

— Юрка, падсьцялі пад скавараду на стол якую-небудзь паперку.

Паставіў скавараду на стол і дастаў з-пад падушкі на ложку бутэльку гарэлкі. Сабастыян заўважыў:

— Нашто ты браў аж бутэльку. Хапіла-б і поўбутэлькі.

— Ат, нічога. Добра.
— Зараз-жа мая павінна падыйсьці, з салам тут і з каўбасамі ўправіцца.
— Якая тут упраўка.
— Чаго, пудоў каля сямі парсюк быў.
— Можа і быў, на хібу сала ніштто.
— Хіба каб Мікалай падышоў на сьвяжыну, а то ўдвух піць... Каб яшчэ хто быў, было-б ямчэй.
— Падыдзе зараз.
Мацьвей адаткнуў бутэльку. Сабастыян яшчэ сказаў:
— А можа пачакаем Мікалая?
— Скваркі астынуць.
Раптам увайшоў Мікалай.
— Гэта гэтак позна малоціш?
— Не, у Алеся сядзеў.
— Садзіся з намі.
— Там Алесь на вуліцы.
— Заві сюды.
Мацьвей вышаў і паклікаў Алеся. Юрка падцягнуў пад стол доўгі столак. Селі ўсе. Чарка абышла ўсіх іх чатырох. Сабастыян гаварыў:
— Здаецца, ня вельмі і парасюк быў, а за дзень ледзьве ўправіліся.
Мікалай запытаў:
— А як дайшоў, скора?
— Адразу. Што там было калоць, я яго, як муху, задушыў.
Выпілі яшчэ па чарцы.
— Што тут, я-ж кажу, было калоць.
— Чаму, усё-ж такі пудоў шэсьць быў.
— Пудоў сем быў.
— Ну от бачыш.
— Эт, што там. Бывала, я ў пісара калоў, дык па пудоў семнаццаць япрукі былі. Як зьвер, ліха

яму. У чатырох бралі, пакуль яго, бывала, абложым. Я ўжо і калю спэцыяльна, а потым, ліха на яго, цяжка, пакуль яго ўкладзеш. Самае цяжкае—гэта аблажыць яго. Бывала, як пена ў яго з роту падаць пачне. Што-ж гэтакі зьяд зьвярына. Ня дай бог.

— Трэба адразу кідацца на яго.

— Ну, пэўна, што адразу, каб ня даць яму раз гэтае... расчомацца. Тады яго цяжэй браць. Раз, памятаю, калолі—я, Гальляш нябожчык і Мірон Грысюкевіч. Ды нейк не ўзялі яго адразу, дык ён на мяне вобцас калі кінецца, пераскочыў цераз мяне, ды на двор. Тады загналі мы яго ў куток, ды паленам па ілбе аглушылі. Тады адно адразу шылам—чок... І скончана музыка...

Мікалай заўважыў:

— Ну, гэтага няма чаго раўняць да якога-небудзь сяміпудовага.

Памаўчалі. Сабастыян павесялеў. Увайшла Сабастыяніха. Мацьвей падаўся ёй насустрач:

— Разьдзявайцеся, братавая, ды садзецеся з намі.

Сабастыяніха падсела да стала.

— Я вам, братавая, скажу, тут перад усімі... Горна мне...

Выпілі яшчэ па чарцы.

— Горна. От гэтага самага парасюка яшчэ нябожчыца карміла... Што я параджу... Нічога ня зробіш.

Сабастыяніха ўздыхнула:

— Добра кажаце, братка, нічога не прарадзіш.

Сабастыян падаў голас:

— Як той казаў, гэтак яно ідзецца чалавеку. Як-небудзь трэба жыць... Год за годам, дзеці падрастуць...

Сабастыяніха сказала:

— Дзеці... Што дзеці. Дзецям, так небаракам, хоць прападай. Вам, братка, хіба ўдаву якую пашукаць ці што...

Сабастыян таксама памог:

— Хіба, браце... што ты думаеш. Так-жа як гэта жыць... Адно падумаць, дзеці, як боб, дробныя.

Сабастыяніха пашла ў мыцельнік парадкаваць мяса. Запахла ў хаце перцам і гарчыцаю. Сабастыян вылез з-за стала:

— Пайсьці каню закінуць.

Мацьвей пачухаў шыю:

— Хто яго тутака ведае.

Правёў Сабастыяна на вуліцу. Унёс у хату бярэмя лому. Седзячы на лаве, поплеч з Алесем, Мікалай выкалупліваў саломінаю з зубоў. Мацьвей падышоў да Алеся:

— Кажуць, жаніцца будзеш?

Адказаў Мікалай:

— А далуль-жа яму хадзіць так. Што, не пара?

— Дзіва што пара.

— Ці няма як у хаце? Здаецца-ж, гаспадар сам!

— Дзіва што.

Алесь устаў, падышоў да печы, узяў з комінка запалкі, закурыў. Зноў сеў поплеч з Мікалаем. Мацьвей загаварыў:

— Сам ня ведаю...

Сабастыяніха перабіла:

— Нічога іначай ня будзе.

Алесь умяшаўся ў гаворку:

— Няхай чалавек робіць, як самому лепш здаецца.

— Але-ж парадзіць трэба.

Тады Мікалай адказаў:

— Парадзіць умеру... Тут самае важнае што? Гаспадаркі глядзець, каб у хаце парадкам усё

рабілася. Дзяцей трэба даглядаць. Гэта самае патрабнейшае. Бо што-ж тут іначай.

Алесь адказаў:

— Вядома, што гэта самае важнае. Тут справа сямейнага ўсталяваньня.

Мікалай падумаў і сказаў, перамагаючы стомленасьць ад малацьбы і хмель ад выпітае гарэлкі.

— Калі ў чалавека сям'я, дык тады трымайся. Аднаму, вядома што, вальней. Адна галава небядна.

— Дык, патвойму, лепш сям'і ня мець?

— Ні то што...

Алесь раптам адчуў прыліў хмельнае ўзбуджанасьці:

— Да ты заўсёды гаворыш гэтак. А што ты такое на зямлі, сярод людзей. Жывеш от, малоціш у Аляксандра. А што ты зробіш для жыцьця? Ты для сябе жывеш, адзін.

— Але я вольны. Куды захачу, туды і пайду.

— Аднак-жа нікуды ня ідзеш, а дзень пры дні да самага цямна малоціш у Аляксандра. А Аляксандар патом больш вольным сябе пачувае за цябе.

— Як?

— Так, што ён урос у жыцьцё ўсімі каранямі. Што яму, ён, жывучы, гаспадаром пачуваецца.

— І па горла задаўлены ўсім.

— Ну добра, а калі ты пойдзеш калі-небудзь, як сам кажаш, брадзяжыць. Ну, паходзіш ты па сьвеце, а тады што? Што ты зробіш такога?

— А іншы хто, распладзіўшы сям'ю, што зробіць? Ну от Мацьвею цяпер прышлося, хоць што хочаш.

— Што хочаш? Мацьвей праз год які вызваліцца ад усяго, і ад патрэбы супроць свае волі жаніцца, і ад таго, што дзеці недагледжаны, і ад чаго ты сам хочаш.

— Памрэ хіба?

— У комуну пойдзе. Будзе рабіць і жыць. І галава ня будзе балець пра ўсялякія непатрэбныя чалавеку дробязі.

— Ну, а ты-ж чаму ня ідзеш сам?

— Дык от мы з ім разам і пойдзем.

— А я пайду сабе на новае месца куды. Дарма, што ты гаворыш, што нявольны я.

— Я не кажу, што ты нявольны.

— Кагадзе гаварыў.

— Гаварыў, што ня можаш ты сабе ніяк узяць у галаву, як гэта вольнаму адчуваць сябе, не брадзяжыўшы і ня жывучы аднаму, як вецер.

— Можа і не магу, хто яго ведае... Пад вясну пайду куды ў сьвет.

— Усяго табе добрага.

— Гэтак сама і табе. Я волю бачу ў сабе.

— А я ў сабе. Ня мінеш ты мае волі.

— А можа і міну. Цяжка нам уведаць адзін аднаго.

XII

Гэта было падобна да трывогі. І абышло гэта ўсіх у позьнюю раніцу. Больш холадна аднёсься да гэтага белабароды Павал. Ён ішоў па вуліцы з рэзьгінамі за плячыма. Юлік Барановіч паіў каля калодзезя коні. Убачыў Паўла, аддаў яму дзяндобры і, выдзьмухваючы з вусоў жытні пыл, гукнуў:

— Чуў?!

— Што?

— Тамаш памёр.

— Калі?

— Кагадзе што сканаў.

— Ну... вечны спакой... Ага... Такі сканаў. Хварэў здорава.

Вашыновіч дзеля гэтага выпадку прышоў па паўдні да Барановіча:

— Вечны спакой. От жыў чалавек, жыў, рабіў, дый сканаў. Нічога чалавек не парадзіш, як-бы, тымчасове, ня жыў, а ўміраць трэба. Хоць разарвіся, а нічога ня зробіш. Так усяму жывому на раду напісана.

І Вашыновіч уздыхнуў. Барановіч сказаў:

— От гаварылі на яго ўсяк, а ён, патом, каб яму лёгкае паляжаньне на тым сьвеце, добры быў чалавек. Разумны і сумленны. Вядома, жывучы, усім не ўнаровіш, але крыўды, дык, сказаць, нікому ён і не зрабіў. Жыў, можна сказаць, пачалавечаму. Я і сам, бывала, часам з ім сашчаплюся паспрачацца, а патом кепскім словам няма за што яго ўспамінаць.

Убачыў у жонкі на вачох сьлёзы і пачаў моўчкі закурваць. Жонка заплакала мацней:

— Бывала, мой божа, і маладым быў... я была на шмат малодшаю за яго, а ён старэйшы, а патом і гулялі разам. Як жывога бачу. А гэта ўсё прашло, усё мінулася. Як нічога і ня было. Як-бы і непатрэбна нічога. Нічога не засталося...

Барановіч уздыхнуў:

— Ат... От яно жывецца...

Вашыновіч сказаў:

— Тымчасове, яму, сказаць, і ня лішне дрэнна жылося пад старасьць. Дзеці вырасьлі, а ён цяжкае работы і не рабіў. Старасьць, сказаць, ня лішне і кепская была.

— Ну, няўжо-ж, каб ён да самае труны рабіў гэтак, як ззамаладу. Якое яму там дабро было. Што там за дабро ўжо.

— Чаму?

— Ня лішне яго, небараку, дзеці і глядзелі. Я-ж ведаю. Раўлі, як на што ліхое, не паважалі яго ўсё-ж, як бацьку.

— Тымчасове, гэта было.

— Ну, то якая-ж там старасьць добрая! На ліхога казана гэтакае дабро. Ён адно што ня скардзіўся ніколі нікому. Бывала, усё маўчыць пра гэта, або калі і ўспамяне, дык доўга гаварыць пра гэта ня будзе.

— Ён ня лішне любіў надакучаць каму.

Барановіч падумаў і здагадаўся:

— Разумны быў чалавек.

— Тымчасове, хто што пра гэта тут будзе спрачацца.

— Дарма, што і я часамі, што, бывала, вазьму дый скажу на яго.

— Кажуць, што Алесь з Клемусем прышлі, як ужо абмылі яго, і заявілі, каб ні папа, ні нават сьвечак ня было.

— А пэўна, што яны гэта зробяць.

— Дзіва што... Я, тымчасове, ня ўручаю, але гаворкі пайшлі, што Алесь распарадзіўся, каб і звону царкоўнага ня было. Я такі, тымчасове, зранку і думаў—прыдуць да мяне, каб пазваніць ці не.

— Ну, а як?

— Ня прышлі.

— Трохі нейк нядобра, гэта-ж чалавек.

— Нядобра. Што ты з імі зробіш.

Аднак далей пакінулі бедаваць пра гэты інтэрас і пайшлі глядзець котнае авечкі. Пасьля Вашыновіч спаткаўся на вуліцы з Мікалаем і запытаў яго зьнячэўку:

— Ня ведаеш, хто труну будзе Тамашу рабіць?

— Адкуль мне ведаць.
— Курыць маеш?
— Іду да Алеся закурваць.
Вашыновіч увайшоў за ім усьлед у хату. Сталі закурваць.
— Тымчасове, от жыў-жыў Тамаш і памёр, вечны спакой.
Алесева маці загаласіла:
— Гэтак сама і мой нябожчык. Яшчэ і здаровы, здаецца, быў і раптам яго хвароба нейкая зламала. Жыў і дабра не прычакаў. Усё спадзяваўся, небарака да самае сьмерці. А гэта Тамаш—працаваў, рабіў, стараўся, а калі ён тое дабро бачыў! Божа-ж мой, божа!..
Яна моцна заплакала.
— Каб мне яшчэ, здаецца, хоць колькі гадкоў на сьвеце пажыць. Жаніся ты, Алеська, аблягчы ты маю старасьць.
— Тымчасове, ну але, пара табе, сынку, жаніцца. Каб бог даў усякаму гэтакага зяця. Я табе адкрыта, перад усімі, тымчасове, скажу.
— Ну але, сыночак, от і людзі кажуць.
— Ціха вы, мама.
Старая села на лаву і, усхліпваючы, выцірала фартухом сьлёзы.
— Тымчасове, цяпер, хто яго ведае, усё нейк як-бы і добра. Спакойна стала, усталёўваецца як мае быць. Што так халасьцяку, можна сказаць, жыць. А жанатаму, нябось, тымчасове, ня тое. Зусім у хаце іначай. Я, тымчасове, сам быў маладым, сам ведаю. Сам гаспадар... Дастань яшчэ тутуню. Папера ў мяне ёсьць у кішэні, газэта... дзякуй.
— Дык от-жа тонкая.
— Ну, тонкая-тонкая... Робіш цяпер дзе, Мікалай?

— Гэтыя дні нідзе.
— Ну як, тымчасове, жывецца?
— Жыву.
— Ды чаму, добра кажа, не. Жывучы і робячы, дык яно, тымчасове, жывецца. Тут-жа ні то што гэта, як той казаў, гэтае. От што.
Мікалай усьміхнуўся:
— Ну пэўна.
— Ды яно-ж, тымчасове, гэтак.
І пашоў з хаты, гледзячы, як старая ўсё яшчэ ціха плакала, і нясучы ў сабе нейкае радаснае адчуваньне сіняга зімовага дню.

XIII

Сіняя ноч стаяла каля дзеравяных сьцен. І спакой яе быў чулым і глыбокім. Пахла ноч сном голых дрэў і сінімі адценьнямі хмурнага неба. Вільготны сьнег паволі падаў на белую зямлю. За сьцяною, у суседнім садзе, зімавала абклёванае дробнымі птушкамі сухое зельле. Сьвятло вузкаю істужкаю падала на яго праз ваконца, што высечана было ў адным бервяне ў сьцяне. Лямпа ў адрынцы вісела на тоўстым дроце і прытульна сьвяціла на стружкі, дошкі і чорны ў куткох ток. Пахла смалою і габляванымі дошкамі.

У вясёлым сьвятле лямпы гаспадарліва сьвяціліся Сабастыянавы вочы. Мікалай габляваў смольны кант у тоўстай дошцы. Плечы яго варушыліся пад рудою жакеткаю, голас быў сталы і словы павольныя:

— От-бо хвоя моцная была, гэта-ж гэтакія дошкі. Тут ні то што з паўтарачак, каб з цалёвых труну зьбіў, дык трымала-б ні то што тры, а чатыры аршыны зямлі.

Сабастыян стараўся надаць свайму голасу як мага больш адценьняў жартаўлівасьці:

— Добра кажа, і з цалёвых каб зьбіў труну, дык на Тамашоў век хваціла-б.

Але твар яго быў халодны. Цяплыня і агонь гарэлі ў ім у глыбіні. Алесь, мераючы дошкі, заўважыў:

— Вы часта берацеся за гебаль?

Сабастыян перш памаўчаў, пасьля адказаў:

— Раз у год, часьцей не бяруся. А то і яшчэ радзей. Я некалі ззамаладу, як у нябожчыка бацькі навучыўся сталярству, дык ад таго ніколі і не бяруся. А гаспадару ўсё трэба ведаць. Што ўмецьмеш, дык за плячыма не насіцьмеш. Я і цясьлярствам магу займацца.

Стоячы каля зачыненых дзьвярэй, Мікалай закурваў. Алесь усё вымяраў дошкі. Доўга яшчэ будзе цягнуцца ноч, пакуль не засінее дзень і пакуль будзе гатовы Тамашу апошні дар жывое зямлі і блізкіх людзей—пахучая смалою труна.

— Сьнег ідзе,—сказаў Мікалай.

— Але, адлежны сьнег.

— Добра будзе гэткім надвор'ем дол капаць. Як гэта пазалетась была пісарыха памёрла, дык я капаў. От-бо было надвор'е—мароз, скавыш. Каб не ўзялі бутэльку гарэлкі, дык прапалі-б. Мы гэта з Аляксандрам капалі. Колькі я за свой век людзям магіл папакапаў.

— Некалі і табе выкапаюць, чаго ты гэтак баішся. Аддзякуюць.

— Ды выкапаюць. На зямлі-ж валяцца ня буду. Цяпер, кажуць, у гарадох дык не хаваюць.

— А як?

— Паляць.

— Паляць?

— Гэтакія, кажуць, ёсьць ні то печы, ні то так нешта прыстроенае гэтакае. І знаку няма. Адно жменя попелу застаецца. Я згадзіўся-б, каб мяне спалілі, а не закопвалі ў зямлю.

— Тады ўжо ўсё роўна.

— Чорт яго ведае, як гэта... з чалавекам... Тры аршыны зямлі наваліць. От чалавечы лёс. Жыве, жыве!

Дым з Мікалаевае папяросы востра запах па ўсёй адрынцы. Сабастыян дастаў з кішэні капшук.

— Закуры, Алесь.

— Давайце.

— Гэта ў цябе, Алесь, бацькаўскі варштат застаўся?

— Бацькаўскі

— Твой бацька таксама быў добры рамесьнік. Працавіты быў чалавек. Як гэта вы з Тамашом кампанавалі гэтак; адзін стары, другі малады.

— Кампанавалі.

— Ці гэта праўда, што Тамаш усё скардзіўся на старасьць?

— Як?

— Зайздросьціў табе, што ты малады. Жыць, кажа, хачу, а тут старасьць. От-бо быў чалавек.

— Праўда. Праўда, дзядзька Сабастыян. Скардзіўся, жыць хацеў. Яму трэба было яшчэ пажыць.

— Дзіва што трэба. Усякаму чалавеку трэба пажыць.

Мікалай узяў у рукі пілу, прысеў на заперыну і сказаў:

— Усякаму? Не, ня ўсякаму. Ёсьць гэтакія, што адно паскудзяць, жывучы. Паскудзіць сьвет, псуе кроў людзям. Дык гэтага ня шкода. Гэтакага, каб прышлося, і забіць ня грэх.

— Ня грэх?

— Не.

Сабастыян падумаў і сказаў:

— Можа яно і гэтак. На сьвеце гэта, як чалавеку здаецца—што грэх, а што ня грэх. Хто гэтыя грахі ўстанавіў?

Моўчкі пачаў габляваць. І Мікалай з Алесем паселі на дошку і пачалі гладзіць яе бараном. Сабастыян гаварыў:

— От сястра мая—Наталя, або хоць другая Наталя—братавая, Мацьвеіха. Адна з сухот памерла, а другая таксама не дажыла свае пары. А чаму не дажыла пары? Чаму памерла? Хто ведае. Сухоты, усялякія хваробы. А ад чаго гэта? Жылося, скажам, дрэнна. А ад чаго жылося дрэнна? Нехта-ж патом вінават, што некаму жывецца дрэнна. Як гэта, каб ня было каго ці можа там чаго, вінаваціць, што нехта ўмірае, а ня жыве. От табе тут і праўда. Шукай тут праўды. Памойму, гэтак. Ты, Мікалай, от быў на вайне аж некалькі год. Забіваў ты там ці не?

— Забіваў.

— Але гэтак, каб сам ведаў, што от забіў чалавека?

— Гэтак.

— Ну і што ты думаў тады?

— Нічога ня думаў.

— Бо можа затым, што гналі цябе, каб забіваў. А каб так, сам, ведаеш, каб сам?

— І сам забіваў.

— Калі?

— Было.

— Ну і што.

— Адно баяўся пасьля, каб не папасьціся. Бо ўсё роўна-ж каралі-б, а тымчасам вельмі горна было-б,

бо сумленьне ў самога перад сабою было чыстае. От як тут гавару перад вамі. Ведаў, што праўда ва мне была. Чуў гэта і цяпер чую. Ведаю.

— І нічога?

— Нічога. Не папаўся і спакойны быў.

— І нічога цяпер ня думаецца?

— Ніколі. Думаю адно, што ўдалося і добра.

— А калі гэта было?

— Даўно. Яшчэ зусім маладым хлопцам быў. Перад прызвамі яшчэ. Яшчэ як у бацькі жыў. А жыць там лішне ня было на чым, дык за парабка застаўся ў двор. А вядома, што гэта ў двары парабак. Я рабіў усё, як мае быць, тое, што ад мяне трэба было, дык я стараўся, каб абы як ня было. Бо, сказаць, любіў я страшэнна работу на полі, а здаровы быў, малады. А там быў аканом, які ўсё хацеў выслужыцца. Ды ўсё даносы рабіў. Ні ліха, ні бяды, нічога там у нас, у парабкоў, і ня было, а ён усё нагаворваў. Дык як прыдзецца расплата, дык нам і не дададуць колькі рублёў кожнаму—у таго, кажуць, паўморга дрэнна заарана, у гэтага коні не дагледжаны і схуднелі, у трэцяга прагул вялікі. Ведаем мы, што нічога гэтага няма, што ўсё гэта работа аконама, але-ж нічога ня зробіш, не дадаюць пэнсіі. Мы і туды, і сюды— нічога не памагае. А ён, бачым, праз нейкі час пачаў выслужвацца—падвысілі яму пэнсію, далі памочніка. Ах, каб ты згарэў, гэта нехта робіць, а нехта на яго рабоце выслужваецца!? Тут мы і згаварыліся. Прыкончыць гадзіну. Хлопнуць, каб і духу не ўказаў. Так мы ўдвух і ўзяліся за гэта. Толькі ўдвух і ведалі, самі, нікому нічога не гаварылі. Нас дзесяць чалавек жыло ў фальварку, дзе ён жыў, а кожную суботу ён за дзьве вярсты

езьдзіў конна да пана ў двор на дыспузыцу. От пасьля работы мы і заселі ў кустох. Узялі гіру і чакаем. Пашоў якраз дожджык, пад восень справа была. Зусім прыцемак быў, як ён ёхаў сабе паволі. Тут мы яго ў кустох на дарозе і прыкончылі. Гіраю ззаду ў патыліцу дзеўбануў і ўсё. Прывязалі каня за куст так, каб адвязацца мог, а самі нішачкам дадому. Як нічога і ня было. Павячэралі і ў карты селі гуляць, як заўсёды ў суботу, каб падазронасьці ніякае ня было. Конь праз гадзіну якую адвязаўся і прышоў на атаву за садам. Тут яго ўбачылі, паднялі гвалт, усшушукаліся і найшлі таго ў кустох. Пападрыжалі мы гадоў два, усё скарбло на сэрцы, каб як ня выявілася. А пасьля ўсё прайшло. Ніхто нічога не дазнаўся. А то яшчэ як у салдатах служыў я. Плюгавенькі быў у нас гэтакі падпрапаршчычак, смарканенькі, сьмярдзючым здаваўся нам усім. Гэта ўжо ў першую рэволюцыю. Раней, дык ён пагонамі ўсё сваімі казыраў, а гэта, чуючы, што пагонаў не далюбліваюць, бяз іх пробаваў франціць. Тады сама што армія пачынала разьбягацца. А палкоўнік у нас быў, хоць і палкоўнік, але свой хлопец. Сам нават рэволюцыйную работу вёў раней. А тады, як гэта ўсё было, дык нагаворваў нас усё супроць Керанскага. Рэволюцыянэр быў. А гэты падпрапаршчык усё яшчэ, трасца яму, выслужваўся. Ці можа гэта якая-небудзь іншая думка была тут у яго, халера яго ведае. Нас, некалькі чалавек увесь час яго не далюблівалі, не паважалі, бо вельмі-ж дурны быў. Дык ён на нас усё нагаворваў палкоўніку, што мы супроць рэволюцыі, што мы з дому нейкія хутаранцы, як цяпер кажуць— кулакі, дык нам выгадна гэтае царскае там ці якое. Зьесьці хацеў нас, халера. Усякімі спаса-

бамі паклёпы ўзводзіў, зьняпраўджваў словы, хто што скажа. Гэтакая зараза была паршывая, гнілая. Тут, у чым крыўда была. У тым, што зьняпраўджана ўсё. Калі мы—я от дык парабак, з ног да галавы за рэволюцыю. А ён гэтак нагаварыць здолеў, што яму і паверылі. Каб гэта праз гадоў два ці праз год пазьней, дык забралі-б, як міленькага. А тады—дык палкоўнік наш і глядзеў на нас коса. Пакуль пасьля сам ня ўбачыў, што ўсё гэта паклёп. А той усё выслугоўваўся ці халера яго ведае што. Яму і ня дарага была рэволюцыя, аб справе ён і ня думаў, але от брахаў. Дык мы таксама яго цокнулі. Ня ўсьпеў змыцца. І скончана дзела.

— І спакоен?

— Спакоен.

Зноў Мікалай адышоўся да дзьвярэй, з стружак на голы пол, і стаў закурваць. Уверсе, над дзьвярыма, праз шчыліну ўпала мяккая сьняжынка, раставала на гарачай Мікалаевай руцэ.

І от яны ўсе ўтрох сышлі са стружак на голы ток да дзьвярэй закурваць. Сабастыян адчыніў дзьверы, глянуў на ноч. Цемень была замест неба. Пасьля лямпы яшчэ цямнейшым здавалася ўсё. Толькі ў асьветленай лапіне прыметна было: сьнег падаў радзей, зьлепленымі камякамі ападаў з голых груш напроці варот, каля плоту.

— Гэта яшчэ, мусіць, твой дзед, Алесь, садзіў гэтыя грушы?

— Але, бацька расказваў.

— Я іх як і запамятаю, дык усё гэтакія-ж стаяць.

— Але.

— Сьнег Тамашу дарогу выбеліў.

Памаўчалі. Сабастыян зноў сказаў:

— А от патом, добра кажа, тое самае—ці хавай ты яго, ці спалі. Усё роўна ня ўстане.

— Ня ўстане.

— Чаго, Алесь, зажурыўся?

— Ат, так сабе.

— Тамаша шкадуеш?

— Шкода.

— Ён вельмі з табою кампанаваў. Усе аж дзівіліся. Як малады ўсё роўна быў.

Алесь маўчаў.

— Нейкі дзіўны быў чалавек.

Сабастыян прайшоў па дварэ, глянуў на вуліцу:

— На вуліцы відней здаецца... Сабакі недзе далёка брэшуць... Невядома, калі хаваць будуць... Хто гэта?

Цёмная постаць прыпынілася каля Сабастыяна.

— Клемусь ці што?

— Ён. Алесь тут?

— Хадзі сюды.

Учатырох увайшлі ў адрынку. Клемусь расчырванеўся, расшпіліў ватовую, картовую жакетку.

— Чаго ты ходзіш?

— Дадому іду. Позна. Калі скончыце?

— Пад дзень скончым.

— Марудзіце.

Сабастыян жартаўліва пакрыўдзіўся:

— Эйш ты, марудзіце!

— Гэта я так.

— Галава... марудзіце!

— З рэпэтыцыі іду, ад Скварчэўскага. За поўнач ужо, першая гадзіна. Заходзіў да Тамаша. У галавах сьвечка гарыць—сястра яго, Рыгорыха, паставіла. Прынясла і паставіла. Галосіць на ўсю хату, а то яшчэ стане на калені і моліцца. Усю

ноч, кажа, буду маліцца. Галосіць, што нават сьвечкі няма, дажыўся, кажа, Тамаш. Стаіць перад ім на каленях і валасы на сабе рве. І народу поўна хата. Бабы і старыя сьпяваюць царкоўныя песьні. Пад поўнач пачалі трохі разыходзіцца.

— А Лявон што робіць?

— Клапоціцца ўсё. Прыгаварыў Вашыновіча яшчэ з нейкім дол капаць. Вашыновіч прыходзіў маліцца па Тамашу—на каленях перад ім памаліўся, заплакаў і пацалаваў Тамашу ў нагу. У белых панчохах ляжыць Тамаш.

Сабастыян панура сказаў:

— Жывучы, дык найбольш у лапцях хадзіў, а гэта ў белыя панчохі ўбраўся, небарак. Эх ты, жыцьцё чалавечае! Дык, кажаш, Рыгорыха галосіць?

— Але. Успамінае ўсё, як жыў Тамаш.

— Як жыў?

— Выкалупвае ўсё, што калі было.

— Што?

— От, калі ня еўшы быў, калі ня піўшы. Як жаніўся, як дзяцей хаваў. Як жылі ў хаце, як сварыліся, як мірыліся.

Клемусь памаўчаў, аддыхаўся:

— Адзін раз убачыў быў, што ў мяне кніжка за папружку засунута. Дык ён на ўсю вуліцу запытаў у нейкага: ці бачыў ты, кажа, каб трымаць на пупе кніжку і чытаць. І сам рагоча. Жартаўлівы быў. Ну, я пашоў.

Зачынілі дзьверы. Ноч маўчала за сьценамі. Усё гэтак сама сьвяціла лямпа, гэтак сама пахлі смалою стружкі і дошкі. Зноў засьпявалі два геблі. Стукаў малаток.

Яшчэ прыцемкам скончым.

— Дзіва што.

І, памаўчаўшы, дадаў Сабастыян:

— Эх, як яно ўсё робіцца! Тамаш, Тамаш. Эх!

Нагнуўся аж да самае дошкі абвіслымі вусамі і выкалупліваў з гебля стружкі. Твар у яго цьвёрды, абдзьмуты вятрамі, халодны. І нічога, здаецца, ня можа адлюстравацца на ім, тое, што жыве і кіпіць недзе далёка ў глыбіні.

Зноў гаворыць Сабастыян:

— Сырыя дошкі. Калі ты іх, Алесь, пілаваў?

— Гэта не мае. Лявон прывёз яшчэ ўдзень учора.

— Сырыя. Як ты не даганяй, усё роўна некалі ўлетку Тамашу хата разасхнецца.

— На яго век хопіць.

Алесь гулка стукае малатком, заганяючы новыя цьвікі ў сырыя дошкі.

XIV

Пад самы-ж дзень з усходу пачаў ісьці вецер і пасьля таго, як шмат свае, неабмежаванае людзьмі дарогі, прайшоў ён, зьявілася над сьветам сонца. Жорсткім зрабіўся сьнег і калючым. Дзень стаў шырокім і халодным бляскам твару свайго, рассяваў ён і дробніў чалавечыя думкі. Пустым быў халодны бляск яго, і дробным звон мёрзлых даляй—халодная бель.

У той дзень зямля прымала ў сябе Тамаша.

Яна была раскапана і разварочана рыдлёўкамі і ломам у аднэй нязначнай мясьціне сваёй. Буйны жвір і гліна чырванелі сярод абязьвечаных зімою бяроз у чыстым полі. На тры аршыны ўглыб адчыніла зямля нетры свае і маўчала, цяжкасьцю кожнае жмені пяску, перад холадам усіх недарэчнасьцяй сьвету. Тры аршыны пяску ўпарта чакалі.

І нічога ня трэба было больш чалавеку. Захаладзіўшыся ў дрэннай адзежы ў лесе, не баяўся цяпер холаду Тамаш—у летняй картовай жакетцы, у адных тонкіх панчохах, якіх ніколі ня бачылі ногі яго, ляжаў ён цяпер у гэтым калючым паветры, сярод голых дрэваў, сярод сотняў людзей, пад халодным сонцам, у замарожаным сьвеце. Паркалёвая падушка была ў яго пад галавою, а ў падушцы мята і чабор—адзіны дар, які адно і магла прынясьці старая сястра яго ў гадзіну найвялікшага трагізму брата свайго.

Яна глядзела на халодны твар, гэтакі белы ў рамцы сіваватае барады. Твар быў на ўзроўні з насыпаным каля ямы жвірам. Апошні раз на вяку сваім пахлі хваёвыя дошкі труны.

А яна—старая, зморшчаная ад холаду, стаяла над гэтым тварам, не глядзела на людзей, ня слухала іх і ўсё галасіла:

„Ды бывала-ж ты малы босы і голы мёрз.

„Ды бывала-ж ты і галодным быў.

„А ці памятаеш ты, братка, як ты ў маладосьці хворым ляжаў, а ня было табе на макавае зерня чым паправіцца.

„А калі ты, Тамашка, хадзіў па суседзях шэсьць злотых пазычыць на падатак.

„А як не дастаў гэтых шасьці злотых і нудзеў, на парозе седзячы.

„А як еў ты крупнік незабелены.

„А як, каня ня меўшы, нёс ты на плячах жыта ў млын ды паваліўся на дарозе.

„Дый малады-ж ты быў, дый прыгожы.

„А дзе-ж твая прыгожасьць дзелася.

„А куды-ж твая сіла ўцякла.

„Ды, бывала, прыду я да цябе, ды парадзімся мы з табою, ды панудзімся і пагаруем удваіх.

„А з кім-жа я цяпер слова роднае скажу.

„Ды чаго-ж ты, родны мой, уцякаеш ад нас.

„Ды чаму-ж ты не пажыў яшчэ з намі.

„Можа-б ты і дабра якога прыждаў-бы.

„А нашто-ж ты, даражэнькі, гараваў гэтак многа.

„А чаму-ж ты маўчыш, Тамашка.

„А ці памятаеш ты, як падверадзіўся быў за работаю.

„А як прасьветлае гадзіны за работаю ня бачыў.

„А як ня спаў ты ўлетку.

„А як аслабеў ты раз быў, робячы ня еўшы.

„А як сваю нябожчыцу хаваў.

„Ды чаго-ж ты выбраўся ад нас у гэтакія халады.

„Ды якая-ж зямелька табе цяпер халодная.

„А чым-жа мы табе не дагадзілі, Тамашка.

„А каб ведала я, дык не адыходзіла-б ніколі ад цябе.

„Ой, нашто-ж гэта на сьвеце ўсё робіцца гэтак.

„Ой, ды хоць апошні раз я нагледжуся на цябе".

Яна ўпала каленьмі на сьнег, перамешаны з жвірам, і прыпала губамі да яго твару.

— Паднімайце труну,—сказаў Мікалай.

Яе адвялі пад рукі і паднялі на руках труну нявысока над зямлёй, падсунулі бліжэй да ямы.

Празрыстаю бураю зыкаў закружылася паветра, медзяныя зыкі музыкі доўга жылі ў халодным бяздоньні зямлі і неба. І яшчэ ледзьве сьціхлі яны, як нэрвовы жаночы голас парушыў замарожаную цішыню:

— ...І от, у гэтую апошнюю хвіліну, мы кажам яму наша дзякуй за тое, што ён быў маладым сярод нас усіх...

Волька! Яна стаяла на накіданай мёрзлай гліне і гаварыла. І апошнія словы яе зноў заглушылі медзяныя зыкі. Яны ўвасаблялі ў сябе ўсю магутнасьць сьвету і ўсю яго слабасьць. І вялікасьць усіх вялікасьцяй была ў гэтых зыках.

Тады пачаў гаварыць Алесь.

Раптам жаночы голас востра рвануўся ў халодным бляску:

— Не накрывайце яшчэ, дайце мне наглядзецца на яго.

Старую падтрымалі пад рукі і накрылі векам труну. Твар Тамаша назаўсёды быў закрыты ад людзей.

Глуха і цяжка стукала мёрзлая зямля па труне ў глыбіні ямы. Хлопцы адышліся на край могілак і ігралі. Волька затульвала свой кароткі кажушок, адыходзячыся да музыкантаў. Алесь раптам адчуў, як нейкая пустэча на некалькі хвілін напоўніла яго, як-бы што адарвалася ў ім. Глянуў на белабародага Паўла,—той, прыгнуўшы плечы, стукаючы па мёрзлай дарозе цяжкаю палкаю, паволі ішоў з могілак. Глянуў на музыкантаў—твар Клемуся прыкмеціўся яму выразна.

Як сканалі апошнія зыкі музыкі, Алесь вострым зіркам акінуў насып гліны і сьнегу. От і ўсё!

XV

Яны стаялі вечарам каля Алесевае хаты і адчувалі на тварах мяккія ўздыхі адлежнага ветру. Мікалай трымаў у руках цэп, выдзьмухваў пыл з вусоў, атрэпваў з жакеткі асьцюкі. Алесь курыў, глядзеў. Клемусь варушыў каленьмі, моцна стоячы на нагах. Алесь гаварыў:

— Да вясны, значыцца?

Мікалай паволі адказваў і заўважаў:

— Да вясны. Надакучыла.

— А дзе не надакучыць?

— Дзе надакучыць, адтуль пайду. Гэтак лепш. Абы адно пад вясну падбярэцца, адразу пайду. За Бабруйск падамся—я там некалі на робоце быў. А там улетку, як пачнецца касьба, далей падамся.

— А на зіму?

— Тады тое будзе. Гадоў праз два ці праз тры зноў сюды зьяўлюся, можа. Цікава тады будзе паглядзець, што за зьмены тады тут у вас будуць. Бо гэтак от, як сядзіш на адным месцы і на тваіх вачох усё робіцца, дык не прыкмячаеш нічога... От Тамаша пахавалі... А колькі тут за гадоў тры зьменіцца! Якім ты тады будзеш?

— Тады і ты пастарэеш.

— Ну, пэўна.

— А яшчэ праз тры гады якія, дык ужо і цяжка табе будзе гэтак брадзяжыць.

— Тады тое і будзе.

— Заставайся тут.

— Чаму?

— Дамо зямлі, асталёўвайся. Куды ты павалачэшся!? Жыві от. Звыкліся нейк, усё роўна, як ты і радзіўся тут ужо.

— Прыду яшчэ, яшчэ асталююся, будзе час.

— Пасьля нямаведама, як будзе.

— Ат, калі жывы чалавек, дык і ўсё будзе. Яшчэ і ажанюся, і на зямлі насяджуся.

— Ажэнішся тады, як агрыбееш.

— Не агрыбею яшчэ. А калі пастарэю трохі, дык тады якраз добра і жаніцца. Калі адно і застанецца, што сядзець на адным месцы з жонкаю. Цяпер, у самай сіле, добра і пагуляць па сьвеце.

Упусьціш—пасьля ня вернеш. Ніколі. Што, ня праўда?

— Гэта як хто думае.

— Гэта то праўда, што як хто думае. Вядома што. Адзін любіць тое, а другі гэтае. Я куды-небудзь у горад або на работу якую вялікую прымацавацца папрабую, каб і рабіць весялей было, як у гэтым заплеценым павуціньнем Аляксандравым гумне. Надакучыла. Размаху якога-небудзь хочацца, а то, што гэта! Нічога няма цікавага. Цупай гэтым цэпам і знаку ніякага няма. Тут, каб аж гуло ўсё! Гэта дык была-б работа. А то што! Як той казаў, саматужніцтва.

— Што гэта на цябе сягоньня найшло гэтакае?

— Я заўсёды, гэтакі ці адно сягоньня.

— Пачакай, зробім, што і тут будзе ўсё гусьці і ўсё гэтае, як ты кажаш, павольнае цупаньне прападзе.

— Братка, калі-ж душа не дазваляе мне сядзець доўга на адным месцы. Такім ужо стаў я. Цягне мяне.

Закурыў.

— Пайду ад пылу ачышчуся. Прайдуся па вуліцы. Можа куды на вячоркі ўкачуся. Пайду.

Пашоў, варушачы кантовымі плячыма жакеткі свае. Клемусь заўважыў яму ўсьлед:

— Вясёлы хлопец.

— А чаму, ён слаўны.

— Добры хлопец. Хадзем куды.

— Куды?

— Да Волькі давай зойдзем.

— Давай.

На змрочнай вуліцы было пуста; у адлежную імглу падала цьмянае сьвятло з вокан.

Волька была дома. Сядзела на нізенькім, пазьвязваным дротам крэсьле, перад лямпаю і чытала. Узрадавалася Алесю і Клемусю. Устала ім насустрач, пацíснула рукі.

— Што ты чытаеш?

— От тут артыкул, проблемы мястэчак. Эканомічны нарыс. Зацікавілася самым загалоўкам. Ты, Алесь, шмат чытаеш?

— Мала.

— Дрэнна.

— Сам ведаю. Часу няма. Усялякае работы—і гаспадарка, і ўсё. Адзін я.

— Трэба што-небудзь прыдумаць. Нельга гэтак.

— Ну, што я зраблю.

— Пачала чытаць гэты артыкул... Ведаеш, цёмна на вуліцах, ціха, а навокал пад сьнегам балота, на балоце брадзячыя сабакі выюць. А тут царква маўчыць, могілкі недалёка. А на гэтым пляцы саматужныя загатовачныя і шавецкія майстэрні, на суседняй вуліцы два ці тры краўцы. Далей хаты, гумны са снапамі, прысады, поле...

— Што ты хочаш сказаць?

— Глуш гэтакая. Людзі жывуць...

— Ну?

— Апярэдзілі самі сябе. Поле арэ худым канём, у лапцях ходзіць, а сам, душою сваёю, ці як тут сказаць, культурны.

— Ты думаеш?

— Думаю. Адно варта як найхутчэй гаспадарку павысіць.

— А от плюе ў хаце, каля стала седзячы, сабе пад ногі. От табе і культура.

— Пакіне зараз пляваць. Адно каб як лапці хутчэй скінуў... От нябожчык Тамаш...

— Тамаш быў дзіўны чалавек, што раўняць.

— Пачала чытаць от...

Задумалася, памаўчала. Зажурылася бляскам вачэй:

— На лета вучыцца, хоць што вы сабе хочаце.

— Добра. Камандыруем.

— Нейкай большай работы хочацца. А чую, што пораху мала. Нічога гэтак ня будзе. Ня можна гэтак.

Прайшла па хаце. Усьміхнулася Клемусю ў твар:

— А ты як?

— Чорт яго... гаспадарыць буду.

Засьмяяўся:

— Я да навукі тупы, я абух.

— Жартуеш.

— Буду павялічваць капэлю. Каб з музыкай жыць... Хіба каб на якія музычныя курсы...

— Маладзец, што зайшоў, Клемуська.

— Калі твая сястра прыедзе?

Волька жартаўліва сказала:

— А я думала, што ты па мне ўздыхаеш гэта?

— А можа і па табе.

— Дык відаць-жа!.. Неўзабаве прыедзе. Ты што, закахаўся? Ну, прызнавайся, чаго там.

— Ну, а калі закахаўся, дык што там.

— Ну, то чаго ты баішся прызнацца. Эх ты, хлапчанё!

— Закахаўся.

Ї засьмяяўся. Падышоў да стала, узяў кніжку. Пагортаў і палажыў назад.

— Расьцеш ты, на лес гледзячы.

— Абы здаровы расту.

Зноў засьмяяўся.

— Ну, а ты, Алесь?

— Мяне сьмерць Тамаша страсянула ўсяго. Ніколі ня думаў, што гэтак выб'е мяне з каляіны. Як сам ня свой.

— А так?

— Ведаеш-жа... Нічога... добра... Усё перавярну. Мікалай крываносы на вясну пойдзе куды-небудзь вялікае работы шукаць. А гадоў праз тры ці пяць зноў, казаў, зьявіцца тут. Дык каб не пазнаў ён тады ні вуліц гэтых, ні людзей. Маладое пакаленьне падрастае, лягчэй ваяваць усё робіцца. Эх, ты...

Жартаўліва ўзяў Вольку пад руку.

— Дык каб адправілі мяне на лета вучыцца. Чуеце?

— Ну, добра.

— Глядзеце-ж... А ты, Клемусік, ня сумуй па маёй сястры, зараз прыедзе сюды... Хлапчанё ты.

Алесь сказаў:

— Ён яшчэ от возьме, ды, жартаў не пазнаўшы, пасватаецца да яе.

— Можа і пасватаюся.

— А што ты думаеш, можа табе і варта ажаніцца. Пасталееш. Хто цябе ведае.

Волька засьмяялася:

— Бач ты, якія парады пачаў даваць. Сват. Давайце па вуліцы павалочымся, ціхі і цёплы вечар.

— Хіба куды на вячоркі закоцімся?

— Давайце. Бяры мяне, Клемусік, пад руку.

— А мне ў адстаўку падавацца ці што?

— А ты з другога боку.

Пашлі на асьнежаную вуліцу. Калыхаўся сіні змрок над чорнымі хатамі і дрэвамі.

XVI

Трэба было яшчэ адгуляць вясельле. Маня і сама гаварыла пра гэта, бо не хацела адмоваю крыўдзіць бацькоў і брата. Алесь гаварыў, каб зрабіць гэты вясельны абед пасьля, праз нейкі час, калі ўжо гэтак трэба, але ўсё-ж згадзіўся— Маня прасіла яго не псаваць добрага настрою яе родным. Алесь адчуваў вялікую зьмену ў сваім жыцьці. Перажывалася мяжа між дзьвюма часткамі жыцьця. Пачыналася новае, невядомае раней. Цяпер больш, як раней, усялякіх думак зьяўлялася ў Алеся. „Гэтак, мусіць, і дзед мой, і бацька перажываў. Думаў іначай, а перажываў, мусіць, нешта падобнае. Усё падобна. А што я зрабіў, каб зьмяніць жыцьцё, каб іначай жыць, каб ня быць ва ўладзе горкага бацькаўскага лёсу? Бо дрэнна жыў бацька“. Ён быў задуменны і гэтак, як ніколі раней, сталы, у гэтыя першыя дні. Шмат гаварыў аб усім з Маняю. Адчуў з горасьцю, як шмат чаго ў ім не зразумее яна, і ўпартая думка апанавала ім—нейк іначай жыць, каб мела яна час вучыцца і зраўняцца з ім. І ў гэтыя, хоць кароткія, але горкія, хвіліны, вобраз Ганны мучыў яго, не даваў яму спакою. Пасьля з пашанаю думаў пра Вольку. А пасьля прайшло ўсё гэта, прытупілася. Зьнікла. Прышла радасьць блізкасьці Мані. Сілу і добрае сэрца адчуў у яе. Хадзіў з ёю на адчыненыя сходы ячэйкі, хацеў, каб здружылася яна з Волькаю. І новыя жаданьні дзейнасьці і працы апаноўвалі ім.

Маці гаварыла:

— Цяпер, сынок, на вясну трэба думаць пра новую хату. Вельмі-ж старая гэтая, яшчэ дзедаўская.

Ён адказваў:

— Добра, мама.

А сам усё думаў пра гэтыя мацерыны словы. Маня запытала раз:

— Чаму ты нейк нявыразна гаворыш маме пра хату?

Адказаў:

— Невядома, як будзе.

— Чаму?

— Можа на вясну будзем перамерваць усё, і зямлю, і пляцы.

— У вас-жа мералі ў гэтым годзе?

— Адзін кавалак... Усё нанава...

— Як ведаеш.

І глядзела з вераю, сілай і каханьнем у вочы яму.

Гэта было сінім адвячоркам. Цямнелі праз вокны дрэвы. Неба адчувалася высокім, прасторным. Пачынаў ісьці з поля вецер. Алесь прыгалубіў Маню, гладзіў па валасох. Хацелася гаварыць ёй пра тое, як разам будуць зжываць гразь і крыўды жыцьця. Як гэтая бацькаўская хата пакіне па сабе чорную памяць. Пачаў гаварыць ён. Доўга гаварыў.

— Ты нейкі як-бы сумны, Алеська?

— Не... так.

— Настрой у цябе гэтакі... Зажурыўся?

— Пройдзе.

— Не заўсёды-ж быць вясёламу вельмі. Я гэта ведаю.

Усьміхнулася ціха, слаўна, як-бы вінавата нейк.

— Будзем жыць, Алеська, добра ўсё будзе.

— Добра.

— Будзь весялейшым.

— Буду.

І павесялеў. Павесялелі абое. Сьмяяліся.

— Чаго ты сумаваў кагадзе?

— Успомніў быў бацьку, думаў пра хату гэтую, без падлогі, пра Тамаша думаў. Бывае гэта з чалавекам. Ведаеш? Цяпер пераламалася юнацтва, поўным стала яно, на поўдні сваім стала... Слаўна мы пажывом з табою.

— Слаўна.

— Ты верыш у гэта?

— Бачу.

— Добра... Ведаеш, я от думаю, што ня будзе ў нас тых дробных няпрыемнасьцяй, якія не давалі жыць нашым бацьком.

— Я рада, з табою.

Яшчэ гаварылі шмат, доўга. Пашлі да Волькі. Ішлі змрочнаю і ціхаю вуліцаю. З поля дыхала ветрам, мяккім, шырокім. Абвяваў вецер твар, весяліў сэрца. Сінеў змрок вечару.

— Каб хутчэй вясна.

— Шмат яшчэ вёснаў будзе.

Глянула з падзякаю яму ў твар. Выклікала ў яго радасную ўсьмешку. Пашлі шпарчэй.

— Што там у нас цяпер дома робяць?!

— Не адвыкла яшчэ.

— Ні то што... Думаецца.

— Бацька твой вясёлы.

— Так гэта ён, гаваркі гэтакі. Калі бяда якая, дык пасьпявае, пасьмяецца, хоць на сэрцы каты скрабуць.

— Мой бацька ня гэтакі быў. Калі што якое нядобрае, дык, бывала, нудзіць і маўчыць.

Ішлі поплеч, цесна адно пры адным.

— Як у ногу мы ісьці злаўчыліся.

— Трэба-ж. Гэтак будзем ісьці вялікую сваю дарогу. Слаўную дарогу.

XVII

Гаворкі цяпер сталі выразнымі і нават як-бы трывожнымі, усе здагадкі былі адкінены. Усё было вядомым і даўно вырашаным. Бо ўсе бачылі, як па паўдні Ганна прыехала да бацькі. Фурман, які прывёз яе, заехаў у двор і папасваў там каня больш гадзіны, а пасьля выехаў. Нават нейкімі як-бы сакрэтнымі сталі гаворкі. Вестка абляцела ўсіх. І от тады Вашыновічыха пашла да Барановічавых пазычыць сіта муку прасеяць.

— Дзяндобры.

— Добра здароўе.

— Як маецеся?

— Дзякуй. Як вы?

— Жывом паволі. Што ад Ганны чуваць? Ці здарова хаця? Можа пісала што?

Барановічыха злосна паглядзела на Вашыновічыху і адказала:

— Нічога, Ганна здарова. Сёньня прыехала ў госьці.

— Ці бач?

— Але.

— Ці надоўга-ж?

— Можа да канца зімы. Бо Андрэй паехаў у вялікі горад давучвацца. Дык пакуль там асталюецца. Тое ды сёе...

— А-а, бачыш ты, давучвацца паехаў. Ну, няхай бог памагае. Як-жа хаця выглядае Ганна, як маецца?

Ганна вышла ў кухню. Твар яе трошкі зблажэў ад таго, як быў раней, трохі на ім ляжалі сьляды здарожанасьці. Усьмешка яе была ціхаю, задуменнаю. Адзнакі нейкае новае нявыразнае сталасьці былі ў постаці яе.

— Дзяндобры, цётачка.
— Здарова, дачушка. Як-жа гадуешся?
— Добра.
— Трошкі паблажэла.
Маці растлумачыла:
— Гэта з дарогі.
Вашыновічыха дасканала абглядзела Ганну, папытала, колькі каштавала гэтая сукенка, што на ёй, выказала думку, што, мусіць, улетку яна зьліняе, і, забыўшыся пра сіта, пашла дадому, дзе чакала яе Сабастыяніха.
— Выразна ня відаць яшчэ, але мусіць такі загрубела Ганна. Мусіць такі ўжо.
— А на колькі прыехала?
— Кажуць, што да вясны.
— Ну, а там вясною будуць гаварыць, што да зімы засталася ў бацькі. Як табе, суседка, здаецца?
— Будзем бачыць.
І тут пачалася доўгая гаворка, поўная здагадак, усьмешак. А пасьля Вашыновічыха ўспомніла бледны, здарожаны твар Ганны, яе сталасьць і спакойны зірк ласкавых вачэй і змоўкла. Успомніла абед на яе вясельлі, сваяўство і сказала Сабастыянісе:
— От мы гаворым, а хто яго ведае, што там у іх робіцца. У чужую душу не залезеш.
— Але яно відаць.
— Нічога ня відаць яшчэ.
— Дзе-ж гэта ёсьць так, каб адпраўляў да бацькі жонку, пажыўшы з ёю гэтак мала.
— А ты падумай, хіба за гэтакі кароткі час могуць яны разлучвацца. Каб, скажам, хоць праз год які.
— Цяперашнім сьветам можа ўсё быць.

— Не ва ўсіх.

— Ды дай божа, каб усё было добра, як-бы я гэта благога ім жадаю! Дзівачка ты, суседка.

— От паглядзіш, што пад вясну яна паедзе.

— Ды дай божа, я-ж тут богу душою нявінна.

І пашла, злосна гледзячы на Вашыновічыху. А дома суседкам гаварыла:

— Мусіць, саўсім Ганна прыехала. Бо Вашыновічыха вельмі-ж стараецца давесьці, што пад вясну паедзе. Вядома, нейкая цётка яна ёй даводзіцца. На яе месцы і я гэтак гаварыла-б. Так што тутака ўсё ясна і вядома. Няма чаго больш гаварыць.

Аднак прагаварылі да самага цямна. А вечарам, управіўшыся дома, сышліся зноў гаварыць.

А Ганна, тады, як пашла з хаты Вашыновічыха, адышлася да вакна і глядзела ёй усьлед. Радасная трывога апаноўвала яе. Як ехала яна сюды, маўчаў паабапал дарогі хваёвы лес. Адлежная сінь стаяла над ім. Пахнуў мокры мох, ледзяніўся яловец кроплямі вады. І гэтакая цішыня і спакой, безутрапёнасьць, панавалі паабапал дарогі.

Хата як-бы зьмяніла твар свой. Усё было такім самым і не такім. Над печаю вісела пазьвязаная ёю-ж самою некалі ўвосені цыбуля, сухое каліўё вяргіні тырчэла перад вокнамі на вуліцы ў агародчыку над абледзянелым сьнегам. Віхрастая страха суседняе хаты на другім баку вуліцы нагадвала выгляд ветранага дню.

Яна заўважыла, што бацька з нейкім непаразуменьнем маўкліва паглядзеў у вочы ёй:

— Госьця прыехала. Разьдзявайся-ж, можа зьмерзла едучы.

— Не. Сёньня цёпла.

А маці адразу заклапацілася і заплакала:

— Паблажэла трохі... Чым-жа цябе і частаваць, госьцейка мая. Ты-ж тут кагадзе сама гаспадыняю была...

І пачала ставіць усяго на стол.

— Абы хаця ела ты.

Пасьля ўсё гаварыла, усё асьцярожна распытвала.

— ...А тут усялякія гаворкі пашлі, плёткі ходзяць. Каб толькі чула ты, што гавораць...

Бацька, грэючы рукі каля печы, перабіў:

— Ат пакінь ты. Мала што меньцяць языкамі. Няхай сабе, горлаў не пазатыкаеш.

— Дык няхай сабе, але-ж вельмі крыўдна.

— Чорт іх бяры.

— А што гавораць, мама?

— Ды от гавораць...

І доўга гаварыла маці. Выцірала рогам хусткі сьлёзы, непакоілася, што Ганна мала есьць.

— Ты-ж зусім схуднееш, дачушка, калі будзеш гэтак есьці.

Бацька, не адыходзячы ад печы, сказаў:

— Ну, няхай сабе. Яна здарожылася. Няхай адпачне, тады будзе есьці.

— То хіба ты ляж пасьпі трохі.

— Уночы пасплю... Хаця пагавару з вамі.

Пасьля думала ўсё пра гэтыя гаворкі; няпрыемна было, нядобра. І няпрыхільнасьць нейкая была да Вашыновічыхі, калі прышла тая і пачала распытваць.

Пад вечар пашла з мацераю ў гумно набіраць мякіну, дастала мацеры з пограбу буракоў. Пасьля засталася адна на прыгуменьні. Ішоў сіні змрок з поля; на агародах сінеў сьнег. Каля гумна на ўзьмежку растаў за адлегу сьнег, вузкая істужка

зямлі чарнела каля самай сьцяны. Каліва травы жаўцела з-пад сьнегу, нізенькае, сашчыпанае птушкамі. Ганна стаяла адна, глядзела ў сінь белых прастораў. Вечарам у хаце пачала гаспадарыць, давяла матку да сьлёз:

— От і добра, што ты пашла замуж, а ўсё-ж— хто яго ведае...

— Што вы, мама, начорта вы верыце гэтым плёткам. Мяне аж злосьць бярэ. Ну, нашто гэта вам?

— Не пра гэта я. Была от дома за гаспадыню, а гэта адно госьцяю стала. І добра яно і горна нейк мне старой. А гэта што гавораць, дык, добра бацька кажа, горлаў не пазатыкаеш. Абы адно няпраўда было ўсё гэта.

Тады Ганна раззлавалася:

— Не гаварыце, мама, больш гэтага. Ліха ведае, якою дурною выдумкаю мучыць і сябе і мяне.

Маці пачала ставіць на стол вячэру. Адчуваньне прытульнасьці грэла Ганьніна сэрца. Брат жартаваў, сьмяяўся; гаварыў з бацькам аб сечцы з жытняе саломы, у якую занадта шмат пушчана было канюшыны. Ганьне ён сказаў:

— От я цябе заўтра сечку рэзаць пастаўлю.

А яна адказала таксама жартам:

— А чаму. Пайду і буду рэзаць.

Маці не зразумела жартаў:

— Куды ты пойдзеш. Нарэжуць і без цябе.

Бацька засьмяяўся. Устаў, апрануўся, пашоў з ліхтарняю глядзець коняй. Кашляў, ходзячы па дварэ.

— Хіба ты, Ганна, спаць лажыся.

— Пасяджу.

— Адпачывай.

— Я не ўтамілася.

— Здарожылася. Сама-ж казала.

— Ай, нічога.

Хацелася ёй узяцца за якую-небудзь работу.

— Дзе гэта скрынка гэтая з-пад лавы дзелася, што вяргіню на зіму ў яе выкопваем?

— Вынесьлі недзе на двор.

— А вяргіня?

— Забыліся выкапаць. Не ў галаве было. То сёе, то тое—забыліся. От, бывала, як ты глядзела...

— Чаму-ж вы... Яна-ж зьмерзла.

— Ну, што ты зробіш.

Пашла з кухні ў цёмную хату. Падышла да вакна. У агародчыку, на змрочным сьнезе, чарнела каліўё мёрзлае вяргіні.

XVIII

Назаўтра Юліку Барановічу было дрэнна з нагою.

— Вільгаць гэтая, адлега, дык яно і горш. Мусіць, надоўга гэтакае надвор'е, каб на яго агні. Хоць холадна, але, як суха, дык яно лепш. Каб яна сьпярунела гэткая жытка, каб яна, бог даў. Ой, божа-ж мой, можа, жыцьцё закончу.

— Хіба, тата, гэтак баліць?

— Ой баліць. Сядзь, хоць пасядзі, каля мяне, дачушка, ніколі-ж гэтак не балела яшчэ. Хоць ты канай вазьмі.

Усю раніцу ён стагнаў, укруціў нагу суконкамі, укрыў кажухом і стараўся не варушыць ёю. Пад поўдзень сьцішыўся і задрамаў. А пад вечар зноў пачаў стагнаць.

— Я вам, тата, натру нагу сьпіртам?

— Няхай, дачушка, ня трэба. Ой ня трэба! Няхай ужо так начуе, не канешне яе варушыць

ганач. Можа за ноч сьцішыцца. Але калі не, дык заўтра зранку. Можа гэта я і захаладзіў яе, па гэтай вільгаці цягаючыся. Няўжо гэта мне суджана ўжо на печы век свой векаваць. Хіба ідзі, дачушка, пазаві дзядзьку Вашыновіча, няхай хоць пагаворыць са мною пра гаспадарку, мне весялей будзе.

Кум прышоў пасьля вячэры.

— Тымчасове, што гэта ты закідаўся?

— Захаладзіўся. А ў мяне—сам-жа ведаеш. Нага гэтая, каб яна сьпярунела, кара нейкая дый годзе.

— Баліць?

— І баліць, і нейк аж тузае.

— Дрымціць?

— Але.

— Гэта мурашкамі трэба націраць.

— Як гэта?

— Узяць мурашак у макацёрт, расьцерці іх качалкаю, каб аж сок, тымчасове, з іх пашоў, а пасьля ўкінуць у бутэльку і наліць сьпірытусам. Дык яно, калі настаіцца, дык гэтаю настойкаю ўзяць дый націраць. Я-ж ведаю.

— Можа і добра?

— Я табе кажу.

— Чаму-ж, кумок, мне раней не параіў?

— Я сам кагадзе пачуў пра гэтую практыку. Гэта мне Несьцер крывасёлкаўскі казаў у нядзелю на месьце. Тымчасове, кажа, самае лепшае лякарства. Боль выганяе зусім. Хлусіць не павінен, што яму, тымчасове, за інтэрас.

— А як-жа гэта лавіць гэтыя мурашкі?

— Ён мне і гэта, тымчасове, расказаў. Узяць, кажа, трэба ўлетку бутэльку ды капнуць у дне малака салодкага, каб яно пахла ім. А бутэльку, тымчасове, уставіць у мурашнік, усю, тымчасове,

усадзіць. Малако пахне, дык яны паўзуць у той бок. Падпаўзе гэта мурашка да бутэльчынага, тымчасове, горла, панюхае, і пойдзе шчыгіляць сабе, пане мой, у бутэльку. А там плясьнецца на дно, дык, тымчасове, там ёй і фарфал.

— А-а-а, ня ведаў я раней.

— А от-жа ж.

— А можа і памагло-б.

— Тымчасове, дастаць дзе трэба. Апытаць дзе трэба, у людзей павінна быць. Чаму не, уг-га. Сярод людзей павінна быць.

— А-а-а, у каго-ж гэта тутака запытаць?

— Тымчасове, Ганна як прышла да мяне ў хату, дык я-ж ня бачыў яшчэ яе. Паблажэла трохі. Але вядома-ж, тымчасове, гэта.

— Ну, але.

— Як-жа хаця ёй там паводзіцца? Я ня ўсьпеў, тымчасове, нават і распытаць, як мае быць. Мікалай крываносы якраз сядзеў у мяне, разьлічвацца прышоў, я яму яшчэ поўрубля быў вінават за касьбу. Прышоў разьлічыцца. Усе даўгі, кажа, тымчасове, сысквае з людзей. З усімі разьлічваецца, хто яму вінават, каму ён, тымчасове, вінават. От пераломіцца, кажа, тымчасове, зіма на сонца, дык падацца думае ад нас некуды. От-бо чалавек, каб яго прывязаў, дык, тымчасове, на адным месцы ня ўседзіць. А-яй, што гэта за чалавек. Як няпрыкаены які, тымчасове, як асуджаны які валачыцца па сьвеце. От-бо натура ў чалавека.

— Ну, але, ён гэтакі.

— Тут-жа, тымчасове, яму і зямлі хацелі даць, каб ён адно захацеў, ён, сказаць, чалавек ня кепскі, крыўды тут ніякае нікому не зрабіў. От што. Жыў-бы сабе.

— Ну, што ты яму зробіш.

— Яму нават, тымчасове, Алесь і гэтае... гаварыў, тымчасове, значыцца, выразна, каб браў сабе кавалак зямлі, дый гэтае. Дык ён, ліха яму, рукі атрэпае, як ад чаго ліхога.

— Натура гэтакая.

— Тымчасове, ён і ня гультай. Не скажу. Нашто, тымчасове, гаварыць. Ён робіць. Працавіты хлопец.

— Робіць, уг-га.

— Я дык думаю гэтак. Тымчасове, як той казаў, на мой дурны розум, дык чалавек, які гэтак лішне мудруе, сам ня ведае, чаго ён, тымчасове, хоча, сам ня ведае.

— Хто гэта, Мікалай?

— Але.

— Ён, сказаць, і ня мудруе.

— Як гэта не? А што-ж гэта?

— Натура гэтакая ў чалавека.

— Тымчасове, натура натураю, а калі трэба, дык трэба. Тут-жа яму ніхто кепскага ня хоча.

— От ён, брадзяга, гэтакі ўдаўся.

— А як-жа. Алесь яму выразна казаў, тымчасове, так і так. Ня хочаш? Не, кажа, не хачу. Што-ж ты яму—кол на галаве будзеш часаць? Ты-ж яму, тымчасове, кала на галаве не зачэшаш.

— Ну, але.

— Алесь, дык той іначай. Ажаніўся, гаспадарыць сабе. Бацька, тымчасове, быў рамесьнікам, а ён за зямлю ўзяўся.

— Мае розум.

— Сказаць, ён хлопец, тымчасове, ня дурны.

— Не.

— Ніхто на яго гэтага ня скажа. Ён што гэта, тымчасове, сьветам круціць, дык патом для гэтага, галава ў яго, ліха яму, варыць.

— Варыць.

— А гэта што тутака, тымчасове, кажуць сёе, ды тое, дык яно што галава—то розум.

— Ну, але.

— Кашляць нешта пачаў. Захаладзіўся... Дык от пра Ганну. Надоўга-ж яна хаця прыехала?

— От месяцаў два ці тры можа пабудзе. Учора прыехала, а сягоньня раніцою ад яго ліст прышоў.

— Прышоў?..

— Але.

— От-бо цяперашнія маладыя, пішуць сабе, тымчасове, адно аднаму. Малайцы, яй-права.

— І зараз-жа яна яму адпісала.

— Ну, а што-ж. Дзякуй богу.

— Села і адразу пачала адпісваць.

— Тымчасове, у іх, маладых, цяперашніх іначай.

— А, гэта як да каго. Іншы і малады, ды нічога ня гэтае. Як да чалавека. Андрэй ня гэтакі, ён сталы, разумны. Ганна кажа, што вельмі-ж ён яе глядзіць. Расказвала.

— Ну, дык ён-жа вучаны.

— Больш паедзе вучыцца, ці ўжо можа і паехаў.

— Яму, тымчасове, відней. Яму што тут можна сказаць. Наша, тымчасове, дзела гэтакае, спакойнае, гаспадарскае.

— Намогся больш вучыцца.

— А за каго, тымчасове, ён ужо выўчыцца?

— За ніжынера, Ганна расказвала.

— Ого, за ніжынера... Ну, каб усё добра было. Тымчасове, калі Ганна і пабудзе дома, дык ні бог тут ведае што, калі гэтак. А то пачалі гаварыць, а тое, а гэтае. Адно паслухаць.

— Людзям-жа абы языкамі мяньціць.

— Тымчасове, ну але, я ўжо казаў.

— Ну, што ты зробіш!?

— Ат!

— Пагавораць ды сьціхнуць.

— Языкоў, тымчасове, не папрывязваеш.

— Дзе бачыў.

— А я думаю, хто яго ведае, кажуць прыехала, а, тымчасове, гаворкі гэтыя пашлі. Ажно-ж за ніжынера...

— За ніжынера.

— Аг-га-га... ну...

— Адно каб як нага прайшла.

— Сьпірытусу гэтага з мурашкамі каб, кумок, тымчасове, дастаць адно.

— Апытаць дзе па людзях трэба.

— Дык, значыцца, Ганна паедзе пад вясну...

Вашыновіч пашоў дадому пад поўнач, нясучы ў сабе і зайздрасьць і абыякавасьць да ўсяе гэтае справы.

XIX

. . . .

. . . .

. . . . „я ніколі гэтак ня думала, ніколі гэтак ня пісала, як цяпер. Ня ведаю, што са мною робіцца, і, мусіць, не заспакоюся я, пакуль ня будзе ад цябе ліста. Каб ты адно ведаў, якія гаворкі пашлі тут пра нас з табою, што гавораць. Мама плача, а тата нічога, але бачу, што і ў яго на сэрцы скрабе. Мама вельмі нудзіць. Мама кажа, што і раней пачалі гаварыць, як толькі дачуліся, што я маю прыехаць дадому. І як гэта дачуліся? Гавораць, што ты мяне кінуў, што цяпер усе маладыя, гарадзкія, гэтакія. Я маму супакоіла трохі, але ўсе роўна яна нудзіць, бо яна і сама ня ведае, каму верыць і што ёй думаць. Калі я прыехала, дык адразу нічога не разумела. Пачалі частаваць

мяне, клапаціцца, але нейк вельмі сумным мне гэта ўсё здалося. А пасьля я ўжо дачулася, мама сама расказала мне пра ўсе гэтыя гаворкі. Я буду ўсё чакаць, калі паеду да цябе. Ты як-небудзь пастарайся, хоць табе і цяжка будзе, я гэта ведаю, каб мне больш, як да канца зімы, тут ня быць, бо тады не дадуць мне па вуліцы прайсьці, усё будуць гаварыць. А ўрэшце, як сабе хочуць. Можа табе вельмі цяжка будзе, дык як-небудзь перабуду. Ты адно не забывай мяне. Ведаеш, усё нейк у хаце зьмянілася, нейк і кухня, здаецца, іначай выглядае. Тата абгабляваў тую лаву, на якой я, бывала, малако цадзіла. А вяргіня ў агародчыку на вуліцы зьмерзла, ня было каму тут яе выкапаць. Вельмі шкода мне вяргіні. Брат сьмяецца, кажа, што ён тут, на гэтай самай градцы, дзе расла вяргіня, і па ўсім агародчыку на спробу пасее нейкіх новых буракоў, будзе глядзець, як яны будуць расьці, ці варта іх больш сеяць. Жартуе ўсё з мяне. А каб я была дома, дык сярод буракоў і вяргіня расла-б. Было-б зусім весела глядзець праз вакно. Прыехала я добра. Па поўдні. Яшчэ больш пацяплела, зусім было адлежна стала і зусім цёпла было ехаць. Усе кажуць, што я паблажэла з таго часу, як мы з табою паехалі былі адгэтуль. Напішы, ці ты выехаў у той самы дзень, як і я, ці яшчэ на дзень застаўся быў? Што яшчэ табе пісаць? Завуць усе дома мяне госьцяю, вельмі клапоцяцца пра мяне, а мне нейк радасна і хочацца плакаць. Бывай здароў, не забывай мяне.

Ганна.

10 сьнежня.

Гэта я напісала ўчора вечарам, а цяпер раніцаю прышоў ліст ад цябе. Я прачытала, родненькі мой. Адпішу табе трохі пачакаўшы, цяпер нейк не

магу пісаць. Тату сёньня баліць нага, енчыць, стогне. Раней, дык нічога, гэта ўсё было, а гэта я адвыкла, дык нейк страшна робіцца. Туман па дварэ густы пашоў, дык яму горш робіцца. Пайду сёньня рабіць што, буду, мусіць, з мамаю крупы дзерці ў жорнах. Брат досьвіткам уставаў малаціць, а мне ўсё ня спалася. Усё новым, інакшым, як было, здаецца мне. Хацелася ўстаць разам з братам, але не хацела непакоіць маці—падумала-б, што я хворая якая, што ня сьпіцца мне. Гэтак і ляжала, пакуль мама не паднялася. На дварэ ўсходжваецца вецер. Бывай".

XX

„Гануся мая! Пішу табе з дарогі. Выехаў у той дзень, як і ты. Ня меў часу напісаць табе перад самым выездам. Дрэнна пісаць у вагоне, але затое, якая шырыня думак. Цяпер я цьвёрда рашыў—на інжынэра вучыцца. Краіна наша гэтулькі пэрспэктыў мае наперадзе, гэтулькі працы чакае! Я цяпер зусім упэўнены, што, будучы інжынэрам, я буду адчуваць сябе на сваім месцы. Я ўпэўнены, што я знайду тут сябе. Якая шырыня бяжыць за вокнамі. І як сябе адчуваю я цяпер вольна. Калісьці, як жыў яшчэ я дома і часта быў галодны і зімою дрэнна адзеты, тады здавалася мне, што будзе самае вышэйшае дасягненьне маё, калі я сам выйду з гэтае беднасьці і выведу з яе сваіх бацькоў, калі я і яны пачнем жыць пачалавечы. Нават думаў яшчэ гэтак, калі першыя гады вучыўся. Пасьля прышло іншае і цяпер зусім сформавалася. Памятаеш, мы гаварылі пра гэтае з табою ў першыя дні, калі жылі разам. Цяпер усё тое, што бяжыць

і кружыцца за вагоннымі вокнамі, ляжыць перада мною. Вось чаму мяне вельмі ўзрадавала ты тады, калі сказала, што ты таксама хочаш вучыцца. Вялікая будучыня перад нашай краінай. Тое, аб чым мы з табою тады гаварылі,—што паднявольвала асобу чалавека—плавіцца і пераплаўляецца. Гэта ўжо яскрава прыкметна цяпер, нават і сярод сялянства, не гаворачы пра горад. Матэрыяльныя перашкоды, якія стаяць тут перад чалавекам, зжывуцца. Мы зьнішчым сваю беднасьць. От чаму, перад гэтакай пэрспэктывай, я ўвесь напоўнены нейкаю бураю работы. Я буду старацца ў горадзе, зараз-жа прыехаўшы, узяцца за заканчэньне свае дыплёмнае працы—гэта дасьць мне магчымасьць лёгка пачаць вучыцца некалі на лета. Ня ведаю, як давядзецца мне ў горадзе, але самае страшнае перажыта. Бывала, і босы хадзіў у халады, і галодны рабіў, і неадзеты зімою, але ўсё прайшло. Адно, што бацьком не магу ніяк памагчы, сама ведаеш. Але ўсё ідзе да лепшага. За ўчарашні дзень я ўтаміўся, але спаць не магу, нейкая нэрвовая ўзбуджанасьць не дае. Гэта ад навіны—выбраўся ехаць, пакінуўшы службу, грошай маю мала. І так усё, усе абставіны. Усё-ж добра мы прыдумалі, што ты паехала да бацькоў, спакайнейшы буду я, дый табе будзе лепш. Можа бацьком гэта і не падабаецца, але пасьля самі ўбачаць, а можа і цяпер зразумеюць. Калі-небудзь прыеду, дзе я зямлю мераў. Цяпер хочацца шмат пісаць, каб усё напісаць. Думкі бягуць, ахапляюць усё. Гэтакі настрой. Як мяне спаткае вялікі горад?! Памятаеш, як табе ў першыя тыдні хацелася дадому, хоць на два дні паехаць хацела. Гэта і ў мяне некалі было, калі вучыцца паехаў. Сумаваў па старой бацькаўскай хаце, роднаю здавалася нават

салома, расьцярушаная каля ганку. Прыехаўшы, буду пісаць больш, пра ўсё, пра свае посьпехі і няўдачы. Пішы мне да запатрабаваньня на 12-е паштовае аддзяленьне. Бывай здарова.

8 сьнежня. *Андрэй.*

XXI

„...Твой ліст быў вельмі нейкім сталым, ці я і сама ня ведаю, як назваць яго. Я некалькі разоў яго чытала і ня ведаю, як адкажу табе на яго. Я вельмі рада, што ў цябе гэтакі добры настрой і ўсё табе гэтакім добрым здаецца Тыя кнігі, што ты мне параіў чытаць, я патроху пробую чытаць, але ня многа, бо памагаю маме. Вечарамі хіба, а днём раблю з мамаю ўсялякую работу. З усім, што ты пісаў, я згодна, і мае думкі гэтакія самыя, але я, можа, ніколі не гаварыла табе пра гэта. Я ўсё шкадую вяргіні, здаецца, жывая яна была і самохаць яе з сьвету зжылі. Табе, можа, ня цікава пра гэта, можа, ты і пасьмяешся нада мною, але я пішу табе, бо нейк усё думаецца пра ўсё гэта. Маме аднэй цяжка рабіць, і брату, мусіць, трэба будзе жаніцца, гэтак мама ўсё гаворыць, але брат вельмі-ж малады яшчэ, яшчэ нават на прызвах ня быў, і сам ён ня хоча. А маме цяжка. Дык нядобра нейк усё гэта ў хаце. Тату з нагою лепш стала, сёньня зранку хадзіў па дварэ, нешта ў гумне рабіў. Гаворкі пра нас з табою трохі заціхлі, а можа гэта я ня чую іх, бо нікуды не хаджу. Кожны вечар дзяўчаты зьбіраюцца на вячоркі, а мне нейк нядобра ісьці, хоць часам і хацелася-б пайсьці. Тут ходзяць гаворкі, што на лета нанава будуць перамерваць усю зямлю, будуць высяляцца некаторыя на пасёлкі, некалькі хат заснуюць комуну. І ў нас

у хаце нават была гаворка. Брат кажа, што тады ня трэба было-б яму супроць свае волі жаніцца. Ня ведаю, ці гэта ён стала гаворыць, ці гэта толькі пад настрой. Жыву я да часу нейк, гэтакі настрой у мяне. Не магу ні за што, як мае быць, узяцца. Пішы мне, як табе паводзіцца там у вялікім горадзе. Пішы пра ўсё“.

Ганна.

15 сьнежня.

XXII

„...Першыя дні мае тут поўна былі непарадку і клапатлівасьці. Нікога знаёмага тут у мяне няма, дык пакуль я знайшоў сабе дзе прыпыніцца, хоць да часу, дык вельмі давялося клопату ўжыць. Застанавіўся я ў агульным памяшканьні для студэнтаў N-скага інстытуту, жыў там некалькі дзён, а цяпер перабраўся на кватэру, вельмі добрую, адно што цесную. Гэта пярэдні пакойчык, малюсенькі, у нейкім белым казённым доме. Праз яго праходзілі з параднага ходу ў дом. Цяпер парадны ход забіты наглуха, і пакойчык заставаўся без патрэбы. Кватаранты зрабілі там былі клеці для сябе. Я наняў яго за вельмі малую цану. Добра. Ён мае чатыры крокі ўшыркі і пяць удаўжкі. Цяпер узяўся ўжо за работу. Цэлымі днямі сяджу ў бібліотэцы. За зіму думаю скончыць працу, а тады ня будзе ніякае перашкоды залічыцца зноў ў студэнты. Цяпер я ў адным месцы стараўся наконт работы. Вельмі можа быць, што дастану яе, тады можна будзе зарабляць у месяц рублёў сорак, а то можа і пяцьдзесят. А яшчэ ў другім месцы ўжо маю работу на рублёў дзесяць—пятнаццаць у месяц. Дык тады можна будзе і табе прыехаць.

Я-ж ведаю, што ты не з раскошы і можаш і з недастаткамі мірыцца. Усё-ж ткі добра, што я паехаў. Памятаеш, як я хістаўся, дый абое мы мелі думкі, што ня трэба мне кідаць гатовае службы, больш-менш спакойнага жыцьця і нават забясьпечанасьці матэрыяльнай. Але нешта не дае мне ўсё спакою, цягне мяне. І добра. Зусім добра, што перамог гэтыя страшныя думкі і паехаў. Праўда, што той ліст быў нейкі, як ты пісала, „сталы“. Настрой быў гэтакі, узьнятасьць настрою, імчаньне думак. Гэта часта бывае са мною. Дык напішы мне, як ты думаеш пра тое, каб прыехаць табе сюды. Пражывём. Можа і ня прыдзецца табе і сядзець у бацькоў да вясны. Вельмі гэта добра будзе, калі ўсялякія там гаворкі пашлі. Я ведаю, што табе прыкра ад гэтых гаворак. Калі ўсё аформіцца добра і калі ты будзеш згодна прыехаць, дык я напішу табе, калі выяжджаць, у які дзень, каб мог тады спаткаць цябе на вакзале. А то ты прыедзеш і ня ведацьмеш, куды падацца. Яшчэ наконт грошай на дарогу. Мусіць, давядзецца табе папрасіць і ў таты, бо ў мяне, мусіць, ня хопіць. Але гэта яшчэ невядома, тады буду бачыць. Можа, тату будзе і няпрыемна, бо яму-ж нагаварылі былі, ды ён і сам думаў, што я вельмі многа зарабляю. Я-ж сам чуў гаворкі, што ты за мяне пашла панаваць. Нейк усё ўспамінаецца цяпер, думаецца пра ўсё гэта. Я твае лісты ўсе атрымаў. Падабаецца мне, як ты пішаш. Зусім ня гэтак, як звычайна гаворыш. Паводле лістоў, нейкай іншай здаешся, вельмі сталай, разважлівай. А ты-ж усяго і ёсьць мая малюсенькая Ганулька, Ганұся. Пішы. Я думаю, што неўзабаве ўбачымся. Калі прыедзеш, дык зіму і лета і яшчэ тую зіму давядзецца жыць тут, а тады на практыку буду выяжджаць. Але да гэтага яшчэ далёка і многа раздумваць над гэтым

ня буду. Неўзабаве зноў чакай ліста, буду пісаць часта. Цяпер вечар, кагадзе прышоў, зьмёрз і грэюся. Тут халады. Бывай здарова“.

Андрэй.

20 сьнежня.

XXIII

За вуліцамі, за хатамі, над лясамі і полем узыходзіў месяц. Вячорнае неба было чыстым і шырокім. Прытульна і вольна скрыпеў сьнег пад нагамі, але была зімовая цяплыня і спакой. Ганна паволі ішла вуліцаю. Расьсеенымі зіркамі акідала хаты. Ящчэ не сьцямнела зусім і востра вырысоўваліся ў небе вельмі выразныя абрысы далёкіх і блізкіх дрэваў. Далёкія кусты ледзьве цямнелі няроўнаю істужкаю за полем. Усё маўчала і слухала. Ганна адна была на вуліцы. Асалода ад гэтага спакою поўніла яе. Раптам утрапеньне пачуцьцяў ускалыхнула яе. Абое яны памкнуліся былі прыпыніцца, нават несьвядома, на адзін найкаротшы момант, зрабілі былі гэта—яна і Алесь, што прайшоў насустрач. Пасьля пашлі. І цяжка было Ганьне разабрацца ў наступныя хвіліны ў сваіх пачуцьцях і ў вострай трывозе сваёй. Адно сказала:

— Добры вечар.

І пачула яго, гэтакі знаёмы, голас:

— Добры вечар.

А як дайшла да свае хаты, прыпынілася на хвіліну ў варотах. Не азірнулася назад, а паглядзела на верхавіны высокіх дрэваў на чыстым вячорным небе. „Сёньня-ж напішу пра гэтую трывогу сваю Андрэю“. Але, прышоўшы ў хату, пасядзела моўчкі каля вакна і на доўгі час пахавала ўсё гэта ў душы сваёй.

Алесь-жа вышаў у сад, глянуў на паплавы за ім, на ружовую істужку захаду над чарнатою лясоў. Адчуваючы, як у вострым смутку сьціснуліся грудзі, увайшоў у хату.

— Маня, хадзем гуляць.

— Куды?

— Хадзем от. Апраніся.

Узяў яе пад руку; пашлі яны вуліцаю, поўнаю гучнай цішыні. Ледзьве ружавеў захад.

— Да часу мы гэтак, Маня, жывем.

— Як да часу?

— Гэтак, як цяпер.

— Пра што гэта ты гаворыш?

— Гаварылі хату ставіць новую, а я падумаю яшчэ.

— Чаму?

— Каб усю гэтую вуліцу дагары нагамі перавярнуць.

— Што ты думаеш гэта? Нічога мне ня ўцяміць.

— Ведаеш, от гаварыў я з табою. Каморнікаў выпісаць на лета. І папрацую-ж я!.. От як!

Прайшлі ўсю вуліцу. Вярнуліся назад. Захад пацямнеў, істужкі лясоў відаць сталі выразьней. Юрка і Юзік весела марозілі рукі, стараючыся з падмёрзлага сьнегу ляпіць сьнежкі.

— Нашто вы рукі марозіце, жэўжыкі?

— Сьнег цёплы.

— Гэта спачатку рукі мерзнуць, а пасьля аж гарэць пачнуць, як разагрэюцца ў сьнезе.

— Ну?

— Йй-права.

— Каб я так жыў, што праўда.

— Эх вы, жэўжыкі!

— Чаму?

І яны пашлі ўсьлед. Усе прыпыніліся каля хаты

— Што вы цяпер робіце?
— Вучымся.
— А я яшчэ і тату памагаю ў гумне.
— І я памагаю. Кагадзе каня паіў.
— Ты-ж вядра з студні не дастанеш.
— Уга! Не?! Лепш нават за цябе!

І ўсе засьмяяліся. Маня глядзела на іх абодвых, малых, радасна нейк, прыхільна, з добрай усьмешкай. Алесь жартаўліва падхапіў іх кожнага пад паху. Падняў і паставіў на зямлю.

— Лёгкія вы якія.
— Я за Юрку цяжэйшы.
— Зусім ты за мяне не цяжэйшы.
— Бо і цяжэйшы.
— А як-жа вы ведаеце, абодва?
— Мы важыліся, яшчэ ўлетку.
— Дык я-ж і быў цяжэйшы.
— Не, я.
— Вы абодва роўныя.

Зноў падхапіў іх. Тыя рагаталі.

— Ай, пусьці, Алесь.
— Яшчэ падарвешся, мы-ж цяжкія. Мала што ты гаворыш. От паглядзіш, возьмеш.

Пагладзіў іх абодвых па галовах:

— Расьцеце, сынкі, расьцеце, браткі. Вучыцеся. Выростайце моцнымі, дужымі. Расьцеце. Выростайце. Бяжэце дадому, ня мерзьніце.

У хаце запаліў агонь. Мацеры нездаровілася. спала, укрыўшыся ўся ватовымі вопраткамі. Маня пачала брацца за нейкую хатнюю работу.

— Пачакай, Маня, пасядзі.
— Чаму?
— От пасядзі. Пагаворым.

Сеў каля яе. Абхваціў рукамі яе галаву. Цалаваў валасы, твар. Абое свавольна паглядалі на ложак—ці не прачнулася маці.

— Чуеш, Маня, гэта-ж паўната жыцьця.

— А часам ты сумны нейкі бываеш.

— Мала што. Ты на гэта не глядзі.

І яшчэ галубіў яе. Забываўся на ўсё.

— Пусьці, Алеська, я буду рабіць што.

— Усё роўна ўсяго за век не перапробіш. Пачакай.

Хораша, добра глянула яму ў твар.

— Яшчэ хадзем гуляць, Маня.

— Добра.

І яны пашлі ў вячорны спакой бачыць і слухаць, як востра жыве ў ясных далях замарожаная сьнегам зямля.

XXIV

У той дзень ішоў адлежны вецер. З сініх лясоў, з асьнежаных даляў. Густы і вясёлы быў вецер. Сьпявалі дрэвы бязупынную мэлёдыю свае ветравое волі, пахлі вільготнай карою. Гойдалі вецьце ў неабсяжнасьцях неба. Пахлі лясы — хвоі і мох. І сьвежы яловец весяліў вочы. Дарогі губляліся ў празрыстасьці даляў. І гэтакія глыбокія, гэтакія сінія былі істужкі неба і зямлі на даляглядах, як дзяўчыніны вочы.

У тым самым, даўнейшым рудым гарнітуры, з вузенькім каўнерыкам была яна. Думала, клапацілася. І маці каля яе — і сумавала і радавалася. Губляла свае матчыны сьлёзы. Апошнія клопаты свае аддавала дачцы.

— Вы, мама, ня плачце.

— Гэта нічога, так гэта я. Ты на мяне не глядзі.

Перад вокнамі ў дварэ брат высьцілаў у возе сядзеньне.

— Ну, то чаго вы, мама, плачаце?

— Добра яно. Але ўсяк думаецца. Тады, дык ехала недалёка, у свой горад, а гэта за сьвет, нямаведама. Дык мацерынаму сэрцу і горка.

Бацька кульгаў па хаце і быў вясёлы:

— От табе і папагаварылі, і языкамі папамяньцілі. Цяпер усякаму скажу. Гэта ні то што...

Дзядзька Вашыновіч тупаў на дварэ каля саней, стараючыся памагчы. У хаце чуваць быў яго голас. І якім родным раптам здаўся гэты голас:

— Тымчасове, заварацень слабы, гатоў лопнуць.

Брат звонка адказваў:

— Ня лопне.

— Ой глядзі, каб у дарозе важдацца не давялося.

Бацька пашоў з хаты, прынёс у сані бярэмя сена. Стаў вымошчваць у нагах. І якія-ж у яго слаўныя, родныя маршчыны каля вачэй і на ілбу.

Усё было гатова. Куплены ў горадзе лазовы кошык, замкнёны зялёным замком, быў перавязаны тоўстым шпагатам. Маці клапацілася:

— Ці хаця-ж усё там тваё цэла за гэты час?

— Цэла будзе.

— Гаспадыня хаця ці пільнавала там?

— Пільнавала.

— Можа ты нядобра і зрабіла, што, едучы сюды, ня ўзяла з сабою хаця самага лепшага?

— Цэла будзе. Сёньня пазабіраю.

— Цяжка табе будзе там у поезд.

— Брат паможа.

— Хіба што.

Ганна сядзела каля стала. Кагадзе што разднела. Сані яшчэ не гатовы былі.

— От добра, што бацьку з нагою лепш.

— Але.

— Я табе яшчэ малака прынясу.

— Ня трэба, мама. Годзе.

— Хаця-ж пішы, як заедзеш.

— Добра.

— А то нам тут усяк думацца будзе. Вядома, усё здаецца. Вам, маладым, можа іначай. Можа што і не ў галаве. А нам рупіць. Кланяйся-ж там Андрэю. Улетку прыяжджайце, калі будзе як.

— Добра, мама.

— Няхай і ён калі напіша.

І пашла маці, заклапочаная, у кухню.

Зараз трэба будзе садзіцца ў сані. З кухні мацерын голас:

— Што-б табе гэтакае прыдумаць апрануць наверх, каб цяплей табе было ехаць, і сама ня ведаю.

Лёгкі туман ледзьве прыметны за вокнамі. На вуліцы чуваць галасы. Здаецца, гэта пахне жытам і сенам.

Ганна падышла да вакна. Чарнела над сьнегам сухое каліўё замёрзлай вяргіні. Моўчкі глядзела на яго. Села зноў за стол. „Калі-ж гэта я зноў прыеду сюды? І ці жыў будзе тады бацька, ці жыва будзе маці? І як будзе тады брат жыць?“ І гэтакаю прытульнасьцю павявае тутака ўсё. І гэтакі-ж шырокі вецер.

Яшчэ раз дастала, каб перачытаць, ліст Андрэя:

. . . .

. . . .

. . . „папрасі бацькоў ад мяне, каб выбачалі, што я ня прыслаў табе грошай на дарогу. Няхай зра-

зумеюць; няхай ня крыўдзяцца. Я выйду цябе спатыкаць у той дзень, калі павінна ты прыехаць. Калі-ж цябе ня будзе, я выйду ў наступны дзень. Скажы бацьком, што я дзякую ім за цябе. Работу я дастаў, і мы пражывем ня вельмі гаруючы. І гэта скажы бацьком. Я буду старацца, каб табе тут было добра. Адно ты кахай мяне гэтак, як кахала. Перад намі шырокі простор будучыны. Перад намі—усё наша. Хутчэй-жа будзь тут, родная мая. Я люблю цябе“.

КНІГІ ТАГО-Ж АЎТАРА

Срэбра жыцьця—кніжка апавяданьняў.

Хвоі гаворацЬ " "

Апавяданьні " "

Па дарозе " "

Пачуцьці " "

Вецер і пыл—роман (рыхтуецца да друку).

Верасьнёвыя зоры—кн. апавяданьняў друкуецца.